Зок-1
12702

У З В Ы Ш Ш А

ЧАСОПІСЬ
ЛІТАРАТУРЫ,
МАСТАЦТВА
І КРЫТЫКІ

№ 11–12

ПЯТЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ

10108

XVIII (VII)

7451

МЕНСК—1931

З Ь М Е С Т

Стар.

М. Лужанін—Галасы гарадоў (*поэма*) 3

Я. Зазека—Рукою ворага (*апавяданьне*) 29

П. Глебка—Арлянка (*поэма*) 48

В. Шашалевіч—Рой (*п'еса*) 59

С. Нортман—Пра машыны і „дэмпінг" 89

З. Бядуля—Язэп Крушынскі (*роман*) 92

Л. Бэндэ—Творчы рост Андрэя Александровіча 149

Із. Плашчынскі—Пра аповесьць Платона Галавача „Спалох на загонах" 168

Пастанова літаратурна-мастацкага згуртаваньня „Узвышша" 173



Галоўлітбел. № 254. Заказ № 743. У ліку 1000 экз. „Палесдрук," Гомель

Максім Лужанін

Галасы гарадоў

Матэрыялы на поэму [1]).

Запеўка

Наперад—
дарога камуніных дзён,
а сёньня
трэба ў трывозе
іпрытавай,—
гэтаму слову
ўдыхнуць жыцьцё,
каб білася сэрца
у кожнай літары.

Каб жменька дум гэтых
даплыла
у сьвет,
дзе з вышак
нашае раніцы
бачу—
заліты сьвятлом далягляд
і чую
пульс гарадоў нячуванага.

10

Погляд туды

Стынуць Лукішкі
ў марозавым ходзе,
крык вартавых
укладаецца ў тахт...
— Дзе-ж яно сонца,
дурное,
ўсходзіць,
калі навокала цемната?
...Поэту Бронеўскаму хочацца неба...
І пакуль
пяюць на дарогах старцы—

---

[1]) Пачатак гл. №№ 8, 9, 10 час. „Узвышша" за 1931 г.

сядзібы асаднікаў
паліць
зрэб'е,
і паўстанцкім атрадам
у бой
карціць.

А полымя помсты угору рвецца,
выбухае у сьвет
стоязыкай зарой,
яно
множыцца штодзень
на тысячы сэрцаў,
у якіх навальніца
ўспажарыла кроў.

На паседжаньні сойму
ідзе няпрошаным
дужасьці словам:
— Права давай!
Крывавая кашуля пасла Валошына
інтэрпэлюе міністру ў твар.

І покуль
Вільня
фокстротам корчыцца,
схаваўшы на грудзі
фашысцкі білет,—
зьбіраецца нарада
ў таварыша Корчыка,
напружнай, як порах, КПЗБ.

Там—
гавораць і раяцца да сьвітаньня,
перакрываючы
дэфінзывы ашчэр.

І радок
за радком
бяжыць прывітаньне
бальшавіцкаму зьлёту
БССР.

Тым,
хто ідэю
і дзею вынасіў,
дзе слова,
як поле,
раджае плён.

Туды,
дзе бязгірная вага Лапідуса,
сыфоны Азарэвіча,
конструкцыі Гурло.
Значыць—
песьні зьвінець,
вырастаць
і вышэй шугаць.
Я дужым Захаду
сёньня
шлю—
слова
пра большае
і даражэйшае
з таго,
чым жыў
і жыве
Саюз.
І новая песьня
праз краты сочыцца:
— Права бяры
цераз дым
і агонь!
Трэба
ўзмахам гэта скончыць,
каб быў дзень
вясёл
і звонак,
каб нам скрозь сьвяціла сонца
і на стрэчу
бег дзіцёнак.
Песьня ліецца...
Песьня сочыцца...
Поэту Бронеўскаму неба хочацца.
Таварыш Бронеўскі,
прымай яго!

11

Крок мінулага

... І сонца
стаяла
на тысячы вёрст,
адно толькі сонца,
густое,
як брага...

І ў кожас
ніводзін загон
не прарос,
пра смагу зямлі
папярэджаны
загадзя.
Ляжала яна
— міжвяковае тло—
і ліпкія гліны
давалі расколіны.
Нішчымныя дні
пад
няўмольным сьвятлом
душылі
кашчавымі пальцамі
голаду.
І смагла яна...
і тужэла яна,—
няўзятаю сілай
сваею
набрыньвала...
Ня спала
яна,
але сьніла, аднак,
што выб'ецца,
здолее,
здужае,
рынецца ..
Пагоніць
зялёныя парасткі
ў рунь—
кашлаты ячмень,
градавая пшаніца—
каб ім,
пераросшы
сябе
і пару,
сьцяблом
і налівам
на сьвет пахваліцца.
Каб
з кожнае поры
угору,
пішчом,

кіпеў ўраджай
масьляністым зяленівам,
каб
гурт каласоў—
чалавеку ў плячо,
ядраных,
цяжкіх,
· як зялёныя венікі.
А роспач
ішла
гэты кон выракаць,
і сны
зьнябываліся,
ў поцемку глухлі...
І енк
па рацэ...
Гаманіла рака:
— Гэх, дубіначка,
ды гух-нем!
І дзень
вырашаў
праз ярэмны накат,
што ўзяць:
жабраваць,
ці ад голаду пухнуць?
Ў гісторыю
ўрэзаўся
крык бурлака:
— Гг-эх, дду-б-бінначкаа —
ды ггух-нем!
Як з галераў
рымскіх
нявольніцкі стогн
ляцеў,
перамогшы інэрцыю руху...
І
рваўся
з тугі
стовяковы прастор:
— Г-гэх-х, дду-ббі-начкаа,
дд-ы ггух-ніем!
А поруч
з гулянкі
ішоў параход,

і п'яны купец,
пацягаючы
з куфля,
сьпяваў,
атлусьцеўшы
ад рабскіх работ:
— Гээх, ду-убіначка,
ды гуу-хнем!
Пад
кіцелем белым
заціснуўшы стан,
на ўсю сваю моц
мардабойнага духу,
за шклянкаю
шклянку
гасіў капітан:
— Гіэх, дыўбіначка,
ды гухніем!
Чыноўнік,
абшарнік
і пан генэрал,
міністры,
папы—
стан
крывёю набухлых—
і кожны
пасвайму
сваё запяваў:
— Гэ-эх, дубі-іначка,
ды гухнем!
Сьпявала „Расея"...
На
тоўсты жывот,
пярсьцёнкам
паклаўшы
азызлыя рукі:
— Мы ўсе за цара...
Гэты
бедны народ—
— Г-гэх,
дубіначка,
ды гухнем!
У вірную пройму
ішоў
параход—

рабоўныя лапы,
памятыя сукні,
майстэрства
прыгону
з майстэрствам пяшчот...
— Гэх!
дубіначка!
Дай!
Гух-нем!

І
пелі рабы,
і
цягнулі рабы...
І рваліся
жылы,
і клаліся гукі...
Бо нашае права –
рабамі ня быць!
— Гэх!
Дубіначка!
Дай гух-нем!

І
дужыя людзі
ішлі
праз суцём,
ужо
ў сутарэньнях
кавалася воля,
і новы закон,
і другое жыцьцё —
Волзе.

Бальшавіцкая папраўка да географіі

Многа каркаў
зломана
аб мора,
шмат людзей
хацела
лейцы ўзяць...
Колькі вось
цароў
падкручвала гісторыю

толькі ўсё
ня ў перад,
а назад.
Пакрышылі косьці.
Леглі
лягма ўсе.
На курганах
вырас
дзень
жывых.
І ніхто
ніколі
не дацягваўся
да таго,
што робіць бальшавік.
Гэта толькі
нам
адным
патраціць,
не хаваючы
сваіх
завад,
дыктаваць
папраўкі
геаграфіям
і наноў
гісторыю
каваць.
Прызвычаіліся:
што зямлі
ня спыніш,
што вадзе—
па рэчышчы
цячы.
А вось мы
ўзялі
ды й пераплынілі,
і рака
маўчыць.
Быў калісь
такі
вялізны Пётр,
той,
каторы
правакніў Эўропу...

Сеў пры моры:
— гэта будзе
порт.

Брыдка нам
такія
крокі
шлёпаць.

Кожнаму—
сваё.
Яго рэдут
на кані
стаяць
чыгунным пужалам...

Ён—
к вадзе.
А мы—
к сабе ваду.

— Саматужнікі
Мы прышлі
зямлю
наноў сагрэць.
На такую шыр
каму
пастаўлен голас?
— Будзь ключом
ад чатырох марэй,
Волга!
Мы цяпер
ня будзем
сьцены сеч,
каб вакно...
А што такое
дзьверы,
Для такіх
мільёнамэтрых плеч?
Як яны
такія выраслі—
ня верыцца!
Дзе-ж такое
ўзгадаваць
у злагадзе?
Вострай бойкай
неба
зрушан гмах.

Мы
такі сквазьняк
Эўропе
зладзілі,
што
ня ўстоіць
на нагах.
Хто
і чым
адужыць,
разгародзіць?
Кім
сьцяна
такая
прынясецца,
каб
ня біцца сэрцу ў тахт
у ткальлі Лодзінскай
і ў тэкстыльшчыцы
Інана-Вазьнясенскай?
Нельга
сэрцы
ўдарам палкі гумавай
разлучыць,
раскінуць за равы—
у каго
аднака
думы думаюцца,
у каго
адзін напор крыві.
Гэта
дужа страшна—
вокны Ўсходу.
Можа
зацыруеце,
буржуйскі акадэмік?
Не!
ня можа
быць
ніякіх загародак
для палётаў ленінскіх ідэй.
І раптам—
гудкоў захлынуліся грудзі,

сьцягі
жалобай
уніз пашлылі...

Гэта йдзе ноч
21-га студзеня,
18 гадзін, 50 хвілін.
У гэтай ночы
ёсьць ўсё.
І нічога...
Нічога
дасюль
зразумець не магу...
Твар і труна...
І сьляза вартавога
на зялёную нашыўку ГПУ.
Шпарчэй, пасы!
галасьней кавадлы!
Чырвонаармеец,
няпружней штых!
Гэты
змагацца
ён нам загадвае,
гэты
заўсёды жывы
бальшавік.
Ноч, няпраўда!
Гудкі,
вы маніце!
Сьмерць—
гэта толькі
прымгло павек.
У дужым сягоньня,
ў вякох за намі—
Ленін жыве!
Мы йдзём
на усю моц
маладога руху,
каб зброяй ягонаю валадзець.
І ён
над песьняй
ўздымае руку

і кожнае слова
у бой вядзе.
Нам шмат вучыцца,
каб думак бярэма
ленінскай сілаю
апавіць,
каб ён
над кожнаю
нашай поэмай,
як над будоўляй,
стаяў жывы.
Плакалі рэкі,
як людзі,
сьлязамі,
як людзі, стаялі
да цела чаргой.
— Камо грядеши сягоньня, Кама?
І Волга сказала:
— Ў Маскву.
Да яго.
І тыя,
што сталі нязрушнай зьменаю
кароткіх і поўных
яго гадоў,
вам выдалі пропуск
ў надтруньніцу
Леніна—
Волга,
Кама,
Ака
і
Дон.
І там,
дзе ляжала
ў труне Паваложжа
галоднае
смагла
ў лядох
блёкад,
мы сёньня
помнік
я м у заложым —
дваццаць два міліярды
кілёват.

На дзьве
магутнасьці Амазончыным
шырэй за сто Ніагар
у плячах—
устане з-за гор
нячуванае сонца—
лямпачка Ільліча.
І з кожнае
лямпачкі
палымнеючы,
расьце,
разыходзіцца
над зямлёй—
тое,
што сёньня
ўжо сьвет
і дзея,
тое,
што словам
да нас
было.
Тое,
чаму

мы паклалі шпалы,
зьбіўшы на землю
прымусаў гвалт.
Тое,
што
ўперад
яго гукала,
ўсё,
што
расьціў ён
і гадаваў.
Тое,
што
шлях
у сусьвеце
вытарыць,
крокам,
як думка яго,
вялізным,

тое
у чым—
наша Волга,—
літара—
непаўторнае—
соцыялізм.

13

Шлях вады

І куды скіруем, Волга,
пабя-
жыш,
і як мы сплянуем, Волга,
будзеш
жыць!
І ў якое скажам мора—
паплы-
веш,
і якія змусім горы—
раза-
б'еш!
І якую зложым песьню—
будзеш
пець,
і якім ударым звонам—
грымнеш
медзь!

Выйдзеш ты
з дрымотлівых плёсаў,
аб заставы
ударыш грудзьмі,
дужая,
мільёнаверстая,
вострая,
як дынаміт.
Што табе
без карысьці
ліцца,
праз
напружныя дні
ў спачын,

калі
ў пыле
стаяць сталіцы,
і мурзацяцца масквічы?
Вось,
здаецца,
пустое слова...
Што такое вада?
Лухта!
А пачалі-ж вось
абмяркоўваць,
перакручваць
і сяк,
і так.
Калі
хочацца так
паводкі—
можна
выціснуць
вершаў том,
пэўне,
выстарчыць
пяцігодчыным
і заводам
і караблём.
Ды няўжарт,
а на гром
навалы
правады
цэлы дзень
гудуць:
— давай
ваду!
І напоўнач
выходзяць
шчоглы,
хвалі б'юць
аб маскоўскі
мол.
І стаіць
на будоўлі
Волгі
шэф электрыкі—
комсамол.

Потам дужасьці
ў навальніччы
Волгу
ў Волгі
цяпер бяруць.
У яго—
галасоў
ня злічыш
і падаўна
ня злічыш рук.
Нашы пляны
ня знаюць
спадаў,
а вось тут
і дасюль
жыве:
падплывае
штогод
Саратаў,
не хапае
вады
Маскве.
Мы умеем
зацята біцца,
намазолім
цяпер
гарбы:
трэба
Ленінавай сталіцы
першым горадам
сьвету
быць!
Калі ўпісваць
гэта
ў анналы—
здрыганецца
гісторый схоў:
горад—сад
разьвінуў
каналы,
йдзе
па Яузе
параход.
Не абціснуць
бакоў
трамваі,

не ачмуціць
бяга аўто...
Падплываеце
і адплываеце,
як патрэбна,
як хоча
хто.
У зяленіве
дрэвы
стромчацца,
ступіш крок—
вадамёт,
відно,
карыстайся—
загара,
сонца...
Прызваіты
такі садок!
Не чакаю,
што гэта будзе!
я ўжо бачу,
што гэта ёсьць.
Разварочвайся
ў сонцым гудзе,
Волга!
чуеш?
прыходзь!
Ня упарціся,
славы мала,
паслужы лепш,
як я
радком!..
Ты ў Крэмлі
на стале
ляжала
ў самых дужых
бальшавікоў.
Перакрэсьленая
алаўкамі,
пераплыненая
ў іншы
бок,
электрычнымі
правадамі

праплывала
па гарадох.
І цэкісты
сказалі слова
так,
каб гуў
на выросьце
дзень:
роўнамоцная пастанова
пролетарыю
і
вадзе!—

14

Гаворыць Волга

Чатыры моры
бяру
на далонь,
дыхаю ветрам
касьпійскіх стэпаў
і вісьне
нявыпалаты
неба загон
сваёй недарэчнаю
зорнай сьвірэпаю.
Шырока ты лёг,
неабсяжны край мой!
Але ідуць
ад усіх бакоў—
першыя роты
працоўнай арміі
цесьляў,
бэтоншчыкаў,
мулярoў.
Там,
пад рукою
ударных брыгад,
прастор ажыў
неаглядны,
вялізманы:
жывая энэргія кілёват
ідзе на службу
соцыялізмаву.

І вось
упарцяцца інжынэры,
пад зялёным бяссоньнем
настольных лямп—
напорнаму ўзмаху
людзкой энэргіі
форт
за фортам
здае зямля.
Вада—
жыцьцё,
і электра—
жыцьцё.
Нязрушная сіла
ад мора
да хмар стаіць,
бо кожная шрубчына
гэтых дзён
прыкручана
сілай
і воляю
партыі.
Я прагна дышу,
каб гэтую музыку,
сьцяўшы вусны,
у слова падняць.
А Волга—
строф
разьбівае шлюзы,
і нельга ўтрымаць
у руках стырна.

На Чорнамор'і рассыпаўся звон,
што там за ён?
—Дон?

Бегма
ярамі
абточвае камень,
што за такая?
— Кама!

Ліецца,
віецца
бліскучаю фольгай,

хто
там
такою дарогай доўгай?
— Волга!

Узяў я на плечы тысячы тон—
Дон.
Кідаю ў сьвет электрычныя гамы—
Кама.

Вашы развоі удубальт падвою—
Волга.

І пяюць яны
у трох:
— На спаборніцтва,
Дняпро!

І гудзе Дняпро
ў адказ:
— на спаборніцтва,
Донбас!

— Кінем гром кілёват
на Пячору,
ў Ленінград!

— Нашы хвалі паплывуць
цераз Клязьму
у Маскву!

— Параходны пойдзе стан
ў Ледаваты
акіян!

— Халады, ляды разьбіць
блісьне кабель
у Сыбір!

— І за Пэнзай сотні вёрст
прабяжыць
электравоз!

І вось
з Уралу,
з Ілецкай зашчыты
падымаюцца руды
і соляў стан,
голасам
квасаў і фосфорытаў

пераплаўляцца
у медзь
і сталь.
Аддаўшы Волзе
найлепшыя гліны,
сухі
і бязьлесы
башкірскі прастор—
ужо
абзываецца алюмініем
у нашых авіё
і
аўто.
Цяжкімі кроплямі
ў тыглі чорныя,
капае калі
і хлёр густы.
— хай
справіцца поле
бавоўну
і
лён расьціць—
стрэчным плянам
гудзе тэкстыль.
І адтуль,
дзе раса
выядала вочы,
садзіла засуха
на хлеб
і квас—
шэсьцьсот тысяч
новых рабочых
заводам дае
павалоскі калгас.
Запаляйце домны!
сьвідруйце шахты!
Даволі капаць
палявы прастор!
За вашыя рукі
ўправіцца трактар,
пра сілу якога
ня марыў
Форд.

І там,
дзе навек
атрупела ўчора,
вылучэнец
ад клясы
сьвежай крыві—
пераварочвае
балонкі гісторыі,
упарты
цяглічны
бальшавік.
І ён,
што выхаваў
дзень саветаў,
дыктатураю клясы,
рукой Чэка—
дыктуе
сёньня
свае дэкрэты
Вяліка-Волскім
будаўнікам:
— Каб нашае слова
ня стала
дзейкаю
і,
калі сказана быць,—
будзь!
Гадзіну энэргіі
за капейку,
даёш, Волгабуд!

Упартая сіла
нашае клясы
ня раз
пераможа
стыхіяў бунт.
Гэй!
на падмогу
шахцёрам Донбасу,
даёш, Волгабуд!

Рукі прэч,
дарагія суседзі!
Брытанскі леў,
зарубі на гарбу:
тысячы тон
найлепшае медзі
даёш, Волгабуд!

Адвагай
і гонарам
— справа гэрояў—
вольных людзей
бяз кайданаў,
бяз пут—
Крыльле Саветаў
вышэй над зямлёю,
даёш, Волгабуд!

На кожным моры,
на акіяне,
кінем
савецкай сірэны
гуд:
цэлы сьвет
ў бальшавіцкім пляне,
даёш, Волгабуд!

Сьвет абыйдзі—
ня стрэнеш дужэйшых.
Гэй!
не марудзь!
працуйце ліцейшчыкі,
дружней
ды гусьцей яшчэ,
даёш, Волгабуд!

Гартуйце крокі,
грудзямі ў разгону шыр.
Гэй!
не марудзь!
Працуйце, бэтоншчыкі,
на славу
ясных дзён нашых,
даёш, Волгабуд!

Ці нам баяцца,
хавацца ад згуб ліхіх?
Гэй!
не марудзь!
Сьпявайце, шархублікі,
на славу
Рэспублікі,
даёш, Волгабуд!
І ўсяму,
што жыве
і расьце там—
сёньня

ліцца
з оркестраў
мядзяных губ.
Я ведаю
імя
гэтай сымфоніі—
даёш, Волгабуд!

Нядарам
яна
падымала поначы,
кідала завулкамі:
— Слова здабудзь!
Покуль
песенны звон
ня ударыў
мільёнаў шыр—
даёш, Волгабуд!

Дужасьцю цягліц
у брамах заводзкіх,
пролетаравай воляй:
— хачу—
магу!—
укрыты
штандарамі
другой пяцігодкі
чыгунны волат
стаіць
Волгабуд.
І гэта фініш.
А шлях
ад старту
вядзе
на тысячны перагон—
ленінскі штаб пабудовы—
партыя
і штаб судзеяньня—
мільёны.

15

Апошні зварот да Ромэна Роляна і Бэрнарда Шоў

Перамерана
сотні міляў,
і ў далінах нашай зямлі
сіверы мяне халадзілі,
сонцы
сілу ў далонь лілі.

Расказаў Вам
усё, што здолеў,
многа ведаў,
ды мала ўмеў.
Колькі радасьці,
колькі болю—
не разважана на бязьмен.
Я аддаў сюды
ўсе настроі
і трывогу сваю
і гнеў,
бо адкуль таго
супакою
узяць мне?
Дзе ўпільнуеш якога пляну?
Мільёны
ідуць будаваць,
мільёны
жывуць змаганьнем,
а поэтаў...
як мала нас!
Калі кляса
ідзе на прыступ—
высіць шчоглы
і гарады—
мне ня трэба спакою
прыстань
ў мае
дваццаць два гады.
З думкі—
кулю магу я выкуць—
сэрца,
лёзунг
і дзень
і твар.
Калі гэтакім
на пабыўку,
дык каму тады
працаваць?
Можа тым,
што за намі крочаць,
каб паўней
на сваім стале?

Рэволюцыі чорнарабочым
трэба—
сонца
вада
і
хлеб.
Песьня!
Далей па пяцігодцы!
Зірк ясьні
ды пружынь
плячук—
за ўдарніка,
вынаходцу,
па прагульшчыку,
па рвачу!
Цела
выцягнута струною,
страдыварыусавай, акурат,
толькі,
здэцца,
кранеш рукою—
буду йграць.
Буду йграць
да адноўленьня сьвету,
аж да сходаньня
ўсёй тугі,
бо на гэтым пасту
поэта
ставяць нашыя дні-вякі.
І на Захад
штыхоў брыгадай,
бальшавіцкі штандар
узьняць,—
песьня выдзе на барыкады,
пад вінтоўкай
стаіць яна.
І тады Вам
ісьці з Усходам,
Ромэн Ролян
і
Бэрнард Шоў—
Галасамі
сваіх народаў,
Галасамі
сваіх гарадоў!

(*Канец*)

Язэп Зазека.

Рукою ворага

I

Зранку...

Рвалася злосна, выла раз'юшаным зьверам мяцеліца. Бура віхрыла сьнег, несла яго па вуліцы, спатыкалася... Білася, як сьляпая аб сьцены, сапла лютасьцю гневу, тармасіла доўгімі мёрзлымі пальцамі пад акном вішню.

Так, здаецца, яна будзе раз'юшана гайсаць, пляваць пенаю ў вокны нізкага пракавечнага будынку цэлую вечнасьць.

Але к вечару вецер расштурхаў, разьвеяў на ўсе бакі хмары, завея—зьвер пачала лагадней лізаць языком на ўзгорках сьнег, згортаваць да платоў і будынкаў.

Павячэраўшы, Волька апранула кажух, завязала суконную хустку:

— Ты, куды пойдзеш?—запытаў муж.

— Сход у школе буду праводзіць.—Яна дастала з століка жмут розных паперак.

— А Юрка як?—працятым нявыразным болем запытаў Ігнат.

— Прыехаўшы з сельсавету, я яго палажыла спаць,—на адыход сказала яна.

Прайшоўшы па вуліцы, Волька адразу стала адчуваць, як колкі мароз пабег па яе целе. Волька шчыльна захінула крысы, адмервала шырокія крокі па вуліцы.

— Хіба ты яшчэ не загадаў?—на сярэдзіне вёскі, яна спаткала Сымона.

— Таму канцу загадаў, многа хто пайшоў,—Сымон сёньня меў нязвычайны выгляд: ён сагнуўся ў крук, паставіў каўнер, уцёг у плечы шыю. Вусы яго аб'інелі і па краёх віселі доўгія мярзьлінкі.

— Ты ўсім загадваеш?

— Ды, не... беднаце і калгасьнікам—падышоў ён бліжэй.

— Ведаеш, Волька, зацікавіліся нашы багатыры сёнешнім сходам Аўсей прыехаў з сельсавету, проста прыбег да мяне.

— „Сымон, браток, дапамажы, кажа. Хай Волька брэша, хоць ты заступіся, суседзямі былі і застанемся,"—жмурыў вочы, сьмяяўся Сымон.

— Бач ты іх!

— Загадвай ды прыходзь,—сказала яна, і бровы вуглом сышліся на пераносіцы.

Рыпеў сьнег, мароз клапатліва шчыпаў Вольку за шчокі. Яна цясьней завязала хустку.

Каля школьнага частаколу блішчэлі ў цемры папяросы,

Вецер часамі падхопліваў іскры, нёс па вуліцы вузкай агністай істужкай, а калі іскры гасьлі, тады зноў станавілася роўная густая цемра.

Параўняўшыся, Волька заўважыла двух знаёмых мужчын. Адзін, абапёршыся аб частакол, смактаў бесьперапынна люльку, другі паста-віў у доўгім чорным кажуху каўнер, паглядаў у бліскучыя вокны школы. Калі Волька параўнялася, першы кінуў курыць, выцягнуў шыю, глядзеў шырокімі, нібы ўстаўленымі з чорнага вугалю зрэнкамі

— Груган,— падумала Волька.—Так бы і выдзеў-б вочы.

II.

У школе, прыбранай плякатамі і лёзунгамі, сядзелі на лаўках колгасьнікі і беднякі.

— У выяўленьні індывіауальных кулацкіх гаспадарак, павінна прыняць удзел уся беднота і серадняцкая частка вёскі,— гаварыла Волька,—на падставе суцэльнай колектывізацыі мы зьнішчаем кулака, як клясу. Кулак гэта разумее, ён бачыць нашу актыўнасьць і шпаркае будаўніцтва на ўсіх франтох соцыялізму. Кулак зараз імкнецца падружыцца з намі, потым, маючы апору, падарваць колектывізацыю. Мы сёньня павінны адкрыта, без усялякіх абарон і прыдзірак сказаць: якія гаспадаркі падыходзяць у нашай вёсцы да індывідуальнага абкладаньня. А ў нас ёсьць такія, нам патрэбна зараз аб іх гаварыць.

Волька скончыла, склала ў некалькі столак газэту, у якой была надрукавана пастанова ўраду аб адзнаках індывідуальнага абкладаньня

— У каго ёсьць пытаньні?

— У мяне пытаньне,—сказала Хрысьціна.

— Ці можна аблажыць індывідуальным тую гаспадарку, якая амаль дармова арандуе ў беднякоў зямлю.

— У каго яшчэ?

— Ці можна абкласьці, калі гаспадарка на лета наймае шэсьць-дзесят жней?

— Яшчэ ў каго?

— Усё зразумела,—гаварылі некаторыя.

— Зараз Карпава адкажа на пытаньні, — устаўшы, апавясьціў старшыня.

Волька адказала, сход застаўся задаволены адказам, узьняўся настрой, пачуліся жарты, размовы, яны перакідваліся на сярэдніялаўкі.

— Давайце, таварышы, супакоімся, хто выказацца хоча?

Спачатку ўсе маўчалі, каля печы пачалі шаптацца. Вялізная лямпа моргала, змагаючыся з густым дымам.

— Мне слова. У нас, як усім вядома, ёсьць кулакі, гэта Аўсей і Шаркоў, ды, падумаўшы, яшчэ можна назваць некалькі чалавек. Яны

самі не працуюць, а ўсё робяць чужніком. Цьвёрдае заданьне збожжа Шаркоў ня здаў дзяржаве, а завёз у Клічаў на рынак,—адрэзаў малады хлапец Юзік.

— Праўда! праўда!—падтрымалі галасы.

Каля стала пачуўся часты і парывісты кашель. З натоўпу нясьмела вышаў дзед Захар'я—бядняк, колгасьнік, а раней быў ён пастухом у маёнтку Паўлюкоўскага. Пад бляск лямпы зморшчаны яго твар выразна быў белым і худым, сьмяглыя яго губы паволі закраталіся, дзядзуля пачаў:

-- Я добра ня чуў, які ёсьць закон у газэце, але Піліпа Аўсеевага аблажыць абдзювідуальным трэба. Ён летам трымае парабка, людзі пакосяць яму і пажнуць. Іван Шаркоў кабанамі гандлюе, у дадатак ваўначоску сваю мае.—Дзядуля закашляўся, задрыжэлі асінаю нязграбныя рукі.

— Праўду Захар'я сказаў,—паўтараліся галасы.

— Хрэн стары і сюды свой нос уткнуў,—буркнуў нэрвова Хведар.

— Дайце мне слова!—Падышоўшы да стала, ён пачаў:

— Дзед Захар'я і Васілёў хлапец няпраўду кажуць. Якія яны кулакі? Што зямлі больш маюць? —дык яны-ж набылі яе сваімі мазалямі. Летам працуюць так, як і мы, а калі Піліп наняў парабка, дык ён-жа дзяржаве даў больш за сто пудоў хлеба. Уладзіку нам трэба падзякаваць, што ён устроіў воўначоску. „Шаўцы" сукна не даюць,—голым прышлося-б хадзіць.

Сход пачаў нецярпліва шумець.—За мякіну ў Аўсея наняўся—з кутка крычаў нехта.

— Хведар, ты не чалавек. Што ты летам казаў, калі па тыдню адкошваў за асьміну насеннай бульбы?—перабіла Хрысьціна.

Каля печы з натоўпу вытаркнулася стаўбунаватая галава Ціхана. У вачох яго сьвяціўся слабы блеск. Рэдкія сьветлыя вусы распаўзьліся на тоўстай адвіслай губе, загіналіся, паглядалі ў рот. Ён доўга стаяў, гледзячы вакол, а потым нерашуча папрасіў слова.

— Мае слова Ціхон,—апавясьціў старшыня.

— Таварышы, браткі, аблажыць Аўсея і Шаркова—гэта перагіб, аб гэтым пісалася ў газэтах. Мы, мужчыны, слухаем баб, а хто іх слухае—той сам баба.

— Халуй ты кулацкі!—стукаючы кулаком па лаўцы крычаўСымон.

— Ды, што тут многа гаварыць. Аблажыць іх,—хвалявaліся галасы.

Сход разыходзіўся...

Працяжна рыпелі настыўшыя дзьверы, адсякаючы ахапкамі белы густы пар. Худыя, доўгія цені лямпы захісталіся і зьніклі. Неба, як і раней, жмурылася чорнымі складкамі. Ад паўночнага подыху ветра паўзла мяцеліца, замятала сьляды палозьзяў.

Вялікі мурзаты месяц праз вузкія шчыліны хмар сыпаў у густую цемру сіні слабы сьвет

Пад нагамі рыпеў сьнег. Волька спяшалася дадому.

III

Ігнат ляжаў на ложку, трымаў у руках чарнявага Юрку. Юрка ўпіраўся моцнымі ножкамі ў жывот Ігната, размахваў тоўстымі, нібы шнурком перавязанымі ў згібах, рукамі, разяўляў шырока рот і сьмяяўся.

— Ляж спаць, сынок, а то воўк зьесьць,—сказаў Ігнат да Юркі.

Васьмімесячны хлапчук спрытна каўзануўся па грудзёх бацькі, нездаволена вышчарыў два белых разцы.

— Сьпі сынок, сьпі,—угаварваў Ігнат.

Пачакаўшы, Юрка хацеў вылезьці з пад тоўстай падшытай кудзеляй коўдры, але Ігнат яшчэ раз запужаў воўкам, і Юрка пачаў драмаць. Ігнат пагасіў лямпу і лёг. Праз нядоўгі час з сьцяны папоўз неразборчывы шорах прусоў. Падпечкам мыш пачала скрэбці нешта зубамі. Вецер за вакном ныў цяжка і нудна. Па сьцяне шоргала настыўшым гольлем вішня. Цела Ігнатава скаваў сон, павекі сваёй цяжкасьцю зачынілі вочы, нейдзе далёка скрэбла мыш. Ігнат дыхаў роўна і цягавіта.

Раптам Ігнат убачыў белы, пухлы твар Аўсея. Шэрыя падсьлепаватыя яго вочы з агіднасьцю глядзелі на яго. Рукі набліжаліся да шыі, у вушах пачуўся голас—задушу цябе!!. Ігнат пачаў бараніцца, закалаціўся, у вачох пасьвятлела.

У сенцах стукала клямка, зморанае цела не хацела варушыцца, але, прыпомніўшы, што Волька не вярнулася са сходу, Ігнат хутка падхапіўся, накінуў на плечы кажух, адчыніў завалу.

Так доўга сход зацягнуўся?,—палячы лямпу, пачаў Ігнат.

— Застанаўліваліся доўга на кулацкіх гаспадарках.

— А каго абклалі?—зацікавіўся ігнат.

— Гараўскага, Аўсея і Шаркова.

— Завошта?

— Як быццам табе гаварыць трэба. Ведаеш жа сам,—спакойна адказала Волька.

Навіны ўскалыхнулі Ігната.

— Няма работы, дык трасцу выдумляюць.—Ігнат стушыў лямпу і лёг каля сьцяны.

IV

Яшчэ прыцемкам.

Дым каміноў слупам уядаўся ў неба.

Каля рэчкі ў кустох павіс туман. Рыпелі дзьверы.

Тупа бразгалі каля студні вёдрамі.

Сёньня вёска Курган набыла руплівы выгляд. Сьпяшаліся хурманкі, ішлі мужчыны, кабеты, а за імі, падскакваючы, бегла дзетвара.

— Чуеш, Агапка, машыну Сымон прывёз. Забіраюць збожжа, арфуюць і ссыпаць будуць у адзін сьвіран.

— Чула, мая суседачка, для салдат, кажуць. Праўду-то... Хведар казаў. Гібель, памор надыходзіць,—каля студні шапталіся Агата з Праскоўяй.

Плёткі, нібы разматанае павуком павучыньне, паўзьлі, чапляліся ад хаты да хаты, дабаўляліся і зьмяняліся на печы бабулькамі.

— Госпадзі!.. божухна! Абарані ад холаду і ад голаду!—даведаўшыся, малілася перад абразамі бабуля Хадора.

— Чуеш, кабета, сьвіньню адну трэба закалоць, а то гадаўё чуць ня ўсе папісаліся ў колгас, давядзецца і нам ісьці.

— Ціхон меў дзьве каровы. Адну сёньня ноччу зарэзаў,—гаварыў, лежачы на палатках, Хведар жонцы.

У хаце Мірона сабраліся з усяго канца мужчыны, сядзелі на лаўках, курылі самасад, апавядалі доўга і дзелавіта.

— Палёгкі ў колгасе нам не дачакацца. Вось паслухай, што кажуць пра колгас у Навасёлках. У мінулым годзе паварочалі да самага глею зямлю трактарам, дык гірса парасла,—уздыхаў Андрэй.

Але, кажуць, што бабы кожную раніцу грызуцца,—разгладзіўшы шырокую бараду, смактаў люльку Ціхон.

У гэты час Пракоп паглядзеў на Ціхона прышчуранымі вачымі. Ён вагаўся, ці то яму сказаць ці не, але нарэшце ня вытрымаў, абурана пачаў.

— Ты, Ціхон, не пляці плётак, у колгасе Навасёлках жыве мая сяструха. Яна казала, што адразу, калі організоўваліся, былі непаладкі, але зараз выкінулі, каго трэба было, і справа пачала паляпшацца. Надоечы разьмеркавалі ўраджай, больш вышла, як ты альбо я зарабіў на сваёй гаспадарцы,—угледзеўшыся ў шырокую бараду Ціхона, гаварыў Пракоп.

V

— Волька, хто прымае збожжа?

— Сымон прымае,—прыпынілася Волька.

— А... гаспадар наш,—добрадушным сьмехам распаўзьліся на твары Васіля глыбокія канаўкі.

— Вы, дзядзька Васіль, калі пойдзеце, дык скажэце Сымону, каб ён хурманкі з ачышчаным насеньнем пасылаў да Пракопа,—тлумачыла Волька.

— Добра! Там ужо зробім.

На Апанасавым гумне стаялі густа хурманкі. Коні хрумкалі цьвёрдымі зубамі сена. Каля варот стаяў натоўп мужчын і кабет. Яны дзівіліся,—пільна наглядалі за кожным рухам трыера. Паміж імі шмыгала з пасінелымі насамі дзетвара.

— Гляньце, якая доўгая машына. Хадзем папросім Сымона, каб даў нам пакруціць,—крычалі прарэзьліва яны.

— Далібог, на падсітак так ня адбярэш чыста,—перасыпаючы з далоні на далонь, дзівілася Агапа.

Шум, гутаркі, перабоямі вясёлыя жарты, часамі агрызьлівыя лаянкі, напаўнялі нявыразным гулам гумно.

— Ты чаго стаіш! язык, як балабайка, а рукі... Стаіць, як цівун, у бокі узяўшыся,—упікнуў адзін з хлапцоў Яўмена.

— Ці-ж вы ня ведаеце, што яму казінец у ногі ўбіўся,—насыпаючы ў мяшкі, жартавала Хрысьціна.

Ізноў загарэўся сьмех, кпінкі кад Яўменам.

— Ну, давай, Марылька! давай хутчэй!—круцячы трыер падахвочваў Юзік.

— Ты ўжо змарыўся, як певень. Рашпыліў кажух, а хутка і кашулю скінеш,—сьмяялася Марылька, цягавіта паварочваючы кола, на якім поўзаў нядоўгі пас.

Юзік паглядзеў, што ад сьмеху застылі на белым круглым яе твары дзьве глыбокія ямкі. Ён хітравата адказаў.

—Паглядзім, хто да вечара і што скіне: ці я кашулю, ці ты кофтку.

Дзьве правыя рукі ляжалі на гладка вытачанай ручцы трыеру. Дзьве цягліцы бесьперабойна сьціскаліся і расьцягваліся. Кульгаў тормаз, ды дзьмулі ветрам крыльлі. З завостранымі канцамі зерняты ныралі праз рэдкія сіты на густыя, падалі на круглы барабан. А там шукала кожнае сабе таварыша, па росту, вазе, злучалася з ім, выхо-дзіла у паасобныя калідоры.

З левага боку важыў Сымон збожжа. Пара маладых хлапцоў спрытна падхватвалі мяшкі і складвалі ў ярус каля застаронка.

— Ну і маладзец Сымон!.. учора шуркі дроў ставіў, а сёньня пры вазе стаў,—сьмяяўся Васіль.—І калі ты ўсьпеў, браток, навучыцца?

— У старой арміі калі служыў, дык, хлеб важачы, навучыўся.

— А якім ты чынам у палон быў папаў?

— У палон я папаў у грамадзянскую вайну, на польскім фронце. Ад успамінаў на шырокім лбе склаліся маршчыны. Чорныя густыя бровы Сымона навісьлі над глыбокімі ўпадзінамі, у якіх іскрыліся васільковыя вочы.

— Вязеце, хлопцы!—чуўся гаспадарны голас Васіля.

VI.

Досьвета, калі закрычаў, залопаў крыльлямі на куросане певень, Ігнат устаў, паправіў лапаць, адзеўся і пашоў на канюшню.

— Гнедзенькі мой! лялечка мая!—падышоў да свайго ранейшага каня Ігнат.

— Зараз, сенца дам.—Наскубшы рэзьгіны канюшыны, натаптаў у жолаб. —Еж, лялечка! ды памятай старога гаспадара.

З праварыны пачалі паглядваць, просячы вачыма, суседзі Гнедага, Ігнат паглядзеў на іх коса.

— Чаго бельмы казерыце! Дам і вам. Ён па невялікім ахапку пачаў закідаць па чарзе сена.

Раніцой, шэрая муць змагалася на падваконьніку з цемрай.

Цярушыў сьнег.

Прышоўшы з канюшні, Ігнат пераматаў сані, пасьля сьпяшаўся да Васіля, каб узяць вяроўку.

— ... Ігнат, суседзе, кажу табе шчырую праўду: твая Волька ходзіць да Сымона. Шмат хто бачыў, як яна вечарам прыходзіла ў восець, калі ён сушыў лён. Шкода цябе, Ігнатка, ты добры чалавек, але жонка сучка ў цябе, круціць, марнуе табе жыцьцё,—затрымаўшы каля сваіх варот, нагаворваў Хвёдар Ігнату.—Я сам бачыў, што яна пасьля сходу пашла з ім на той канец. Кажуць, Пракоп у новую хату пусьціў.

Ад навін Ігнатавы вочы загарэліся сінім і страшным агнём.

— Няпраўда, брэшаш, руды сабака,—зашыпеў Ігнат.

— Ігнатка, ці мне гэта ў кішэню? У суседзяй запытайся. Я проста ад шчырага сэрца кажу,—нібы спагадліва перасьцерагаў Хвёдар.

— Усяго могуць набрахаць,—Ігнат рэзка павярнуўся і пашоў.

Крыўда сьціснула балюча грудзі, у нутро хлынуў кіпучы, едкі боль. Ігнат ішоў па вуліцы, стараўся не глядзець на людзей, але яму здавалася, што на яго ўсе глядзяць, гавораць пра гэта. Ігнат горбіўся, уцягваў, як гусь, шыю ў плечы, стараўся не паказваць свайго хваляваньня.

— Волька дома?—пачуўся ў вушах Ігната, нібы здалёку прынесены ветрам, голас.

— Дома,—нехаця адказаў Ігнат, зірнуў востра ў вочы Сымону, пасьля рэзка падаўся наперад. Ігнат зараз-жа адчуў, як па целе яго прабегла шчымлівая хваля. Ён застыў, адзеравянеў, толькі пальцы хацелі схапіць, разарваць горла Сымона.

— Ты, Ігнат, як прыдзеш дадому, скажаш ёй, каб яна прышла да Пракопа. Трэба памеркаваць, у чыім хляве зручней зрабіць кармушкі.

— Скажу.—Ігнат скрывіў твар, стаяў доўга на адным месцы, а потым рашуча ўзмахнуў рукамі, нэрвова разьвіў шпаркі ход.

— П'яны ён, ці якое ліха,—падумаў сам сабе Сымон.

Перабоямі, парывіста дзьмуў паўночны вецер, белым слупам віхрыўся сьнег.

VII.

Сьпіць пад тоўстай, цукраванай марозам, абалонкай дрыхкае ржавае балота.

Ад дзікай завірухі нудна і цяжка стогне голы гальлісты алешнік.

Роем мітусяцца лёгкія сухія сьняжынкі, раўнуюць гладзьдзю купіны і дробны хмызьняк.

На ўзгорку, распасьцёршы шлапаватыя стрэхі, прытаіліся, ураслі пакрыўленымі бярвеньнямі ў зямлю пуні.

— Дзьме, каб яму губы папухлі, засадзіў, ня выедзеш,—прыслухоўваючыся да енку ветру, вяла і незадаволена, скідаў Хвёдар сена.

— Нічога, дзядзька, у лесе дарогі не замяло, а полем ехаць мала давядзецца,—топчучы воз адказаў Юзік.

— Усё нічога. Ты навучыўся ад Волькі. У тае-ж язык, як трапло хвошча: „выканаць, лепш паставіць працу". Паглядзім, як яна паставіць. Гэта ня ў полазе з Сымонам качацца. Гаспадарка—справа сур'ёзная.

— Волька адна гаспадарку ня можа паставіць, пачаў супярэчыць Васіль.

— Дурань ты, Васіль. Ты верыш таму, што табе валаськія гавораць. А што-б яны рабілі? Хлеб жа з гэтага ядуць? Паглядзім, як ты пад'ясі калгаснага хлеба. — Хвёдар ярчэй вытрашчыў вочы.

— Ты забыўся, як за 30 капеек дзень касіў у Аўсея летам. Хлеба кавалка ня меў. А калі перастала муляцца на карку ярмо, дык, горла дзярэш, заўсёды за яго. Перагаворваеш Аўсеевы словы. Сорам табе, Хаёдар, — стыдзіў Пракоп.

— Што-ж ты Аўсеем упікаеш? Аўсей нашаму брату заўсёды можа дапамагчы. На каляды мукі пшанічнай мышы ўдавіцца ня было ў мяне, зайшоў да яго, бяз слоў 10 фунтаў даў. А праўленьне табе дало-б? Гараўскі трэці дзень бяз хлеба жыве, многа аб ім падумалі?

— А ці думаеГараўскі, што ў калгасе сьвінарнік ня скончан альбо лес ня вывезен? За цалюткую зіму два разы на працу вышаў,—падышоў да Хвёдара бліжэй адзін з калгасьнікаў.

— Вось ён кажа, што яму Аўсей ўсё дае, пазычае. А раней ён табе пазычаў, альбо даваў што-небудзь? — міргнуў вокам Юзіку Васіль.

— Пазычаў: кошык ацір, за які ён дзень сечку рэзаў, трыбухі бараньні даваў на адработ, — напомніў Юзік.

Узьняўся рогат, Пракоп аж вілкі выпусьціў з рук, заліваючыся ад сьмеху.

Хвёдар здрыгануўся, навалай апанавала яго злосьць. Ён хацеў абурыцца на Юзіка, але ўбачыўшы, што ўсе заняліся працай, Хвёдар дрыжачымі рукамі дастаў з-за пазухі люльку, набіў крышонкай і пачаў з смакам курыць.

Дзень раскалыхаўся, павесялеў.

Паволі хісталася вымытая сьнегам гальлё алешніку.

Пеніўся пад палозьзямі сьнег.

— Усё забралі?—вышаўшы з двара Ігната, запытаў Сымон.

— Яшчэ засталося,—адказалі з першых хурманак.

— Ён ужо справіўся, — задрыжэлі губы Ігната — „Марнуе табе жыцьцё",— успоўніў Ігнат.

Момантам уськіпела нечалавечая дзікая напружанасьць. Ігнат здрыгануўся, глянуў зьвярыным поглядаў на Сымона.— Я з ёй пагавару — Ігнат пачаў непатрэбна тузаць лейцамі каня.

VIII

Прыехаўшы, Ігнат адпрог каня, ня зьдзеўшы хамут, увагнаў яго ў хлеў. Падышоў да дзьвярэй і стаяў доўга, разважаючы, потым, раптам рвануў за клямку.

Родная хата, у якой Ігнат радзіўся і пражыў 32 гады, здавалася яму чужой і варожай.

— Усё сена забралі? — спаткала на парозе Волька.

— Самой ахмістрыні трэба было паехаць, дык ведала-б. Праўду людзі кажуць, што толькі языком, як сучка, чэшаш ды...

— Што ды?... Што здарылася?.., — адкрыўшы вочы, у якіх замуціўся спалох, — пыталася яна.

Ігнат расшпіліў папругу, кінуў у запечак, падышоў да стала, сьціснуў моцна кулак.

— Што здарылася, Ігнатка. Сена мо ўкралі?

— Сучка ты! Сорамна на вуліцу паказацца.

— У чым справа? Ігнат? Я нічога не разумею,

— Не разумееш? Зараз усё ты ў мяне зразумееш. Паслухай, брыда, што на сяле гавораць; праходу не даюць, — сьціскаючы сківіцы, разышоўся Ігнат.

— Ігнат, ты апамятайся...

— Сама, флюндра, апамятайся. Табе тольлі з Сымонам на восецях ды ў Пракопавым полазе аціралца. Я ашукваць сябё ня дам Галаву гадаўцы адкручу, а больш сораму цярпець ня буду.

Ад прыліву шалёнай злосьці Ігнат стукнуў з усяе сілы кулаком па стале, і прарэзьлівым голасам крыкнуў:

— Вон з мае хаты!

— Ма ма, — у калысцы прачнуўся Юрка. Цёмнаватая, з мяккімі валасамі, галава яго паказалася з-за рабой завешанай пасьцілкі. Чорныя вочы глядзелі лагодна і прыемна на бацьку.

— Т-т-т-а, - вышчарыўшы два белыя разцы, нешта хацеў сказаць Юрка.

Ігнат бокам глянуў, у вачох яго мільгануў дужа падобны твар Юркі да Сымона. Ад гэтага яшчэ больш запала пякучая іскра крыўды на Вольку. Ігнат закалаціўся, пачаў крычаць няпрытомна.

— Сучка ты! Флюндра!. Юрка—ня мой сын! Ты з Сымонан яго набыла. Ты даўно хвастом круціш. Цяпер усё вядома, як ты са сходу пашла з ім да Пракопа і ў сельсавеце разам начавалі. Ды я табе маць... галаву адкручу!—падыходзячы ўсё бліжэй і бліжэй, дрыжаў увесь, як у трасцы, Ігнат.

Волька хацела нешта сказаць, пераканаць Ігната, што, акрамя сувязі з Сымонам на працы, інакшай між імі ня было, але Ігнат ня слухаў. Ён абурана, згубіўшы прытомнасьць і волю, выцягнуўшы шыю, падаўшы тулава ўперад, падыходзіў усё бліжэй і бліжэй.

Бачачы, што апраўдвацца ў гэту хвіліну нельга, Волька адходзіла паволі задам, потым раптам далоньню націснула клямку, выскачыла за дзьверы.

— Вон, сучка, каб тваей нагі ня было ў маёй хаце разам з тваім байструком!—кінуўшыся ўсьлед, закрычаў Ігнат.

IX

Падвечар.

На чырвоным небасхіле шугала сонца.

Ад будынку паўзьлі цені.

Волька сядзела ў канцэлярыі калгасу, перачытвала толькі што атрыманыя з Райкалгассаюзу паперкі.

— Ну, добра, што я цябе знайшоў,—увайшоўшы ў канцэлярыю, адразу пачаў калгасьнік Яўтух.

— А што скажаце?—запыталася Волька.

— Аваньсік, каб рублёў у 50 узяць, дачку замуж аддаю. Яна ў мяне адна, дачушка. Хачу зрабіць вясельле, каб ніхто не пасьмяяўся,—кісла скрывіў губы Яўтух.

— Ад шчырасьці дала-б, але ў касе лічаныя капейкі. Учора Райкалгассаюзу за плугі пераводам паслалі.

— Дык, кажаш, няма?

— Няма.

— Грошы ёсьць, але ты даць ня хочаш,—закіпеў Яўтух.

— Кажу папраўдзе: грошай сёньня няма, ускорасьці будуць—дамо.

—А ўчора для Пракопа былі?—зрабіўшы хітры твар, упікнуў Яўтух.

— Паслухай, учора зранку грошы былі. Ён папрасіў 10 рублёў на пільную патрэбу, хлапца ў бальніцу павёз, яму далі.

— Брэшаш, грошы ёсьць, але ты сабе пакідаеш, а нас паншчыну прымушаеш адрабляць, ашукваеш нас,—сьціснуў кулакі Яўтух.

— Дзядька Яўтух, ты паслухай, — хацела адказаць Волька.

— Што, слухй! Давай маю маёмасьць і знаць вас, сволачы, нехачу.—Яўтух дастаў з шапкі заяву і кінуў са злосьцю на стол.

— На, удавіся ёю,— вылаяўшыся, пашоў.

— Чаго ён крычыць? 20 рублёў нядаўна ўзяў,—паціскаючы плячыма сказаў рахункавод.

Волька глянула на дзьверы, потым вяла апусьцілася на зэдаль.

— І што з ім здарылася? Учора ўвечары сядзеў у канцэлярыі. Мы з ім доўга гутарылі. Вельмі рад быў, што лесу блізка адпусьцілі, а сёньня раптам—на табе!—ня чог супакоіцца рахункавод.

— У гэты момант у галаве Волькі паплыў шум, смутак напоўніў нутро, вострым сьвердлам дрыляваў мазгі, да сэрца напаўзаў шчымлівы боль. Волька апусьціла галаву, сьціснула моцна далонямі шчокі, утаропіла вочы ў паперу.

Шум, званкі лезьлі, сьвідравалі ў вушах, напаўнялі галаву бязладным і тлумным. Нібы за сьцяной гаварыў рахункавод.

А вунь у мільгаце выплыў вобраз школьнага частаколу, дзьве постаці, апранутыя ў доўгія чорныя кажухі, а там дробна-руды твар Хвёдара. Як гадзіна, выцягнуў ён шыю, жмурыць вочы, гаворыць, хітра аглядваючыся. У мільгаце паказаліся рукі Ігната, яны набліжаліся да шыі. Замурзаны твар Юркі з поўнымі вачыма сьлёз.

— Кінуць усё гэта к чорту,— мільганула ў галаве яе думка, але ізноў паўстаў сьвежы малюнак сходу, калі выбіралі старшынёй колгасу. Мазолістыя рукі замітусіліся. Волька хацела пераключыць думкі— пайсьці паглядзець Юрку, але яе цягліцы былі аслаблены, не падпарадкаваліся ей.

— Добры вечар!—На парозе вырас хударлявы мужчына.

— Вы будзеце Карпава?—запытаў ён.

— Я,—глянула заплаканымі вачыма Волька.

— Я—брыгадзір з заводу. Райком партыі накіраваў мяне ў дапамогу вам.

— Вельмі рада... бліснулі весялей Вольчыны вочы.

X

Як і кожную раніцу, стаіць нібы прысеўшы на куркішках, будынак вёскі Курган. Сьнег тоўстым пакрывалам залёг на стрэхі, гняце яшчэ ніжэй да зямлі пракавечны будынак.

На вуліцы глуха і пуста, толькі бывае пад-час перагнецца на драўляным шворні журавель, гляне ў студню ды зарыпіць пісклівa і дзяркуча.

Брыгадзір Лабанаў устаў яшчэ прыцемкам. Штосьці непакоіла яго, здавалася Лабанаву, што трэба зараз-жа кудысьці ісьці, сьпяшацца. Часамі недзе чуўся гудок, гоман, шум, бойкія размовы пераліваліся, то зьнікалі ў яго вушах, але гутарка з Сымонам пра колгас, пра новыя будынкі адцягвала памалу думкі Лабанава. Ён неўзаметку пачаў знаходзіць сабе заспакаеньне ў гэтай размове.

— Сёньня, калі чатыры пары будуць рэзаць, дык на падлогу дошак хопіць, а на столь—ёсьць, яшчэ ўвосень напілавалі,—апавядаў Сымон пра ўсе падрабязнасьці, якія зьвязаны з будаўніцтвам.

— А бярвеньня хопіць, каб скончыць?—зацікавіўся Лабанаў.

— Амаль што хопіць. Балек і крокваў зусім няма. Лясьніцтва вызначыла, толькі патрэбна вывезьці,—адказаў Сымон, але зараз-жа аб нечым пачаў далей думаць.—Страхі і цьвікоў, таксама няма,— падумаўшы дадаў ён.

Дагледзеўшы быдла, да калгасьніка Андрэя зайшоў Гараўскі. Раней, чым гаварыць пра тое, што яму рупіла, Гараўскі пачаў з другога.

— Корму для жывёлы да вясны ў калгасе хопіць?—нібы зацікавіўся ён.

— Хопіць.—Андрэй ня прыдаў гэтаму пытаньню асаблівай ўвагі.

Гараўскі некалькі хвілін стаяў: думаў, з чаго пачаць. Нарэшце памкнуўся нешта гаварыць, але супыніўся.

— Ня ведаю, хто гэта выдумаў такім марозам рэзаць дошкі?—дастаючы з-пад лаўкі пілу, нездаволена загаварыў Андрэй.

— Праўда, Андрэйка. Сабак такім холадам на двор ня гоняць... А каб карысьці мелі людзі ад гэтага. Некаторыя цешацца, што жыць будуць у новых хатах. Усёроўна, суседзе, яны дзяржаўныя. Калгас даўгоў ня выплаціць, дык прададуць і яго парахню. Што-ж дзяржава дарэмна дала 8000 рублёў? А з чаго яны заплацяць? Мужыцкі карак зноў будзе цягнуць лямку,—быццам шкадаваў Гараўскі.

Андрэй глянуў на Гараўскага ў непаразуменьні, сказаў сабе нешта пад нос і палажыў пад лаўку пілу.

Аўсей ад цёмнага адсякаў каля студні лёд, ён часта спыняўся, закурываў і ўважліва глядзеў на двор Сымона.

— Вось ідзе... — убачыўшы Лабанава, Аўсей падаўся ўперад, а потым застыў у нярухомасьці.

— Прабачце, у вас запалачка ёсьць?—калі Лабанаў параўняўся, ён падскочыў з папяросай.

— Ёсьць. — Лабанаў дастаў запалкі.

— Мабыць, я не памыляюся. Вы брыгадзірам да нас прыехалі?— Аўсей запытаў няскладна, вочы яго замітусіліся крыху спалохана.

— Так, прыехаў, разам працаваць будзем,—усьміхнуўся Лабанаў. Па вуліцы, размахваючы рукамі, ішоў Хвёдар.

— Само начальства хай ідзе ды робіць. На марозе нас душаць,— падышоўшы, нэрвова запыхаў ён.

— У чым справа?—зьвярнуўся да Хвёдара Лабанаў.

— Боты нам давайце, кажухі, тады на работу пойдзем,—раз'юшана-яркім поглядам глянуў Хвёдар на Лабанава.

— Бачыце, а ён-жа самы, што называецца бядняк, а ў калгасе ня хоча быць. Такіх, як ён, многа ёсьць. Сёньня толькі пяць чалавек вышла на працу,—усьміхаўся Аўсей.

— Вось дык да...—падумаў пра сябе Лабанаў.

Аўсей у гэты час маўчаў. Ён хацеў сьмяяцца, але стараўся стрымацца.

— Няўжо-ж усё яна нарабіла?—ня вытрымаўшы, галосна сказаў Лабанаў, пасьля спахмурнелі яго вочы. Сьвежую бадзёрасьць пачала падломліваць млявая слабасьць.

— Самі паглядзеце, як Карпава кіруе,—на адыход сказаў Аўсей.

— Вечарам сход будзе, аб гэтым гаварыць трэба,—яшчэ мацней рэзнула вострым нажом па сэрцы Лабанава.—Калгас разваліцца не павінен,—глыбока ў галаве засела прачулая думка.

Каля будынку хадзіла некалькі чалавек.

— Пракоп, вярні яго на кант,—крычаў, седзячы на вугле, Васіль.

Калі Лабанаў падышоў бліжэй, да яго вушэй пачаў далятаць шуршавы шум пілы.

— Вось дык прыстала, што камар носу не падточыць,—прыпусьціўшы бервяно, сьмяяліся калгасьнікі.

XI

— Таварышы, пачынаем,—старшыня сходу Сымон падняўся, абвёў поглядам прысутных, пасьля настойліва ўгледзеўся ў кут, дзе вяліся гарачыя размовы. На пярэдніх лаўках заціхлі, потым прыціх кут.

— Парадак дню сёньня наступны: аб становішчы калгасу і розныя. Другіх дадаткаў ня будзе?

— Хопіць і гэтых,—пачуліся галасы.

— Агорклі горш рэдзькі вашы сходы!—крыкнуў нехта з сярэдзіны.

— Не хадзі і не гаўкай,—сярдзіта адказаў нехта з натоўпу.

— Таварышы, давайце цішэй, так ні да чаго не дагаворымся.

— Дагаварыліся ўжо да здохлага парасяці,—запішчаў голас Хвёдарыхі.

— Чулі вашы песьні,—завёў Яўтух.

— Ды сьціхніце там, слова прагаварыць за вамі нельга,—загулі галасы.

— Таварышы, супакойцеся!—сур'ёзна закрычаў Сымон,—а то да тых, хто прышоў сарваць сход, прымем меры.

Галасы пачалі сьціхаць і, нарэшце, супакоіліся.

— Большасьці з вас вядома становішча нашага калгасу і настроі калгасьнікаў. Хлеў не накрыт. Распачаты дом, калі мы так будзем рабіць, да вясны скончан ня будзе. Авёс не абмалочан. Аб выхадзе з калгасу падалі восем заяў. Зьдзельшчына прышчэпліваецца дрэнна.

— Хвёдар з Аўсеем падбухторваюць выпісвацца,—не дачакаўся адзін з калгасьнікаў.

— Грошы—восем тысяч крэдыту, дзе дзелі?—як з скуры ня вылазіў Андрэй.

— Чаго горла дзярэш? Забыўся, як галасаваў? На будоўлю пашлі,—спыніў Андрэя Юзік.

— Чаму да гэтага часу праўленьне ня бачыць, што ў нас у калгасе падкулачнікі агітацыю супроць калгасу праводзяць,—узьняўся выразны напружаны голас.

— Хто?

— Ды ты яшчэ пытаеш! Хвёдар Кельма, Яўтух Верамейка,—перакрыкаваўся, вёў гарачую спрэчку, шумеў сход.

— Таварышы... Таварышы...—басам прагуў голас Васіля. Сход заціх, напружана пачалі чакаць.

— Калгас развальваецца. На кулацкую вудачку некаторыя калгасьнікі пашлі: жывёлу з хлявоў абагуленую пачынаюць ноччу забіраць. Аб тым, каб закончыць нашы будынкі, мала хто думае. Што-ж прэць у парахні будзем?

— Але, але-ж праўду ён кажа,—пачалі перашэптывацца на лаўках

— Ня ведаю, што там за асэсар сядзіць у Рыку. Да гэтага часу ня вырашыць справу аб высяленьні кулакоў. Хвёдара таксама паслаць у Салаўкі, а то вельмі разумны ён па-іхняму стаў.

— Цябе, задрыпу,—падхапіўся Ціхон.

— Выключыць Хвёдара з калгасу,—узьняўся крык, спрэчкі, гоман узмацняўся.

— Таварышы... угледзеўся цьвёрдымі, нібы сталёвымі, вачыма брыгадзір-Лабанаў:

— Сёньня сход лавінен быць пераломным. Кулаком і падкулачнікам ня месца ў калгасе.—Словы яго важкія, прадуманыя, твар сурёзны.

— Распачатая будоўля павінна быць скончана да тэрміну. Ёсьць думка—склaсьці брыгаду і заўтра-ж прыступіць да вывазкі лесу і заканчэньня жыльлёвага будынку.—Лабанаў быццам прадыктаваў закон.

— Правільна, правільна, скончыць,—зашумелі весялей галасы.

— Да 1 мая перабрацца ў новыя хаты.

Хвёдар сядзеў, зацяўшы ўздых.

— Галасуем. Ты, Пракоп, галасы падлічвай,—зьвярнуўся Сымон.

Пацягнуліся ўгару рукі. Андрэй не паднімаў адразу, а, нарэшце. устаў, падняў вышэй усіх.

Хвёдар з Яўтухом моцна ляпнулі дзьвярыма і пашлі.

— Бяз вас абыйдземся,—пачуліся ўсьлед галасы.

— Заўтра а 7-ай гадзіне раніцы зьбіраемся. Вяроўкі, тапары кожны павінен свае мець,—абвясьціла Волька.

XII

З самага ранку сонца было вясёлае, іскрыстае.

На мяккай сьнегавой белі блішчэлі крышталі сьняжынак.

Лес, стары хмурны лес, глядзеў, як зьзяе гэта мільённая плойма чырвона-зялёных вачэй. Ён ўглядаўся ў поле і напружана ціха зьвінеў.

— Яна паваліцца на тую прагаліну

— Падсякай з таго боку.

— Каня адтуль прымеце,—агледзеўшы з усіх бакоў стромкую хвою, перагаварвалiся калгасьнікі.

— Г-ак-г-ак-г-ак,—Лабанаў з размаху падсякаў яе камель.

— Правая будзе, бачыш трэскі, як гэбляваныя,—заўважыў Андрэй.

— Зж-зж-зж,—ядавіта, упарта заядалася піла.

Старая хвоя толькі ўхмылялася ды пераказвала на сваёй лясной мове нешта маладняку.

— Давай, Пракоп, ускінем верх на падставу, пасьля заважыць можна будзе,—расчысьціўшы сьнег, падважваў бервяно калом Сымон.

— Раз, два, тры,—узялі, хапілі дружна некалькі чалавек тоўсты кавалак.

— Расьпілаваўшы рамы, і вушакі,—во будуць—увязваў Сымон.

— Глядзі там! —сьпілаваўшы елку, крыкнуў адзін з калгасьнікаў.

Т-р-р-ты-ты, затрашчэла старая елка. Адразу яна ратавалася, нават, спрабавала хапацца пруткімі рукамі за малады хвойнік, а пасьля зашумела вяршынай, і мякка лягла ў сьнег.

— Восем мэтраў адмерай,—цярэбячы вяршыню, зьвярнуўся да свайго напарніка Ахрэм.

— Ты, Аніс, падваж, а то сарваць воз цяжка з места,—Волька ўзяла каня за повад.

— Ну, сівы,—гыкнуў Аніс.

Сівы, як відаць, меў практыку ў працы: ён адразу павярнуў сані ўбок, а пасьля натужыўся цягуча.

Сані зарыпелі, падбіралі пад сябе маладыя дрэўцы і крышылі іх.

Волька крута паварочвала сівага, выкручвалася па больш чыстых прагалінах.

Лес шырэй расчыніў таемнасьць сваіх грудзей, паказваў сьцежкі простыя, ня блытаныя.

Толькі асіньнік рэдкі дзе-ні-дзе дрыжэў голым суччам, стараўся ўшчаміць сані, загарадзіць дарогу.

Днём, калі прыгрэла сонца, калі пачалі з стрэх капаць кроплі вады, ля будоўлі кіпела работа.

Два чалавекі палажылі на сьцяну бервяно.

— Васіль і ты, Яўмен, давай, каціць будзем,—зьвярнуўся адзін з іх.

Ну і навёў ты пілу, як вуда сьвішча,—калі стала калода сьціскаць пілу, падганяў кліньні Юзік.

— Развод шырэй трэба паставіць, тады яшчэ лягчэй пойдзе,—пачалі зноў пілаваць Юзік з Лабанавым.

Побач трое маладых хлапцоў канчалі пілаваць тоўсты хваёвы краж.

— Глыбей, брат, вазьмі драчку, цяплей будзе,—насьцілаючы мох, заўважыла Волька Анісу.

Сымон засякаў вугал. Дзед Захар падаваў на рыштаваньне кошыкам мох.

— Слухайце, дзяўчаткі, калі яшчэ па дзьве посьцілкі прынясём, ды мо‘ і хопіць,—насілі з суседняга гумна мох дзяўчаты.

— Многа наношваць ня трэба, а то, калі застанецца, дык уначы можа сьнегам засыпаць, лепш пойдзем Вольцы дапаможам,—раіла Ніна.

— Глядзі, тры вянкі палажылі,—зьлезшы з рыштаваньня радаваўся Аніс.

— Вялікадня будзем спраўляць у новых пакоях, выціраў аб'інеўшую бараду Захар.

— Уходзіны зробім, во.

— Замачыць трэба будзе,—узьняўся сьмех.

— Як скончым, таварыша брыгадзіра жаніць будзем,—жартаваў Сымон.

— Жанат, браткі, спазьніліся крыху,—сьмяяўся Лабанаў.

— Юзіка, ён-жа даўно за Марылькай Насьцінай поўзае,—сьмяяўся Андрэй.

— Ты, Юзік, доўга, павячэраўшы, не марудзь, цягні з свайго канца вёскі пабольш моладзі,—напомніў Лабанаў, ідучы дадому.

— Зьбяромся,—сказаў Юзік, крута павярнуўшы ў свой двор.

XIII

Вечарам у Сымонавай хаце сыпаліся бязладныя, звонкія задорныя галасы.

Ну і дурны ты, так ушчыпнуў, ажно сьсінела, крыкнула Мальвіна штурхнуўшы ў плечы хлапца.

Сып, сып, Сямён,
Падсыпай, Сямён,
У цябе, Сямён,
Штаны—клёш, Сямён.

Піск, песьні, ўзьляталі абрыўкамі бурлівага маладога жыцьця. Каля стала стаяла некалькі чалавек. Відаць было па выразу іх твару, што кожны хацеў запытацца, зразумець незразумелае.

— Дзядзька брыгадзір, а што наша ячэйка будзе рабіць?—задаў адзін пытаньне.

— Дапамагаць у гаспадарча-арганізацыйным замацаваньні калгасу,—вёў гутарку з хлопцамі Лабанаў.

— Чаго галаву павесіў, шкода табе яе?—гіранічна запытаў у Юзіка хлапец.

— Каго ён шкадуе?—пацікавілася Ніна.

— Марылькі. Яна-ж з калгасу выпісалася за тое, што сястру раскулачылі.

— Варта, умелі вясной па 7 рублёў за пуд мукі браць,—сьмяяўся другі.

Юзік скрывіўся, пачырванеў, ня ведаў, што сказаць.

У хуткім часе прыйшла і Волька.

Сход пачалі. Лабанаў узяў слова.

— Таварышы! камсамольская ячэйка дапаможа праўленьню ў яго працы. Ячэйка павінна павесьці сярод неарганізаванай моладзі працу. прыцягваць яе для актыўнага ўдзелу ў сацыялістычнай будоўлі.

— А хто будзе кіраваць ячэйкай,—запыталася Ніна.

— Ці падпарадкаваецца ячэйка сельсавету,—пасыпаліся да Лабанава пытаньні.

Пасьля пачаў Юзік:—ячэйку камсамолу арганізаваць трэба. Мы пад кіраўніцтвам нашых таварышоў-камуністаў, Карпавай і Лабанава, многаму навучымся і дапаможам у працы калгасу.

Слова ўзяла Волька, яна падзялілася ўраджаньнем, як працуе ячэйка КСМ саўгасу, якая знаходзіцца ў 10-ці клм. ад калгасу.

— На што нам такая ячэйка, каб толькі сваркі сеяць паміж нам і нашымі бацькамі,—выказалася Мальвіна.

— Цябе і так матка кожную раніцу таўчэ,—сказала голасна каля печы дзяўчына.

Падняўся сьмех...

На сход зайшоў Хвёдар. Убачыўшы, што яго сын сядзіць на лаўцы, ён затросься, задрыжалі яго вусны. Хвёдар хацеў адразу сказаць нешта. але замест гэтага вырваўся крык.

— Дадому пашоў, сукін сын!—Ён кінуўся да сына, схапіў яго за вушы.—Я табе пакажу, як пісацца ў недавяркі,—штурхаючы каленам, павёў з хаты.

— Хвёдар! За што ты яго?—пачалі хваляваца некаторыя.

— Таварышы, ячэйку, як бачыце, арганізаваць трэба. Нам трэба будзе павесьці працу сярод тых беднякоў, якія шушукаюцца з кулакамі, прыкладам, як Хвёдар, якія зьбіваюць сыноў за тое, што яны ходзяць на сходы...—усхвалявана гаварыла Ніна.

— Арганізаваць, арганізаваць ячэйку! Пішы, Волька, мяне! Мяне пішы,—пасыпаліся сьмелыя, звонкія галасы.

XIV

Назаўтра вечарам за сталом у Аўсея сядзела кампанія.

— ... Госьцейкі, яшчэ па чарцы вып'ем, —наліваючы ў келішкі гарэлку, ласкавым, прыемным тонам гаварыў Аўсей.

Ігнат сам узяў бутэльку, наліў роўна з берагамі шклянку.

— Пі, Ігнатка, гэта не сьмярдзючая самагонка, а налівачка салодзенькая.

— За ваша здароўе,—перакуліў Ігнат.

— Відаць, гаспадару дабра жадае, да дна выпіў,—загаварылі ў адно галасы.

— Ігнатка, баранінку бяры,—падсунула тарэлку Аўсеева жонка.

Побач з мясам стаялі ў глыбокай місцы агуркі. Ігнат браў рукамі, закусваў ды хваліў гаспадыню.

— Яшчэ чарачку,—чокаючыся, пачалі зноў выпіваць. Ігнат з прагнасьцю выпіў і другую шклянку, моцна стукнуўшы дном аб стол.

— Маладзец, люблю за ўхватку,—сьмяяўся Гараўскі.

— Прабуй цяляцінкі халодненькай,—крышыў на талерку Ігнату Шаркоў.

У галаве ў Ігната зашумела, вочы замуціліся, сталі цяжкімі і непаваротлівымі. Унутры пачаў расьці крыўдны буяны ўздым. Нешта ціха і далёка гаварылі. Ігнат павярнуўся, зарыпела пад ім крэсла, у вачох заскакалі каля сьцяны на нізкіх тоўстых ножках канапы. Пасудная шафа, хістаючыся, блішчэла сінімі дзявярыма.

На камодзе ў люстры далёка, далёка ўбачыў сябе.

— Яшчэ чарачку!—Аўсей наліваў у чаркі руды сьмярдзючы самагон.

— Браточку... Мы пілі...—абняў Ігната Аўсей.—Гуляем... гулялі-б да веку, але Волька труціць табе жыцьцё і нам не дае жыць... Сам бачыш... добра, што ў воласьці знаёмыя, шчырыя людзі ёсьць, а то даўно ў Сібіры быў-бы. Ігнатка, яе трэба, як авадня, раздавіць. Тысячы людзей выратуем, бог на нас не забудзецца.

— Раздавіць на блін, я даўно ўжо табе, Ігнатка, гаварыў,—прасіў Шаркоў.

— Я ёй жывой язык вырву!—падхапіўся Хвёдар.

— Раздавіць, як авадня, сьцерці на муку...—закалаціўся Ігнат.

— Дайце мне яе,—прабаваў уставаць.ён.

— Ігнатка, яна з Клічава будзе ехаць, падпільнаваць на грэблі трэба.

— Дайце мне яе,—не сваім голасам крычаў Ігнат.

Скрыпнулі дзьверы. Чатыры нагі, абутых у лапці і шэсьць ў боты, сходзілі па ступеньках з ганку.

. . . . . .

— Тут, мужчынкі, чакаць будзем,—шапнуў, аглянуўшыся кругом, Аўсей, прысеўшы за выварата.

Лес, як заўсёды, не маўчаў. Ад хваляў ветру гуў, распрануты яшчэ восеньню, высокі падгалісты алешнік. Рэдкі, карамзаты ельнік, запыліўшыся сьнегам, апусьціў шырокія доўгія вушы, паглядаў уніз, нешта журботнае шаптаў хмызьняку. Па прывычцы дрыжэў празябшы асіньнік, скардзячыся ветру на холад.

— На асіне гадаўку павесіць,—выцягнуўшы шыю з-за выварата, вужакай сыкнуў Хвёдар.

— Маўчы,—напружана ўглядаўся Аўсей.

За балотам завылі ваўкі, у адказ на вёсцы забрахалі сабакі.

Пяць постацяй, прысеўшы на карачках за выварата, сьвідраралі вачыма цемру.

Здалёку суха зарыпелі аб настыўшы сьнег палозьзі.

— Едзе! Гляньце, Яўменаў белакапыты,—сказаў шопатам Аўсей.

Ігнат дастаў з-за пояса сякеру, прыпадняўся на руках.

— Сто-о-ой!

Калі хурманка параўнялася, дружна кінуліся на дарогу.

Аўсей, як на пружынах, падскочыў, затрымаў за аброць каня.

— Ігнатка, за што?—усьпела крыкнуць Волька. Іржавая, халодная сякера зьверху каля вуха расьсекла глыбока чэрап.

Ля грэблі праз хмызьняк ляжалі паразварочаныя сьляды.

Белакапыты, аглядваючыся, прывёз Вольку ў вёску.

— Гляньце, конь стаіць і чалавек п'яны на санях, заўважыў адзін хлапец.

— Конь калгасны... Волька забіта... крыкнуў Юзік дзікім, страшэнным голасам, кінуўшыся на сані.

Натоўп рынуўся да хурманкі. Трывожным крыкам напоўнілася вуліца.

Каля саней, апусьціўшы рукі, стаяў Лабанаў.

— Няжывая!—крычаў Андрэй.

— Гляньце, рукавіца Гараўскага, ён у мяне браў белую аўчыну на далонкі.

— Але-ж Гараўскага! Яны забілі...—вырваліся з натоўпу галасы.

— Яны самі яе забілі, а на Гараўскага кажуць,—шапнула на вуха Марылька суседцы.

— Кінь ты, долата дурное, гаворыць абы што, яны яе жывую пачалі есьці, а зараз дакончылі,—гнеўна абурылася тая.

Крык, гоман, сьцяна людзкога натоўпу нарастала на вуліцы.

— Зьелі, суседзе, багатыры, але калгас ім ня ўдасца праглынуць,—размаўляў з Сымонам Юзік.

Белакапыты паволі вёз па вуліцы Вольку. Пад вакном вішня, апусьціўшы рукі, стаяла нярухома, нібы прыняўшы каманду: зважай!

Волька нічога ня чула і ня бачыла. На твары пад посьцілкай застылі ад болю і жаху дзьве сьлязінкі.

15/IV-31 г.

г. Менск.

Пятро Глебка

Арлянка

(*Поэма* [1])

23

Пакідалі маўкліва мітынг
непаслушныя бацьку сыны
і трывогі глухой,
непазбытай,
наплывалі цяжкія сны.

— Хлопцы,
хлопцы!..
Чаго натварылі!
Нехта цяжка,
услых
уздыхнуў
і туга разьняла свае крылы,
ахінула у смутак вясну.

Зашчымелі балюча сэрцы,
зубы сьціснуўшы,
тоячы боль,
выракалі чырвонаармейцы
свой суровы прысуд над сабой:

— „Як-жа сьмеў ты пакінуць змаганьне
і чужою краіну назваць,
дзе мільёны гараць паўстаньнем,
каб нядолю сваю зваяваць?“

Скруха бразгала вострым дакорам:
— „Ты ідзеш на спачын у цяпло,
а таварыш калее ў дазоры
за краіну, за гэта сяло...
Ты сьмяяўся і строіў жарты,
а чужынец разлад прынёс.
Як-жа сьмеў ты
пакінуць варту,
занядбаўшы рэспублікі лёс?

Гэта-ж самая подлая здрада,
калі вораг наточыць нажы—
пашчапаць на кавалкі атрады
і вінтоўкі свае палажыць.

---

[1]) Гл. „Узвышша“ №№ 2, 3, 4, 5, 6-7, 10.

Не загоіць надлому скруха,
калі хлопцаў,
братоў
і сясьцёр
ты пакінуў у час завірухі
ваяваць за тваё жыцьцё.
Не загладзіш віны дакорам,
дык упарта,
цярпліва маўчы,
нясучы гэты чорны сорам,
і няўцішаны боль нясучы".
Ноч ішла
цераз лес і нівы,
вартавала санлівасьць хат,
і зьнябытыя людзі маўкліва
абміналі шарэнгі прысад.

Хаты стрэлі пагардліва такжа—
не знайсьці супакою нідзе,—
прыгняла нявымоўная цяжкасьць
яшчэ ніжай маўклівых людзей.

Гэтак цяжка—
бывае аднойчы:
калі ўсе адракуцца цябе
і глухія,
бяссонныя ночы
трэба зносіць,
маўчаць
і цярпець.

Узьнімаўся халодны вятрыска,
але цёпла было ля хат
і да ранку сядзелі на прызбах
таварыскія групы салдат.

Каб забыцца на тую рознасьць,
што была як прычына смут—
і ласкава
і асьцярожна
дагаджалі адзін аднаму:
— Хе,
дармо,
што Сібір гадавала,
Украіна твая,
ці Каўказ,—
доля роўная нас страчала
і аднолькава песьціла нас.

А было вось...
такое здарэньне,
у нямецкую,
значыць,
вайну...
Адступалі,
кальнула ў калена
і—
нагой не магу зварухнуць.
— „Браце,—
клічу,—
на дальняй чужыне
ня кідай аднаго мяне“...
Хоць-бы вокам здалёку акінуў,
хоць-бы крок на хвіліну зьнямеў.
„Сукін сын ты!
А я-ж табе праўдай
колькі год батраком служыў,
ты-ж мой хлеб запрацованы“
краў быў,
ты-ж смактаў мае сілы з жыл“.
Захлынулася жалем сэрца:
— „Мая доля—
мяне ня міне:
мусіць суджана мне
памерці
на далёкай чужой старане“.
Можа і згінуў-бы,
можа лепей
жыў-бы з песьняю,
не смуткаваў,
але шэньціла—
выручыў Лейба—
мой вясковы сусед,
каваль...
Ох і сіла-ж была!
Навакол
пра яго разышоўся слых...
Нёс тады ён мяне далёка,
покуль вынес зусім да сваіх.
От якія бываюць здарэньні...
Нехта слова ізноў узьняў:
— І выпадкаў такіх—
ня меней,
як сто тысяч,
бывае штодня.

Але нейк
забываюцца людзі...
Вось і мы—
узьнялі гэты рух:
„За чужыну змагацца
ня будзем“...
Ці-ж чужына
для нас Беларусь?

Яна стане працоўных краінай,
а ці-ж мэта у нас
не адна?
Можа, нават,
і тая жанчына
вінавата ня болей за нас.

Забарабаніла
крыльлямі скруха
і сумленьне угрызлася зноў:
— Лепш адсеч было
гэтыя рукі,
спапяліць непакорную кроў;
лепш сагнаць было
скуру у столкі
рамянём
на сваіх плячах,—
як пакінуць-злажыць вінтоўкі
у такі неспакойны час.

Разрывала сумленьне сэрцы,
зубы сьціснуўшы,
тоячы боль,
выракалі чырвонаармейцы
свой суровы прысуд над сабой.

Ноч ішла,
ня прыносячы скутку,
высьцілаўся бялёвы туман.
— Можа з ім
прыкацiліся чуткі?
Можа ён нас
уводзіць у зман?

Але-ж нехта жывы,
нізкарослы,
разышоўся на ўсе галасы:
— Я-ж казаў вам,
салдаты й матросы,
што ваш Рацкі —
сабачы сын.

От злавілі-ж падлюгу на здрадзе:
падыходзім мы гэта,
глядзім,
ажно ён —
батарэі крадзе...
Я за шкірку
і хлопцам:
— „Вядзі!“

І гэроем хадзіў нізкаслы,
а ніхто ня спыніў:
„Ілжэш!“
Бо з маной гэтай слоўнай бросьні
дакранулася праўда вушэй.

З лушпавіньня легенд несапраўдных
адлучылася восем слоў:
— „Рацкі злоўлены...
Рацкі —
здраднік...
На пагібель рэспубліку вёў“.

Накацілася чорная хмара,
пацямнела і даль
і ноч...
Калі гром з навальніцай ня ўдарыць,
дык ніколі ня будзе відно.

Калі людзі
памылак і здрады
не паправяць адданасьцю дзей,
дык ніколі ня будзе радасьць
гасьцяваць у такіх людзей.

Напяліся да болю нэрвы
і жахнуўся над вуліцай крык:
— І калі-ж нас адправяць з рэзэрваў
у вагонь,
у магілу,
пад крыж!

Хоць куды...
Абы змыць гэты сорам,
ці загінуць у бойцы ня ў час,
каб ні людзі,
ні дзень,
ні зоры
не глядзелі з дакорам на нас.

І адзіным няўтольным жаданьнем
загарэліся сэрцы ваяк:
віхрам рынуцца зноў у змаганьне,
каб і скруху
і сум
пахаваць,
каб крывёю
ганебную пляму
змыць у слаўных,
адважных баёх...
Ноч праходзіла,
гасячы лямант,
рассыпаючы зоры ў палёх.

24

Ліпень.
Пагожы,
як радасьць,
дзень,
сонца купае
купавы;
лес на пагурках—
памаладзеў,
п'яна запахлі травы.

Нават руіны папаленых хат,
тоячы боль
і раны,
Гольлем зялёных
кляновых шат,
як на ўрачыстасьць,
убраны.

Пераклікаюцца скрозь галасы—
словам гамонкі,
акордамі песьні...
Звонка шасьцяць,
шалясьцяць каласы,
туліцца радасьць да весьніц.

— Добра такою часінай
ісьці
поруч,
у ногу з сябрамі...
Пляц учарашніх гамонак—
прыціх,
змоўк,
утаптаны нагамі.

Спрытна ў шарэнгі пастроіўся полк,
зьліты адзіным настроем...
Зірк страпянуўся—
і вочы—
у дол—
стаў комісар перад строем:
— Добрае раніцы!
(Так маладзёж
часта вітае маленства).
Доўга і моўчкі ён тупаў
уздоўж
роўных,
як струны,
шарэнгаў.

Бліснулі іскры ў ягоных вачах,
сэрцы зацепліўшы
скрухаю новай,
ён прыпыніўся,
і вось ён
пачаў
словам ласкавым
прамову:
— Што-ж вы,
таварышы,
хмурыя ўсе?
Досыць журыцца!
Сушэце набоі!
Хто нам палёгку,
адкуль прынясе?
Трэба здабыць яе...
сілаю!
з бою!
Глянце навокала,
колькі тугі!
Сьлёз неадплачаных—
цэлае мора.
Нашыя хаты,
палеткі,
лугі
нішчыць пажарамі вораг.
Што-ж мы зрабілі,
каб скінуць ярмо?
Сьмерць
прысудзілі жанчыне?

Гэта заслона,
з нявінным кляймом,
крыла варожасьць учынкаў.
І,
калі брудную шырму падняць,
выступіць Рацкі гэроем...
Што яму трэба?
Адно—
разьяднаць,
дужасьць на часткі пакроіць.

Ён не для жартаў
хацеў распаліць
нацыянальныя спрэчкі.
Хтосьці на гэту прынаду прыліп,
варту пакінуў ля рэчкі;

хтосьці паверыў,
вінтоўку аддаў,
слова зламаў сваё нехта
і чужаніцай далёкай назваў
ён
Беларусь саветаў.

Мы —
гэта працы сусьветнай сыны,
наша краіна
усюды
там,
дзе гараць рэволюцый агні,
там,
дзе працоўныя людзі.

Сёньня мы кінем змагацца,
дамоў
пойдзем да мамы,
да таты, —
заўтра паганая банда паноў
выгане з роднае хаты.

Хутка ільга заваёвы аддаць,
толькі ўжо вораг —
ня верне.
Кроўю рабочых,
сялян
і салдат
бралі іх...

Галасы:

— Правільна!
— Верна!

Комісар:

— Хто не жадае ісьці самахоць,
хай пакідае змаганьне.
Хто бунтаваўся —
наперад выходзь!
— Хто бунтаваўся? —
пытаньне.

З вуснаў у вусны яно паплыло,
толькі ня стрэла адказу,
быццам нічога зусім ня было,
проста —
„Жадаюць абразіць".

Комісар:

— Зноў гавару вам,
хай зброю аддасьць
той,
хто змагацца ня хоча,
той,
хто за цёплы закутак
прадасьць
справу і долю рабочых.

Гул скалыхнуў амярцьвелую ціш:
— Зброі ніколі ня кінем!..
— Будзем рэспубліку
ўсе бараніць,
нашу,
працоўных,
краіну.

— Пойдзем адважна у бой,
як адзін,
мы ня спужаемся сьмерці.
— Таварыш начальнік,
бяры і вядзі,
не дакарай нашы сэрцы!

Комісар:

— Хлопцы,
рэспубліка будзе вітаць
шчырую вашу адданасьць.
Помніце,
сёньня ўначы наступаць,
трэба нам быць зрыхтаваным.

Галасы:

— Будзем,
таварыш!
— Даеш,
комісар!
— І на спатканьне й на ростань
хопіць на панскія плечы пісаг,
шаблі навостраны востра.

Камісар:

— Веру,
што моцна вінтоўкі свае
будзем трымаць у змаганьні.
Хай рэволюцыя
скрозь жыве!
Панскае прэч панаваньне!

Галасы:

— Зьнішчым нядолі адвечны уціск,
волю ў змаганьні здабудзем!

Камісар:

— Дзякую,
хлопцы,
за дружнасьць усіх.

Полк:

— Служым!
— Працоўнаму!
— Люду!

ЭПІЛЁГ

Па дарогах,
разьбітых ушчэнт,
па руінах брукованых вуліц
увайшлі
у савецкі Менск
калмыкі і кітайскія кулі,
і лезгіны з Каўкаскай гары,
украінцы,
татары,
тунгусы...
Гэта ўсё —
за жыцьцё змагары
і за волю маёй Беларусі.

Ночы,
голад
і холад тайгі,

балаты,
і лясы,
і пустыні,
неадступная змора тугі—
перад імі усё адступіла.

Бо вяла іх упартасьць адна,
скасаваўшы граніцы ўсіх нацый—
Рэволюцыі сьцягі узьняць,
каб ня ведаць прыгону у працы.

Перайшлі яны тысячы вёрст
без абутку,
адзеньня
і зброі,
але кожны у сэрцы данёс
маладога змаганьня настроі.

Ад сібірскіх лясоў
да балот
і выжар непраходных Палесься
правялі яны слаўны паход
з баявою,
вясёлаю песьняй.

Не за славу крывіцкіх славян,
не за ўласную долю
і лёс свой,
а за волю рабочых-сялян
гарадоў занядбаных
і вёсак.

І з далёкіх,
і з блізкіх краёў,
ад канца
да пачатку сьвету
пралівалі працоўныя кроў
каб жыла
Беларусь
саветаў.

Чэрвень 1930 г.—
Кастрычнік 1931 г.

Васіль Шашалевіч.

Р о й [1])

Драматычныя абразы

(Канец)

А б р а з 12

На ганку хаты-чытальні некалькі чалавек комсамольцаў: сакратар ячэйкі Мікола, Алесь, Васіль, Аўгеня, Сьцёпа ды інш.

Сярод іх комунарка Ганна.

Ганна. Дык што-ж, таварышы... Гэта-ж у вас дрэнныя справы...

Алесь. Поўная няўдача...

Васіль. Бегалі мы, бегалі...

Сьцёпа. Агітавалі, агітавалі

Алесь. Угаварвалі, угаварвалі...

Мікола. Ну хоць ты галавою разьбіся,—ня хочуць.

Аўгеня. А да баб ня прыступіцца. Што ты, кажуць, як шатан да нас прычапілася!

Ганна. Няўжо-ж і з беднаты вам не ўдалося скласьці ініцыятыўную групу?

Мікола. Ня хочуць. Можа хто і хоча, але першы баіцца. (*Да Алеся*) Ты ў Цімоха і Нупрэя быў?

Алесь. Ня хочуць.

Мікола. Ці сказаў ты ім, што гэта адзіны выхад беднаце?

Алесь. А як-жа. Яны ня супроць. Толькі першымі ня хочуць.

Мікола. Ты-б сказаў, што ўжо чатыры запісаліся.

Ганна. Хто—чатыры?

Мікола. Краўкоў, Лапатошнік ды два дэмобілізаваныя чырвонаармейцы.

Аўгеня. Дык у нас ужо чатыры!

Ганна. Гэта яшчэ не колгас... Нешта ня верыцца мне, каб тут нічога ня можна было зрабіць. Дрэнна вы, хлопцы, працуеце.

Мікола. Мы ўсё зрабілі, што можна. Мы зьбіралі сходы,—няўдача. Тады мы пачалі індывідуальна агітаваць,—таксама няўдача. Ну што тут зробіш?

Ганна. Гэта-ж вы, хлопцы, соцспаборніцтва прагулялі?..

Мікола. Пачакай: у нас яшчэ два тыдні засталося.

Ганна. Што-ж вы зробіце за два тыдні?

Мікола. Ёсьць у мяне адна думка.

---

[1]) Гл. „Узвышша“ № 9 і 10. Сцэнічны тэкст належыць БДТ І.

Ганна. Якая?

Мікола. Падыйдуць хлопцы, скажу.

Ганна. Памятайце, хлопцы: наша ячэйка ўжо арганізавала колгас Карла Маркса з пятнаццаці сем'яў.

Мікола. Вам лягчэй было. Вы—комунары.

Васіль. А нам мала хто верыць.

Сьцёпа. Па-мойму, хлопцы, вам трэба кінуць гэтую справу...

Усе. Што? Што? Якую справу?

Сьцёпа. Наконт колгасу. Ні храна ня будзе. Народ наш не дарос да колгасу і няма чаго папустому траціць сілы.

Ганна. Ты, таварыш, не пакомсамольску гаворыш. Комсамольцы ня зьвешваюць галовы перад няўдачамі і не адступаюць (*Пачуўся гармонік і песьні*).

Мікола. Гэта ўжо Мікіта з сваёй хэўрай.

Васіль. Бядняцкі сын, а падкулачнічае!

Алесь. Ён сваім гармонікам увесь народ зводзіць.

Мікола. Ён нам усе вечары зрывае. Зьявіцца з гармонікам—усе за ім, а мы адны застаемся.

(*Пад гукі гармоніка сьпяваюць „Салавей ты мой, дробна птушачка!—Гэй, гэй". Натоўп дзевак і хлопцаў выходзіць на сцэну сьпяваючы. Папарадзе ідзе Мікіта, зухавата іграе*).

Мікіта (*да натоўпу*). Айда, хлопцы, да Паўкі Кандраценка. Ён учора хрэсьбіны спраўляў, а сёньня апахмяляецца. Паставіць, далібог! Што ў яго ўчора тварылася! Во, весела было! Перапіліся! Такая мордабойка пачалася! Міхею абедзьве рукі выкруцілі! Ха-ха-ха! Саўку нагу перабілі! Ха-ха-ха! Масею чыста галаву разьбілі. Весела было! (*Усе ідуць. Засталіся чалавек пятнаццаць комсамольцаў і комсамолак*).

Ганна (*да комсамольцаў*). Хлопцы, дрэнна ў вас на вёсцы.

Мікола. Чаму?

Ганна. Кулак у вас гаспадарыць.

Васіль. Гэты Мікіта ў кулакоў на павадку ходзіць.

Мікола. Хлопцы! Цяпер я скажу вам сваю думку. Досыць нам бегаць па дварох, досыць агітаваць ды ўгаварваць словам. Пара перайсьці да справы.

Алесь. А як?

Мікола. Я прапаную, каб мы пачалі першымі. Давай усе мы ўступім у колгас! усёй ячэйкай! (*сярод комсамольцаў рух*).

Ганна. Здорава! (*запляскала ў далоні*).

Галасы. Правільна!

Даеш колгас!

Мы дакажам, што ўмеем працаваць!

Мікола. Таварышы! Мы начнем. А потым да нас далучацца і беднякі і сераднякі.

Васіль. Правільна! Хлопцы! Нас пятнаццаць чалавек, ды яшчэ чатыры—два дэмобілізаваныя чырвонаармейцы ды два былыя комунары. Гэта-ж у нас будзе такі моцны колгас!

Галасы. Правільна! Стаў на галасаваньне! Што там яшчэ марудзіць!

Ганна. Таварышы! Перад тым, як галасаваць, добра падумайце. Бо гэта вы робіце сур'ёзны крок. І прыдзецца вам шмат выцярпець.

(*Паўза*).

Васіль. Галасуй!

Мікола. Хто супроць таго, каб наша ячэйка ўступіла ў колгас?

(*Маўчаньне. Паднялася адна рука... Цішыня. Поднялося яшчэ дзьве рукі*).

Мікола (*спакойна*). Выйдзіце сюды.

(*Вышлі Алесь, Сьцёпа, Аўгеня*).

Якія прычыны, таварышы?

Алесь (*зломаным голасам*). Ты-ж ведаеш... Наша маці хворая. Ня вытрывае яна, калі яе кіну...

(*Твар у Міколы зморшчыўся ад болю, аднак стрымаўся*).

Мікола. А ты, Аўгеня?

Аўгеня. Не магу. Выганюць мяне з хаты. Навек будзе сорам.

Мікола. А ты Сьцёпа?

Сьцёпа. Таварышы! Мы толькі ўмажамся з гэтым колгасам! Паглядзеце вы цьвярозымі вачыма. Бацькі нас выганюць! Нічога нам не дадуць! Што-ж мы з імі судзіцца будзем?

Галасы. Будзем судзіцца.

Сьцёпа. Я ня буду. У нас нічога няма. З голымі рукамі выдзем у поле! Хлопцы! Угробімся, далібог! Вось пабачыце. Гэта-ж, калі правалімся, ад сораму вачэй ня можна будзе паказаць.

Ганна. Няпраўда! Ня з голымі рукамі! Кожны з вас мае права па закону патрабаваць ад бацькоў сваю долю! Чаго-ж вам баяцца? Усе працаваць умееце! Таварышы! Даю вам слова: мы, комунары, дапаможам вам стаць на ногі! Ня бойцеся!

(*Воплескі*).

А табе, Сьцёпа, сорамна галасаваць супроць лініі партыі і комсамолу!

Мікола. Дванаццаць чалавек нашай ячэйкі ўваходзіць у колгас. Як быць з гэтымі траімі?

Голас. Выключыць з комсамолу.

Ганна. Таварышы! Не сьпяшайцеся з выключэньнем. Разглядзеце кожнага з іх паасобку.

Васіль. Правільна.

Голас. Аўгеня з бядняцкай сям'і. Яна ня супроць колгасу. І Аўгеня і Алесь усё адно будуць з намі працаваць.

Васіль. Прапанова: выключыць умоўна Алеся і Аўгеню. А Сьцёпу зусім. Ён кожны раз кідаецца ў паніку і наводзіць дэзорганізацыю.

Мікола. Хто супроць таго, каб Сьцёпу зусім выключыць, а Алеся і Аўгеню ўмоўна?

(*Маўчаньне. Ніхто рукі не падымае*)

Мікола. Сьцёпа, аддай свой білет.

(*Сьцёпа муліцца*).

Аддай білет.

(*Моўчкі вьіняў білет. Аддаў*).

Пакінь сход.

Сьцёпа. Ну, ліха-ж на вас! Будзеце шкадаваць, што мяне не паслухалі! Усё адно ўмажацеся з колгасам! (*Пашоў*).

Мікола. Якое імя колгасу?

Галасы. Чырвоны Золак!

Маяк соцыялізму!

Бальшавік! Кастрычнік!

Мікола. Хто за Чырвоны Золак?.. Таварышы! З гэтай хвілінай нарадзіўся колгас Чырвоны Золак і будзе жыць! (*Воплескі. Песьня комсамольская*).

Абраз 13

Банкуз. Нашы комунары дужа ўзрадаваліся, як даведаліся, што ў вас організаваўся комсамольскі колгас. Мяне прасілі перадаць, што комуна ўсім вам дапаможа.

Краўкоў. Дапамога комуны нам во як трэба, бо ў нас амаль нічога няма.

Мікола. Трэба, хлопцы, зараз-жа, каб кожны з нас узяў сваю долю ад бацькоў.

Галасы:

— Я прывяду цялушку.

— А я бычка гадавалага.

— А мне дзьве авечкі.

— А я жарабё прывяду. Паўтара гады.

Мікола (*спахмурнёў*). Ой, хлопцы! На чым-жа мы будзем араць?

Голас. Дрэнныя нашы справы. Мусіць на авечках прыдзецца араць.

Банкуз. Не бядуй, хлопцы. Мы сваім трактарам узарэм ваша поле. Дадуць вам крэдыты, купіце жывёлу.

Разжывяцеся. Нічога!

(*Убягае Васіль надзвычайна ўсхваляваны*).

Васіль. Хлопцы! што рабіць?! Бацька выгнаў. Вывеў за вароты цёлку ды авечку, а самаго мяне за шкірку ўзяў—вон! Каб твайго й паху ў маёй хаце ня было! Куды-ж дзець мне іх? Яны-ж тут на вуліцы. Можа ўцяклі ўжо?

Лапатошнік. Гані да мяне. І сам там жыві покуль што.

Васіль. Ну добра (*пабег*).

Мікола. Шмат каму з нашых хлопцаў няма дзе прытуліцца, бо іх выгналі з хаты. Таксама няма куды дзець скаціны. Я прапаную заўтра-ж пайсьці ў РВК, каб нам выдзялілі зямлю і зараз-жа пачаць будаваць хлявы для жывёлы і дом для ўсіх нас!

Краўкоў. Правільна. Нам трэба дамагацца, каб лясьніцтва адпусьціла лес.

Голас. Таварышы! А ў нас-жа яшчэ няма праўленьня колгасу!

Мікола. Правільна. Намячайце кандыдатаў.

Галасы. Краўкова!

— Лапатошніка!

— Міколу!

— Лясюка!

— Буцяна!

(*Уваходзіць бяднячка Мар'я*).

Мар'я. Добры дзень, вам, таварышы. Ці тут гэта новы колгас?

Галасы. Тут, тут.

Мар'я. Ці прымаеце вы гэтакіх, як я, бедную ўдаву?

Мікола. А чаму-ж?

Мар'я. Вы ведаеце мяне. Як памёр мой чалавек, дык і пачалося ў мяне гора. Трое дзяцей. Няма з чаго жыць! Па дварох пашла, на ўсялякую работу ў кулакоў наймалася.

Мікола. Што ў цябе ёсьць?

Мар'я. Ой, таварышы! Сорамна сказаць. Адна каза лядаштая, ды тры курыцы... Ці прымаеце вы гэтакіх?

Мікола. Хто за тое, каб прыняць цётку Мар'ю ў наш колгас?

(*Усе падымаюць рукі*).

Абраз 14

Сход хутаран пасёлку Зайцавы Загоны.

За сталом старшыня РВК Дзевясіл, аграном Скрабакова, колгасьнік Лапатошнік, дзелавод.

Дзевясіл гаворыць, як начальнік,—цьвёрда, як-бы загадвае.

Сяляне слухаюць хмура. Бабы шэпчуцца.

Дзевясіл. Таварышы, грамадзяне! Вы ўжо ведаеце, з якой мэтай мы прыехалі да вас. (*Нерашучыя галасы—Ведаем, ведаем*). Мы змагаемся за лёзунг—суцэльная колектывізацыя! Гэта значыць, што ўсе сяляне заклікаюцца стаць на барацьбу за соцыялізм! Гэта значыць, што і ваш пасёлак, Зайцавы Загоны,—усе як адзін пагалоўна,—павінны стаць за гэты лёзунг. Досыць вам быць „зайцавымі загоншчыкамі"! Вы павінны ўсе да аднаго запісацца ў колгас! Колектыўнай апрацоўкай зямлі вы даб'яцеся большых посьпехаў, як поркаючыся на сваёй аднаасобніцкай паласе! Апрача таго мы колгасам даем розныя льготы, як у першую чаргу забясьпечваем таварамі, машынамі і г. д. Усё гэта дасьць колгасьнікам магчымасьць усьцягнуць сваё жыцьцё

на соцыялістычныя рэйкі. Сялянства масамі ўліваецца ў колгасы. Запісвайцеся і вы, каб ня плесьціся ў хвасьце. Хто не запішацца,—таго савецкая грамадзкасьць асудзіць, як падкулачніка і белгвардзейскага падпявалу! Запісвайцеся! (*Хмурае маўчаньне, толькі зрэдку асьцярожны кашаль*). У каго ёсьць запытаньні?

(*Выступіў Дзядок. Памуліўся, пачухаў патыліцу*).

Дзядок. Баімся, таварыш...

Дзевясіл. Чаго?

Дзядок. Як-бы нам бяз портак не застацца...

Дзевясіл (*дзелаводу*). Запішы для мяне—„баіцца бяз портак застацца". Яшчэ хто хоча?

Селянін (*хітра усьміхаючыся*). Мне, таварышы, дужа падабаецца колгас. Я-б зараз-жа запісаўся застрэльшчыкам да канца пяцігодкі. Ну, вось толькі мне трэба прыгледзіцца. Падумаць. Год, два...

Дзевясіл. Не, гэтакія тэмпы нам не падыходзяць.

(*Падступілі бабы да стала. Пытаньні як з меха пасыпаліся*).

Галасы. Ці праўда, што ў колгасьніка усю маемасьць запісваюць, нават мякіну?..

— Ці праўда, што ўсіх кароў будуць даіць у адну дайніцу, а па малако з грошыкамі прыходзь?..

— Божачка мой! Я-ж сваю карову як вока берагу! Ці будзе-ж глядзець колгас за яе вымем? А калі ў яе цыцка патрэскаецца?

Дзядок. Вось, таварышы, скажу я вам... Мы ўсе згадзіліся-б. Бо мы працавітыя людзі і будзем працаваць. А вось як бабы нашы? Ось тут закавыка! Баба-ж гэта для нас усё. Спадружніца аж да самай сьмерці. Запытайцеся ў іх, ці захочуць яны?

Дзевясіл. Ну, таварышы бабы, што вы на гэта скажаце? (*Бабы маўчаць. Дзядок ківамі іх падбухторвае. Раптам падняўся шум, вэрхал, вісклівыя бабскія галасы*).

Крыкі. Навошта нам колгасы!..

— Дайце нам яшчэ хоць троху пажыць на волі!

— Перацягнулі нас на хутары, а цяпер да Ісуса цягнуць!

— Ня трэба колгасы! Што гэта такое!

І-ая баба (*падскочыўшы да стала*). Не пайду ў колгас! Нічога не баюся! Як хочаш іграй на мне! Бі мяне! Рэж,—і кроў не пацячэ!

Дзевясіл. Грамадзяне! Ціха! Што вы антыколгасны крык паднялі? Зараз слова мае тав. Скрабакова, комунарка і савецкі аграном.

Скрабакова. Таварышы! Ня крычэце. Хачу з вамі пагаварыць, як з людзьмі.

Галасы. Ну гавары, гавары.

Скрабакова. Якія выгады ў колгасе? Перш за ўсё колгасы могуць апрацоўваць зямлю па апошняму слову навукі і тэхнікі. Колгасам будуць даступны самыя складаныя машыны, а значыць колгасьніку будзе лягчэй працаваць. Трактары...

Крыкі. Ня трэба нам трактар'ё!
На коніках арэм, а хлеб ядзім.

Скрабакова. Машынная апрацоўка зямлі павысіць ураджайнасьць! Вызваліць чалавека ад лішняй працы. Палепшацца вашы бытавыя ўмовы. Зараз кожны з вас увесь век свой топчацца ў гнаі, жыве разам з жывёлай. У колгасе жывёлу аддзеляць ад чалавека ў вялікія хлявы. У колгасе вы збудуеце сабе клюбы, сталовыя, дзіцячыя яслі.

(Зноў падняўся шум)

Крыкі. У ко́лгасах з голаду падохнем!
— Ня соладка будзе ў колгасах!
— Брат з братам ня ўжывецца, а як чужыя людзі ўжывуцца?
— Што-ж гэта за мода новая вышла? З вёскі пераехалі на хутары. Не хацелі мы пераяжджаць—ну, угаварылі—пераехалі. Цяпер кажуць,—пераяжджай у колгасы! А можа гады праз два яшчэ ў якую трасцу пераяжджаць папросяць. Дык гэта-ж трэба пад хату колы падставіць? Пераяжджай ды пераяжджай!

Лапатошнік. Таварышы, ня бойцеся колгасаў! Плюньце таму ў вочы, хто сказаў, што ў колгасах з голаду падохнем! Товарышы! Няўжо-ж мы не наарэм сабе хлеба! Наарэм ня толькі сабе, а яшчэ каму другому. Вось я быў комунар. Спакусіўся я на гэта вашае жыцьцё,—кінуў комуну, пераехаў на хутар. Дык колькі-ж я нацярпеўся на гэтым хутары! Таварышы! нам лепей будзе, а ня горай!

Скрабакова. Таварышы! Прыходзьце да нас у комуну. Мы пакажам вам, як мы, комунары, жывем. Будзеце і вы гэтак сама жыць па культурнаму. Комунары з таго самага пачыналі, з чаго й вы цяпер: абагулілі, што ў каго было і пачалі працаваць.
І хутка наладзілі сваё жыцьцё.

Дзядок. Я-б і рады быў, таварыш, запісацца. Ды што, калі жонка трымае мяне і рукамі і нагамі...

Дзевясіл. Мужчыны! Не глядзеце на баб! Запісвайцеся! Бабы ня дзе дзенуцца. Колгасы—мерапрыемства савецкай улады. Хто супроць колгасу, той супроць савецкай улады! Хто за колгасы, падымеце рукі. Так. Аднагалосна. Ну, цяпер запісвайцеся. (*Ніхто не крануўся*). Ну што-ж вы?.. Ну, вось ты дзед? Што стаіш?

Дзед. Я-б, сам-ба-б узяў-ба-б ды пашоў... у колгас... Ды каб жонка-баб-ба-б... Не таго...

1-шы селянін. Таварыш, дазвольце адлучыцца на хвілінку, параіцца з жонкай.

Дзевясіл. Ніякіх жонак! Што ў цябе ў самого галавы няма?

1-шы селянін. Таварыш! (*б'е сабе ў грудзі*). Мая душа хоча ў колгас, бо я-ж беднята! А як я жончыну душу прымушу? Будзе атака!

2-гі селянін. Таварыш старшыня! Вось выму я табє сваю душу, пакладу на стол, будзе яна скакаць пад тваю дудку, бо яна паслухмяная. А баба мая а-ні за якія...

Дзевясіл. Грамядзяне! Зараз-жа каб усе добраахвотна запісаліся. А заўтра пачнем абагульваць коні і каровы...

(*Падняўся крык, шум, гармідар*).

Крыкі. Бабачкі! Кароў забіраюць!

Ты хочаш, каб мае дзеці ў колгасе воўкам вылі ды лапу смакталі!

Баба (*падбегшы да стала, зьняла кажух*). На! Бяры! Апошні кажух! Грэйся! А каровы ня дам!..

Дзевясіл (*крычыць*). Эй там! Зачынеце дзьверы! Хто выдзе, хто пакіне сход,—будзе адказваць! (*Дзьверы пачалі хляпаць, народ выходзіў. Бабы кінуліся вон, за імі мужчыны. Хата апусьцела. Стаяла адна баба, якая запісалася*). Ах, вы, мякінныя галовы! У другі раз я прыеду з міліцыяй! Пабачу, як вы не запішацеся.

Баба. Таварыш старшыня! Вычыркні мяне з колгасу!

Дзевясіл. А? а? Што такое?

Баба. Вычыркні, кажу. Запісалася я па дурасьці сваёй. Думала, яшчэ хто пойдзе. Што-ж мне адной у колгасе зязюляй кукаваць?..

Скрабакова. Таварыш Дзевясіл! Ты ўсю справу сапсуў. Хіба так можна рабіць?

Дзевясіл. Што? што?

Лапатошнік. Э-э... Няладна ў нас вышла!..

Абраз 15

Габінэт РВК. Дзевясіл і Залешчык.

Дзевясіл. Праўду кажучы, у нас надзвычайна цяжка з колектывізацыяй хутароў. Тут мы нічога зрабіць ня можам.—Ня хочам і канец. А хутароў у нас да 35 проц.

Залешчык. А як вёска?

Дзевясіл. З вёскай у нас ня дрэнна. Там ёсьць моцная апора—беднота. А хутары...

Залешчык. Я разумею. Тут могуць дапамагчы толькі моцныя лекі.

Дзевясіл. ?

Залешчык. Так. Моцныя лекі. Хутары можна колектывізаваць толькі гвалтам. Нічога ня зробіш. Трэба націснуць. Трэба моцна ўдарыць па ўласьніцкіх інстынктах хутаран. Не пакладацца на самапас. Раскулачваньне на ўсе сто. Нават на сто дваццаць. Трэба пашукаць ворагаў сярод сераднякоў, нават сярод беднаты. Трэба пакапацца сярод тых, хто ня хоча ісьці ў колгасы. Чаму ня

хоча? Якая прычына? Значыць ты супроць колектывізацыі. Значыць, ты супроць мерапрыемства савецкай улады. Значыць ты—хто? Вораг! Падкулачнік... І калі некалькі экзэмпляраў раскулачыць, арыштаваць, выселіць...

Дзевясіл. Сераднякоў? Райком не дазволіць. Гэта парушэньне генэральнай лініі.

Залешчык. Не парушэньне, а моцныя лекі. Усе гэта робяць. Адной агітацыяй ня доймеш. Кажу вам, гэта зробіць нячуваны эфэкт! Вось пабачыце. Валам папруць у колгасы!

(*Уваходзіць Гарчак*).

Дзевясіл. Таварыш Гарчак. Вы незнаёмы? Гэта з брыгады Наркомзему па колектывізацыі...

Залешчык. Залешчык...

Гарчак. Мы з вамі сустракаліся.

Залешчык. Не памятаю.

Гарчак. Некалькі год таму назад мы з вамі сустрэліся, як ворагі...

Залешчык. Не памятаю.

Гарчак. Вы прыяжджалі ў наш раён. Вы насіліся з ідэяй стварэньня ў нас на Беларусі савецкай Данii. Памятаеце? Вы агітавалі за хутары.

Залешчык. Так, так. Прыпамінаю. Я тады яшчэ здорава вас аблаяў...

Гарчак. І я вас.

Залешчык. Вас тады здорава асьвісталі, і вы, як пабіты, пашлі са сходу. Памятаю.

Гарчак. А цяпер вы агітуеце за колгасы?

Залешчык. У той час колектывізацыя сельскай гаспадаркі яшчэ не стаяла ў парадку дню партыі. І калі я тады агітаваў за хутары,—гэта была не мая памылка: я выконваў дырэктывы. Цяпер органы пролетарскай дыктатуры пад кіраўніцтвам партыі зрабілі моцную дызэнфэкцыю ў Наркамземе і ўсіх тых, хто зьяўляўся шкодным,—абясшкодзілі.

Гарчак. А вы самі? Якім чынам вы...

Залешчык. Я перабудаваўся.

Гарчак. Я радзіў-бы вам зьмяніць сваё прозьвішча.

Залешчык. Чаму?

Гарчак. Прозьвішча—Залешчык цяпер не падыходзіць, бо за вамі ўжо ніхто ня пойдзе. За—адпадае. Вам трэба называцца проста—Лешчык.

Залешчык. Я з вамі ня згодзен.

(*Дзьверы крыху адчыніліся. Высунуліся нечыя тры лахматыя галавы*).

Дзевясіл (*строга*). Што трэба?!

Голас. Нам грэба галоўнага агранома бачыць.
Залешчык. Гэта я.
Кулакі (*адзін аднаго перапыняючы*). Таварыш аграном! Мы прышлі скардзіцца!
Што гэта ў нас такое робіцца!
Нас раскулачылі!
Можна сказаць зусім арашылі!
Залешчык. Пры чым тут я?
1-шы кулак. Вы-ж, таварыш, ад Наркамзему? Разьбярэце нашу справу
2-гі кулак. Нас залічылі кулакамі. А якія-ж мы кулакі? У нас была культурная гаспадарка. Вось-жа нашы „абаронныя граматы".
Залешчык. Пакажэце (*праглядае*). Так. Дакумэнты ў парадку. Толькі. гэта дакумэнты гістарычнай недарэчнасьці.
1-шы кулак. Што-ж нам з імі рабіць з гэтымі граматамі?
Залешчык. Можаце спатрэбіць іх на .. што-небудзь...
шы кулак. Таварыш аграном! Тут-жа і ваш подпіс.
алешчык (*пачырванеўшы*). Як? Пакажэце... Ну, тады... Схавайце.
1-шы кулак. Дык што-ж гэта робіцца? Наркамзем адной рукою выдае нам „абарончыя граматы", а другою рукою хапае нас за карак!
Залешчык. Рука вашых прыхільнікаў выдавала вам абарончыя граматы. А цяпер за карак вас хапае рука пролетарыяту! (*Завярнуўся да іх сьпіною. Дзьверы ляснулі. Залешчык, усьміхнуўшыся. Дзевясілу*). Як вам гэта падабаецца? Га?..

Абраз 16

Цёмная вуліца вёскі. Залешчык, сьпяшаючыся, ідзе. Баклага яго даганяе.

Баклага. Таварыш Залешчык!
Залешчык. А!
Баклага. Вы мяне мусіць ведаеце...
Залешчык (*зірнуўшы*). Ня ведаю.
Баклага. Вы павінны мяне памятаць. Я Баклага.
Залешчык. Хто такі Баклага? Не памятую.
Баклага. Няўжо-ж вы маю хлеб-соль забылі? Памятаеце,—вы ў мяне застанаўліваліся, як прыяжджалі на земляўпарадкаваньне. І паіў я вас і карміў...
Залешчык (*углядзеўшыся*). А, так, так... Дык вы той самы?.. Што-ж, вас яшчэ не раскулачылі?
Баклага. Не яшчэ.
Залешчык. Шкада, шкада. А трэба было-б.
Баклага. Таварыш Залешчык! Што вы жартуеце?
Залешчык. Не, я сур'ёзна. Чаму не раскулачылі?
Баклага. Чарга за мной. Штодзень чакаю. Усе гавораць—трэба Баклагу раскулачыць.

Залешчык. Ну, дык што?
Баклага. Дайце рады, што рабіць. Ці няма якога выхаду?
Залешчык. Колькі ў цябе коняй?
Баклага. Чацьвёра.
Залешчык. А кароў?
Баклага. Тры. Двое падцёлкаў.
Залешчык. Прадавай.
Баклага. Ці-ж я не прадаў-бы? Каму яны трэба? Хто цяпер купіць? У колгасы гоняць нават без каня і каровы прымаюць. На адной сьвіньні можна ў колгас уехаць.
Залешчык (*азірнуўшыся*). Тады вось што... Рэж.
Баклага. Каго?
Залешчык. Каровы, коні... Хоць скуру прадасі. Рэж. Або і гэтага ня будзеш мець. Задарма возьмуць. Толькі маўчок!.. (*Хутка пашоў. Баклага стаіць, разьвёўшы рукі*).

Абраз 17

Дзевясіл (*ля тэлефону*). Опэрацыйная зводка на фронце колектывізацыі па нашым раёне. На сёньнешні дзень колектывізавана 62,5 проц. Сялянства ўжо ўспрыняло ідэю соцыялістычнай перабудовы вёскі. Рабочыя брыгады, якія прыехалі на колектывізацыю ў наш раён, за апошнія суткі арганізавалі чатыры моцныя колгасы. „І-га маю“, „імя Кастрычніка“, колгас „Аўрора“ і „Чырвоны сьцяг“. Бедната і серадната масамі ўліваюцца ў колгасы. Усё гэта сьведчыць, што мы бальшавіцкімі тэмпамі ідзем да хуткай пабудовы фундаманту соцыялізму, да выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, да канчатковай ліквідацыі кулацтва як клясы.

Аднак ня гледзячы на ўсе гэтыя дасягненьні, ёсьць у нас і недахопы, прарывы і ценявыя бакі нашага колгаснага жыцьця. Клясавы вораг, прадбачачы сваю блізкую пагібель, шалёна супраціўляецца, ночы ня сьпіць, прыдумляе, як-бы найбалючай ударыць па нашым соцыялізьме. Так некалькі дзён назад ноччу несьвядомыя сяляне вёскі Глухія Двары, і Забягаеўка, з'агітаваныя кулацкім шэптам, вывелі 300 коні на поле і наладзілі конскую крывавую лазьню—усіх чыста зарэзалі, скуры злупілі і прадалі іх Скуртрэсту. Цяпер пачалося масавае стыхійнае зьнішчэньне жывёлы, сяляне рэжуць коні, каровы, авечкі, сьвіньні. Гэта наносіць сур'ёзны ўдар гаспадарцы нашага раёну. Аднак мы прымаем рашучыя энэргічныя меры, каб спыніць гэтыя жывёлазабойствы, растлумачваем сялянам усю пагубнасьць гэтых злачынстваў і агітуем за найхутчэйшае сканчэньне суцэльнай колектывізацыі.

Трэба зараз-жа выдаць законы аб прыцягненьні да суровай адказнасьці за падобнае разбазарваньне жывёлы... Так... Так...

Абраз 18

Ноч. У полі на начлезе ля агню сядзяць чатыры сялянскія хлопчыкі. Недалёка пасьвяцца коні—чуваць цiхае браскатаньне балаболак.

Паўлючок: (*пяе*)

Я табун сьцерагу.
А ўсе людзі сьпяць.
Я адзін на расе...
Адубеў!
Акалеў!
Абмакрэў!
Перамёрз!
Ой!..
Ой вы, конікі мае!
Коні быстрыя!
Вы хадзеце па траве
Ня іржэце!
Не брыкайце!
І дадому не ўцякайце
Ой!

(*Падыходзіць да агню*) Здарова, хлопцы! Што, бульбачку пячацё?

Пятрок. Мусіць ужо сьпяклася. Даставай! еж.

Паўлючок. Ох, ноч сёньня сьцюдзёная. (*Грэе рукі*).

Сёмка. А гароху нам ня прынёс?

Паўлючок. Неспасобна было... Баклага быў на дварэ.

Пятрок. Шкада. Што-ж ты невясёлы такі?

Паўлючок. Дума ў мяне...

Сёмка. А што?

Паўлючок. Бяда з Баклагавымі коньмі.

Алесь. Што за бяда?

Паўлючок. Хоча Баклага зьніштожыць. Зарэзаць хоча.

(*Хлопчыкі падхапіліся*)

Галасы. Што ты кажаш?

Паўлючок. На свае вушы чуў. Сваёй жоніцы сказаў. Дык яна як заплача—заплача.—Аднаго, кажа, коніка сабе пакіну.

Галасы. Дык гэта-ж ён ашалеў.

Паўлючок. Прачуў ён, што яго хочуць раскулачыць. Тады забяруць яго коні задарма.

Сёмка. Дык няхай прадасьць.

Паўлючок. Хацеў прадаць, дык ніхто купляць ня хоча.

Пятрок. Ай-яй-я! гэтакія коні!

Паўлючок. Зарэжа гад.—Ты, кажа, папасьві троху, а я прыду цябе зьмяню. Ведаю ўжо, чаго ён прыдзе...

Сёмка. Эх, каб я быў цыган! Далі бог украў-бы. І не злавілі-б. За ноч сто вёрст ускакаў-бы, і вецер мяне не дагнаў-бы!

Алесь. Чаму-ж яго не раскулачаць?
Паўлючок. Часу ў людзей няма, ці што?
Пятрок. Дык гэта ты можа апошнюю ноч пасеш?
Паўлючок. Шкада мне коні... Во як... Добрыя коні.
Сёмка. Чакай... Мы не дадзім яму. Калі ён прыдзе, сюды, мы...
Паўлючок. Што?
Пятрок. Загнаць іх куды-небудзь трэба... У балота, каб не знайшоў.
Паўлючок. Сёньня ня знойдзе... Дык заўтра...
Сёмка. Братачка! Чакай... А што, калі ты яго раскулачыш?
Паўлючок. Каго?
Сёмка. Баклагу.
Паўлючок. Як?
Сёмка. Забірай коні! Гані іх у комуну!
Пятрок. Скажы там, што Баклага хацеў зарэзаць.
Паўлючок. Добра! Пабягу. (*Бяжыць. Спыніўшыся*): Заб'е мяне Баклага... Не, я яму ўжо і на вочы не пападуся. Хлопцы! Прыдзе Баклага, скажэце, што коні яго ў шкодзе папаліся,—комуна забрала. Дык я пашоў у комуну.
Пятрок. Ты яшчэ прыдзеш?
Паўлючок. Тут-жа мой конь.
Пятрок. Прынясі гароху.
Паўлючок. Добра. (*Пабег*).

Абраз 19.

Дзевясіл. Праклятыя хутары! Мая прапанова: не цацкацца з хутарамі, бо там усё сядзяць шкурнікі! Падкулачнікі! Мяне і т. Скрабакову проста выгналі! Проста з метламі гналіся за намі бабы. А мужчыны схаваліся за бабскія спадніцы.
Скрабакова. Гэта праўда, што ён сказаў. Нас выгналі. Але мы самі вінаваты. Ня ўмеем агітаваць. Ня крыўдзіся, тав. Дзевясіл, ты ня ўмееш агітаваць.
Дзевясіл. А ты ўмееш?
Скрабакова. Я таксама. Але ты ўсю справу сапсуў. Ты адразу-ж пачаў пагражаць.
Дзевясіл. Я не пагражаў.
Скрабакова. Ну, ты загадваў.
Дзевясіл. Я—салдат колектывізацыі.
Скрабакова. Не, ты фэльдфэбэль колектывізацыі. Ты камандаваў, а сяляне ня хочуць слухаць тваёй каманды. Нашы словы—кол-гас, партыя, савецкая ўлада,—ты як гаворыш? Усё адно як камандуеш— сьмірна!.. Кол-гас! (*Грукае кулаком па стале, сьмех*).
Дзевясіл. Ну, а ты—лепей?.. Паспрабавала лагодненька, так, ласкава. А ўсё адно і цябе аблаялі.

Скрабакова. Трэба было нам падыйсьці да іх бліжэй, паглядзець, як яны жывуць, чым дышуць.

Дзевясіл. Э, ведаем мы ўсё гэта.

Скрабакова. Але-ж людзі гэта, не стада авечак.

Залешчык. Сапраўды, надзвычай цяжка агітаваць хутары. На адным сходзе мне баба ў самыя вочы плюнула. Так і заляпіла, шэльма.

Гарчак. Мусіць, пазнала вас.

Наважын. Ты, т. Дзевясіл, няправільна падышоў да сялян. Ты зьніжаеш свой аўторытэт.

Гарчак. Як ты цяпер пакажашся на вочы ў гэтыя Зайцавы Загоны?

Дзевясіл. Я з імі буду іначай. Для колектывізацыі хутароў у мяне ёсьць добры сродак.

Гарчак. Які?

Дзевясіл. Не цэрамоніцца з імі.

Залешчык. Гэта самы пэўны сродак.

Наважын. Партыя не давала права на такі сродак.

Дзевясіл. А што рабіць, калі хутары ніякім макарам ня ідуць?

Наважын. Трэба ўзмацніць агітацыю.

Дзевясіл. Ня йдуць!

Наважын. Трэба ўвесь час растлумачваць і пераконваць іх у перавазе колектыўнай гаспадаркі.

Дзевясіл. Ня йдуць!

Наважын. Ці стварылі вы на хутарох ініцыятыўныя групы з беднаты?

Дзевясіл. Мы зрабілі там вось што... (*вымае з портфэлю тры жмуты заяў, бахнуў на стале*). Раз!.. Два!.. І вось яшчэ—тры!..

Усе. Што такое?

Гарчак (*нахіліўшыся, зірнуў*). Заявы ў колгас. Красуліны Балоты!

Дзевясіл. А што-ж вы сабе думалі? І Сіняе Ўзгор'е, і Зялёны Ручай.

Гарчак. Здорава!

Наважын. А што-ж ты гаварыў, што хутары ня йдуць?

Гарчак. Красуліны Балоты! Не чакаў!

Наважын. Якім-жа чынам табе ўдалося гэта?

Дзевясіл. Перад хутарамі я са ўсёй цьвёрдасьцю паставіў пытаньне рубам: або вы будзеце колгасьнікі, або... для вас мы пашукаем іншае месца, дзе няма суцэльнай колектывізацыі.

Залешчык. Правільна.

Наважын (*ускочыў*). Дзевясіл! Гэта парушэньне прынцыпу добраахвотнасьці.

Дзевясіл. Яны добраахвотна выбралі, што для іх лепей.

Гарчак. Дзевясіл! Нічога з тваіх колгасаў ня будзе.

Дзевясіл. Чаму?

Гарчак. Разьбягуцца, як мухі пры першым выпадку.

(*Уваходзіць Банкуз і Ганна*).

Банкуз. Добры вечар!

Гарчак. А! З комсамольскай брыгады. Ну якія ў вас навіны?

Ганна. У нас удача. У вёсцы Шырокія Дубы заклалі колгас Маяк Соцыялізму.

Дзевясіл. Колькі ўвайшлі?

Банкуз. Трыццаць гаспадарак.

Дзевясіл. З ста дваццаці двароў? Мала!

Ганна. Гэта 25 процантаў.

Банкуз. Тав. Дзевясіл! Там справа на мазі. Там засталіся яшчэ Рыгор, Мікола, Кандрат і Васіль працаваць з актывам.

Наважын. Моцны гэта будзе колгас?

Ганна. Моцны. Актыў там здорава працуе.

Наважын. А перагібаў там ня было? Ніхто з хлопцаў не запужваў сялян?

Банкуз. Комсамольцы такімі мэтодамі не працуюць.

Ганна. Мы прышлі ў Шырокія Дубы, а там у іх амаль усё гатова.

Гарчак. Малайцы, хлопцы!

Дзевясіл. Паспрабавалі-б яны што-небудзь зрабіць на хутарох!

Банкуз. На хутарох у нас іншы мэтод.

Наважын. Які?

Банкуз. Мы паставілі перад сабою задачу заваяваць хутарскую моладзь.

Наважын. Правільна!

Ганна. А потым, за моладзьдзю пойдуць і бацькі.

Наважын. Правільны шлях!

Дзевясіл. Доўгая песьня!

Гарчак. Малайцы хлопцы!

Ганна. У нас ужо ёсьць і посьпехі. У колгасе Чырвоны Золак пяць комсамольцаў кінулі сваіх бацькоў-хутаран.

Дзевясіл. Што такое пяць хлопцаў? Вы вось зірнеце, колькі я заяў прывёз з хутароў.

Ганна (*зірнуўшы*). Красуліны Балоты!

(*Уваходзіць рабочы Сіўкоў*).

Гарчак. А! Тав. Сіўкоў! Ну як-ты?

(*Сіўкоў моўчкі сеў, падпёр галаву рукамі*).

Скрабакова. Ты змарыўся, тав. Сіўкоў?

(*Сіўкоў маўчыць, як-бы ня чуе*).

Ганна. Што з табой, тав. Сіўкоў?

Сіўкоў (*падняўшы галаву*). Хто колектывізаваў Красуліны Балоты?

Дзевясіл. Я.

Сіўкоў. Гэта подласьць! Гэта злачынства!

Дзевясіл (*ускочыў*). Тав. Сіўкоў!

Сіўкоў. За такую колектывізацыю ня толькі з партыі трэба гнаць, а аддаць пад суд! Вы-ж іх гвалтам загналі ў колгас!

Дзевясіл. Як гвалтам?

Сіўкоў. Вы ім пагражалі Салаўкамі і Нарымскім краем і раскулачваньнем!

Дзевясіл. Вам наплялі на мяне, в вы і паверылі!

Сіўкоў. Я толькі што адтуль прыехаў! Вы што-ж, ствараеце папяровыя колгасы? Заганяеце людзей усякімі пагрозамі, а потым крычыце аб энтузіязьме мас?! А змычка дзе? Я пытаюся вас, дзе змычка?

Дзевясіл. Што ты крычыш на мяне? Што, ты маё начальства? Камісарыць сюды прыехаў?

Наважын (*стукнуў па стале*). Тав. Дзевясіл! Не забывайся!

Дзевясіл. А што ён крычыць на мяне? Хай ставіць пытаньне ў райкоме, у ячэйцы...

Сіўкоў. І пастаўлю. Я не камісарыць прыехаў, а глядзець, каб правільна праводзіліся ў жыцьцё лёзунгі партыі. Не правільна ў вас, таварышы, колектывізацыя хутароў!

(*Уваходзіць Паўлючок*).

Гарчак. Паўлючок! Ну што? Можа заяву прынёс ад бацькі?

Паўлючок. Не... Раскулачыў Баклагу.

Гарчак (*ускочыўшы*). Хто?

Паўлючок. Я... Таварышы! Прывёў вам Баклагавы коні! Ратуйце іх! Зарэзаць хоча. Далі бог, на свае вушы чуў! пастаўце іх. Схавайце!

(*Паўлючка акружылі*).

Галасы. Адчаяны хлапец!

— Як-жа ты гэта наважыўся?

— Як-жа ты не пабаяўся Баклагі?

Паўлючок. Пастаўце коні хутчэй, а я пабягу.

Гарчак. Куды?

Паўлючок. Там-жа мой конь застаўся. Прывяду да хаты, а сам...

Гарчак. Куды?

Паўлючок. Сюды... Куды-ж мне дзецца?

Гарчак. Глядзі, Баклагу не пападзіся. З жывога скуру злупіць.

Абраз 20

Ноч. Каля гароду Баклагі. Грады гароху. Стаіць саламянае пудзіла. Ідуць Баклага і Куранега. Гавораць ціха.

Куранега. Я баюся, нас зловяць...

Баклага. Нічога ня зловяць.

Куранега. У іх усюды вартавыя стаяць.

Баклага. Я ўжо ўсё даглядзеў... Каля саду няма вартавых. Мы пералезем праз плот, дабярэмся да самага вакна Гарчака.

Куранега. Я дрэнна бачу. Я ня ўцэлюся.

Баклага. Мы ўраз. Удвох. Хто-небудзь з нас уцэліць.

Куранега. Стой! Хто гэта? Нейкі чалавек стаіць.
Баклага. Дурны! Гэта пудзіла гарохавае.
Куранега. Гэта ня пудзіла. Ня пудзіла. Я бачыў як яно шавялілася.
Баклага. Колькі мы таго выпілі, а ў цябе ўжо ў галаве круціцца!
Куранега. Глядзі! Глядзі! Яно мне пальцам пагражае! Дай я яму па галаве трэсну. (*Хапае кол*).
Баклага. Далібог, з табою толькі бяды набярэшся. Пойдзеш ты ці не?
Куранега. Пайду! (*Пашлі*).
Паўлючок. (*Ля пудзіла ціха*): Бацька...
Куранега. Чакай... Нехта назваў мяне бацькам... (*Шукае*). Якому я сукінаму сыну бацька?

(*Баклага цяжне яго. Пашлі. Зьніклі. Саламянае пудзіла скранулася з мейсца, бяжыць, на-хаду зрываючы з сябе салому*).

Паўлючок. Хоць-бы пасьпець! Хоць-бы пасьпець.

Абраз 21

Дзевясіл. Таварышы. Наконт комуны і суцэльнай колектывізацыі нашага раёну ў мяне ёсьць вялізарны проект.
Наважын. Што за проект?
Дзевясіл. Навошта нам будаваць малыя колгасы? Калі суцэльная колектывізацыя,—значыць у нашым раёне будуць усе калгасьнікі! Дык навошта нам распыляць свае сілы! Давайце мы з'арганізуем нешта адно вялікае, комуну-гігант, на ўвесь раён!

(*Ад нечаканасьці некаторыя ўскочылі, паразявілі раты.* (*Ад заду пачуўся сьмех—хо-хо-хо*! *Дзевясіл нэрвова крычыць*): Што за сьмех! Справа сур'ёзная!

Наважын. Ты звар'яцеў.
Гарчак (*зірнуўшы на Дзевясіла спадылба*). Хочаш адразу пераскок. нуць у царства соцыялізму?
Дзевясіл. Давядзеце мне, што ў нас ня можа быць комуны на ўвесь раён!
Наважын. Можа, але не зараз.
Дзевясіл. А чаму на Украіне і ў РСФСР вырастаюць саўгасы-гіганты, цэлыя аграрныя гарады, а ў нас ня могуць?
Наважын. У нашых конкрэтных умовах зараз змагацца за комуну-гігант гэта лявацкая бязглузьдзіца!
Гарчак. Комуна-гігант, пытаньне далёкай будучыні! Кінь Дзевясіл! Твой проект праваліўся.
Дзевясіл. Таварышы, выслухайце мяне!
Галасы. Хай гаворыць, хай выкажа сваю думку!
Дзевясіл (*гарачыцца*). Ну, скажам, пабудуем мы на раёне шмат колгасаў. Хто будзе імі кіраваць? Няпісьменнае праўленьне? Дзе кадра? Няма яе. Для Саюзу трэба мільён рахункаводаў і пяцьсот тысяч кіраўнікоў колгасаў! Якая жанчына нам народзіць адразу мільён рахункаводаў? Га?

Гарчак. Не пары гарачку, Дзевясіл!

Наважын. У акрузе адчыніліся курсы рахункаводаў і кіраўнікоў...

Дзевясіл. Гэта капля ў моры. Усе мы будзем дрыжаць за кожны колгас, бо няпісьменнае праўленьне—вялікая небясьпека! Ці-ж ня лепей нам стварыць адно нешта вялікае, комуну-гігант! Перад намі адкрываюцца такія пэрспэктывы, ад якіх проста закруціцца ў галаве!

Наважын. Дзевясіл! У цябе ўжо закруцілася ў галаве!

Гарчак. Хто наштурхнуў цябе на гэтую ідэю?

Дзевясіл. Сам сябе наштурхнуў. Што такое наша колектывізацыя? Крычым—но! но! а конь на месцы. Калі ўжо ісьці ў бой, дык за нешта вялізарнае, за што ня шкода было-б і галаву пакласьці... (*Голас: і ў ДОПР сесьці*). За комуну-гігант на ўвесь раён.

Крык (*сярод моладзі*). За комуну-гігант! (*Некалькі чалавек запляскалі*)

Наважын (*ускочыў*). Таварышы! Пачакайце пляскаць!

Гарчак. Ня слухайце Дзевясіла!

Дзевясіл. Паслухайце Дзевясіла! Чаго нам баяцца? Сотня комунараў пабудавала лепшую ў Саюзе комуну Карла Лібкнэхта, а што могуць зрабіць 30 тысяч комунараў?

Наважын. Сотня якіх комунараў! Прайшоўшых суровую школу, цяжкі шлях, сотня рабочых, партызанаў, удзельнікаў грамадзянскай вайны!

Гарчак. Гэтую сотню я не аддам за ўсе 30 тысяч дробных гаспадароў, што ўчора запісаліся ў колгас!

Дзевясіл. Дык гэтая сотня будзе на чале комуны-гіганта!

Наважын. Я прапаную зьняць з абгаварэньня проект Дзевясіла. Гэта ўсім відавочная бязглузьдзіца!

Дзевясіл (*ускочыўшы крычыць*). Гэта дэмагогія! Я патрабую выслухаць мой плян да канца!

Галасы. Даць выказацца Дзевясілу! Хай гаворыць.

Дзевясіл. Як я сабе мысьлю комуну-гігант? Як нейкі вялізарны аграрны горад...

Галасы. Аграрны горад! Аграрны горад!

Дзевясіл. Аграрны горад тэрыторыяй ў 80 тысяч га! Мы яго назавем—Аграгігант Карла Лібкнэхта (*гарачыцца і спяшаецца*). У цэнтры гэтага Аграгораду—наша цяперашняя комуна. Сто комунараў на чале організацыйнага цэнтру! Далей: цяперашнія нашы колгасныя вёскі ператворацца ў гнёзды-аддзяленьня комуны! У гнёздах мы пабудуем фабрыкі, заводы, комбінаты!

Гарчак. Зусім з глузду зьехаў чалавек!

Дзевясіл (*крычыць*). Не перапыняй! Я прапаную адчыніць дзьверы комуны для ўсяго раёну! Хай усе сяляне запішуцца ў комуну! Правільная організацыя працы дасьць нам экономію ў дзесяць тысяч рабочых рук, якія мы можам кінуць на будаўніцтва гораду, і наш глухі куток яшчэ да канца пяцігодкі ператворыцца ў Аграрны

горад Карла Лібкнэхта, у Аграгігант-комуну з шосэйнымі дарогамі, з фабрыкамі, з заводамі, паркамі, садамі, клюбамі, сталовымі!

(*Моладзь наэлектрызавалася*).

Крыкі. Няхай жыве Аграрны горад! Аграгігант Карла Лібкнэхта!

(*Воплескі*).

Банкуз. Хлопцы! Што вы, як дзеці якія, загалдзелі, вушы разьвесілі! Думаць трэба!

Ганна. Таварышы! Чаму вы пляскаеце? Гэта-ж недарэчнасьць!

Наважын. Проект Дзевясіла—гэта самая крайняя ступень левага загібу! Гэта поўная капітуляцыя Дзевясіла перад цяжкасьцямі колектывізацыі! Так, так! Ты спалохаўся і таму пачаў марыць—адразу́ пераскокнуць у соцыялістычны рай! Ты адарваўся ад нашай рэальнай практыкі! Аграрныя гарады—проблема далёкай будучыні. А зараз мы будуем фундамант соцыялізму і можа быць фундамант будучых аграрных гарадоў!

Гарчак. Таварышы, не захапляйцеся Дзевясілаўскім проектам! Гэта проект чалавека, які зьвіхнуўся! Ён прапануе зрабіць шалёную спробу над нашай комунай! Ён крычыць—гані ўсіх у комуну! Ты хочаш, Дзевясіл, каб учарайшыя дробныя гаспадары адразу зрабіліся комунарамі! Адразу перагопнулі ў соцыялізм!

Дзевясіл. Таварышы! гэта скурніцтва! Мы ім, малаверам, дакажам!

Гарчак. Таварышы! змагайцеся за колгасы!

Дзевясіл. Хлопцы! Заклікаю вас у бой за соцыялістычны горад! Мы ім пакажам! Мы ім!.. Мы! Мы!..

Гарчак. Што ты мыкаеш?

Абраз 22

Ноч. Двор комуны. Вышка з маленькім дахам з званом, ад якога вісіць вяроўка. Задыхаўшыся ,бяжыць Паўлючок. Саламяныя лахманы разьвяваюцца. Узьбег на вышку, схапіў вяроўку, б'е трывогу—Бам!—бам! бам!

Паўлючок (*крычыць*). Ратуйце! Ратуйце! Ратуйце Гарчака! Рату-уйце!

(*Бам! бам! бам! Бяжыць брыгада вартавых*).

Крыкі. Што такое! Што такое! Хто звоніць? Нейкае пудзіла!

Паўлючок. Ратуйце Гарчака! (*Бам! бам! бам*)!

(*Раптам здалёку адзін за другім грымнулі два стрэлы. Паўлючок зьбягае ўніз, крычыць, не памятаючы сябе*).

Забілі Гарчака! Забілі! Лавеце злачынцаў! Хутчэй! Яны там у садзе! Хутчэй! Аяяй! Забілі Гарчака.

Варта бяжыць, бягуць людзі. Крык, шум. Усе бягуць у сад, зьнікаюць у цьме. Некалькі стрэлаў. Крыкі—лаві! Хапай! Забягай! наперарэз! Во яны! трымай іх! Здавайцеся злодзеі).

Абраз 23

Гарчак ляжыць на канапе. Белая кашуля акрываўлена. Вочы закрыты. У пакой забягаюць людзі.

Галасы. Ці жыў ён?

Аяяяяй! Што гэта здарылася?

Бяжэце па доктара!

Злавілі! Вядуць іх!

(*Брыгада вартавых уваходзіць. У пакой уводзяць двух чалавек. Гарчак адкрыў вочы. Паўза*).

Гарчак (*ціха*). Хто гэта?.. Падвядзеце іх бліжэй. (*Углядзеўся*). Куранега!..

Куранега (*узмахнуў рукамі*). Прабачай, Гарчак!

Гарчак. Дрэнна на мушку ўзялі... Жыў... Хацелі забіць Гарчака?..

Дурныя. Мільёны Гарчакоў будуюць саюз... Усіх не пераб'яцё.

Акт IV

Абраз 24

Гарчак (*у тэлефон*). Хутчэй выяжджайце на вёску. Растлумачвайце сялянам! Зрабеце ўсё, каб толькі не сарвалася падрыхтоўка да сяўбы!

Голас (*у тэлефон*). У Глухіх Дварох неспакойна. Колгасьнікі бунтуюцца. Уночы бабы разламалі вароты хлява і вывелі пятнаццаць кароў.

Дзевясіл (*у тэлефон*). Што? Што? Што такое?!

Голас. Хутары Красуліны Балоты забралі 12 коняй. Падаюць заявы аб выхадзе.

Дзевясіл. Глухія Двары! Сельсавет! Хто? Старшыня? Што робіць у вас міліцыя? Гэта-ж анархія! Не дазваляйце забіраць коняй. Ня прымайце заяў.

Голас. Нічога зрабіць ня можам.

Дзевясіл. Арыштоўвайце.

Голас. Баб?

Дзевясіл. Што бабы за цацы? такія Яны будуць хавацца за сваю цемнату ды рабіць контррэволюцыю.

Голас. У Сінім Узгор'і і Зялёным Ручаі распаліся колгасы. Колгасьнікі разабралі абагуленую жывёлу.

Дзевясіл. Праклятыя хутары! Сельсавет! Старшыня! Што ў цябе робіцца? Я прыцягну цябе да адказнасьці за гэтакае галавацяпства!

Голас. Нічога зрабіць ня можам.

Дзевясіл (*Залешчыку*). Што рабіць?

Залешчык (*усьміхнуўшыся*) Стыхія. Што можна зрабіць з стыхіяй?

Гарчак. Колгас Чырвоны Золак! Што ў вас?

Мікола (*у тэлефон*). Спакойна. Ніводзін з колгасьнікаў ня вышаў. Брыгада цесьляроў будуе вялікі дом і хлеў для жывёлы.

Гарчак. Малайцы! Колгас Карла Маркса! Што ў вас?

Голас. Брыгады будуюпь хлявы, сталовую і клюб. Брыгады рыхтуюцца да сяўбы, сартуюць насеньне, папраўляюць інвэнтар.

Гарчак. Каля вас развальваюцца колгасы на хутарох. Выяжджайце брыгадай туды. Паглядзеце, што за прычына. Мусіць кулацкая агітацыя! Не дапусьцеце каб расьцяглі адсартаванае насеньне.

Голас. Добра.

Дзевясіл (*у страшэнным абурэньні*). Зайцавы загоны! Сіняе ўзгор'е. Красуліны Балоты! Сукіны дзеці! Вы зрываеце нам суцэльную колектывізацыю! Вы зрываеце вясновую сяўбу! Вы зрываеце нам плян! Я з міліцыяй зараз прыеду да вас! Я навяду ў вас парадак!

Гарчак. Колгас Маяк Соцыялізму!

Голас. Слухаем.

Гарчак. Ня зьніжайце тэмпаў падрыхтоўкі да сяўбы.

Голас. Ня зьніжаем. Заключылі соцспаборніцтва з колгасам Чырвоны Золак—за семнаццаць дзён скончыць сяўбу. Павялічыць яравы клін на 12...

Гарчак. Як у вас?

Голас. Добра.

Гарчак. Каля вас колгас Пролетарская Рэспубліка. Памажэце ім. Там слабае праўленьне. Дрэнна з арганізацыяй працы.

Голас. Наша брыгада ўжо там.

Абраз 25

У пакой Гарачка гураганам убягае Дзевясіл.

Дзевясіл. Гарчак! Што рабіць! Развальваюцца! Развальваюцца!

Гарчак. Што?

Дзевясіл. На хутарох колгасы! Мае колгасы!

Гарчак. Ты сёньнешніх газэт ня чытаў?

Дзевясіл. Мне цяпер не да газэт.

Гарчак (*дае газэту*). Прачытай, тут пра цябе напісана.

Дзевясіл. Пра мяне! (*Пачынае чытаць з хваляваньнем. Гарчак моўчкі спадылба глядзіць на яго, курыць люльку. Скончыўшы чытаць, бегае як шалёны, хапаецца за галаву, крычыць*). Так! Гэта Сталін тут пра мяне напісаў у „Правде"! Гэта я загадваў „камандаваць соцыялістычным боем"! Няўжо-ж нам, бальшавікам, плясьціся ў хвасьце адсталай масы?! А дзе-ж нашы бальшавіцкія тэмпы! Калі селянін па свайму шкурніцтву, па цемнаце сваёй ня хоча ісьці ў колгас,—дык мы будзем патураць гэтаму?! Не! Мы павінны павесьці яго за сабою!

Гарчак. Правільна! І павядзем. Але ня гвалтам.

Дзевясіл. Доктар хвораму дзіцяці гвалтам дае лякарства! Хай сабе яно пакрычыць, а потым, як падрасьце, адчуе яго карысьць.

Гарчак. Гэты артыкул—удар па дзевясілаўскім галавацяпстве!

Дзевясіл. Калі-б Сталін пабыў у нашай скуры, ён не напісаў-бы такога артыкулу! Які лямант падымуць нашы ворагі!—Ага! Бальшавікі адступаюць! Ага!

Гарчак. Хутка яны ўбачаць, што мы не адступаем, а наступаем па ўсім фронце колектывізацыі! Толькі не дзевясілаўскімі мэтодамі!

Дзевясіл. А якімі?

Гарчак. Аказваецца не адзін ты ў нас, Дзевясіл! Дзевясілаў у Саюзе шмат. Цяпер вы будзеце расплачвацца за ўсе шкоды...

Дзевясіл. Тое, што я гвалтам заганяў у колгасы гэтыя праклятыя прышчэпаўскія хутары—гэта шкода?

(*Уваходзяць Наважын і Сіўкоў*).

Наважын (*хутка*). Чыталі?

Гарчак. Чыталі.

Наважын. Трэба зараз-жа склікаць сход комунараў...

Гарчак. Я загадваў ужо. Зараз пазвоняць.

Сіўкоў. Трэба ў вашай комуне стварыць брыгаду з самых лепшых комунараў і з імі зрабіць агляд усіх колгасаў у раёне.

Наважын. Трэба пачаць кампанію за аздараўленьне колгасаў.

Гарчак. Правільна.

Наважын. А самае галоўнае, каб гэтыя брыгады на кожным кроку растлумачвалі артыкул т. Сталіна. Не дапусьціць кулацкай агітацыі і скажэньня сэнсу артыкула.

Гарчак. Правільна.

Наважын (*Дзевясілу*). Прызнаеш свае памылкі?

Дзевясіл. Адзін Дзевясіл вінаваты!

Наважын. Мы таксама вінаваты. У тым, што ў свой час ня спыніл ўсіх тваіх загібаў.

Гарчак. Мы папярэджвалі цябе шмат разоў, але ты бюрократычна ўсё рабіў па свойму!

Наважын. Я цяпер ведаю, хто ты, таварыш Дзевясіл. Ты—трацкіст.

Дзевясіл. Я!

Наважын. Пасьлядоўны трацкіст! І вось адкуль ідуць твае загібы Цябе трэба было даўно з партыі вычысьціць. Ты зрабіў нам такую шкоду, як самы люты клясавы вораг!

Дзевясіл (*распаліўшыся*). Што-ж я зрабіў такое? Што-дзень я быў, як заведзены гадзіньнік! Што-дзень я кіпеў, гарэў, хваляваўся! Пісаў рэзолюцыі, пасядаў, пастанаўляў, падпісваў, загадваў, адміністраваў, гнаў у колгасы! У імя чаго гнаў? У імя соцыялізму, у імя суцэльнай колектывізацыі!

Гарчак. У імя гэтага ты загадаў абагуліць курэй!

Дзевясіл. Ну, дык што? Які-ж гэта будзе колгас, калі мы пакінем колгасьніку карову, сьвіньню, курэй, гародзік, садзік?

Наважын. Гэта будзе сельскагаспадарчая арцель.

Дзевясіл. Дык гэтым-жа мы пакідаем у колгасьніка ўласьніцтва, якое ўсё адно прыдзецца нам гвалтам вытрасаць з чалавека! Не! Калі ўжо колгас,—дык каб усё было абагулена! Да ніткі.

Сіўкоў. Гэта-ж нейкі гарматны соцыялізм у цябе, таварыш Дзевясіл! Ты хацеў-бы выстраіць палкі з гарматамі і гнаць сялян да соцыялізму!.. Ты забыўся, што сто мільёнаў сялян з рэвольвэрам у колгас не загоніш! Ты праспаў змычку рабочай клясы з сялянствам!

Дзевясіл. Але-што рабіць? Што рабіць? Уся мая работа прахам пашла!

Наважын. Колгасы, організаваныя правільнай політыкай, не распадуцца.

Гарчак. Чаму не разваліліся колгасы Чырвоны Золак, Маяк соцыялізму, Карла Маркса?

Дзевясіл. Гэтыя колгасы не на хутарох.

Гарчак. Але ў гэтых колгасах ёсьць хутаране.

Сіўкоў. Таварышы, зараз-жа трэба ўзяцца за выпраўленьне памылак. У першую чаргу ачысьціць хутары ад кулакоў. Колькі разоў я дамагаўся гэтага, але таварыш Дзевясіл і пальцам не пашавяліў.

Дзевясіл. Чаму-ж вы ня ўзялі на сябе гэтую справу?

Сіўкоў. Я зрабіў усё, што мог. Я дабіўся пастановы беднаты і сялянскіх сходаў аб высяленьні кулакоў. А вы нічога не зрабілі. Вы махалі рукою,—кулакі ня дзе дзенуцца!

Дзевясіл. Мне ня было часу!

Гарчак. Ён займаўся пабудовай аграрнага гораду!

Сіўкоў. Развал колгасаў—гэта чыя, калі ня кулацкая рука?

(*Пачуўся звон*).

Гарчак. Ідзем на сход комунараў.

Дзевясіл. Таварышы, я не пайду на сход.

Наважын. Чаму?

Дзевясіл. Што-ж мне там, каяцца? Прызнаваць памылкі? Біцца галавою аб сьцяну? Не магу я гэта!

Наважын. Твая справа (*ідуць*).

Дзевясіл. Таварышы, пачакайце... Аб чым вы там будзеце гаварыць?

Наважын. А як-ты думаеш?

Дзевясіл. Вы будзеце біць Дзевясіла?

Наважын. Дзевясілаўшчыну.

Дзевясіл. Мне ўсё адно. Я цяпер ня веру ні ў вошта! Усё гіне! Усё разваливаецца!

Наважын. Значыць нам з табою не па дарозе.

Сіўкоў. Мы будзем змагацца за соцыялізм без цябе.

Абраз 26

Блізіцца вясна. Колгас Чырвоны Золак абрастае будовамі. Ужо зусім скончаны хлеў. Брыгада цесьляроў будуе дом. Стукаюць тапары. Ідзе падрыхтоўка да сяўбы. Гудзе трыер. Брыгада сартуе насеньне.

Цесьляры сьпяваюць:

Стукаем, грукаем!
У колгасе дом будуем.
Дом новы!
Дом сасновы!
Стукаем! грукаем!
Весялей працуй брыгада!
Хутка будзе дом гатовы—
Дом новы!
Дом сасновы!

(*Ідуць Зыль, Дзядок. Спыніліся. Галовы задралі ўгару*).

Зыль і Дзядок. Здарова, хлопцы!
Усе. А! Здарова, таварышы!
Зыль. Вялікую работу зрабілі!
Мікола. Не зрабілі яшчэ. Канчаем.
Дзядок. А дзе-ж тут мой хлапец?
Мікола. Васіль? Зараз будзе.
Зыль. Ну прышлі, падзівіцца...
Дзядок. Ого! Гэта, братка, гмах!..
Краўкоў. Дом на чатырнаццаць кватэр!
Дзядок. Ого!
Зыль. А хто ў вас тут за галоўнага?
Краўкоў. Я—брыгадзір.
Дзядок. Ого! Ці добра-ж нашы хлопцы працуюць?
Краўкоў. Добра.
Зыль. Яны-ж дома ня ўмелі цясьлярыць.
Мікола. Тут навучыліся.
Дзядок. А ну, дай нам сякеры. Паможам троху вам.
Зыль. Хай і наша рука тут сьлед пакіне.
Краўкоў. Ну, памажэце, калі ваша такая ласка. А ну хлопцы ўсьцягні бервяно! А ну—другое!

(*Дружна застукалі тапары*).

Васіль (*бяжыць*). Хлопцы! Кулацкі жарабец кусаецца! Ніяк ня справіцца!.. А гэта хто там яшчэ ў вас?.. Бацька.
Дзядок. Я сынок, я! Здароў сынок!
Васіль. Як-жа ты сюды забраўся?
Дзядок. Працую, бач, у вашым колгасе. Во!
Васіль. Ты ў наш колгас уступіў?!
Дзядок. Не, сынок, ня буду хлусіць—ня ўступіў. (*Злазіць за ім* Зыль). Прышлі мы, значыць, паглядзець, што ў вас у колгасе робіцца.

(*Ідуць Гарчак, Ганна, Банкуз*).

Гарчак. Здарова хлопцы!

Усе. Добры дзень! Таварыш Гарчак! даўно вас чакалі!

(*Кінулі працазаць. Акружылі Гарчака*).

Гарчак. Ну вось прышлі да вас. Толькі ня ў госьці, хлопцы. Наша брыгада аглядае ўсе колгасы па раёну.

Ганна. Мы, таварышы, не на рэвізію прышлі да вас, а толькі паглядзець, як у вас організацыя працы...

Банкуз. Калі вы ў чым заблыталіся, дык мы разблытаем.

Галасы. Калі ласка, калі ласка! Мы рады.

Краўкоў. Організацыя працы ў нас добрая. Хлопцы-во як працуюць. Во якую махіну выводзім!

Гарчак (*аглядзеўшы дом*). Здорава! Калі думаеце скончыць?

Краўкоў. Да выхаду ў поле хочам перабрацца.

Гарчак. Гэта цяжка будзе. Наўрад.

Краўкоў. Калі паднапяцца...

Мікола. Скончым! Тут нам ужо глупства засталося: дах, падлогу. столь, вокны, дзьверы, ну і печы, і ўсё.

Гарчак. Гэта больш за тое, што вы зрабілі. Ну, хлопцы, вы сабе, працуйце, а мы з Краўковым агледзім, што ў вас і як. А потым я вам скажу.

Краўкоў. Перш-на-перш зірнем на нашы хлявы.

Зыль. Дазвольце-ж і нам з вамі аглядаць.

Гарчак. А, і вы сюды прышлі!

Дзядок. А як-жа. Трэба-ж і нам падзівіцца... (*Ідуць*).

Мікола. Ну, айда, хлопцы, за работу (*Зноў пачалася дружная праца*).

(*Здалёку ідуць дзяўчаты-хутаранкі. Адзеты па-сьвятачнаму. Пяюць раньнія вясновыя песьні*:

Вясна красна на дварэ!
Гэй, вясна красна на дварэ!
Вясна красна на ўвесь сьвет!

Дзяўчаты выходзяць на сцэну, прытупваючы, пяюць).

1-я дзяўчына (*пяе*). Жоўтае масьліца,
Белы сыр,
Пабіў мяне, мамачка,
Сукін сын!

2-я дзяўчына. Дачушка прывыкай!
прывыкай!
Праз малую буконачку
ўцікай!
уцікай!

1-я дзяўчына. А чорт яго, мамачка,
уцячэ!
Як дагоніць, галовачку
натаўчэ!
натаўчэ!

Алесь. Уступай у наш колгас,—ня будзе ён табе галаву таўчы.
1-я дзяўчына. Ой, хлопчыкі! Што-ж вы працуеце? Сёньня-ж нядзеля!
Алесь. У нас нядзеля ў панядзелак.
2-я дзяўчына. Кіньце працаваць, хадзем з намі шпацыраваць.
Мікола. Не, няма часу.
Алесь. Дзяўчаткі! Падавайце заявы ў колгас. У нас дзяўчат не хапае.
1-я дзяўчына. Раней трэба ў вас закахацца, а тады ў колгас запісацца.
Алесъ. Дык чаму-ж?
2-я дзяўчына. Ідзеце з намі гуляць.
Алесь. Не. Зараз не.

(*Дзеўкі пашлі, сьпяваючы*):

На гарэ явар бел, кудраў
Бел, кудраў
А каб нашых хлопцаў
Чорт пабраў!
Чорт пабраў!

Алесь. Мікола! Ня вытрымаю! Пайду трохі пагуляю з дзяўчатамі.
Мікола. Што з табою такое?
Алесь. Дужа добрыя дзяўчаты!
Мікола. Не, браток, дысцыпліна. Як скончыш працу.

(*Ідзе Аўгеня. Б'е ў адрэзак рэйкі*).

Аўгеня (*крычыць*). Гэй, хлопцы! Перапынак! Сьнедаць прынесьлі Хутчэй! Кідай працу!

(*Дзьве дзяўчыны нясуць чыгунок крупніку і малако. Хлопцы садзяцца на бярвеньні, пачынаюць сьнедаць. З гармонікам ідзе Мікіта*).!

Мікіта. Хлеб соль, хлопцы! Дзеўкі пашлі туды?
Мікола. Туды.
Алесь. Растуды... (*схамянуўся*).

(*Мікіта пашоў быў, але вярнуўся*).

Мікіта. А што, хлопцы, заяву маю разглядалі?
Мікола. Разглядалі.
Мікіта. Ну?
Мікола. Пастанавілі—не разглядаць.
Мікіта. Чаму?
Мікола. Па-першае—мы абы-каго ня прымаем.
Мікіта. Я-ж не абы-хто. Я—Мікіта Зухаваты.
Алесь. Ты быў падкулачнік.
Васіль. Памятаеш, якія ты пра нас прыпеўкі сьпяваў?
Мікола. Быў ты ў кулакоў на вяровачцы?
Мікіта. Быў грэх. Прызнаю памылкі. Іграў я ў іх на вясельлі, на хрэзьбінах. Ну, выпіваў з імі. А цяпер, вы-ж ведаеце, я адышоў ад іх.

Алесь. А ці добры ты будзеш колгасьнік?
Мікіта. Такога колгасьніка, як я, шукаць будзеце, ня знойдзеце.
Голас. А чаму ты хочаш у наш колгас?
Мікіта. Падабаецца мне дужа, што хлопцы дружныя, гарачыя і працуеце, як чэрці! Ну, калі мяне возьмеце—у нас чорт ведае што будзе.
Алесь. Вось гэтага мы і баімся.
Васіль. А прыпеўкі?
Мікіта. Я пра наш колгас буду сьпяваць геройскія прыпеўкі!
Мікола. Дык як, хлопцы?
Алесь. Я думаю, калі правільна накіраваць яго здольнасьці, дык ён можа прынесьці нам карысьць.
Голас. Увечары ён будзе іграць, да нас будуць прыходзіць з вёскі і з хутароў хлопцы...
Алесь. І дзяўчаты...
Мікіта. Дзяўчат у нас будзе прорва!
Мікола. Хлопцы, прапаную покуль што прыняць Мікіту ўмоўна і добра прыгледзецца да яго.
Мікіта. Хлопцы! Я сам бядняцкі сын. Што я маю? Маці старую, кабылу ды карову. Забірай гэты жаночы пэрсонал у колгас ды мяне ў прыдачу.
Галасы. Прыняць умоўна.
Мікола. Ну, глядзі, новы колгасьнік! Спачатку будзеш ты ў нас пад наглядам. Калі што якое,—вычысьцім.
Мікіта. Сябе апраўдаю—ня сумневайцеся.
(*Ідзе Дзядок і Зыль*).
Дзядок. Ну, малайцы хлопцы!
Зыль. Добра даглядаеце жывёлу!
Дзядок. Гэтыя два кулацкія жарабцы, як агонь!
Зыль. Добрыя жарабцы!
Мікола. А што гаварыў Гарчак?
Зыль. Так, нічога не гаварыў. Запісваў сабе ў кніжачку.
Дзядок. Пашоў кнігі вашы глядзець.
Васіль. І Гарчаку наш колгас спадабаецца. Во наш колгас—во!
Дзядок. Бачую я, добра хлопцы будуць жыць.
Зыль. Калі добра працуюць, дык і жыць будуць добра.
Дзядок. Цяпер, Васілёк, скажу я табе праўду, чаго мы прышлі... Тады пасварыліся мы з табою... Выгнаў я цябе...
Васіль. Ну, бацька, няма чаго ўспамінаць.
Дзядок. Не, ведаю, што пакрыўдзіў... А цяпер скажу я табе... І ў нас-жа на хутарох на Зайцавых Загонах заклаўся колгас!
Васіль. Як! Калі?
Дзядок. А як-жа. Гэтымі днямі. Прыходзіў да нас Гарчак з брыгады...
Зыль. Доўга яны мучыліся з намі. Бо мы ані блізка.
Дзядок. І слухаць не хацелі. Дужа нас Дзевясіл напужаў.

Зыль. Ну, потым растлумачылі нам пра арцель. Думалі людзі, думалі..
Дзядок. Дзевяць двароў запісаліся.
Васіль. А ты, бацька?
Дзядок. А як-жа. І я, сынок, запісаўся і Зыль.
Васіль. Ну, бацька, я рад! (*Трасе яго за руку*).
Дзядок. Дык гэта-ж я прышоў да цябе... Можа ты пяройдзеш у наш колгас?.. Разам-бы жылі...
Васіль. Не. Я тут застануся... Можа ты да нас?
Дзядок. Не. Не спасобна мне... Мяне там, бач, у праўленьне абралі. Нясу адказнасьць.
Васіль. Дык і я-ж тут адказваю за ўсю нашу жывёлу ..
Дзядок. Ну, як хочаш, сынок.

(*Ідуць Гарчак, Ганна, Банкуз, Краўкоў*).

Гарчак. Ну, хлопцы, усё агледзелі. З цягавою сілай у вас слаба З сяўбою туга прыдзецца.
Мікола. Мы набудзем яшчэ з пару коняй.
Гарчак. Мала. Тры пары ня меней. Але вы, хлопцы, не бядуйце. Калі ня ўдасца вам атрымаць трактар, дык мы на сяўбу прышлем свой.
Мікола. Мы на вас спадзяемся. Ну як вам наш колгас спадабаўся?
Гарчак. Ня буду вас, хлопцы, выхваляць. Ня ўсё ў вас добра. Дрэнна гаспадарыце, хлопцы.
Мікола. Дрэнна? (*Хлопцы повесілі насы*).
Гарчак. З такім гаспадараньнем можна ў трубу вылецець.
Краўкоў. Мы дрэнна гаспадарым! Ну, гэта ты ўжо выбачай, жартуеш!
Гарчак. Сур'ёзна.
Краўкоў. Што-ж у нас не ў парадку?
Васіль. Можа жывёлу дрэнна даглядаем?
Ганна. Не, добра.
Гарчак. За жывёлу вы—малайцы.
Мікола (*з трывогай Алесю*). Можа ты з фінансамі зашыўся?
Алесь. Ня можа быць! За кожнай капейкай глядзеў!
Гарчак. Гэта ў вас добра.
Краўкоў. Ты, таварыш Гарчак, паніку на хлопцаў наводзіш. Хлопцы-ж ужо так працуюць, не шкадуючы сілы!
Гарчак. Малайцы!
Краўкоў. Хлеў збудавалі добра? Дом будуем? На складах у нас добра? Ачыстку насеньня амаль скончылі? Інвэнтар паправілі?
Гарчак. Гэта ўсё у вас добра...
Краўкоў. Што-ж дрэнна?
Гарчак. Організацыя працы!
Мікола. Мы не організавана працуем?
Гарчак. Як у вас вядзецца вучот працы?

Мікола. Мы запісваем кожны дзень, што зрабіла брыгада.

Гарчак. Кожнаму завядзеце асобны рахунак і запісвайце, колькі хто з вас зрабіў.

Ганна. Вам трэба выпрацаваць нормы працы.

Банкуз. Для кожнай работы ўстанавіць працадні.

Гарчак. Краўкоў! Ты быў комунар. Ты-ж ведаў, як у нас была арганізавана праца.

Краўкоў. Я быў сказаў хлопцам, а яны кажуць: што тут запісваць? Ня сябе-ж працуем!

Гарчак. Э, так ня можна. Вы-ж за кожную працу будзеце разьліч-вацца ўраджаем.

Банкуз. Тут, хлопцы, трэба самы строгі вучот.

Гарчак. І яшчэ галоўнае пераходзьце на зьдзельшчыну. Хто з вас, болей зробіць, той болей і заробіць. Калі гэта вы ўлядзяцё дык ваш колгас будзе моцны, і ніякая сіла яго не разваліць!

Мікола. Як-жа нам выпрацаваць гэтыя нормы... працадні. Мы-ж ня ведаем.

Гарчак. А гэта ўжо мы вам поможам. Адзін з нас застанецца ў вас на некалькі дзён. Пакажа вам. Каго хочаце: Ганну ці Банкуза?

Галасы. Ганну! Ганну!

Алесь. У нас дзяўчат не хапае!

Ганна. Бачу я, ты дзяўчат любіш... Ну, пачакай трошкі. Во, як наладзім працу...

Васіль (*Алесю*). Што, зьеў?

Ганна. Прыду я да вас у госьці,—во, тады глядзі на мяне, як на дзяўчыну.

Мікола. Правільна.

Гарчак. Ну, у нашай брыгадзе засталося толькі два чалавекі—я ды Банкуз. Там-сям у колгасах раскідалі па чалавечку—памагчы наладзіць працу.

Галасы. Ну, як колгасы?

Гарчак. Адсыпалася народу досыць. Але цяпер зноў пачынаецца прыліў у колгасы. Нават ёсьць зрух і на хутарох.

Васіль. У нас сягоньня прыбавілася на аднаго.

Мікола. Таварыш Гарчак! А як усё-ж такі наш колгас?.. Ніштo сабе? А?

Гарчак (*усьміхнуўшыся*). Хочацца табе дужа, каб я пахваліў твой колгас! Дык вось што, хлопцы. Калі вы правільна наладзіце арганізацыю працы,—дык Чырвоны Золак будзе самы лепшы колгас у раёне! (*Воплескі*). А потым пяройдзеце на статут комуны.

Мікола. У комуне астаноўка!

Абраз 27

Вясна. Неба ружовае ад зары. На фоне неба зьяўляюцца цёмныя сілуэты кароў. дуць. За імі ідзе і трубіць пастух. Пашлі. Зьяўляецца сялянка. Сьпявае смутлівую песьню:

Ой, ты, зара-ж мая, ты зараначка!
Чаго раненька загараешся!

Раптам пачуліся другія галасы. Сьвежыя галасы моладзі. Сьпяваюць новую песьню—

... Хутчэй, зара, займіся!..

Бадзёрая песьня расьце і зусім заглушае смутлівую песьню.

На фоне неба зьяўляецца трактар. За ім ідуць коні з плугамі. з баронамі...

Натоўп колгасьнікаў з сьцягамі, з плякатамі, з вілamі, матыкамі, з рыдлёўкамі, сьпяваючы песьню, вышаў у поле сьвяткаваць прыход Бальшавіцкай вясны...

(Канец)

13/I-32.

С. Нортман

Пра машыны і „дэмпінг“

У порт ідуць
чарадой караблі;
На іх сьцягі
ня чырваньню рэюць.
Машыны з-за межаў
яны прывязьлі,
Сьцяг чужы
трэпле вецер на рэях.

Ходзяць хвалі
малыя ў парту,
Хістаюць масыў параходаў...
Маракі Джон і Артур
Успамінаюць свае пераходы.

Лябёдкі і краны працуюць,
Толькі чутно: „майна“ ды „віра“.
Жыцьцё ў нашым краі пульсуе,
Нібы кроў у артэрыях-жылах.

Падганяюць састаў паравозы,
Машыны для фабрык,
колгасаў бяруць.
І саставы па краі развозяць...
Вагоны па рэйках
грукочуць...
бягуць...

У іх машыны да часу купляем,
Будуем свае заводы.
Залежнасьць ад іх мінае
З кожным месяцам, годам.

З усіх краін—
Усходу, Захаду,
Ад берагоў Італіі
і да Канады.
Ад Швэцыі
да цёплай Афрыкі,
Прывозяць караблі
машыны і прылады,

Усе гандлююць
сёньня з намі,
Прадаюць машыны
Савецкаму краю.
Тоўсты „сам“ у мяккай панаме
Аўтомабілі, комбайны раіць.

З намі сёньня гандлююць лёрды,
За сьпіною-ж трымаюць нажы.
За ухмылкай адкормленых мордаў,
Адчуваецца,—вораг дрыжыць.

Ён гандлюе, каб збыць тавары,
Падрыхтоўку-ж вядзе да вайны:
Днём і ноччу заўсёды марыць,
Сьпіць і бачыць наш край у агні.

Мы купляем,
бо трэба купіць.
У нас будоўля ідзе ва ўсю шыр,
У нас будоўля
і праца кіпіць,
Хоць там вораг
і точыць нажы.

Мы-ж мацнеем,
будуючы край—
Гэта лепшы
адказ інтэрвэнтам
Нам ня страшны
налёты зграй
Ў залатых завіткох эпалетаў.

Прадаем стромкі лес і хлеб,
Каб за гэта машыны здабыць,
А там, вораг ад злосьці сьлепа
Пра „дэмпіг“ савецкі крычыць.

Выліваюць памыі газэты,
Пасяджэньні ідуць чарадой,
Скавычуць пра „дэмпінг“
у салёнах-клёзэтах,
Ад злосьці трасуць барадой.

Хоць ад злосьці
й зьмяняюцца твары,
Нам байкот абвясьціць
жадаюць,

На іх рынках нашы тавары
Усё-ж купляюць...
купляюць...
купляюць...

Гандляваць з намі йдуць,
Мы-ж купляем у іх машыны,
І плывуць караблі
і плывуць:
Адвозяць тавары на рынак.
І стаяць караблі на рэйдах.
Вецер сьцяг наш чырвоны
палошчыць
На туманнай, далёкай
Тэмзе.
Сьцягі чырваньню рэюць
Чырвоных, як кроў,
палотнішчаў.

* * *

У порт ідуць
чарадой караблі,
На іх сьцягі
Ня чырваньню рэюць.
Машыны з-за межаў
яны прывязьлі.

Сьцяг чужы
трэпле вецер на рэях.

Лябёдкі і краны працуюць,
Толькі чутно: „майна“ ды „віра“.
Тут жыцьцё
у нашым краі пульсуе,
Нібы кроў
у артэрыях-жылах.

15/XII—31 г.
Зав. імя Варашылава.

З. Бядуля

Язэп Крушынскі

КНІГА ДРУГАЯ [1])

15. Сьнег

У той восеньскі дзень з каламуці набухлых воблакаў нізіўся лапцяваты вільготны сьнег. Ледзь прымосьціцца дзе дробным пер'ем да крушні, глебы, даху ці плоту і зараз-жа расплывецца. На палёх і дарогах квасілася шэрае цеста клеістай гразі. У заімжавелым полі крычалі, скардзіліся вароны. Над хмызьнякамі і напоенымі вільгаццю лагчынамі яны з устрывожанай рупнасьцю пісалі крыльлямі шырокія кругі. А там, дзе яны апускаліся на зябленыя шнуры, іхні колер скрадвалі шэрыя грудзістыя гоні.

Па расхлябанай дарозе хлюпала фурманка. На возе было двое—мужчына і жанчына. Абодвы ў брэзэнтавых плашчох з капюшонамі на галовах. Яны стараліся схавацца ад вільготнага ветру і сьнежнага хлюпату, але іх усёроўна пранізвала сьцюжа. Твары былі чырвоныя і набраклыя.

— Вам ня холадна, цётка Крушынская?—часта чуваць быў прыглушаны голас.

— Не... Далёка да Менску?

— Яшчэ гадзіны дзьве язды.

І ў горадзе няпрытул.

Сьнег прыстае да шыбаў вакон мутнымі кроплямі, расьцякаецца рагамі па шкле.

Поэт Антон Цярэшка толькі што прышоў на працу. Якраз пасьпеў на гарбату.

Ля ўваходу ў трохпавярховую камяніцу была прыбіта да сьцяны невялічкая шыльда. На ёй красаваліся залатыя літары на чорным мармуры.

Інстытут.....
.....

Рэшта ўсё было залеплена вільготным сьнегам.

Было дванаццаць гадзін дня.

У вялізарным пакоі змрочна і нудна. Цярэшка зірнуў праз вакно трэцяга паверху. Від, нібы з самалёта, які спускаецца на зямлю

---

[1]) Гл. „Узвышша" №№ 1, 2, 3, 4, 10, 1931 г.

мутнаватыя квадраты дахаў. Шахматнымі клеткамі яны драбнеюць у аддаленьні. За імі высокія фабрычныя коміны пыхкаюць рыжым і сінім дымам. Насупроць праз вуліцу Цярэшка бачыць з вакна белыя шкілеты рыштаваньняў вакол двух новых будынкаў, незаконченых за сяголетні сэзон.

Ад іх улетку многа пылу. Так на ўсіх вуліцах. Цярэшка і большасьць прафэсараў Інстытуту ў гарачы час летняга будаваньня ўцякаюць на поўдзень. Так кожнае лета. Ластаўкі аблепліваюць вясковыя стрэхі, а інстытутчыкі—пляжы Чорнага мора і вышыні Каўказкіх гор. Тым часам Менск адбудоўваецца. Кожны сэзон—нямала новых гмахаў, новых фабрык, гарадкоў, рабочых пасёлкаў на акраінах.

Сам Цярэшка можа па-свойму, на сваясаблівы лад рабіць падлічэньні будаўніцтва ў Менску за апошнія некалькі год.

Ён у Кіславодзку—тут каналізацыя гораду і новы мост.

Ён на крымскім узьбярэжжы Чорнага мора—тут універсытэцкі гарадок.

Ён на Волзе на параходзе—тут трамвай.

І гэтак далей, і гэтак далей.

Толькі тэхнічныя працаўнікі, канцылярысты і трэцярадныя навуковыя спэцы абыходзяцца бяз курортаў.

Цярэшка мацае пальцамі астылую шклянку гарбаты. Яму ўсё здаецца, што вельмі горача.

Ён-бы і на гэты раз сюды ня прышоў (ніхто над каркам не стаіць), але сягоньня зусім іншы дзень. Сягоньня зьявіліся і тыя вялікія спэцы, якія прыходзяць у Інстытут два разы ў месяц. Ва ўсіх аддзелах нязвычнае для гэтых муроў ажыўленьне.

На сталох габінэтаў садом і гамора портфэляў, капялюхоў, шапак, кніг і рукапісаў з шафаў і шуфляд. Зірне прафэсар у кнігу з нязвычайнай для яго жвавасьцю, дзяўбне пяром у атрамант і...

...Сягоньня будуць выплачваць пэнсію...

Па сходах усіх трох паверхаў туды і сюды вандруюць людзі. Па каменных плітах прафэсарскія ногі дробяць чачотку. Рупатлівыя галасы:

— Прышоў з банку Залескі?

— Бухгальтар ужо выдае?

— Напэўна сягоньня дадуць.

У бухгальтэрыі чарга вучоных. Кожнага новага трактуюць дасьціпнасьцю, анэкдотам.

Стаў у чаргу і Цярэшка.

— Чаму-ж гэта Цярэшка сягоньня ня ў добрым гуморы?

Так пытаецца адзін з чорнай бародкай у суседа па чарзе—у чалавечка ў акулярах, які па гусінаму нахіляе галаву.

— Што?—і наставіў левае вуха (ён глухаваты).

— Ця-рэш-ка неш-та ся-гоньня сум-ны.

— А-а-а! Адкуль я магу ведаць?

Чалавек з чорнай бародкай кпліва:

— Вы-ж яго крытык.

— Што? Што?—глухаваты нахіляе вуха і вінавата ўсьміхаецца.

— Вы-ж я-го кры-тык, та-ва-рыш Гай-дач! Вы-ж ка-ля яго жы-ві-це-ся! Усё я-го пад-на-гот-нае па-він-ны ве-даць!

Вакол лёганькія сьмяшкі.

Гайдач сур'ёзна тлумачыць:

— Мабыць у таварыша Цярэшкі сягоньня лірычны настрой. Восень, сьнег і ўсё такое. Ды пры чым тут я? (па гусінаму круціць галавою). Я, як вучоны, адкінуўся ад літаратуры ў апошні час. Цяпер над таварышам Цярэшкай апякуецца паважаны Лявон Карпавіч: піша артыкул да чарговага юбілею Цярэшкі.

Стол бухгальтара Залескага пакуль што пусты. Яшчэ не шалясьціць на ім шырачэзная ведамасьць на пэнсію з доўгімі слупікамі лічбаў і прозьвішчаў. Яшчэ няма з банку бухгальтара. Аднак уся чарга цэліцца вачыма ў стол—у атрамантніцы і ў папельніцу з жоўтымі недакуркамі.

Антон Цярэшка з няцярплівасьцю аглядаецца на дзьверы. З яго ўяўленьня ня выходзіць шэрая бэкеша бухгальтара, яго карыя вочы з бляскам вечнай заклапочанасьці. На твары бухгальтара прытоеная ўсьмешка, нібы ён нешта цікавае ведае ды казаць ня хоча.

Аднак урыўкамі, праз вобраз бухгальтара ў галаву Цярэшкі пракрадваюцца трывожныя думкі. Яны псуюць настрой, моршчаць яго лоб.

У чарзе шэпт:

— Цярэшка сягоньня ў кепскім гуморы.

Звычайная рэч—газэтны артыкул, прамільгнуў чорным корпусным шрыфтам у адным з нумароў „Зьвязды" за подпісам Міколы Ярэмчыка.

Цярэшка выразаў доўгімі канцылярскімі нажніцамі гэты артыкул і палажыў у верхнюю шуфляду свайго пісьмовага стала. Толькі адзін раз прачытаў. Кожны абзац калоў яго шпілечкамі дробных літараў. Кожны радок сьмяяўся з Цярэшкі трыма дзесяткамі маленькіх вочак. Кожнае слова кпіла з яго:

— Ага! Папаўся...

— Падумаеш! Папаўся! Я—Цярэшка, беларускі поэт, а той—Крушынскі... Крэўны? Мала што...

У артыкуле ўся „дзейнасьць" Язэпа Крушынскага. На гэты раз без портрэту вусатага лысага дзядзі, але з кожнага радка глядзіць на чытача жывы Крушынскі.

Ёсьць у артыкуле і пра раён, дзе выкрылі цэлы гнайнік. Некалькі адказных працаўнікоў зьняты з працы. Склад Гайдачанскага сельсавету зьменены.

Папярок дарогі стала нечаканая бяда:

— Як ратаваць Язэпа Крушынскага?

Цярэшка хадзіў „куды трэба“, да каго трэба, намацваў розныя грунты, заходзіў з розных бакоў, сам баяўся, асьцярагаўся. Пакуль што яшчэ нічога не зрабіў.

Некаторыя спачувалі, шкадавалі, жаласьлівымі вачыма паглядалі на яго.

Гэтым і канчалася. Ён-бы можа „згадзіўся-б“ з такім становішчам, але да яго часта прыяжджае Стэфка, жонка Язэпа Крушынскага.

Колькі год таму назад адзін пачынаючы беларускі мастак напісаў на мотыў „Слова аб палку Ігарава“ карціну пад назваю „Плач Яраслаўны“. Ля старога тыну сядзіць чырвонашчокая жанчына ў нацыянальных беларускіх вопратках і плача. Чамусьці гэта жанчына напамінала Цярэшку кожны раз жонку Крушынскага.

Стэфка ў яго часта пытаецца:

— Ну, як?

— Пакуль што нічога яшчэ ня мог зрабіць.

— Вы верыце, што мой Язэп даў атруту нейкім там бандытам, каб коняй труціць?

— Ня веру, але...

Курганішча раскулачылі. Стэфка пакуль што жыве ў адным пакоіку ранейшага дому Крушынскага. Настачка і Мзей, дзеці Крушынскага ад першай жонкі, прыехалі да Цярэшкі. Шмат сварак было ў яго з жонкай аб гэтым самым.

— Клопату з гэтымі дзяцьмі будзе мне, а не табе,—гаварыла яна.

Тады Антон Цярэшка прыжмурыў на яе злосныя вочы і пачаў незнаёмым голасам задаваць ёй запытаньні:

— А сала і масла, вэндліну і каўбасу з Курганішча ты любіла есьці?

— А мануфактуру на вопратку і шоўкавыя панчохі, якія табе Крушынскі прывозіў, ты любіла браць?

— А дача ў Курганішчы табе падабалася?

Цярэшка вылічаў усё.

Яшчэ была бяда са зборнікам вершаў, напісаных у Курганішчы. Як наўмысьне, на гэты раз зборнік хутка папаў у друк ды ўжо набраны. Цярэшка хацеў-бы выкінуць з-пад кожнага верша слова „Курганішча“, але праваронiў карэктуру. У вершах, праўда, нічога страшнага няма. Звычайная лірыка прыроды...

У чарзе Цярэшка аб усім гэтым успамінае.

Лапчасты сьнег пярэсьціць перад вокнамі бухгальтэрыі кавалачкамі падзёртай паперы. Над галовамі чаргі ўецца ў круцёлкі табачны дым. Хударлявая, нэрвовая машыністка кашляе суха і адрывіста. Яна грэбліва круціць губы:

— Ня курэце.

Дзьверы бухгальтэрыі рыпаюць туды і сюды. Усоўваюцца галовы. З адчыненых дзьвярэй пільна цікуюць за бухгальтэрскім сталом заціkаўленыя вочы:

— Залескага няма?

— Няма.

Грукаценьне прыдушаных галасоў. Кожны стараецца гаварыць ціха, але так, каб яго голас чуваць быў.

Пад гэты гул лёгка меркаваць аб розных справах. Цярэшка мяркуе.

...а што рабіць з млынамі? Шкода. Такі млын быў у Курганішчы...

Папраўляе гальштук. Круціць галавою, стараецца вызваліць шыю з цеснага каўняра манішкі.

...хто будаваў, а хто цяпер карыстаецца такім харошым млынам.

Глядзіць застылымі вачыма. Туманіцца перад ім чарга вучоных. З розных куткоў сьвядомасьці ды ўяўленьня высоўваюцца, як зладзеі ў цёмную ноч, затоеныя мары:

...шугаюць чырвоныя языкі полымя, драўляна-вуглёвы хрыпат сьцен. Ад бярвеньняў—чорныя галавешкі з мядзянымі зьмейкамі...

Цярэшка моршчыцца, палохаецца:

— Чорт ведае, што лезе ў галаву...

У чарзе па пэнсію стаяць, нецярпліва чакаюць „Цені на сонцы" Александровіча. Вось яны—некаторыя з натуршчыкаў „Ценяў"! Многія з „ценяў" чакалі сваёй чаргі... Маршалкі, дзянікінцы, урангелеўцы, „міністры"-замежнікі, братва-адэсыты. Лезла няпрошанае мінулае на ўзьверх, нібы кот з завязанага мяшка. Пётра Крушынскі, які дастаў годнасьць профэсара за дзіцячы лемантар, тортмайстар Бычкавіцкі, які на імяніны аўторытэтных людзей торты прыносіў, чакалі сваёй чаргі ў „ценях".

— Чулі?

— Чулі...

— Гэта ён вас меў на ўвазе.

— А я ўпэўнены, што вас.

Адзін юбілейны літаратурны крытык, кругленькі, нізенькі профэсар, каб адкінуць сьлед ад сябе, напісаў хвальбу гэтаму твору.

А колькі ціхіх праклёнаў сыпалася ад натуршчыкаў на аўтара „ценяў".

Каб усе гэтыя праклёны спраўдзіліся, дык ад аўтара і пылок не застаўся-б. Ён перажыў-бы дзесяткі розных мучэньняў, ня менш чымся ў любой дэфэнзыве сучаснай панскай Польшчы. Былі ператвораны ў адзін моцны экстракт праклёны ўсіх вякоў. Хоць вазьмі ды пішы з іх доўгі, як разгорнуты скрутак палатна, верш.

Тым часам інстытутчыкі займаліся вывучэньнем гайдачаназнаўства, Францішка Скарыны, Сымеона Полацкага...

Раптам Цярэшка ўздрыгануўся ўсім целам: прышоў ён—аўтар артыкула ў „Зьвязьдзе" пра Язэпа Крушынскага—Мікола Ярэмчык.

Гэта-ж ліха ведае што!—хвалюецца Мікола.—Стаяць у чарзе. як жанчыны каля коопэратыўнай крамкі! Проста брыдка! А на вечарох самакрытыкі іх мала бывае.

Мікола ўспамінае гэтыя вечары. Прыходзяць рабочыя з друкарні, тэхпэрсонал, асьпіранты і вельмі мала з прафэсуры.

— Чаму вучоных мала? Няўжо-ж ня ўсе павядомлены?

— Як не павядомлены!—усхоплівaецца малады дзелавод, дэмабілізаваны вайсковец.—Ва ўсіх аддзелах абвесткі прыклеены. Многім дамоў паведамленьне пасылаў.

— Мусіць гонар не дазваляе прыходзіць да нас,—кажа набор-шчык Сакалоўскі, чалавек з вачыма колеру піва.—Як-жа гэта мы будзем крытыкаваць іх? Як мы „адважымся“ на гэта?

Вялізарная пуставатая заля інстытуту прыслухоўваецца, адказвае лёгкімі водгаласкамі. Гіпсавы чорны б'юст Скарыны ўтаропіў вочы на пустыя крэслы, дзе павінны былі сядзець навуковыя працаўнікі.

Зьвіняць галасы—абураныя, злосныя.

— Чаму ня ўсе вучоныя?

— Пустыя крэслы.

...Такімі тэмпамі, калі мы ў навуковых працах адсталі на пяцьсот год ад Кастрычніка, нічога ня зробім для соцбудаўніцтва...

Доўга гаворыць таварыш Сакалоўскі. Спачатку ноткі крыўды ў голасе, а пасьля абурэньне ў бок пустых крэслаў, дзе павінны былі сядзець вучоныя. Вельмі мала іх тут.

Яркія электрычныя лямпачкі прагналі цень з пустых крэслаў, якія стаяць роўнымі шэрагамі дубовыя, зграбныя, моцныя, з лёгкім пылком ад няўжываньня, нібы ў мэбельным магазыне.

Наборшчык Сакалоўскі канчае:

— Да пустых крэслаў гаворым. Будзем у насьценгазэце вастрэй пісаць! Можа ачухаюцца.

Пасьля кожнага нумару насьценгазэты „Навука і Праца“ некаторыя з „пакрыўджаных“ прафэсараў ня вітаюцца з рэдколегіяй.

Два лягеры абменьваюцца халодным, як лёд, „дзень добры“.

Нарэшце прышоў бухгальтар.

Бэкеша ў мокрым сьнезе. На ворсе шэрага сукна маленькія кроплі-іскры.

Чарга ажывілася.

Пачалася выдача пэнсіі. Хоць павольна, але ўсё бліжэй соўваецца да бухгальтарскага стала Ангон Цярэшка.

Падышла і яго чарга.

Толькі што падпісаўся ў соліднай ведамасьці. Яшчэ не пасьпеў праверыць грошы, як пачуў урачысты і строгі голас дзелавода:

— Вас завуць, тав. Цярэшка!

— Да тэлефона?

— У калідоры. Жанчына. Тая самая, што заўсёды да вас прыходзіць.

Дзелавод глядзіць на яго чужымі халоднымі вачыма.

Цярэшка чырванее.

...Мабыць, „яна“...

Зноў успомніў твор пачынаючага маляра; малюнак пад назваю „Плач Яраслаўны“.

Шпаркімі крокамі Цярэшка высоўваецца з бухгальтэрыі. „Яна“ стаіць у калідоры і незацікаўлена разглядае кнігі, выстаўленыя ў вітрыне пад шклом.

„Плач Яраслаўны“ займае цяпер шмат месца ў жыцыі Цярэшкі. Жонка Язэпа Крушынскага часта прыяжджае да яго з Курганішча і торгае за нэрвы запытаньнямі і кароткімі заўвагамі:

„Што будзе?“

„Калі?“

„Далей так цягнуцца ня можа“.

„Чалавек толькі ў бядзе пазнаецца“.

„Я больш чакаць не магу“.

„Ратуйце майго мужа. Ён вам ня чужы“.

„Адно-два словы пагаварэце, напішэце“.

„Ён-жа вам часта дапамагаў...“

Яна прабуе на ім і сілу жаночых сьлез.

Цярэшка заўсёды стараецца абыходзіцца з ёю далікатна і цярпліва. Кожны раз, як угледзіць яе, зьменіцца ў твары. Яму няпрыемна. Колькі разоў прыходзіла яна сюды ў інстытут шукаць яго. Некаторыя з інстытутчыкаў заўважылі яе, гаварылі:

„Новая муза ў Цярэшкі.

„Падобна да адкормленай мельнічыхі“.

Цярэшка падыходзіць да вітрыны.

— Стэфка?

На ёй паліто з сіняга сукна і шэрая вязаная хустка. Тлусты твар чырвоны і набраклы ад холаду.

— А я так і думаў, што гэта вы. Хадзем, тут ня выпадае.

Яны спусьціліся па сходах уніз. Ён наставіў каўнер паліта, каб знаёмыя не пазналі. Спыніліся каля рамізьніка. Паехалі дамоў.

Раней Цярэшка тлумачыў жонцы Крушынскага, што нічым ёй дапамагчы ня можа, але Стэфка кожны раз яму напамінала, што мабыць ён забыўся на той час, калі яе муж трымаў на сваіх плячох усіх менскіх Крушынскіх.

Тады Цярэшка прыдумаў новую тактыку:

— Усё будзе добра. Яго вызваляць. Яшчэ не даведзена, што ён прымаў удзел у справе атручэньня коняй. Цяпер на фаэтоне з цаднятаю будаю яна зноў запыталася:

— Што чуваць?

— Дома аб гэтым пагаворым.

Змрочнымі вачыма Цярэшка паглядаў з буды на сьпіну фурмана. Хлюпаў мокры сьнег.

— З кім вы прыехалі ў такую бездарож?

— Бочка запрог каня і прывёз.

— Гэты нізкі і тоўсты Дрозд?

— Але.

Дома Бочка яму апавядае, што ў пакоях Крушынскага ідзе цяпер рамонт. Новыя сельсаветчыкі рыхтуюць клюб у Курганішчы.

Доўга гутарыць аб гэтым Бочка і паўтарае часта, для большай яркасьці:

У Курганішчы цяпер габлююць і майструюць.

Цярэшка п'е гарбату, слухае і думае пра сябе:

...Усюды цяпер габлююць і майструюць. У інстытуце таксама...

Жонка Крушынскага выцірае заплаканыя вочы.

Прывыклі тут да сьлёз Стэфкі. На Цярэшкавых яны ўжо ніякага ўражаньня ня робяць. За вакном хлюпае мокры сьнег.

Сонечны зімовы дзень. Дрэвы абрасьл і сівой поўсьцю. Драты над гарадзкімі вуліцамі абтрушаны шэраньню. На дратох дзе-ні-дзе шэрыя кропкі вераб'ёў, з-пад лапак якіх пыліцца ледзь прыкметная сьнежная труха.

Антон Цярэшка ідзе ў друкарню, дзе друкуецца яго зборнік вершаў „Галасы палёў".

І радасьць і трывога.

Кніжка ўжо ў пераплётнай, але што аб ёй скажа крытыка? Вось, каб выкінуць з-пад кожнага вершу слова „Курганішча"... А то яўна відаць, што кніжка напісана ў кулацкім хутары. Як наўмысьне і на вокладцы дзераўца, хаткі, птушкі. Мастак пастараўся, зрабіў паводле зьместу.

У пераплётнай на сталох якраз яго кніжка, Ідзе фальсоўка. Шалясьцяць аркушы, растуць сьцірты. Куды ні павернецца Цярэшка— „Галасы палеў"... Каб мог, дык зьнішчыў-бы цяпер гэту кніжку.

Але, каб ніхто з рабочых не заўважыў, ён бярэ адзін экзэмпляр „Галасоў палёў" і кладзе ў свой портфэль.

Дома яшчэ раз прачытае, адразу дасьць на прагляд свайму крытыку. Можа праплыве ліха.

У пераплётнай гудуць сшывальныя машыны. Пахне мучным клеем. Ніхто з рабочых не зьвяртае ўвагі на Цярэшку. Кожны заняты сваёй працай. Ніхто ня цікавіцца ім, як аўтарам. Ды ці мала аўтараў тут бывае?

З друкарні Цярэшка вышаў з першым экзэмплярам „Галасоў палеў" і з дрэнным настроем. Баяўся, што кепска сустрэнуць яго новую кніжку.

...Цяжкія часы насталі,—думае ён.—Недахопы продуктаў, мануфактуры, абуцьця, жорсткае раскулачваньне на вёсцы. Што з усяго гэтага будзе? А што калі ў маіх вершах знойдуць адбіцьцё ўсяго гэтага? Я-ж, здаецца, толькі лірыку прыроды...

Не дакончыў аб гэтым і пачаў аб другім:

— Дзеці (Настачка і Мзей) цэлы садом у хаце паднімаюць. Зусім ня бядуюць. Ім весела, а жонка цэлымі начамі плача няма ведама чаго.

Не дакончыў аб другім і давай аб трэцім:

— Нейкая пустата ўнутры. Аб чым пісаць? Дзе шукаць натхненьня?

Цярэшка зайшоў у піўную.

16. Спадчына

У Гайдачанскі сельсавет прыехала з Менску брыгада з двух чалавек—Мікола Ярэмчык і наборшчык Сакалоўскі.

У клюбе ўсё новае і сьвяточнае: невялічкая сцэна з суфлёрскай будкай, на якой выступіла клейкая сасновая смала; жоўтаватыя сталы, расстаўленыя каля сцэны; гладка адгебляваныя сасновыя лавы; белыя шпалеры з сінімі ўзорамі на сьценах. Дзьве нікельныя лямпы „молнія“ вісяць пад стольлю і кідаюць роўнае сьвятло на шматгаловы сход. Народу з усёй ваколіцы: Дразды і Дзятлы, гайдачане, пасёлкаўцы, глухаўцы, комунары з „Чырвонага Кастрычніка“, хутаране. Паміж жоўтых кажухоў і сівых сьвітак дзе-ні-дзе вайсковыя шынэлі прымежнікаў. Сярод шэрагаў рознастайных шапак і кучмаў жаночыя хусткі. Рыгор, былы парабак Язэпа Крушынскага, сядзіць на аднэй з бакавых лавак і шэпча белабрысаму суседу на вуха, у той-жа час вачыма глядзіць на сцэну, дзе сядзіць прэзыдыум сягонешняга сходу. У адзін і той самы час Рыгор слухае і шэпча суседу:

— Сьценкі бакавых пакойчыкаў разбурылі і вось бачыш, які вялікі клюб! Раней гэты пакой называўся „салёнам“. Усё барахло адгэтуль выкінулі—вазоны, і цацкі на століках, і стары сапсаваны гадзіньнік. Фортап'яна хацелі адрамантаваць, але нікуды не гадзіцца—таксама выкінулі.

Антось Драчык—новы старшыня Гайдачанскага сельсавету, абраны замест ранейшага, адчыняе ўрачысты сход. Усе ўважна слухаюць Выцягнулі галовы ў бок сцэны і ня здымаюць вачэй з прамоўцы.

Голас Драчыка (сягоньня мякчэйшы, чым заўсёды) плыве, нібы човен па спакойным возеры. Толькі калі-ні-калі на гэтым возеры ўсьпеньваюцца хвалі: вырываюцца грозныя выкрыкі па адрасе кулакоў. Традыцыйныя словы Драчыка: „люблю праўду“, „люблю шчырасьць“—гэта тыя вёслы, якімі ён кіруе свой човен. Сягоньня, спэцыяльна да гэтай урачыстасьці Драчык пагаліўся. Суседзі, якія прывыклі бачыць яго заўсёды са скалмачанай бародкай, прыглядаюцца да яго, як да незнаёмага чалавека. Некаторым здаецца, што Драчык памаладзеў, а некаторым, што пастарэў, бо якраз цяпер на голеным твары выступаюць раней схаваныя пад барадою глыбокія маршчыны.

Шэрыя вочы ў павуценьні тонкіх маршчынак адкідваюць іскры ва ўсе бакі. Аднэй рукою Драчык абапіраецца аб сасновы белы стол, другою энэргічна махае ў паветры ў тахт сваім словам.

— Люблю шчырасьць! Каб сягоньня вярнуўся з турмы Язэп Крушынскі, гэты бандыт і прахвост, каб вярнуўся ў сваю „культурную“ гаспадарку ды пабачыў, што мы ў яго „салёне“ зрабілі клюб для нашай беднаты і серадняцтва, дык я ўпэўнены, што гэты „культурнік“ не абрадаваўся-б нашай сапраўднай культуры! Люблю праўду, не абрадаваўся-б!

У прэзыдыуме ціха перашэптваюцца Мікола Ярэмчык, сакратар райкому і наборшчык Сакалоўскі. Новы сакратар райкому пачаў нешта ўпісваць у невялічкі блёк-нот. Яго густая чупрына блішчыць сівізнай. Калі-ні-калі паднімае вочы з блёк-ноту і праніклівa аглядае сход.

У пярэдніх радох сядзіць у застылых позах моладзь, хлопцы і дзяўчаты з організаванай нядаўна комсамольскай ячэйкі. У некаторых у вачох многазначныя ўсьмешкі. У іншых грозная і акамянелая сур'ёзнасьць. А вось хлапчук з завостраным носам ловіць па вучнёўску кожнае слова прамоўцы. Калі глядзець на яго выразьлівы малады твар і зусім ня чуць прамоўцы, дык па аднэй міміцы гэтага твару можна прыблізна здагадацца аб чым ідзе гутарка.

— Крушынскага ў нас няма, але люблю праўду, Крушыншчыкаў у нас яшчэ ня мала засталося. З імі нам цяпер прыдзецца змагацца, доўга і ўпарта змагацца. Во як весьці бойку! (Драчык сьціснуў кулакі і выпяў грудзі наперад) Я ўпэўнены, што Крушыншчыкі будуць нам перашкаджаць на кожным кроку, як яны дагэтуль рабілі! Гэта факт, таварышы! Такіх чорт ня мала тут насеяў (на лаўках замітусіліся.. Пачуўся многагалосы гул сходу. Нібы дрэвы ў лесе пад ветрам). Крушыншчыкі спакойна жывуць у пасёлках, на хутарох, сярод Драздоў і Дзятлаў, у Гайдачанах. Ваўкі ў авечай скуры! Люблю шчырасьць, таварышы! Чаго варты Слуп і Бочка, наш поп, які ледзь ня старшынёю сельсавету быў у нас! (Зноў на лаўках мітусьня, нецярплівае шараваньне кажухамі і сьвіткамі аб новыя сасновыя дошкі ўслоньняў). А пра колгас, таварышы, якраз сягоньня трэба будзе пагаварыць. Пяцігодка—гэта вам на жарты. Ня думайце, што толькі ў газэтах аб гэтым пішуць. Вы можа скажаце, што нашыя багацеі спакойненька сядзяць, злажыўшы лапкі? Паглядзеце, як у нас прайшла сёлета хлебанарыхтоўка! Люблю шчырасьць! Кулакі правалілі (на лаўках зноў мітусьня. Драчык выцірае пот са лба рукавом сатынавай касавароткі). Толькі „Чырвоны Кастрычнік“ і бедната да гэтага шчыра адносіліся... Трэба ведаць, што...

— А ты, старшыня, ня сам вінават у гэтым?

— Ты сам!

Гэтыя галасы пачуліся з маленькага гуртка жанчын—удоў, якія сядзелі на адным з зэдлікаў.

— Заткні глотку, бабская каманда!—закрычаў хтосьці з іншай лавы.—Шмат вы там далі гэтай нарыхтоўцы?

— У нас нічога няма!

— Вось за гэта самае вы надта жвавыя на языкі, каб іншыя за вас давалі!

Зноў сход узбурыўся. Грукатаньне гарачых галасоў расплываецца, сыплецца на розныя лады. Драчык трохі непакоіцца. Твар яго чырванее.

— Ціха! Супакойцеся, таварышы! Калі кулакі пахавалі дабро, дык мы яшчэ з імі паваюем! Люблю шчырасьць! Паваюем!

Сход зноў застыў. Кажухі і сьвіткі перасталі рухацца.

„Леў Талстой“ сядзіць на першай лаўцы супроць прэзыдыуму і глытае кожнае слова. За апошні час барада яго яшчэ больш пабялела. Ён сягоньня сумны, што яго не абралі ў прэзыдыум, аднак старанна запісвае алоўкам у кнізе земскага ўсё, што чуе і бачыць. Часта выцірае кавалачкам палатна свае акуляры і насоўвае іх шчыльней на нос з заклапочанай старанасьцю.

Хвёдар і Зьмітрок сядзяць побач на аднэй з бакавых лавак. За той час, што вярнуліся з арміі (каля пяцёх год) абодвы пасталелі. Хвёдар выглядае. як Вухар купец на старых лубачных малюнках: русая кучаравая бародка ахоплівае ўвесь яго ружовы твар да самых вачэй, Даўно ня стрыжаныя валасы ўюцца ў дробныя абаранкі. Ён сядзіць каля самога вакна. Шыбы напалавіну кованы сьнежна-срыбнымі хвойкамі з лёду. Дзе-ні-дзе праз чыстыя кавалкі шкла заглядаюць у клюб цёмна-сінія плямінкі зімовай ночы. Хвёдар часта пазяхае ў руку.

Зьмітрок штурхае Хвёдара локцем у бок.

— Хвёдар!

— Га?

— Раз назаўсёды ты павінен, Хведзька, сёньня сказаць...

У голасе Зьмітрака цяплыня, якой Хвёдар даўно ў яго не заўважыў у адносінах да сябе.

— А што?—Хвёдар вылупіў вочы на Зьмітрака.

— Раз на заўсёды кажы мне: альбо—альбо. Ці ты з Крушыншчыкамі, ці з намі?

Хвёдар апускае галаву. Маўчыць.

— Кажы, Хведзя! Мы разам з табою гэтулькі часу ў Чырвонай арміі жылі. З аднымі думкамі назад вярнуліся. І вось ты збочыў на права, да багатых...

Хвёдар панура глядзіць перад сабою.

— Так,—працадзіў ён праз зубы.—У душы, я такім самым застануся. Але ведаеш, Зьмітрок, як я жыў раней? Вечна ў галоце. Хоць бацька моцны гаспадар, але мне ад гэтага ўсё роўна. Хочацца хоць трохі лепш пажыць. Хочацца хоць чутачку дабра і для сябе.

Хвёдар махнуў рукою.

— У душы я, дальбог, такі самы, якім быў раней. Але я-ж думаў, што гэтыя пасёлкі... ды што аб гэтым казаць...

Хвёдар зноў махнуў рукою.

— Значыць,—зазлаваўся Зьмітрок,— твая душа ня прымала ўдзелу тады, калі поп твайго сына ахрысьціў?

— Гэта рабілася без мяне. Я ня быў тады дома...

Зьмітрок зірнуў на яго прыжмуранымі вачыма.

У клюбе пачынае станавіцца душна. Над рознатварым сходам уюцца воблачкі махорачнага дыму. Некаторыя пацеюць. Густы пах аўчыны і чалавечага поту.

Кончыў сваё уступнае слова Драчык. Таварыш з раёну гаварыў аб неабходнасьці колгаснага будаўніцтва, даводзіў сялянам вялікую для іх выгаду пры пераходзе сельскай гаспадаркі на новыя рэйкі. Выступіў наборшчык Сакалоўскі аб фабрыках хлеба. А пасьля яго гаварыў Мікола Ярэмчык. Ён намаляваў яркі портрэт Язэпа Крушынскага як шкодніка і эксплёататара, які маленькімі падачкамі і рознымі хітрыкамі трымаў у сваіх руках увесь сельсавет. Усё насельніцтва баялася Крушынскага. Дзе падачкі не памагалі, там былі страшункі, а дзе і гэтага не баяліся, дык некаторыя ў раёне баранілі „культурніка“ з Курганішча.

У пакоі горача. „Матушка“ (жонка айца Дзімітрыя) сьпіць на канапе. На стале стаіць лямпа.

— Маці... маці...

— Га?

Яна расплюшчвае спалоханыя вочы і глядзіць на айца.

— Можа хопіць табе спаць?

„Матушка“ ня чуе. Яна зноў заснула. Па яе ружовым твары мільгае цень ад пальца айца Дзімітрыя. Айцец хацеў з жонкаю пагаварыць аб сур'ёзных справах ды не пасьпеў: яна зноў заснула.

Яшчэ за некалькі дзён да сходу ў новым клюбе айцец Дзімітры „рыхтаваў“ людзей. Сам быў нявідзімкай, але дзейнічаў праз Слупа і Бочку. Яны ледзь ня кожны дзень рапартавалі папу аб усім тым, што дзеецца ў сельсавеце пад старшынствам Антося Драчыка. Айцец Дзімітры праз Слупа і Бочку вучыў сваіх парахвіян як трымацца на сходзе. „Расседжвацца трэба так, каб свае былі ўперамешку з няпэўнымі на ўсіх лаўках. Свае павінны падаваць знак: калі выступаць, а калі маўчаць. Самых небясьпечных трэба заўчас улагодзіць пазычкамі грошай ці чаго іншага. Гэтым заткнем ім рот няпрыкметна і пэўна. Можна палохаць Польшчай; як толькі вайна, дык гайдачанскі сельсавет, як прымежная паласа, зараз-жа апынецца на „тым“ баку. Ні аднаго фунту хлебанарыхтовак! Няма лішняга, сабе трэба...“

Айцец усьміхаецца. У гэтай справе ён ня мала папрацаваў. Колгасы і рэлігія—вада і агонь... Усё залежыць ад нас саміх... Не захочам: дык... Дагэтуль так ціха было ў нас, а вось надышла завіруха...

...Што там на сходзе цяпер робіцца? Зараз прыдзе адтуль Слуп. Такі быў угавор...

Ад нецярплівасьці айцец надзяе кажух і выходзіць на двор.

Змурудны сьнег трэцца пад нагамі, як расьціснутае шкло. Дзьве старыя бярозы, як вартаўнікі ў белых футрах, стаяць застылыя каля брамы. Калі-ні калі па бярвеньнях будынкаў стрэльне мароз. У бяздоньні ночнага неба жаўтаватымі кроплямі вісяць зоркі. Вось-вось яны са звонам упадуць на купал царквы (яна стаіць воддаль на ўзгорку) і рассыплюцца гарохам па бляшаным даху. Саламяныя стрэхі вёскі Глухаўкі прыдушаны сіняватымі пластамі сьнегу. Адтуль вее холадам і цішынёю.

... Мабыць, і глухаўцы пайшлі на сход...

З боку бярэзьніка, які зьліваецца з сіняй глухаманьню ночы, плыве сюды воўчае выцьцё, спачатку ціхае, як з пад зямлі, а з кожным разам усё галасьней. Ім адказваюць глухаўскія ды іншыя сабакі. Мурза рвецца з ланцуга. Няпрыемна становіцца папу. Вецер рыпае асьвірам над студняй. Поп сьвідруе вачыма сінява-сьнежны абшар. Некалькі вёрст адгэтуль граніца. На шырокім полі лінія калючага дроту. Вялікі камень ляжыць на тым полі. Аб камені ёсьць байка, што гэта акамянелая капліца. У капліцы—княгіня. У княгіні на пальцах—пярсьцёнкі з дарагімі каменчыкамі. А на тым баку калючага дроту—вёска Рудня.

Поп шчыльней акрываецца кажухом, адварочвае твар ад марозьлівага ветру, супакойвае Мурзу і бокам ідзе ў хату. Гудзіць грозны вецер. Яго гул здаецца папу водгульлем сходу ў Курганішчы. Поп сьцяў зубы. У яго вачох аганькі нянавісьці.

У сенцах скідае кажух. Уваходзіць у пакоік да „матушкі“ і садзіцца к сталу. Ад рыпату дзявярэй і раптоўнай сьцюжы, якая шматкамі ўварвалася ў пакой разам з папом, „матушка“ прачнулася.

— Чаму, баця, спаць ня ідзеш?

— Чакаю...

— Ах, праўда, і я-ж чакаю...

— Колькі цяпер часу?

„Матушка“ зірнула на свой ручны гадзіньнік.

— Роўна адзінаццаць.

— Сход яшчэ доўга зацягнецца. Калі ім сягоньня ўдасца, тады канец нашаму добрабыту. Парахвія дасьць нам гэтулькі, як дае „Чырвоны Кастрычнік“...

— Што-ж нам тады рабіць?—палохаецца „матушка“.

— Так доўга цягнуцца ня можа. Эўропа ня будзе маўчаць. Рыхтуецца Польшча, Францыя, Англія. Увесь цывілізаваны сьвет рыхтуецца. Я ўпэўнены, што хутка ўсяму гэтаму канец.

Басавы голас айца пераходзіць на альт.

— Пяцігадовы плян гэта нешта д'ябальскае для народу. Яны сапраўды плянава працуюць. Глядзі, як па трохі з кожным годам тут усё горш і горш робіцца. Крушынскі вось праваліўся, бо ня ведаў вайсковай стратэгіі.

Вочы „матушкі" праясьнелі. Адпала ахвота ад сну.

Айцец Дзімітры пачаў спацыраваць з кута ў кут. Цень пера-дражніваў па сьцяне яго рухі.

— Некаторыя раілі мне адмовіцца ад духоўнага сану. І добра, што я так не зрабіў. Кіну расу тады, калі зноў трэба будзе надзець мундзір паручніка. Помніш мяне ў гэтым мундзіры?

— А як-жа! я потым спаліла фотоздымак.

— Цяпер выгадней быць паручнікам з крыжам. Я вось тут з табою гавару, а камандую фактычна сходам у Курганішчы. Эх...

Перад яго ўяўленьнем, нібы яшчаркі, мільгаюць успаміны. Твар айца становіцца сумным і задумёным. У гэту хвіліну „матушка" гля-дзіць на яго і кажа:

— Мне здаецца часта (таксама і цяпер), што твая брыдкая барада і кудлы на галаве прыклееныя, чужыя...

— Але я ўвашоў у папоўскую ролю як належыцца. Нават задумаў быў з'арганізаваць тут рэлігійны інтэрнацыянал (айцец хіхікнуў мышы-ным піскам). Хацеў наладзіць сувязь з местачковым рабінам. Мы з ім сустрэліся неяк на вуліцы і ён на мяне паглядзеў такімі спачу-ваючымі вачыма; мне здалося, што ён кінецца да мяне як палякі кажуць: „як свуй до свего". Але ведаеш, яго барада, пэйсы і бліскучы ад бруду лайбсардак здаваліся мне больш праціўнымі за мае кудлы ды папоўскую расу...

„Матушка" зарагатала срыбным сьмехам. І грудзі, і круглыя шчокі яе трасьліся, як квашаніна.

Мікола Ярэмчык выцёр пару разоў пот з ілба. Быў бледны, змораны ад духаты, але голас яго бадзёры і сьвежы:

— Адзінае выйсьце для вас—гэта колгас! (ён зірнуў на сход, на многія дзесяткі рознакаляровых вачэй, якія ўтаропіліся ў яго. Успомніў вузенькія шнуры тутэйшых сялян, саламяныя стрэхі, бруд у хаце, галоту, худую жывёлу... Усё гэта ў адзін міг: працяглая кропка між двума сказамі). Скажэце, ці ня лепш жывуць у „Чырвоным Кастрычніку"? Калі хто наракае, што дагэтуль тут будавалі новыя хутары і пасёлкі, дык аб прышчэпаўшчыне ўжо гаварыў папярэдні прамоўца.

Бочка сядзіць побач са старым Сухарукім ды шэпча яму на вуха:

— Гавары! Табе, старому, няма чаго баяцца...

Сухарукі, высокі і тонкі, як жэрдка, падняўся з лавы. Зыркімі вачыма зірнуў вакол і крыкнуў старэчым пісклівым голасам вывучаныя словы:

— На нашым карку будзеце памылкі рабіць? А ¸можа выйдзе пасьля, што і колгас памылка, што тады будзе?

— Ціха ты!—крыкнуў Драчык.—А-а-а! Каля цябе Бочка сядзіць? Навучыў? Глядзі, Бочка! Гэта табе ня бойка за лужок. Глядзі, каб на цябе абручы ня трэснулі! Пакуль што дайце гаварыць тав. Ярэмчыку, а пасьля выступіць хто захоча!

Сход ледзь супакоіўся. Бочка скрыгатаў зубамі.

— Няхай клясавы вораг ня радуецца нашым памылкам. Мы іх ня тоім. Мы першыя аб іх і гаворым. А што тычыцца прышчэпаўшчыны, ды гэта проста шкодніцтва з боку клясавага ворага.

Так сказаў Мікола Ярэмчык і пачаў далей тлумачыць перавагу колгаснай гаспадаркі над аднаасобнай для беднаты і серадняцтва.

Пасьля дакладу Ярэмчыка быў зроблены перапынак.

Сход рушыў з месца, падзяліўся на групкі, прыціснуўся да вакон, расплыўся па кутох, многія выходзілі ў цёплыя сенцы. Цяпер стаяў такі гуд, што здавалася, нібы на людзей напаў нейкі шал.

Каля аднаго вакна высокі Слуп шэпча на вуха чорнавусаму Яўхіму ў кароткім кажуронку:

— Калі табе трэба хлеба, ідзі ка мне, дам колькі хачаш! Мы-ж суседзі! Пасьля разьлічымся. Толькі ня думай ісьці ў гэту цёплую кампанію, калі жыць ахвота.

— А вось у комуне ўсё-ж такі людзі добра жывуць. Чаму-ж нам колгасу тут не рабіць?—баязьліва пытаецца чалавек у кажуронку

— Пан Гардзялкоўскі ім гатовую гаспадарку пакінуў. Бокам ім усё гэта вылезе, як прыдуць палякі.

— Прыдуць?

— Прыдуць... Помніш, як яны табе ўсыпалі за панскае бярвеньне? І цяпер тое самае будзе. У цяні, адвярнуўшыся ¸тварамі да сьцяны, гавораць двое:

— Нэпа трохі дала дыхнуць, а цяпер зноў узяліся. Ты не гаспадар над сваёй працай. Толькі дармо аддавай! Кармі новых паноў-камісараў.

— Там-жа рабочыя, яны-ж з нашага брата. Вось і мой сын на фабрыцы ў Менску працуе,—бароніць другі голас.

— Рабочыя! Рабочыя!—перадражнівае першы голас.—А што мы маем ад рабочых? Што нам у коопэратыў прысылаюць? Не! Каб жыў Ленін, дык трымаўся-б за нэпу. Добрая была яна і разумная гэтая самая нэпа!

У бакавым пакоіку з левага боку сцэны сядзіць комсамольскі штаб і прэзыдыум сходу.

Мікола Ярэмчык хвалюецца, голас яго трохі ахрыплы:

— Сягоньня, таварышы, нічога ня выйдзе з колгаснай справай. Ты, Драчык, яшчэ слаба падрыхтаваў беднату. Будзе тое самае, што з хлебанарыхтоўкай.

— Нічога, мы з крушыншчыкамі расправімся!—упэўнена кажа Драчык.

— А табе вядома,—не адстае Ярэмчык,—колькі ў сельсавеце кулакоў?

— Яшчэ падлічыць пе пасьпелі. Бо шмат вазьніны было са справамі ў канцылярыі. Але я і па пальцах пераліч у. Люблю шчырасьць, усіх памятаю.

Драчык трохі зьбянтэжыўся.

— Вось бачыш, „па пальцах", кажаш, пералічыш. Думаю, што табе пальцаў ня хопіць... А чым комсамол займаецца? Не маглі хлопцы гэтага зрабіць?

Драчык пачаў церабіць патыліцу.

— Гэтулькі часу варонілі тут і нічога не зрабілі!—дзівіцца наборшчык Сакалоўскі. Ён глядзіць на сакратара райкому з дакорам. Яго вочы колеру піва цяпер цёмныя. Маршчыны на ілбе глыбеюць.

— Я тут новы чалавек,—кажа той.—Зусім згодзен з вамі, таварыш Сакалоўскі, што гэты раён вельмі адсталы.

— А комуна? Не адстае Сакалоўскі.—Што комуна рабіла?

— Комуна ўвесь час была абкружана ворагамі, і ёй не да гэтага было. Вось яшчэ нядаўна, як вам вядома, былі атручаны коні. Комуна мела свае клапоты.

Так пачаў бараніць комуну Драчык.

— Але...—Драчык пагладзіў голены твар,—люблю шчырасьць,—комуна спала ў шапку. Тое, што мы цяпер пачалі, комуна магла зрабіць куды раней. Комунары былі захоплены сваёй справай і не зьвярталі ўвагі на сельсавет. Я сам, калі-ні-калі прабаваў дзейнічаць, кідаўся, як той кажа, нібы рыба аб лёд, але і ў раёне ня мог дабіцца праўды. Усё-ж такі і я вінават.

Драчык паморшчыўся і махнуў рукой.

— Я бачу, многа ліха нарабілі ў вас прышчэпаўскія хутары і пасёлкі,—сказаў Сакалоўскі, ня то Драчыку, ня то самому сабе.

На стале ў айца Дзімітрыя гарэлка і ежа. Чакаюць гасьцей. Побач на камодзе гафтаваная сарвэта—мастацтва „матушкі", калі была яшчэ дзяўчынай. Фрэнзьлі сарвэты вісяць уніз ледзь не да самай падлогі. Фрэнзьлямі забаўляецца адкормлены кот. „Матушка" сьмяецца.

Як табе, маці, ня сорамна?—злуецпа айцец Дзімітры.—Тут сур'ёзныя падзеі адбываюцца. Усё жыцьцё наша крэмсаюць на кавалкі, а ты забаўкамі занята.

— Няўжо-ж мне вечна плакаць? І так атручана маё жыцьцё. Можа загадаеш пайсьці са стрэльбай пад Драчыкава вакно?

Айцец Дзімітры тупнуў нагой і крыкнуў:

— Ах ты, дурная баба!—і дадаў няпрыстойнае слова.

„Матушка“ заплакала.

Айцец Дзімітры, не зьвярнуўшы ўвагі на яе сьлёзы, выбег на двор. Прывёў Мурзу.

Ледзь не забыўся,—сказаў ён.—Гэта-ж сабака нарабіў-бы галасу на ўсю ваколіцу, каб сустрэў іх на дварэ.

А другой гадзіне ўночы прышлі яны: Слуп і Бочка.

Скінулі кажухі, выцерлі заільдзянелыя вусы і бровы.

— Садзецеся, госьцікі! Ну, і доўга цягнулася гэта музыка...

Ня сход быў, а лазьня,—сказаў Слуп.

— Ня лазьня, а бойка,—паправіў Бочка.

Айцец Дзімітры наліў гарэлкі ў кялішкі.

Пілі і закусвалі. „Матушка“ з асаблівай ветлівасьцю падавала гасьцём закуску.

— Ну і як там гэта бойка праходзіла?—пачакаўшы трохі, запытаў айцец Дзімітры.

Слуп паглядзеў на вокны. Аканіцы былі шчыльна зачынены.

— Выпусьціце, бацюшка, сабаку на двор. Можа хто за намі цікаваў. Тады няпрошаных сустрэне Мурза.

Айцец Дзімітры вывеў Мурзу на двор.

Пасьля гэтага Слуп доўга апавядаў нізкім голасам.

... Нарэшце пасыпаліся запытаньні ў прэзыдыум. Нашыя раней умовіліся, што пытацца і нашэптвалі людзям на вушы:

— А калі ў колгасе ператруцяць усіх нас, як тых коняй у „Чырвоным Кастрычніку“?

— Чаму нам трохі не пачакаць з гэтай справай, ну, хоць год адзін?

— Калі наша воля, дык мы ня хочам у колгас, бо яшчэ даўней паншчыну адбывалі. Навошта нам колгас, калі пры савецкай ўладзе нам і так добра?

— Ці будзе дазволена ў колгасе богу маліцца?

...На ўсё гэта яны вельмі трапна адказвалі. Зноў доўга гаварылі аб пяцігадовым пляне і так замарочылі галовы, што многія з гайдачанцаў запісаліся ў колгас.

Айцец Дзімітры паморшчыўся, выставіў палец у гару і сказаў:

— Та-а-к... Пяцігадовы плян. А мы на плян адкажам плянам. Ня можа быць, каб так доўга цягнулася. Эўропа павінна нас ратаваць.

— Зноў у лес прыдзецца ісьці,—дрымотным голасам сказаў Бочка, і вочкі яго замасьліліся ад хмелю.

— Трэба як кольвечы затрымліваць колгасную музыку, а там прыдуць разумнейшыя і навядуць лад і парадачак. Ні аднаго фунту хлебанарыхтовак! Дармаедаў карміць—грэх! Вясною абсеяць поле толькі для сябе. Жывёлу прадаваць альбо рэзаць для сябе. Хоць мяса сабакам аддаваць, толькі колгасам нічога не пакідаць. Вось і зробімся ўсе беднякамі, калі беднякі ім так любы і дарагі. Пабачым, што з усяго гэтага выйдзе. Нарэшце ў кожным колгасе павінны быць і нашы.

Усю ноч дзьмуў вецер—сухі, марозьлівы. Па вясковых комінах ён высьвіствaў працяглыя нудныя песьні.

Усю ноч „Леў Талстой“ пісаў. Сядзеў крукам над маленькім столікам. Ня спала ўсю ноч і яго жонка Барбара—плакала на печы. Яна часта зьвярталася да мужа з такімі словамі:

— Ах ты, памяло сівое! Куды палез? Які ты ў мяне гаспадар?

— Ціха, маці, не перашкаджай мне працаваць. А то гаворыш, як той клясавы вораг. Трэба прызнацца, так яно і ёсьць.

— Я ўсё жыцьцё працавала-гаравала, а ты, паскуда, паскудзіць мне задумаў?

„Леў Талстой“ перастаў прыслухоўвацца і давай далей пісаць:

„...Трэба прызнацца, гайдачанскі колгас будзе называцца „Першамайскі“. Зьмітрок—старшынёю колгасу. Так. Той самы Зьмітрок, які калісьці разам з Хвёдарам вярнуўся з Чырвонай арміі. Іхнія дарогі цяпер разышліся ў розныя бакі. Так. Упартыя Дразды і Дзятлы. Косамі, гарэлкай ды іншай трасцай Язэп Крушынскі труціў іх некалькі год. Так. Можа гэта горшая атрута за тую, якую ён, Крушынскі, тоісь, перадаў Пархамчуку, а Пархамчук—Троську-бандыту, а бандыт-Троська—коням комунарскім. Так“.

Ужо зусім відна стала, калі ў хату ўвайшоў радасна ўсхваляваны Зьмітрок. Зірнуў адным вокам на пісаніну „Льва Талстога“.

— Пішаш?

— Пішу...

— Пойдзем. Вазьмі з сабою паперу і аловак. Будзем рабіць падлік маемасьці колгасьнікаў. Абагулім жывёлу, насеньне, інвэнтар сена.

— Пайду, пайду...—устрапянуўся „Леў Талстой“ і высунуўся за дзьверы разам з Зьмітраком.

Ён нават не зьвярнуў увагі на тое, што першы раз за ўсё сумеснае жыцьцё з Барбарай яна не падала яму сьняданьня...

У хаце Зьмітраковых бацькоў ужо ўсе былі ў зборы.

— Ну і спадчыну пакінуў нам Крушынскі!—пачуў „Леў Талстой“ гутарку Міколы Ярэмчыка, які таксама сюды зьявіўся,—апрача майго шварга Марціна, ніхто з Драздоў і Дзятлаў у колгас ня йдзе.

17. Страх бярэ

І Яўхіму, аднаму з старых касцоў Язэпа Крушынскага, успомнілася:

...Год-у-год, як толькі касьба, ён адзін з самых рупных на сенакосе ў Курганішчы. Жонка—адна з першых там-жа на жніве.

Тады і ён і жонка думалі, што Крушынскі робіць ім вялікую ласку. І былі яны ўдзячны такому гаспадару.

Калі пад вясну ў Яўхіма канчаўся хлеб, ён зараз-жа з мяшком да Крушынскага.

— Добраму суседу ніколі не шкадую,—гаварыў Крушынскі. Са сваім чалавекам гатоў апошнім падзяліцца. Вось які я!

Крушынскі цёр лысіну, хадзіў туды і сюды па розных справах. Спачатку ішоў на гумно, з гумна — у хлявы, потым у хату. Яўхім з-заду за ім, як цялё за каровай, ды ўсё выслухваў гутаркі Крушынскага.

Умеў Крушынскі так пагаварыць з чалавекам, каб той глядзеў на яго, як варона, і ня мог слова сказаць.

У Яўхіма галава кружылася. Пакуль выбіраўся ў Курганішча, пакуль жонка яго сюды не прагоніць, паказваючы на згаладалых дзяцей, заўсёды праходзіла некалькі дзён. Вельмі ня любіў Яўхім доўгіх і мудрых гутарак гаспадара Курганішча. Калі-б адкідаць тоўстую шкарлупіну гутарак, дык зярно іх заставалася заўсёды вось якое:

„Мы суседзі. Павінны памагаць у бядзе адзін аднаму".

У Яўхіма бяда, што сям'я галадае. У Крушынскага бяда—сваімі сіламі ня справіцца скасіць лугі і зжаць збожжа на полі. Заўсёды пасьля гутарак Крушынскага выходзіла, што ён, Яўхім, не адзінокі ў бядзе...

Кожны раз пасьля такой гутаркі, павадзіўшы Яўхіма за нос доўгі час, Крушынскі даваў яму пуд-другі жыта.

— Улетку адробіш, жонку прышлеш. Ну, бывай здароў!

З нейкім цяжарам на сэрцы заўсёды адыходзіў Яўхім ад Крушынскага, ня гледзячы на тое, што той ніколі Яўхіму не адмаўляў.

Яўхім сягоньня позна падняўся з ложка.

— Гэта-ж усяночная была ў Курганішчы!—пачаў ён апраўдваць самога сябе, што позна спаў.—Потым, як вярнуўся, доўга заснуць ня мог. Усё думаў-думаў.

— А на дварэ вецер і мароз,—сказала жонка і пагладзіла ўздуты жывот. Яна была цяжарная.

Яўхім пацёр пальцам чорныя вусы і няголеную бараду. Паглядзеў у акно. На дварэ круціла завея.

Пры сьняданьні Яўхім сказаў жонцы:

— Дзіва, як усё неяк круціцца-мелецца!

— А што?—зацікавілася жонка і паглядзела на Яўхіма паблекламі шэрымі вачыма.

— Вось быў Крушынскі ды няма Крушынскага! Гэта я пра ўчарайшы сход. Учора, як растлумачылі на сходзе, дык я зразумеў, што мы былі парабкамі ў Крушынскага гэтулькі часу.

— А я гэта даўно, бяз сходу, ведаю!—сказала жонка. Яе твар у жоўтых плямінах ажывіўся. Мала мы на яго працавалі? Кожны пудзік жыта нам дорага абыходзіўся. Апошнюю сілу выцягне, пакуль адробіш. Ды што-ж там на сходзе гаварылася?

— Усяго не перакажаш. Гаварылі, што трэба ісьці ў колгас. Неяк страх бярэ.

— А які страх? Чаго ты баішся? Нам дык няма чаго палохацца.

Яўхіміха паднялася з лавы ды зноў села.

— Няма чаго палохацца, кажаш? А калі палякі прыдуць? Калі пан Гардзялкоўскі вернецца? Помніш, як за бярвеньне мне ўсыпалі? Каб не палякі, я пашоў-бы.

Хто табе сказаў, што палякі вернуцца?—усхапілася жонка.—Няўжо-ж гэта праўда?

Яна добра памятае, як білі Яўхіма за тое, што знайшлі на іхнім дварэ пару бярвеньняў, вывезеных з панскага лесу да прыходу палякаў.

— Слуп гаварыў. Калі, кажа, табе трэба хлеба, дам колькі хочаш. Мы-ж суседзі, кажа, пасьля разьлічымся. Толькі ня ідзі, кажа, у гэту цёплую кумпанію, калі жыць хочаш.

— Ён і ласкамі, і страшуначкамі?—Яўхіміха раскрычалася.—Як той Крушынскі ўсёроўна! Ведаю іх! Дай бог нам жыць, як у комуне! Была я там ня раз! Ведаю!

— Ціха, ня крычы!—зьбянтэжыўся Яўхім. Ён трохі баяўся жонкі.—Ня крычы, а то пачуюць.

— Чаго мне баяцца! Нашай беднасьці? Не баюся! Калі ўсе пойдуць, дык і мы. Няма чаго шкадаваць. Бачыла я людзі ў комуне жывуць.

— А калі вайна? —палахліва запытаўся Яўхім.

— Дык што, калі вайна? Твае маёнткі забяруць? Чаго мне баяцца вайны? Мала ваюю, пакуль дзяцей накармлю. Што ў нас возьмуць? Ды ці будзе гэта вайна.

— Слуп сказаў.

— Слуп?—жонка кпліва засьмяялася.—Гэты дык майстар! Як толькі людзі будуць пісацца, дык і мы.

— З Драздоў і Дзятлаў яшчэ ніхто ня ідзе, а вось гайдачаны падаліся ў колгас. Праўда, ня ўсе.

Яўхім цярэбіць бараду.

— Калі ня ведаеш, чалавеча, дзе лепш будзе.

— Горш ня будзе! Шкада, што ў мяне вось гэткі жывот, а то я-б на сходзе была, паглядзела-б сама што і як.

Яўхім вінавата аглядаецца па бакох.

— Схадзі ў Гайдачаны, паглядзі, што там робіцца, цікава,—сказала Яўхіміха.

Яўхім апрануў кароткі кажуронак і вышаў з хаты. Вецер адразу разануў у твар. Не хацелася цяпер ісьці ў Гайдачаны. Яўхім злаваўся на самога сябе, што баба рэй вядзе ў хаце. Ён то праўда ў прымакі пайшоў да яе. Хата, гарод, кавалак сенакосу, некалькі палосак поля, кароўка—ўсё гэта яе. Аднак-жа ён гаспадар, „бо мужчына". З яго і людзі сьмяюцца, што ён дае жонцы волю. Некаторыя добрадзеі нават вучылі яго так вымуштраваць жонку, каб яна ішла на яго павадку Нічога з гэтага ня выходзіла. Каб ён і адважыўся спрабаваць сваю сілу на ёй, дык яна была дужэйшая за яго.

У Гайдачанах на вуліцы было вялікае ажыўленьне. Ня гледзячы на кепскае надвор'е, усе былі на дварэ—і старыя і малыя.

Яўхім далучыўся да гуртка людзей, якія хадзілі з хаты ў хату абагульваць жывёлу, збожжа, конскую зброю, вазы, плугі ды іншае.

„Леў Талстой" акуратна ўсё ўпісваў у кнігу. Кожную хвіліну шчыльней насоўваў акуляры на нос.

— У вас тры каровы, дык вам адну пакінем, якую сабе хочаце,— сказаў Зьмітрок да гаспадара-гайдачаніна.

— Мне што,—сказаў той,—мне нічога, але вось жонка артачыцца.

Барадаты гайдачанін зірнуў на жонку—нізенькую зморшчаную кабеціну. Яна паглядзела спалоханымі вачыма на Зьмітрака, на „Льва Талстога". Нават на Яўхіма недаверліва зірнула.

— Я бурай каровы ня дам. Гэта пасаг дачкі!—сказала яна пісклівым голасам.

— Вялікая бяда,—засьмяяўся Зьмітрок,—няхай бурая табе застанецца, а падласую і рабую мы запішам для колгасу.

— Дзякую за ласку!—завізгатала старая,—а нам ня трэба? Запішэце адну—падласую! Рабую нам патрэбна, а бурая—Марыльчын пасаг.

Тут-жа стаяла іхняя дачка Марыля. Яе шчокі ўспыхвалі, нібы агонь.

— Ня можна так,—тлумачыў Зьмітрок.—Тады-ж у вашай сямі, застануцца дзьве каровы, а мы пастанавілі толькі па аднэй пакідаць.

— Але-ж гэта пасаг!—крычала старая.

— Марыля яшчэ замуж ня ідзе. Як ты, Марыля, ідзеш цяпер, замуж?—запытаўся Зьмітрок.

Марыля чырванела, маўчала і ня ведала дзе дзецца ад сораму.

— Ды яшчэ з бацькамі жыць будзеш!—не адставаў Зьмітрок.

— З бацькамі,—ледзь чутна прагаварыла Марыля.

— У колгасе і пасаг не патрэбен—тлумачыў Зьмітрок.—Там адна вялікая гаспадарка для ўсіх. Там мужчыны і жанчыны роўныя. Выдадзім Марылю замуж за лепшага комсамольца. Без пасагу Марыля будзе добрай гаспадыняй-колгасьніцай! Праўда, Марыля?

Дзяўчына ўсьміхалася.

Старая маці Марылі супакоіцца не магла. Калі ўжо ўсе вышлі з хаты, чуваць быў яе лямант:

— А я гадавала, а я карміла буранькую, думала для Марылькі пасаг, а вось чэрці лысыя буранькую запісалі.

— Ціха ты! дурная!—крычаў на яе муж.

Гаспадыня заплакала.

— Страх бярэ,—падумаў Яўхім, ківаў галавою і цмокаў губамі.

У другой хаце вышла гісторыя з новым хамутом.

Усе ведалі, што ў Яўмена ёсьць два хамуты, адзін стары, а другі новы. А вось ён запісвае толькі стары хамут.

— А дзе новы?—запытаўся Зьмітрок.

Глядзіць на яго Яўмен вочы ў вочы і кажа:

— Прадаў новы хамут.

— Як гэта прадаў?—дзівяцца ўсе.

— Калі прадаў? Гэта-ж пазаўчора, як ты ехаў у лес, на кані быў новы хамут. Што ты, Яўмен, пляцеш? Трэба прызнацца, ты хлусіш. Так.

Гэта сказаў „Леў Талстой“ і падняў акуляры з носа на лоб.

— Кажу, прадаў ды і годзе!—зазлаваўся Яўмен і давай круціць плячыма, нібы хоча скінуць з сябе нявідочны хамут.

— Хто ў цябе купіў?

— У Шапалевічах на рынку прадаў! Вось што!

— Ты-ж нікуды ня езьдзіў. Што выдумляеш?

— Прадаў і канец,—падняў голас Яўмен.

— Як табе, Яўмен, ня сорамна маніць,—пачаў яго стыдзіць Зьмітрок.—Калі ты такі, дык навошта было табе ў колгас пісацца? Нам гэткія ў колгасе не патрэбны. Можаш выпісацца!

Яўмен апусьціў галаву. Нешта мармытаў сабе пад нос. Неразборлівае спачатку мармытаньне перайшло ў разборлівыя словы:

— Я хацеў прадаць гэты хамут. Слуп, сказаў, купіць. А калі такая ўжо справа, дык няхай сабе! Запішы і гэты хамут,—зьвярнуўся ён да „Льва Талстога“.

У трэцяй хаце сварыліся бацька з сынам.

— Я ня пісаўся ў колгас!—крычаў бацька, і не хачу, каб да мяне прыходзілі цяпер апісваць! Нікога ў хату ня пушчу!

Ён стаяў каля парога, разьняў рукі крыжам і ня пускаў у хату. Густыя рыжыя бровы над яго вачыма былі насуплены, вочы няпрытомныя. Засьлюнявілася рэдкая рыжая бародка.

Сын стаяў з другога боку, бяз шапкі і спакойным голасам прасіў:

— Пусьці, тата.

— Ня пушчу!

— Тут і мая праца ёсьць.

— Уткніся ты са сваёй працай..!—крыкнуў бацька і кінуўся на яго з паднятым кулаком.

Сын адскочыў, зьбянтэжыўся спачатку, а потым і ён зазлаваўся. І ў яго бровы насупіліся. Ён цяпер стаў вельмі падобным да бацькі.

— Дык давай дзяліцца!—крыкнуў ён. І голас яго стаў падобным да бацькавага.—Я са сваёй часткай пераходжу ў колгас!

— Ня сын ты мне!

— А ты мне ня бацька!

Яўхім ня вытрываў ды ў голас сказаў:

— Страхоцьце адно...

— Якое страхоцьце?—зьвярнуўся да яго Зьмітрок.—Сын з бацькам пасварыліся? Глупства! Памірацца. Пасьля яшчэ сам стары прасіцца будзе, каб мы яго прынялі ў колгас, але мы яшчэ падумаем ці варта прымаць яго такога сварлівага.

Потым абагульваньне пайшло спакайней. Толькі адзін гаспадар адмовіўся ісьці ў колгас. Калі Яўхім у яго ціха на вуха запытаўся ў чым справа, дык той сказаў:

— Ведаеш, нейкі страх бярэ. Вось, як пачнуць ва сходзе гаварыць, дык здаецца ўсё добра, лепш быць ня можа. Ну, думаю, толькі ў колгасе мне і жыць. А як вось дайшло да таго, што трэба ў агульны кацёл кінуць усё тое, што за ўсё жыцьцё сваё нажыў, дык нейкі страх нападае. Хто яго ведае, што са мною робіцца. Вось жыцьцё ня міла. Баюся ісьці туды. Хто яго, братку, знае, што з усяго гэтага будзе?

Глядзіць Яўхім на спалоханага гайдачаніна ды шчыра яму спачувае.

Ведае Яўхім добра гэтага чалавека. Ня раз езьдзілі разам у лес, вазілі калоды на сплаўную рэчку. Гэты голены, нявысокі, шырокаплечы гайдачанін Макарам завецца. Хоць гаспадарка ў яго невялікая, але ня кепска жыве. Ён трохі сталяркай займаецца. Усю восень працаваў у Курганішчы, калі дом Крушынскага пераробляліпад клюб.

— Дык страшна, кажаш?

— Страшна, братку, аддаваць гатовенькае, а потым ласкі чакаць, каб хто табе даў паёк з твайго-ж запрацаванага.

Каб добра самому даведацца ў чым рэч і каб самому ўпэўніцца ў перавазе колгаснай гаспадаркі над аднаасобнай, Яўхім пачаў яго агітаваць:

— Як гэта, каб хто табе даў паёк! А сам ты не гаспадар у колгасе, як усе іншыя?

— Так-то яно так, але ці будзе чаго дзяліць? Ведаеш, ня будуць-жа працаваць, як раней для сябе. Кожны пачне выкручвацца ад працы. А тады шыш і дастанеш.

— Ну, ну!—паехаў далей у сваёй агітацыі Яўхім.— А як-жа ў комуне жывуць? Лепш, чымся мы, брат, з табою.

— Калі неяк боязна. Вось і там коняй атруцілі, раней спаліць хацелі колькі разоў.

— Дык гэта-ж сволачы робяць!—аж крыкнуў Яўхім і сам зьбіўся з свайго голасу. А тут палохаюць адзін аднаго няма ведама чаго. Вось мне Слуп кожны раз нагаворыць, дык жыцьцё нямілым становіцца.

— І мяне той самы палохае чорт ведае чым: вайна, паны...

— Такім, як Слуп, выгады няма ісьці ў колгас з багатай гаспадаркі, але нашаму брату зусім іншы сэнс ёсьць.

— Што праўда, то праўда, але хто яго ведае, каб чалавек ні баяўся-б, дык...

Яўхім не заўважыў, як пры гэтай гутарцы з чалавекам, самога сябе пераконваў у тым, што трэба ісьці ў колгас.

Яны яшчэ доўга гутарылі-б, але пачулі крыкі з трэцяга двара. Жаночы візгатлівы голас рэзаў паветра:

— Ня дам хлява! З сякерай у руках буду свой хлеў бараніць!

Яўхім і Макар пабеглі туды паглядзець. Там стаяў гурт людзей. Хто жартаваў ціканька, а хто ў голас сьмяяўся. Але ўсім было весела. Пасярод грамады стаяла старая жанчына, злосная, страшная ў сваёй злосьці, ды ўсё крычала, што хлява ня дасьць. А з грамады пад'юджвалі яе, што хлеў забяруць для абагуленых кароў.

Абагульваньне ішло ня лёгка. Зьмітрок аж ахрып.

— Навошта яшчэ пісаць?—пыталіся некаторыя.—І так вядома, што ў каго ёсьць.

За тое іншыя з гайдачан з нейкай шчырай радасьцю адносіліся да гэтага. Яны хацелі, каб усё запісваць у агульнае.

І вось у Яўхіма зьявілася такое адчуваньне, што ён сам ня ведаў як тут рабіць—ісьці ў колгас, ці не?

Пабачыць Яўхім новага колгасьніка з вясёлымі вачыма і добрым настроем—і думае тады, што адным з першых пойдзе ў колгас. А вось хто-небудзь скрывіцца, скажа моцнае слова супроць колгасу—Яўхім пачынае сумнявацца. З такой няўпэўненасьцю ён вярнуўся дахаты.

18. Сутычка

Пасьля ветру пачалася адліга. Неба было яснае, сонечнае; капала са стрэх, каля сьцен будынкаў стаялі лужыцы. З саламяных дахаў зышоў сьнег. Дарогі пачарнелі. Было падобна да вясны. Аголіўся лес. Усюды ў далягляда х ён цяпер абрамляў край неба цёмнымі палоскамі. Чыліканьне вераб'ёў напоўніла паветра. Санкі ўрэзваліся ў разьлезлы сьнег, як у кісель.

Калі скончылася абагульваньне кароў і коняй, інвэнтару і насеньня ў вёсцы Гайдачаны, на нарадзе ў сельсавеце Мікола Ярэмчык раіў дастаць каваля для рамонту плугоў. Ён абяцаўся паехаць у мястэчка і прывезьці сюды каваля Лейбу. Што тычыцца чысткі збожжа на насеньне, дык гэта зробіць „Чырвоны Кастрычнік".

Драчыка захапіла іншае:

— Пачатак зроблены. Люблю шчырасьць! Пастараемся каб увесь сельсавет на ўсе сто процантаў быў колектывізаваны! Мы гэта зробім! Што-б тут ня было, а так павінна быць!

— Не гарачыся! Сваёй гарачкай нічога ня зробіш. Трэба рабіць памаленьку, але затое моцна, грунтоўна, каб потым ня прыходзілася перарабляць. Дразды і Дзятлы яшчэ Добра пахнуць духам Крушынскага. Трэба выветрыць з іх гэты пах.

— Комсамольцы пастараюцца,—не адступаў Драчык,—Змобілізую ўсю беднату! Люблю шчырасьць, з кулакамі хутка пакончым!

Некалькі гадзін цягнулася нарада.

Ночы надышлі цёмныя. Над зямлёю віселі густыя хмары. Гнілая вільгаць расплылася па дварох. У адну з такіх начэй Бочка разбудзіў старшага свайго хлапчука.

— Гальяшка! Схадзі, пазаві сюды Слупа!

— Навошта ён?—пазяхаючы запытаўся хлапчук.

— Ты ня пытайся, а хутчэй зьбегай!—зазлаваўся бацька.

Гальяшка апрануўся і пабег. Тым часам Бочка пайшоў крадучыся ў хлеў і запаліў запалку. Тры яго добрыя каровы паднялі на гаспадара зьдзіўленыя асалавелыя вочы. Ужо ў поцемках Бочка накінуў на рогі аднэй з кароў пятлю з вяроўкі і ціханька павёў у пуню. Карова ішла за ім спакорліва. Калі прышоў Слуп, Бочка паслаў у хату сына па маленькую газоўку. Яе паставілі на калоду пасярод пуні. Жоўтым кругам расплылося сьвятло лямпачкі ў халоднай цёмнай будыніне. Слуп выняў з кішэні бліскучы навостраны нож. Дзьве пары вачэй паглядалі на Слупа і Бочку ня то са страхам, ня то з дзівам. Гэты выраз асьвечваўся ў цёмных зрэнках Гальяша і каровы.

— Што-ж тут такое будзе?—запытаўся Гальяшка.

Ні бацька, ні сусед яму на гэта не адказалі. Яны можа і ня чулі, бо былі заняты. Нейкім хітрым чынам зачапілі ногі каровы вяроўкай і карова павалілася. Тады яны моцна зьвязалі ногі каровы. Бочка ўрэпіўся за рогі і павярнуў, пацягнуў карову за галаву. Бурая шыя каровы напружылася. Слуп падышоў з нажом... Карова замэкала. Спужаўся Гальяшка.

— Татка, ня трэба...

І сьлёзы бліснулі ў яго вачох.

— Адыйдзі!—прабурчэў бацька такім голасам, што Гальяшка яшчэ больш спалохаўся, заплакаў.

— У хату ідзі, шчанё!—крыкнуў бацька.

Хлапец пабег.

Як справіліся з каровай, прывалаклі пару авечак. Скончылі і пашлі да Слупа рабіць тое самае...

Яшчэ ў додні яны паехалі ў Менск. Па дарозе заўважылі многіх, якія ехалі ў горад на напакаваных санках. У некаторых за санкамі ішла на павадку жывёла.

У Менску ў Цярэшкавай кватэрына кухні тады стаяла пазычаная ў суседкі, былой крамнічыхі, вага. Тут адбываўся продаж мяса. Зося, хатняя работніца Цярэшкавых, наказала ўсім знаёмым. Прыходзілі пакупцы, Слуп і Бочка з імі нават мала таргаваліся. Ці ведаў Цярэшка аб гэтым ці не, але яго жонка прымала ў гэтай працы самы гарачы ўдзел.

Удава Мацеіха глядзела праз вакенца на вуліцу. Нядаўна яна ўправілася са сьнеданьнем. Накарміла бульбай сына, які зараз-жа пабег ў Гайдачаны ў сельсавет, і ня ведае, што рыхтаваць на абед. Сын яе ўжо некалькі тыдняў як увайшоў у комсамол. Цэлымі днямі

працуе ў сельсавеце. Лявон з ёю цяпер мала гаворыць, ён вельмі заняты. Глядзіць Мацеіха ў вакно і бачыць; цэлая ганьня сабак цягне па вуліцы трыбух і кішкі. За сабакамі з кіямі ў руках бягуць дзеці.

— Хто-ж гэта жывёлу зарэзаў?—падумала яна.—Эх, даўно мяса не каштавала... Забылася нават смак гэтага мяса... Добра каб хлеба было ў волю. Колькі ўжо год будзе як Мацей памёр?

Мацеіха ўспомніла:

Было так. Пры паляках яе муж партызаніў, Яго шукалі і вось. аднаго разу... Была тады цёмная летняя ноч. Душна было ў хаце. Яна спала на ложку з васьмігадовым хлапчуком. Пачула нібы нехта драпае пальцамі вакно з боку гумна. Уздрыганулася Мацеіха, падскочыла да вакна ў аднэй кашулі.

— Хто тут?—яна спалохалася, бо ў вёсцы былі легіянэры.

— Выходзь, гэта я...—пачула яна голас і задрыжэла ўсім целам Гэта быў Мацей. Яна хутка апранулася і выбегла на двор.

Яшчэ раней некалькі разоў прыходзілі легіянэры.

— Дзе муж?

— Ня ведаю...

Тады яе пачалі цягаць за валасы і вадзіць па хаце ад сьцяны да сьцяны...

— І цяпер, псякосьць, ня ведаеш?

— Ня ведаю...

Яна сьцісквала зубы ад болю, калі бізун ляснуў ёй па сьпіне і твары.

Малы Лявон плакаў.

— Маўчы, чортава насеньне!—крыкнуў адзін ды намерваўся над хлопчыкам бізуном.—Кажы, дзе тата?

— Ня ведаю...—Лявонка заплакаў.

Хацеў азьвярэлы чалавек даць хлопчыку бізуна, але вырвалася матка. Клок яе валасоў застаўся ў руках жаўнэра. Болю яна тады не адчувала. Бізун ляснуў ёй па руцэ. Абараніла сына.

Некалькі разоў прыходзілі да яе легіянэры.

На дварэ за вуглом хаты яна тады сказала Мацею:

— Уцякай, легіянэры ў вёсцы.

— Ведаю. Забяры сына ды пойдзем у лес, а то яны цябе тут прыкончаць. Можа яшчэ тыдзень і мы іх адгэтуль прагонім.

— А хата?—няўпэўненым голасам запыталася Мацеіха.

— Усёраўна спаляць. Сына я панясу, а ты падушку якую возьмешь

— Рукі ўгару і ні з месца!—пачулі яны раптам гучны крык.

Мацей стральнуў з нагана, але з-за вугла кінуліся на яго з шаблямі трое. Маціху павалаклі назад у хату.

Што было далей?

Крывавы туман ахапіў яе з усіх бакоў, душыў. Прачнулася ў местачковай больніцы. Яе хлапчука забраў сусед.

Глядзіць Мацеіха ў вакно і думае:

...Што сыну зварыць на абед?

Чуе вясёлыя посьвісты і крыкі дзяцей, візгатаньне сабак.

Не заўважыла Мацеіха як адчыніліся дзьверы і ў хату ўвайшла жонка Слупа.

— Дзень добры, мая міленькая!—пачула Мацеіха шчабатлівы голас. Задрыжэла ад неспадзеўкі ды адвярнулася.

— Дзень добры, дзень добры!—паўтарыла яна аж два разы. Ня зьдзівілася на прыход жонкі Слупа, бо ў апошнія часы тая часта прыходзіла да яе з рознымі навінкамі. Але і не абрадвалася, бо навіны цёткі Слупіхі заўсёды былі нейкія невясёлыя: то „канец сьвету" яна прыносіла ў гэту хату, то з вайною прыходзіла, то з нейкімі бунтамі супроць бальшавікоў, то з цудадзейным сном...

З пустымі рукамі цётка Слупіха ніколі ня прыходзіла.

Кожны раз, пасеяўшы трывогу ў сэрцы Мацеіхі, яна ішла ў іншую хату з тымі-ж падарункамі.

Доўга шчабятала на гэты раз цётка Слупіха.

— Людзі па начох ня сьпяць, мая ты родненькая. Ад нуды вошы напалі. Кажуць ня можна пісацца ў колгасы, бо хутка палякі прыдуць. Тым, што ў колгасе, горш будзе, мая ты родненькая...

Вочкі цёткі Слупіхі блішчаць. Яна выцірае сьлёзы.

— На, прынесла трохі мяса... Ты-ж, мабыць даўно ня прабавала. Людзі рэжуць жывёлу. Усёроўна, кажуць, у колгасах лепшых дадуць а мы ўсе хочам быць беднякамі. Мы ўсе цяпер роўныя, на, міленькая. Дык ты там глядзі, каб твой Лявон нічога на нас ня ўзьвёў. Нешта там, у сельсавеце, кулакоў шукаюць. Мой-жа, ведаеш, цяпер зусім ня кулак...

Яна палажыла на зэдлік ёмкі кавалак бараніны.

— Дык няхай ужо есьць на здароўе твой Лявон і ты, мая родненькая, таксама... Ну, бывай здаровенька!

Пад вечар прышоў Лявонка і зьдзівіўся: у хаце пахне тлустым вараным мясам.

— Маці, хутчэй есьці!—і носам давай уцягваць прыемны пах.

Ён ўжо ведае новую кулацкую махінацыю. У сельсавеце гавораць, што трэба прыняць меры супроць разбазарваньня жывёлы. Сам бачыў на некаторых дварох лужы крыві ад зарэзаных кароў і авечак. Але цяпер думаць аб гэтым ня хочацца. Вельмі галодны, а пах з печы так вабіць...

Маці тымчасам выняла з печы гаршчок.

— Ах, як пахне... Маці, дзе ты дастала мяса?

— Слупіха прынесла...—зірнула на сына і спалохалася. Ніколі ня бачыла яго такім узлаваным.

Ён увесь пачырванеў, жылы ўздуліся на яго ілбу, з вачэй пасыпаліся іскры.

— Як?!—крыкнуў ён не сваім голасам.—Ад кулака ты падарунак прыняла?! Можа Слуп хоча мяне падкупіць? Няхай сабак корміць!

З агідай і злосьцю Лявон скінуў мяса са стала.

Прыехаў стары Лейба з мястэчка. На дзьвёх фурманках прывезьлі ўсе яго кавальскія прылады і хатнюю маемасьць. У адзін з гэтых шумных дзён у Курганішчы ў кузьні, дзе раней Язэп Крушынскі рыхтаваў на продаж калёсы на жалезным хаду, пачуўся звон малаткоў. Рамантаваліся плугі ды іншыя сельскагаспадарчыя прылады гайдачан для колгасу імя Першага мая. У дапамогу старому кавалю прымацавалі да кузьні яшчэ двух комсамольцаў. Вакол кузьні грамадкі людзей.

За пару дзён каля кузьні вытапталі чорную пляміну зямлі. Ня то што сьнегу тут не засталося, але і леташняй травы.

Часта падыходзіў сюды крадучыся Слуп. Глядзеў на гайдачан кплівымі вачыма:

— Плужочак ладзіш, першамайнік?

— Плужочак, а табе што?

— Мне? Мне нічога, цябе шкадую. Хіба вясною цябе ў ім араць упрагуць, бо коні вашыя перадохнуць. Хто за імі цяпер глядзіць, за чужымі?

— Толькі ты, Слуп, ня вельмі бядуй,—адказвае барадаты гайдачанін.

— Як мне не бедаваць? Суседа школа.

— Ідзі адгэтуль, бо пападзецца табе за кулацкую агітацыю,— злуецца той ды аглядаецца па бакох, каб ніхто ўсё-ж такі не пачуў...

Слуп сьмялее.

— Ты схаваў калёсы? Хоць калёсы схавай, а то паломяць, Пасуседзку кажу. Я-ж цяпер такі серадняк, як і ты...

Барадаты наставіў вушы.

— Калёсы, кажаш?

— Ты-ж гэтулькі гараваў, пакуль іх нажыў... (у Слупа літасьлівы галасок). Ты ўжо, братку, не гаспадар. Над сталым чалавекам гаспадараць сысуны-комсамольцы. Дажыўся ты, няшчасны.

— Ня плач над маёю галавой.

Слуп аглядаецца па бакох і шэптам кажа:

— Схавай, дурны, калёсы, як суседу кажу. Будзеш пасьля шкадаваць.

З кузьні вышаў адзін з памоцнікаў Лейбы, малады хлапец.

Слуп павярнуўся ды праз сад пашоў у вёску.

— Што табе Слуп на вуха бубніў?

— А нічога... Пытаўся, ці можна тут яго каня падкаваць...

У бакавым пакоіку на ложку гара падушак і падушачак „матушкі". Ад большых да меншых яны цягнуцца ўверх завостраным стажком. З боку каля самага вакна стаіць круглы столік. Айцец Дзімітры сядзіць шры століку і піша. Часам паднімае твар з паперы і глядзіць у вакно Са страхі падаюць уніз кроплі. Мільгаюць перад вачыма.

У цішыні айцец чуе, як кроплі плюхаюцца ўлужынку. Яны лічаць хвіліны, лічаць нясупынна, без памылак: раз, два, тры... На гародзе выступіла чорнае лапікла зямлі. Здалёку відаць аголены бярэзьнік. Адліга змыла з яго сьнежны кажух.

Айцец ня піша, а „друкуе“—піша друкаванымі літарамі, каб ніхто ні пазнаў яго рукі. Павольна і старанна выводзіць літары.

Адліга плача за вакном. А кроплі са страхі:

...раз...

...два...

...тры...

Лічаць яны „надрукаваныя“ айцом Дзімітрыем радкі. Айцец чытае напісанае монотонным голасам. Яго пульхныя губы выпячваюцца. Хадыром ходзіць рэдкая барада.

Браты сяляне!

Цяжкі час надышоў для вас.

Новыя чырвоныя паны вас абдурваюць рознымі спосабамі ўжо многа год. Цяпер яны ўжо бяссорамна накідваюць моцныя петлі на вашыя шыі. Колгасы—гэтая чырвоная паншчына.

Колгасы—гэта...

Айцец Дзімітры „надрукаваў“ яшчэ некалькі слоў і спыніўся. Зірнуў праз вакно на гарод і задумаўся.

Перад яго ўяўленьнем стаяў на гародзе, на чорным лапікле, аголенай ад сьнегу, зямлі вайсковец у белым летнім мундзіры з бліскучымі залатымі пагонамі.

— Глядзі, з настаўніка які зграбны афіцэр выкраўся!—сьмехатлівым голасам кажа „яна“, з якой увесь час перапісваўся з фронту. У „яе“ доўгія косы і сінія вочы. Ён гасьціць у яе бацькоў. Жаніхоўскі настрой.

Пільна ўглядаецца ў айца Дзімітрыя малады афіцэр, малады але абветраны ў бойках. Дзе яго ня было—на Каўказе, ў Крыме, пасьля—на Румынскім, а пасьля...

Толькі вочы тыя самыя засталіся...

Афіцэр-стратэг перасьцерагае айца Дзімітрыя знаёмым голасам, да якога айцец даўным даўно адносіўся з павагай:

— Ня пішы. Небясьпечна... Прымежная паласа... На цябе падазронасьць падзе... Яшчэ па стылі пазнаюць... Ня пішы... Словамі лепш... Праз сваіх людзей... Кожнаму на вуха... А то... скончыцца, як з Язэпам Крушынскім...

Айцец Дзімітры рве „надрукаваную“ паперу на дробныя кавалачкі, кідае ў грубку.

За вакном кроплі—кап, кап.

Айцец Дзімітры ўздыхае.

Вечарам прыходзіць да яго Слуп.

— Бацюшка напісаў?

— Не... Не...

Сполах у вачох айца.

...— Што ты, мілы мой... Ня можна так супроць савецкай улады...Ты глядзі.... каб і Бочка ня ведаў... Сказанае слова ніхто за хвост ня зловіць, гавары колькі хочаш, а з напісаным не жартуй...

Праз некалькі дзён ў новым клюбе адбыўся яшчэ адзін сход.

Голас брыгадзіра з Менску, наборшчыка Сакалоўскага, роўны, спакойны і пераконваючы. Нібы вядзе гутарку, таварыскую, сямейную, з адным чалавекам. Вочы яго ўсьміхаюцца лагодна. Ад катара ён трохі гаворыць у нос, часта робіць перапынкі і аглядае сход такімі пільнымі вачыма, нібы выбірае сярод людзей тых, якія апразу яго зразумеюць.

Ён гаворыць аб фабрыках і заводах, на якіх працуюць аднэй сям'ёю сотні і тысячы рабочых, аб спорнасьці ў колектыўнай працы, аб магутнай сіле рабочых колектываў, якія ў аб'яднаньні з бедным сялянствам скінулі з сябе ярмо фабрыкантаў і паноў.

— Беднаце і серадняцтву адна толькі выгада пры тэй сельскай гаспадарцы, дзе людзі, як на фабрыках і заводах, працуюць разам вялікай грамадою. Толькі ў колектыве вызваліцеся з-пад эксплё атацыі кулака, які па сягонешні дзень трымае вас у руках. Мала вы яму працуеце за малатарню, за пазычку збожжа, грошай, каня? Колектыў зьніме з вас многа лішніх клапот па гаспадарцы, палегчыць працу, павялічыць ураджаі.

Доўга гаворыць брыгадзір Сакалоўскі.

Маўчыць сход, прыслухоўваецца. Ніхто прамоўцу не перабівае.

Лямпы „молнія" асьвятляюць шапкі і хусткі роўным сьвятлом.

Бываюць хвіліны, калі Сакалаўскаму здаецца, што ўсе з ім цалкам згодны. Тады яго голас становіцца яшчэ больш лагодным. А часамі яму здаецца, што такая маўклівасьць, бяз ніводнай рэплікі з боку сходу, азначае незацікаўленасьць да яго слоў нейкай раней падрыхтаванай змовай. Тады ў голасе яго пачынаюць зрывацца ноткі нецярплівасьці, злосьці. Ён гаворыць і той-жа час думае, што куды лягчэй збудаваць новы завод, чымся організаваць колгас.

Не падабаецца Сакалоўскаму загадкавая маўклівасьць сялян.

Дзе-ні-дзе блішчаць аганькі папярос. Вочы становяцца нецярплівымі. Чуецца з розных куткоў кашаль.

— Ня думайце—кажа Сакалоўскі,—што як толькі ўступіце ў колгас, дык адразу пападзеце ў соцыялістычны рай. Ніхто гэтага вам не абяцае. Але агульнымі сіламі вы даб'ецёся посьпехаў. Ня думайце, што ў колектыве ня будуць вам перашкаджаць нашы ворагі. Але гэта вам добра вядома.

Калі Сакалоўскі скончыў, сход нават і дыханьне стрымаў. Да воплескаў у прэзыдыуме далучыліся толькі комсамольцы і „Леў Талстой". І гэтыя воплескі—адзінокія, не падтрыманыя усім сходам, здаліся дзіцячай гульнёю ў аладкі.

Сакалоўскі сеў і давай прыглядацца да дзесяткаў вачэй маўклівых людзей. У вачох некаторых блішчаць іскрачкі стрыманага сьмеху. Ня то злосьць, ня то сум заўладаў Сакалоўскім.

Мікола ў сваім чарговым выступленьні прыводзіў лічбы з іншых колгасаў БССР, дзе кожны гектар зямлі дае ў два разы больш, чымся ў аднаасобніка. Ён, як і Сакалоўскі, даводзіў на фактах выгаду колгаснай гаспадаркі.

— Няўжо-ж вам так цяжка і боязна, таварышы, адмовіцца ад сваіх вузенькіх шнуроў, ад праклятых дзедаўскіх межаў?—запытаўся ён у многагаловага сходу.

— Цяпер, таварышы, кажэце вы свае думкі без усялякай утойкі,—кончыў Мікола свой даклад і зірнуў на залю.

— Хто просіць слова?—запытаўся Драчык.

Маўчыць сход.

Вочы ўсіх накіраваны ў бок прэзыдыуму.

Марцін, швагер Міколы, падняўся.

— Я прашу слова!

— Дык вось, таварышы! Сягоньня Дразды і Дзятлы ды ўсе іншыя павінны раз назаўсёды пакончыць з тэй музыкай, якая цягнецца ад бандыта Язэпа Крушынскага. Вы ледзь ня ўсе парабкамі былі ў яго, за гарэлку і касу ён вас купляў і прадаваў. У яго вы заўсёды талакою працавалі, а для сябе вы ня хочаце агульна вясьці сваю гаспадарку? Я думаю, што сягоньня ўсе дадуць згоду арганізаваць у нас колгас. Я першы іду!

— Бач, як швагер швагру камэрцыю падтрымлівае!—пачуўся голас з грамады.

— Хто яшчэ просіць слова?—запытаўся Драчык і давай аглядаць сход, плаваў вачыма па лаўках, наставіў здаровае вуха.

Шушуканьне прайшло па ўсіх лаўкак. Адзін кашлянуў.

— Ты, Мірон, просіш слова?—зьвярнуўся Драчык да таго, хто кашлянуў.—Дык ня кашляй, а гавары сьмела! Люблю шчырасьць, няма чаго маўчаць, таварышы!

— Я не прашу,—адказаў Мірон.

— Ніхто ня хоча выказацца? І так усё ясна? Тады можа хто пытацца хоча?

Ніхто на лаўках і з месца не зварухнуўся.

Зрабілася так ціха, што чуваць было як стары Сухарукі цмокаў сваю люльку.

— Пастаў на галасаваньне!—шапнуў Мікола Драчыку.

— Хто за колгасы?—крыкнуў Драчык. Яго ліхаманкавыя вочы ахапілі ўсю залю. Над галовамі сходу ён заўважыў толькі двое рук—Марціна і Мэры.

Драчык глядзеў на дзьве паднятыя рукі, як на выспы паратунку ў бурлівым моры, і ахрыплым голасам прагаварыў:

— А яшчэ хто?

— Ніхто...— мармытнуў „Леў Талстой“, які рыхтаваўся лічыць галасы.

— Хто супроць колгасу?

Драчык сьціснуў зубы. Сківіцы ў яго дрыжэлі ад напружанага гневу. Вочы кідалі маланкі на анямелы сход.

— Ніхто...— уздыхнуў „Леў Талстой“.—Хто-ж гэта іх зачараваў? Трэба прызнацца, гэта ўжо нешта нейкае...

— Хто стрымаўся?

— Ніхто...

Пры гэтым слове „Леў Талстой“ выцёр акуляры, а хацеў выцерці ўспацелы лоб...

Мікола ўтаропіў вочы ў залю.

Апрача вачэй па рознаму бліскучых, гаварлівых бяз слоў, ён нічога ня бачыў. Твары і постаці людзей зьліваліся перад яго зрокам у нейкую туманістую бясформеную масу. Ён успомніў саламяныя стрэхі, вузенькія шнурочкі, схудалых маленькіх конікаў, малаўрадлівую глебу. Забалела... Чым прабіць гэту многавекавую саламяную крэпасьць, якая прапахла клапамі, „сьвятымі“ абразамі і брыдкімі лаянкамі? Як ты ім дасі зразумець, што колгас—адзіны для іх паратунак? Няйнакш варожыя лапы заткнулі ім рты...

Перад яго вачыма пачалі з туману вырысоўвацца знаёмыя постаці Драздоў і Дзятлаў. Вось Сухарукі піпкае сваю люльку. Удава Мацеіха глядзіць спалоханымі вачыма, ківае галавою і нібы шэпча: „божа мой, божа мой“. А там далей у ценю каля самых дзьвярэй двое шэпчуцца.

— Дык што-ж вы, таварышы, маўчыцё—(голас Міколы зьбянтэжаны).—Я-ж бачу сярод вас нямала беднаты. Няўжо-ж вы ня ведаеце, што ў „Чырвоным Кастрычніку“ беднота лепш жыве, чымся вы у адзіночку? Чаго вы баіцёся? Вы-ж нічым ня рызыкуеце. Саламяныя стрэхі і вузенькія шнурочкі не вялікае шчасьце, за якое трэба трымацца і рукамі і нагамі. А не спадабаецца колгас—ніхто вам не забароніць выйсьці з яго. Прымусу ў нас няма. Усё гэта па добрай волі.

— Няхай савецкая ўлада выдасьць закон, каб усе ішлі ў колгас, тады пойдзем!—пачуўся жартаўлівы голас з задніх лавак.

— Законаў такіх няма. Я ўжо казаў, што гэта добрая воля кожнага грамадзяніна,—сказаў Драчык ажыўленым голасам. Ён рад быў, што хоць адзін загаварыў.

— Калі па добрай волі, дык мы ня хочам...—адказаў той-жа голас,

Драчык стукнуў кулаком аб стол, закрычаў:

— Гэй, хто там? Выходзь сюды, кулацкі аблакат! Чаго хаваешся, як мыш пад венікам? Сюды ідзі! Вы што гэта, таварышы, кулацкага падпявалу нанялі за аблаката?—крыкнуў Драчык ахрыплым

раптам голасам. Яго голены твар пачырванеў, успыхваў чырвонымі латкамі. Драчык цяжка дыхаў. Аглядаў сход. Нібы ўпяршыню бачыць гэтых людзей.

Абазвалася некалькі галасоў. Ніто апраўдваліся, ніто злаваліся, ніто радаваліся:

— Ніхто Слупа не прасіў за нас гаварыць!

— Ён сам за сябе!

— Ліха яго бяры, гэтага аблаката!

Мікола прыглядаўся, прыслухоўваўся.

... Прабіта саламяная крэпасьць,—падумаў ён.—Людзі загаварылі.

Дзе-ні-дзе на лаўках блішчэлі папяросныя аганькі, успыхвалі, ніклі, зноў мігацеліся.

— Дык можа цяпер хто з вас выступіць, таварышы?

Высунуўся наперад Сухарукі. Высокі тонкі, як жэрдка, ён падышоў аж да прэзыдыуму. Усе павярнуліся з цікавасьцю ў яго бок. Ён выняў люльку з губ, спакойна вытрас попел і палажыў люльку ў кішэнь штаноў.

— На-а-а!—сказаў ён ахрыплым голасам і паглядзеў бліскучымі, як тлеючыя вугольлі, вочкамі на прэзыдыум.—На-а-аце маё горла! Рэ-э-эжце!

Ён выставіў наперад сухі, зморшчаны гарляк.

— Рэжце, усё роўна не пайду! Альбо піпка, альбо рыбка! Усё роўна хутка памру. Мае бацькі і дзяды адбывалі паншчыну, а мне дайце хоць памерці спакойна. Маёй мяжы ня чапа-а-айце! Ніко о-ога не баюся! Вось арыштуйце мяне, калі хочаце! Арыштуй, Драчык!

— Ніхто і ня думае цябе, дзядок, арыштаваць, — сказаў усхваляваны Мікола.—Ня хочаш, ня ідзі ў колгас.

— Ня слухайце, што стары пляце,—абазваўся барадаты сын Сухарукага, Пархвен.—Сядзеў-бы, тата, на печы, лепш было! Як усе зробяць, так і мы!

Паднялася раптам з месца ўдава Мацеіха.

— А я скажу перад усімі, хто нам тут круціць мазгі!

— Гавары! Гавары!—падбухторылі яе некаторыя з лавак.

— А вы думаеце. што баюся казаць?—зьвярнулася яна да сходу,— зусім не баюся! Старога так навучыў гаварыць Слуп. Ён ды яшчэ некаторыя ўвесь час нас баламуцяць.

— Ах, гадзіна!—крыкнула Слупіха, вечна корміш цябе, а ты вунь што ўзводзіш на нас.

— Ды я тваё мяса сабакам выкінула! Лявон і ня думаў есьці,— увайшла ў газарт Мацеіха. — Слуп і старога Сухарукага навучыў, а ўвесь сход маўчаць вучыў! Я гэта таму, што нейк нядобра гэта і ўсё такое.

Ад хваляваньня ў Мацеіхі дрыжэлі губы. Шэрая хустка зьехала на лоб.

Сход загуў, як ўстрывожаны вулей.

Цяпер ужо многія парываліся гаварыць. Нібы паводка, якая хоча прарваць грэблю.

...Рушыцца саламяная крэпасьць...—узрадаваўся Мікола. Ён выцер успацелы лоб.

— Ня толькі Слуп!—крыкнуў Яўхім, чалавек у кажуронку.—Тут і Бочка ды яшчэ некаторыя! А мы бедната за колгас стаім! Няма, казаў той, чаго нам баяцца. А то многія—„страх бярэ“!

Некалькі чалавек пры гэтым шуганула за дзьверы. У агульным тлуме і сумяціцы ніхто гэта і не заўважыў.

Спалоханы і злосны бег Слуп. Ён туліўся каля вуглоў будынкаў, каб яго ніхто не заўважыў.

Ноч была цёмная і вільготная.

Боты Слупа хлюпалі ў мокрым сьнезе. Мінуўшы вёску, ён пайшоў дарогай. Часта азіраўся навакол, ці хто за ім ня гоніцца. Ноч ахапіла яго з усіх бакоў. Вільготны вецер калоў твар халоднымі шыламі.

— Цікава, што на гэта ўсё скажа бацюшка...—мармытаў Слуп і адварочваў твар ад ветру.

Скрыгатаў зубамі і прыдумваў розныя рэчы:

...Млын падпаліць?

...Каля млына ўночы ходзіць варта...

...Застрэліць Драчыка, або Міколу Ярэмчыка?

...Хто яго ведае...

Успомніў нецікавы лёс Язэпа Крушынскага.

Сьцюдзёны вецер сьцёбаў у твар.

Здалёку мігацеўся прытульны агоньчык з хаты айца Дзімітрыя.

19. Рашучы бой

У сельсавеце няма мапы, але Антось Драчык ведае на памяць, як сваю далонь, тую ваколіцу, дзе ён радзіўся, вырас і жыве па сягонешні дзень,

...Пяцьдзесят процантаў сельсавету ўжо колектывізавана.

Той сход у клюбе быў пераломным. Большасьць Драздоў і Дзятлаў згадзілася ісьці ў колектыў. За імі пайшла і вёска Глухаўка. Цяжэй з хутарамі ды пасёлкамі.

Шэрыя вочы Драчыка за гэты час заўпалі .Ён па начох ня спаў. Некалькі разоў езьдзіў у райколгассаюз за парадамі і кіраўніцтвам.

Абшар сельсавецкай зямлі стаяў увесь час перад вачыма:

Рэчка на вялікім балоце цягнецца на некалькі вёрст, робіць розныя ўзьвівы, лукі, падковы. Яна служыць. гранічнай паласою. Каля яе стаяць прымежныя слупы. Далей мяжа ідзе праз хваёвы лес роўнай, як струна, лініяй. Яшчэ далей мяжа прасякае аграмаднае поле,

тлустае, роўнае, без каменьняў (тут ёсьць разгул для трактараў). У гэтым месцы калючы дрот дзяржаўнай мяжы. На тым баку калючага дроту вёска Рудня, Туды ў прымакі пайшоў старшы брат Драчыка. Даўней Драчык там бываў часта. Ведае ўсіх сялян вакольных блізкіх вёсак на тым баку. Калі стаіш на высокім камені, што ляжыць на полі, і глядзіш туды, дык за Рудняю бачыш некалькі хутаркоў.

Уяўляючы перад сабою ўвесь абшар сельсавету, Драчык пачынае перад новым сельсавецкім актывам меркаваць аб новых плянах вось у самыя блізкія гады: вялізарныя дамы для колгасьнікаў; дзьве, тры школы; дзіцячыя яські; сельскагаспадарчыя машыны; аграмадныя сьвірны для збожжа; добрыя хлявы для жывёлы; сілосныя вежы; шосэйныя дарогі, цагельні, вапярні, асушка балот, торп; новыя насельныя пункты, новыя назвы насельных пунктаў; электрыфікацыя ўсяго сельсавету.

— Усё гэта напэўна будзе ды нават хутка!—мяркуе актыў.

Недалёкая будучыня.

А на сельсавецкіх сталох ляжаць сьцірткамі, кубікамі карткі—рэшткі часоў Язэпа Крушынскага, калі былы старшыня сельсавету рабіў розныя фокусы.

На стале Драчыка гарыць газавая лямпа і асьвятляе скупым сьвятлом пакоік. На сьценах мільгаюць цені. Перад яго нутраным зрокам—немалы абшар сельсавету, асьветлены сонцам, жыве новым жыцьцём...

У гэтыя ночы Драчык сьпіць толькі па тры-чатыры гадзіны. Схуд за гэты час.

— Яшчэ адна пяцігодка,—думае ён.

У дзень кіпіць праца.

Зьмітрок, Драчык з брыгадай комсамольцаў паехалі ў пасёлак да Хвёдара. Пасьля адлігі выпаў новы сьнег. Санкі шпарка сьлізгаліся па сьнезе. Мільгалі перад вачыма і адсоўваліся назад платы, дробныя хмызьнячкі.

Трохі няпрыемна Зьмітраку:

...Калісьці разам у арміі служылі, былі шчырымі таварышамі. Чужым зрабіўся цяпер Хвёдар, чужым і далёкім...

Бялее на ўзгорачку прышчэпаўскі пасёлак, які выгадаваў пару новых кулакоў ды ўзмацніў ранейшых.

Хутка імчацца санкі, шорхаюць у пухкім сьнезе.

Пасёлак расьце перад вачыма, набліжаецца.

На Хвёдаравым дварэ іх сустрэла гаспадыня, Хвёдарава жонка.

— Да нас?

— Да вас.

Гаспадыня выцірае рукою сьняжынкі з русых валасоў, падазрона глядзіць на гасьцей.

— Хвёдар дома?

Маладая ружовая Хвёдарыха аглядаецца па бакох, паратунку шукае.

— У хаце яго няма,—кажа яна.

Ноткі спалоху ў голасе. Яна ўтаропіла вочы ў твар Зьмітрака, шукае ў ім тлумачэньня: навошта запатрэбіўся Хвёдар.

— Дык дзе-ж ён?—не адстае Зьмітрок.

Яна стараецца не глядзець у бок гумна. Адвярнулася тварам да абледзянелай студні.

— Ня ведаю дзе Хвёдар.

— Ня ведаеш, дык абыйдземся без яго.

Нешта такое было ў голасе Зьмітрака, ад чаго яна яшчэ больш устрывожылася.

— А вы па якой справе прыехалі?

— Трэба апісаць вашу гаспадарку,—сказаў Драчык.

Жанчына пабляднела. У яе вачох загарэліся два аганькі.

— Вось як... Вось як...

Адвярнулася ў бок гумна і крыкнула:

— Хвё-о-о-да-ар!

— Глядзі, і Хвёдар дома!—усьміхнуўся Зьмітрок і дзве глыбокія маршчынкі заіграліна яго ілбу

Да двара падыходзяць некалькі пасялкоўцаў.

Зацікаўленымі вачыма яны паглядаюць на Зьмітрака, Драчыка і маладых хлапцоў, якія стаяць каля санак.

Зьмітрок з імі вітаецца.

— А ты, Сідар, што валачэшся хворы?—пытаецца ён у аднаго худога селяніна ў латаным, зашмальцаваным кажушку.

— Усё роўна.

Сідар махае рукамі. Ён ледзь на нагах стаіць ад слабасьці.

Хто сёлета ў цябе касіў луг?

— Хвёдар...

— І ўсё сена забраў?

— Навошта мне сена, каля ня маю каго карміць гэтым сенам. Бачыш, хварэю, жывёлу прадаў.

Сідар вінавата апускае галаву.

— Хвёдар і каня ў мяне адкупіў,—мармыча ён ціха, нібы сабе самому навіну гаворыць.—Дзеці малыя...

— Хвё-о-о-од-ар!—крычыць гаспадыня ў другі раз.

— Чаго-о табе?—плыве з пуні Хвёдараў голас.

— Ды ты, Марыля, ня крычы. Мы да яго пойдзем,—супакойвае гаспадыню Зьмітрок.

Гаспадыня ўсплясьнула рукамі:

— А божа-ж мой... А мі-і-іленькі...

У пуні яны засталі Хвёдара пры тым, як ён канчаў аблупліваць карову. Над яшчэ цёплым тулавам віўся ледзь прыкметны дымок пары...

— Га? —адазваўся Хвёдар на прывітаньне Зьмітрака.

— Ты ня кепскі скуралуп! Навошта такую добрую карову зарэзаў?

— Як навошта, на мяса,—спакойна адказвае Хвёдар.

— А ведаеш, што дастанеш за разбазарваньне жывёлы?

— Жывёла мая, што хачу, то і раблю.

Хвёдар адразу падняўся, і твар яго зрабіўся сур'ёзным. Ня ведаў як схаваць боты і рукі, запэцканыя ў крыві.

— Эх, ты скуралуп! Раней Сідара некалькі год лупіў, а цяпер вось што робіш! Хадзем! Трэба рабіць вопіс тваей гаспадаркі. Хлопцы, запрыце пуню, каб сабакі ня ўлезьлі сюды,—зьвярнуўся Зьмітрок гаспадарчым тонам.

— Што? Раскулачваеш?—запытаўся Хвёдар зьмененым раптам голасам і левая рука ў яго задрыжэла.

Зьмітрок нічога не адказвае.

У хату ідзе не ранейшы Хвёдар: моцны і ўпэўнены, а чалавек, якога раптам нібы схваціў паляруш. У яго павісьлі рукі і апусьцілася галава.

На гумне стаяць, нібы дробныя хатачкі з дзіцячых казак, рамачныя вульлі. Іхнія маленькія стрэшкі абтрушаны сьвежым сьняжком Дзьверцы і сьценкі вульляў ахварбаваны ў зялёны колер. Над вульлямі, нібы белыя пчолы, кружацца, мільгаюць сьняжынкі.

— Падлічы, Лявон, вульлі,—зьвярнуўся Зьмітрок да аднаго маладога хлапца з комсамольскай брыгады.

...А цяпер так трэба рабіць...—навучаў айцец Дзімітры,—зараз-жа, пакуля ня выслалі, падацца ў колгас. Усім нашым гаварэце, каб ішлі... А там далей відаць будзе што рабіць. Трэба, каб колгасы апынуліся ў нашых руках.. Вы разумееце?

— Разумею...—кажа Слуп.

— Разумеем яшчэ як...—дадае Бочка.—Нас дык, мабыць, ня прымуць, але іншых з нашых возьмуць.

Той самы маленькі пакойчык. Тая самая лямпа на стале і „Матушка" слўхае вельмі зацікаўлена. Жвавы кот грае фрэнзьлямі сарвэткі, якія вісяць з камоды.

Мала таго, што акяніцы зачынены, вокны шчыльна завешаны тканінамі.

На дварэ сеецца дробны сьнег, пытлюецца, і пыліцца, і туліцца каля платоў і сьцен будынкаў невялікімі гурбамі. Каля царквы сьцелецца сіняя ноч. Над купалам вісяць халодныя зоркі.

Айцец Дзімітры п'е гарбату. „Матушка" налівае з самавара і гасьцём. Яны, чырвоныя і оптныя, слухаюць настаўленьні айца:

— Да вясны трэба трымацца так-сяк, а потым пабачым. Заграніцай маўчаць ня будуць. А як толькі вайна, дык наша ваколіца будзе вызвалена ў першы дзень.

Айцец аглядаецца на завешаныя вокны. Доўга прыслухоўваецца. прыгнуўшы трохі галаву на левы бок. Апрача шуму самавара нічога ня чуваць.

— Вясною нешта будзе. Вайна нямінуча. Увесь сьвет супроць тутэйшых парадкаў...

Голас айца шапатлівы і мэлянхолічны.

— Канец усяму-ж гэтаму павінен быць. Так цягнуцца доўга ня можа...

Ён частуе гасьцей папяросамі.

— У мяне іх цэлы запас. Яшчэ у восені купіў на трыццаць рублёў. Цяпер у коопэрацыі ні за якія грошы не дастанеш.

„Матушка“ перагортвае старую „Ніву“. Глядзіць на малюнкі ды любуецца:

— Вось прыгожа. А як пісалі даўней. Прыемна чытаць.

— Э-э-эх...—глыбока ўздыхае айцец Дзімітры і вачыма ўпёрся ў сьцяну, нібы некага бачыць там жывога. Вочы ў яго павялічыліся, пацямнелі.

На дварэ гудзе вецер. Каля сьцен царквы мільгаюць цені. Вось яны вызначаюцца чорнымі профілямі, а вось сьнег зноў закруціў, калматымі сівымі лапамі пачаў мацаць высокія сьцены, давай пыліць па іх белай мукою. І зноў нікога няма. Толькі ноч сіва-сіная глядзіць з усіх бакоў, вандруе па сьнежным полі ў абмерзлых лапцёх. А з зажмураных далячын імчыцца вецер, імчыцца грозны і суворы, і блытае па саламяных стрэхах свой заільдзянелы бурнос.

І думае айцец Дзімітры.

...Хутчэй ужо скінуць гэту агідную расу ды зноў апрануць блі. скучы мундзір паручніка...

Слуп і Бочка кураць папяросы, зацягваюцца смачным дымам і на іх тварах разьліта прыемнасьць.

— Даўно такіх добрых папярос ня курыў.

— Аг-га...

Забрахаў на дварэ Мурза.

Уздрыганууся айцец Дзімітры і давай азірацца па бакох.

Слуп і Бочка ўскочылі з табурэтак.

— Што гэта можа быць?—устрывожылася „матушка“ і адкінула ад сябе „Ніву“.

Загаласілі, завылі на розныя галасы ўсе сабакі вёскі Глухаўкі.

У айца Дзімітрыя ледзь дрыгнула барада.

— Няўжо-ж...—прамармытаў ён...—Няўжо-ж вобыск?

Адну хвіліну прыціснуў стол правай рукой. Пальцы пабялелі. Супакоіўся:

— У хаце нічога ня знойдуць. Няма чаго баяцца.

— Адчыне-е-це!

На ганку тупат ног. Драчык, трое вайскоўцаў-прымежнікаў ды некалькі комсамольцаў увайшлі ў хату. Усе са зброяй у руках.

У прытульны пакой уварваўся холад зімовай ночы. Вочы ў людзей блішчаць, марозны срыбны шэрань на брывох.

Аж да поўдня круціла завея. Марозным подыхам яна імчалася па полі па замеценых дарогах. Гурбы сьнегу наносіла на гумны.

Мікола і Сакалоўскі сягоньня яшчэ нікуды ня выходзілі. Трэба ехаць у Менск, а тут гэткае на вор'е.

Марцін лапатай пракопвае сьцежку ад двара да гумна, а Мэра трымае на каленах Зорачку і кажа да Міколы і Сакалоўскага:

— Не бядуйце, пад вечар паедзеце. За дзень дарога палепшае.

— Навошта чакаць?

— Ды ўсёроўна адпачнеце. Гэтулькі ў нас працавалі. Ды як працавалі. Ня елі, ня спалі.

— Ну, гавары, гавары! Яшчэ што скажаш?

— Ахрып ты, Мікола, высах, аброс барадою.

Зорачка паўтарае за Мэрай:

— Дядзя ахліп, высах, аб'ёс баядою...

Усе сьмяюцца.

— Аж нейк ня верыцца,—кажа Мэра,—што ў нас ўжо колгас. Здаецца, нічога не зьмянілася.

— Вясною зьменіцца. Тыя межы, якія цяпер занесены сьнегам, будуць завораны. Іх зьнішчыць трактар.

— Мама, сто такое т'яктай?—пытаецца Зорачка.

Не пасьпела Мэра адказаць Зорцы на гэтае запытаньне, як у хату ўвайшоў „Леў Талстой".

Не сказаўшы „дзень добры", ён адразу запытаўся:

— Чулі?

— А што?

„Леў Талстой" да таго ўсхваляваны, што доўгі час атрасае нешта нявідочнае з барады.

— Ды на вашай барадзе няма сьнегу!— сьмяецца Мэра.

— Так. А я, трэба прызнацца, мог-бы трэсьці яе яшчэ доўга, бо яна белая сама па сабе, а я ўсё думаю, што на ёй сьнег. Так. Ух, ты! Забыўся, што мне даўно стукнула шесьцьдзесят год. Так! Мая барада і летам пакры...

— Дык раскажы, брат, у чым справа? Чаго прыбег так раптоўна? — зацікавіўся Мікола.

„Леў Талстой" наставіў на яго вочы, памацаў кішэні ды ўстрывожыўся:

— Ах, ты ліха! Акуляры ў хаце забыўся.

— Раскажы без акуляраў,— параіў Мікола і ўсьміхнуўся.

— Так. Сягоньня ў ночы быў вобыск у бацюшкі. Арыштавалі яго і Слупа і Бочку. Яны якраз былі на той час у яго хаце. Доўга шукалі, дык вось у царкве раскапалі нейкі стары склеп, а там знайшлі пудоў сто тухлага збожжа, шмат контрабанды і дзьве кадкі з салам: каля пятнаццаці пудоў.

— Ого-го-о-о! Гэта дзела!

Мікола ўскочыў з свайго месца.

— Бачыш ты іх! Дзе-ж яны цяпер, арыштаваныя?

— Павязьлі ў Шапалевічы — ў раён. Так. А раскулачваньне ідзе поўным ходам!

— Каб хаця Драчык не перахапіў мерку,—заўважыў Мікола. — Але не! Было ўсё гэта абмеркавана раней з удзелам раёну. Пагрэйся, стары, і назад туды пайдзем — у Гайдачаны.

— Не у Гайдачаны, а ў Першае Мая. Так, — паправіў яго „Леў Талстой".

Як супакоілася завея, засьвяціла яркае сонца.

Бліскучы і крохкі сьнег сьляпіў вочы. Мікола, Сакалоўскі і „Леў Талстой" ішлі ў Першае Мая.

„Леў Талстой" усю дарогу апавядаў падрабязнасьці вобыску.

Пры гэтым кожную хвіліну спыняўся і ўстаўляў у свой верставы монолёг сьвежыя навіны:

— Ага, ледзь не забыўся. Так. Раскулачваюць сягоньня Слупа і Бочку. Так.

Прайшлі яшчэ трохі і „Леў Талстой" зноў успомніў:

— Бацюшка, як кажуць, зусім ня быў раней духоўнай асобай, а белагвардзейскім афіцэрам.

...Вось табе „храм божы",—думае Мікола.—А хлебанарыхтоўкі? У кулака лепш згніе збожжа, а дзяржаве даць ня хоча...

— Ага,—перабіў яго думкі „Леў Талстой",—шмат золата знайшлі ў склепе пад царквою. Так. Бацюшка, тоісь афіцэр белагвардзейскі, тлумачыў, што золата і контрабанду тут схаваў ня ён, а Язэп Крушынскі.

Сельсавет перанесьлі з Гайдачан у дом бацюшкі. Драчык яшчэ ўвосені зьбіраўся гэта рабіць. Усё часу ня было.

Царква зусім забыта людзьмі. Дзьверы яе занесены сьнегам. Часта Драчык глядзіць на яе праз вакно сельсавету. Яна мазоліць яму вочы.

І вось была пушчана пагалоска, што стары Сухарукі адзін з бацькоў Драздоў і Дзятлаў, нейк дзіўным зрабіўся. Пачаў гаварыць сам з сабою аб тым, што нікога на свае межы ня пусьціць, што крыжам ляжа і сваёй зямлі нікому не аддасьць.

Аднаго разу ў мяцеліцу, калі ў полі круціла завіруха і намяло многа сьнегу, стары Сухарукі ўзяў лапату і пайшоў шукаць у сьнежным прасторы палёў свае палоскі-

— Хачу перад сьмерцю паглядзець свае шнуры,—гаварыў ён і давай лапатай раскопваць тое месца, дзе каля стагодняга адзінокага дуба павінна была быць вузенькая мяжа аднаго з яго шнуроў.

Ён капаў лапатай, а мяцеліца круціла, выла над яго галавою, сьляпіла вочы і новыя гурбы намятала на тым самым месцы. Вось ён дабіраўся да самой глебы, да таго месца, дзе ўвосені вылезла з зямлі скупая рунь, тоненькія жыцяныя шпілечкі, але мяцеліца зноў засыпала сьнегам ачышчаную глебу.

Як аб гэтым даведаліся колгасьнікі, дык гаварылі, што Сухарукі звар'яцеў, папрабавалі супакойваць яго тым, што ніхто яго шнуроў чапаць ня будзе. Няхай ён сабе асобна гаспадарыць.

У другі раз ён у цёмную ноч пайшоў некуды. Хатнія не агледзеліся. Раптам пачулі людзі сярод ночы перакліканьне званоў. Устрывожыліся, аглядаліся, ці не палыхае ў небе полымя пажару. Прыслухоўваліся, ці ня чуваць крыку, гвалту. І пабеглі з усіх бакоў да забытай царквы.

На званіцы знайшлі адубелага ад мароза і зусім звар'яцелага Сухарукага. Ён упіраўся рукамі і нагамі ды не хацеў зьлезьці.

Некаторыя старыя бабы ў сувязі з гэтымі званамі пачалі прыдумваць новыя байкі аб „цудах божых".

Тады колгасьнікі пастанавілі зьняць званы.

20. Трывожныя дні

Нарэшце вышла з друку кніжка Антона Цярэшкі „Галасы палёў". Аўтар з трывогаю чакаў што аб ёй скажа крытыка:

... Ці будзе заўважана тое, аб чым ён выказваў свой боль? Ці пачуюць гэты „голас палёў"? Ці дойдзе ён да сэрца? Ці знойдуць тое, што ёсьць у гэтых вершах між радкамі, між словамі?

Ён хацеў, каб усё гэта было знойдзена, было зразумела, бо ў адваротным выпадку—ня варта было пісаць...

Ён і не хацеў гэтага; бо тады пачнуцца на яго, Цярэшку, напады, і няма ведама, чым гэта ўсё можа кончыцца...

Антон Цярэшка пільна сачыў за газэтамі: калі ўжо зьявіцца? У інстытуце ён прыглядаўся да твараў людзей, можа ўловіць усьмешку пры сустрэчы з імі, можа хто проста зьвернецца да яго са словамі: „Тав. Цярэшка, ёсьць у друку аб вашай кніжцы"...

Але сам інстытут перажываў тады трывожныя дні. Нікому з інстытутчыкаў і ў галаву ня лезла кніжка Цярэшкі.

Некаторым Цярэшка даў свае „Галасы палёў" з цёплым словам „ад аўтара". Дзякавалі, ціскалі руку. „лічылі за гонар, але ніхто з іх не казаў яму свайго погляду аб „Галасох палёў".

Да Інстытуту была тады прымацавана рабочая брыгада: праверка працы Інстытуту за ўсе гады і чыстка парт'ячэйкі. У калідоры была прымацавана да сьцяны скрынка з надпісам на ёй:

Сюды апускаюцца матар'ялы да чысткі

Многія з працаўнікоў трывожна будзілі сваё мінулае, успаміналі даўно пазабытае, прыглядаліся адны да адных, шэпты вялі па кутках. Настрой у іх быў такі, як у Цярэшкі.

— Калі напішаце?—зьвярнуўся раз Цярэшка да свайго крытыка Гайдача.

— Цяпер не да гэтага,—адказаў Гайдач.—Хіба пасьля, як у нас усё супакоіцца.

Гайдач трымаў нос па ветру і наогул лічыў, што лепш ня пісаць у часе буры і завірух, а то яшчэ можна ўлезьці ў такую бяду, што і ня вылезеш.

Тое самое і юбілейны крытык.

Ліхаманкава блішчэлі тады вочы ў некаторых інстытутчыкаў. Яня ня спалі начамі.

А ў страшную скрынку ляцелі паперкі.

Што-ж там, у тых паперках? Які лёс яны нясуць? Прыглядаліся нстытутчыкі да твараў рабочых з брыгады, да выразу іх вачэй, лавілі кожнае слова..

Усе ведалі, што хутка пачнецца... Але заўчас хацелася знаць тым, у каго на сумленьні паіржавелыя гіры туманістага мінулага.

Антон Цярэшка дачакаўся. Зьявіўся артыкул у „Савецкай Беларусі".

„Гэта не галасы палёў, а галасы кулакоў",—гаварыў крытык.—„Няўжо-ж можна ў такі час вострага змаганьня, калі на вясковых палёх наступае кляса на клясу, пісаць аб воблаках, зорках і курганох? Ды яшчэ ў такіх танох, як пісалі прыблізна сорак год таму назад? Каму патрэбны гэты сум, сьлёзы, маркотнасьць, задумёнасьць?"

Прыводзілася многа ўрыўкаў з вершаў Цярэшкі з запытаньнямі да іх:

„Аб чым поэт сумуе? Аб чым ён льле такія сьлёзы? Сум поэта гэта сум кулака. Сьлёзы яго—плач клясавага ворага, які адчувае сваю нямінучую гібель. Апрача малюнкаў прыроды ў гэтым зборніку вершаў (лосыць слабых з формальнага боку), нічога нама. Ні слова аб клясавым змаганьні, ні слова аб .колгасах і комунах. Для Антона Цярэшкі рэконструкцыя сельскай гаспадаркі пусты гук. Антон Цярэшка—кулацкі поэт. Ён чэрпае свае настроі з чужых для нас крыніц. Цярэшка нам чужы".

Артыкул заняў у „Савецкай Беларусі" цэлы падвал, пад якім стаяў подпіс: „Н. Бандарчук".

Цярэшка аж ускочыў з свайго месца.

Яшчэ больш Цярэшка ўзьеўся за два радкі ў гэтым артыкуле:

„Цярэшка сядзеў сабе ў кулацкім хутары і копіраваў настрої кулака".

— Няхай яно згарыць гэта Курганішча!— сказаў ён у голас.— Вось і падарунак ад стрыечнага брата...

Цэрэшка злаваўся няма ведама на каго і на што. Быў вінаваты і Крушынскі, і цяжкі час, і „тэндэнцыйны" крытык, і жонка, якая псавала яму нэрвы, і ўвесь сьвет—толькі ня ён сам...

Хацеў быў Цярэшка плюнуць на ўсё гэта, але нешта ўнутры смактала, трывожыла і супакою не давала.

Першае, што Цярэшка зрабіў супроць крытыкі, гэта тое, што ён перастаў вітацца з Бандарчуком... Бандарчук на гэта ніякай увагі не зьвяртаў. І гэта яшчэ больш злавала яго.

У той час трамвай сьвяткаваў свае першыя мядовыя месяцы на вуліцах Менску. Кончыліся анэкдоты аб тым, што рэйкі будуць дваццаць год іржавець на бруку, пакуль дачакаюцца вагонаў. Аўтары анэкдотаў з нецярплівасьцю чакалі, „калі ўжо спыніцца трамвай," „калі сапсуюцца вагоны", бо:

— „Ня можа быць, каб у нас усё добра ішло".

А тым часам на вуліцах гораду кіпела. Гулі трамваі, зьвінелі. Новенькія, прыгожыя вагоны імчаліся па бліскучых рэйках з канца ў канец гораду.

Пролетарскі Менск радаваўся, а Цярэшка сабе месца не знаходзіў. Усё яму было чужым і далёкім.

Тым часам Язэп Крушынскі яго не забываў. Часта лісты прысылаў з Нарымскага краю. Калі-ні-калі пытаўся, што робіцца цяпер у Курганішчы. Аднаго разу напісаў, што сустрэўся там з былым агрономам Іванам Мацьвеевічам Шапавалавым ці паранейшаму Антонам Сяргеевічам Мятловым.

Цярэшка адразу рваў гэтыя лісты.

... Вось каб можна было так сабраць увесь тыраж маёй кніжк „Галасы палёў" і парваць на дробныя кавалачкі...

Часам ён зайдросьціў і аграному і Язэпу Крушынскаму.

... Яны цяпер спакойны. Яны працуюць „там", і ніхто іх не чапае. У іх там ідзе новае жыцьцё на новым месцы. А я...

Свае скаргі Антон Цярэшка выказваў цяпер толькі аднаму: чалавеку з вачыма сфінкса і эўропейскай бародкай.

Той раіў:

— Углыбецеся ў сябе. Вы ў самім сабе знойдзеце вялізны сьвет лятуценьняў... Думайце аб вечным харастве на зямлі і не ўдавайцеся ў тыя драбніцы жыцьцёвыя, якія мільгаюць, як цені. Будзьце горды сабою, а ўсё рэшта трынь-трава.. Вы чалавек, шануйце свой чалавечы гонар. У вас тады зьявяцца такія ідэі, якія дадуць вам вялікую асалоду.

Глядзіць Цярэшка ў сфінксавыя вочы аднаго з былых „прэм'-ераў" беларускіх „міністэрстваў" і шукае ў іх апоры. Усьміхаюцца блакітныя вочы, паблеклыя за пяць дзесяткаў год, і глыбока пранікаюць Цярэшку.

— Ведаеце што,дзядзька Цярэшка,—зьвяртаецца да яго чалавек з вачыма сфінкса,—прыходзьце да мяне. Я вас навучу адносіцца абыякава да ўсяго, што робіцца вакол, да ўсялякіх вашых няпрыемнасьцяў. Трэба мець цьвёрдасьць духу... А вашыя „Галасы палёў" вельмі ўдала напісаны...

Крытыка прац інстытуту перанесена ў адзін з рабочых клюбаў. З усіх канцоў гораду накіроўваюцца туды інстытутчыкі. Кожны вечар у вялікай залі клюбу шмат народу. Асьпірант Бандарчук сядзіць у прэзыдыуме. Ён узяў на сябе абавязак сэкратарства. Апрача інстытутчыкаў, якія акуратна прыходзяць сюды кожны вечар, тут прысутнічае шмат рабочых.

Антон Цярэшка сядзіць у кутку і прыслухоўваецца да выступленьняў.

— Дык вось, таварышы...—чуе Цярэшка голас аднаго з рабочых,—глядзеце, хто засеў у Інстытуце? Усе ранейшыя беларускія „міністры". У выпадку чаго, дык у іх гатовы свой урад! Я ня ведаю, чаму ячэйка да гэтага часу ня прыймала болей рашучых мер, чаму ячэйка так раскланьваецца перад так званымі прафэсарамі... Гэта можа горш, чым опортунізм, таварышы!

Цярэшка ўглядаецца ў прамоўцу: той-самы наборщчык Сакалоўскі. Ён успамінае розныя сустрэчы з гэтым Сакалоўскім. Голас яго строгі. Калі-ні-калі чуюцца асабліва грозныя выкрыкі. Вось зараз сарвецца ў яго лаянка. Але не: ведае меру. Вочы колеру піва пацямнелі.

— Відаць, часта выступае,—думае Цярэшка.

У гэты час Цярэшка забывае пра крытыку яго кніжкі „Галасы палёў". У моры вялікіх няпрыемнасьцяй, калі праца Інстытуту разносіцца ў пух і прах, яго кніжачка толькі малая кропля... У гэтым ён знаходзіць для сябе нават малую ўцеху.

У вялікай залі цішыня. Ніхто і не шапне. Толькі калі-ні-калі чуваць прыглушаны рукою кашаль.

... Бачыш, як рабочыя цікавяцца навукай...—думае Цярэшка.

Ён углядаецца ў незнаёмыя твары мужчын і жанчын і шукае сярод іх асабліваснцяй тыпу, рысаў твару... Адно ён заўважае, што рабочыя чыста і добра апрануты. Ня горш за вучоных інстытутчыкаў. А некаторыя вучоныя спэцыяльна для гэтых вечароў у рабочым клюбе, замест капялюхоў ці каракулевых шапак, насунулі на галовы старыя кепкі...

— Я, таварышы, рабочы,—чуе Цярэшка голас Сакалоўскага.—Не бяруся сам крытыкаваць навуковыя працы Інстытуту, але, паводле

водзываў нашых компэтэнтных таварышоў, у навуцы адбываецца шкодніцтва. Мастацтва нашае гэта, паводле мастацтвазнаўцы, апісаньне цэркваў і касьцёлаў, у аграрных працах апраўдваецца тэорыя Прышчэпава, які спрыяе кулаку, у гісторыі адмаўляецца клясавае змаганьне на Беларусі. Таварышы! Гэта яўнае шкодніцтва! Гэта працяг дзейнасьці контррэволюцыйных радаўцаў і так званых маршалкаў і міністраў, якія знайшлі сабе ў Інстытуце цёплае месца!

Цярэшка смаліць папяросу за папяросай, апускае нізка галаву, бо яму ўсё здаецца, што новы крытык Бандарчук шукае яго вачыма.

Чалавек з вачыма сфінкса падсеў да Цярэшкі. Шапнуў яму на вуха:

— Прыдзеце заўтра да мяне. Я зараз адгэтуль выходжу. Трэба супакоіць нэрвы.

— Дык вы таксама непакоіцеся?—зацікавіўся Цярэшка.

— А дзе-ж ты, чалавеча, дзенешся...

Цярэшка заўважыў, што за час гэтых вечароў у рабочым клюбе твар чалавека з вачыма сфінкса пакрыўся маршчынамі, і вочы зусім выцьвілі, нібы змылі з іх сінюю фарбу.

— Нам патрэбны ў навуцы свае пролетарскія кадры,— чуе Цярэшка, як праз сон, голас прамоўцы.

Бандарчук пры стале прэзыдыуму нешта ўпісвае ў свой блёкнот. Недалёка сядзіць і Мікола Ярэмчык. Ніколі ў яго ня было такога вясёлага твару, як тут у рабочым клюбе.

— Чыстка павінна быць у нас самая бязьлітасная! Побач з гэтым нам патрэбны новыя кадры вучоных.

Пры гэтых словах прамоўцы ўздрыгнулася рука профэсара Максіма Максімавіча—былога дзянікінца. Ён трымаецца рукою за крэсла і доўгія тонкія пальцы яго дрыжаць. Шамкае губамі.

Калі пасьля аднаго з такіх вечароў Мікола Ярэмчык прышоў дамоў, ён знайшоў на сваім стале ліст ад швагра Марціна. Той пісаў:

„Дарагі Мікола.

Праца ў нас кіпіць. Мы усе рыхтуемся да веснавой сяўбы. Трыеры з комуны „Чырвоны Кастрычнік“ працуюць поўным ходам. Кончыўшы з абагульваньнем, колгасьнікі цяпер возяць лес на новыя хлявы ды на іншыя патрэбы. Да нас цяпер часта прыяжджаюць рабочыя брыгады і дапамагаюць нам у працы. Антон Драчык працуе з усіх сілі ўдзень і ўночы, ніколі аддухі ня мае. На пасяджэньнях сельсавету ці праўленьняў нашых новых колгасаў ён выстаўляе для абмеркаваньня такія цікавыя пляны, ажна многіх радасьць прабірае. Аднак, некаторыя выпісаліся з колгасаў і ў сувязі з гэтым было нямала новых няпрыемнасьцяў. Вясною прышлюць нам з Украіны сто цялушак і некалькі заводных сьвіней. З раёну нам абяцаліся

прыслаць штучнага ўгнаеньня некалькі сот пудоў. Усё ідзе ня кепска. Я ўпэўнены, што ўжо да вясны забудуцца старыя назвы вёсак Гайдачанскага сельсавету.

Усе мае жывы і здаровы. Мэра і Зорачка табе кланяюцца. Зорачка просіць, каб ты купіў ёй трактар у Менску. Вось табе і малыя дзеці аб трактарох загаварылі. Цікавыя часы! Праўда? Ага! Яшчэ адна навіна. Пры абагульваньні вельмі шмат працаваў стары Гарбочык з белай барадою. Памятаеш яго? Усё ў нас завуць яго „Леў Талстой". Ён прастудзіўся, хварэў некалькі дзён і памёр. Перад сьмерцьцю цябе бачыць хацеў. Ён мне перадаў для цябе свае рукапісы. Іх вельмі многа. Прасіў, каб ты іх друкаваў у Менску. І яшчэ адна навіна! Стары дзед Сухарукі звар'яцеў. Бегае па дарогах з лапатай у руках ды ўсё гаворыць аб сваіх межах засыпаных сьнегам. І яшчэ адна навіна! З царквою ў нас пакончана. Новага папа няма. Некаторыя з колгасьнікаў паляць абразы. У сувязі з гэтым між старымі і маладымі адбываюцца вялікія спрэчкі, якія часам даходзяць да боек. Дык вось, Міколка, што ў нас робіцца! Яшчэ нейкія цёмныя сілы стараюцца баламуціць нашых сялян, але нічога! Перамога на нашым баку. У колгасе „Чырвоная ніва" скінулі старшыню. Помніш, як ён на сходах вырабляўся, крычаў, што толькі ў колгасах добра будзе жыць і запісаўся адным з першых? Дык вось што ён зрабіў— прысвоіў сабе шмат з маемасьці раскулачаных ды кожны дзень ладзіў вечарынкі ў сваёй хаце. Вось і вер! Яго, вядома, выкінулі з колгасу. Трэба пільна глядзець за тым, каб кулацкія агенты ня ўлезьлі ў колгасы. Можа вырвешся калі да нас на некалькі дзён? Напішы, дык я па цябе адразу прыеду".

Мікола толькі ўсьміхнуўся на гэтае запрашэньне.

— Дзе-ж тут паедзеш, калі ў Інстытуце гэтулькі цікавага! Хутка Інстытут будзе адноўлены. Увальюцца ў яго сьвежыя сілы. Будзе выкіунта шмат старога барахла...

Удзень Цярэшка ходзіць у Інстытут на працу. Усе сталі вельмі акуратнымі... Кожны з навуковых працаўнікоў адседжвае гадзіны пры сваім стале. Часам некаторыя з інстытутчыкаў шэпчуцца між сабою. У іх вачох трывога.

Ледзь ня што дня мяняецца насьценгазэта „Навука і Праца". Ёю пачалі цікавіцца...

Трывожныя дні.

Ходзіць Цярэшка з габінэта ў габінэт да навуковых працаўнікоў, аглядаецца па змрочных калідорах, туліцца каля сьцен.

— Што чуваць?—пытаецца ён, як у хворых.

— Тое самае...

Зноў садзіцца на сваё месца і глядзіць праз вакно. Калі супакоіцца трохі ад агульнай трывогі ў Інстытуце, тады пачынае яго

мучыць нутраны боль. Як ні стараецна забыцпа пра крытыку, паводле парады чалавека з вачыма сфінкса, а паасобныя сказы артыкулу ня выходзяць з галавы:

...Цярэшка нам чужы...

...Кулацкі поэт...

...Хутарская лірыка...

Курыць Цярэшка папяросу за папяросай і глядзіць у вакно. Дахі абтрушаны сьнегам. Дзе-ні-дзе ў аддаленьні над высокімі фабрычнымі комінамі кучаравяцца дымкі.

У такія хвіліны Цярэшка хоча схавацца ад усяго сьвету, каб нікому не мазоліць сабою вачэй. Хоча, каб усе забыліся аб ім, аб яго поэзіі, аб яго кніжках.

Кожны дзень заходзіць да яго чалавек з вачыма сфінкса. У таго цяпер зьявілася новая ідэя:

— Пішэце для самаго сябе... Не старайцеся ламаць сваёй псыхолёгіі, а будзьце такім, якім вы ёсьць...

Гэта ідэя падабаецца Цярэшку. Ён так і робіць. Піша і чытае сваім блізкім.

Нікаторыя з яго падпольных вершаў чалавек з вачыма сфінкса сам на машынцы перапісвае і раздае таму-сяму...

— Трэба дзейнічаць,—навучае яго чалавек з вачыма сфінкса і пачынае яму апавядаць сны: яго ўласныя, жончыныя. У снох фігуруе БНР, шыбеніцы, кароль у кароне з васількоў.

Пры гэтых апавяданьнях-снох у чалавека з вачыма сфінкса няпрытомныя агоньчыкі ў вачох...

Трывожныя дні.

У гэтыя дні ў Міколы Ярэмчыка вольнай хвіліны няма.

Крытыка прац Інстытуту за некалькі год зьяўляецца для Міколы працягам працы пры колектывізацыі Гайдачанскага сельсавету. У ва ўсім гэтым ён адчувае лёгічны ход падзеяў, якія з нязвычайным імпэтам імчацца наперад. Накіроўвае адна магутная рука.

Мікола часта думае аб гэтым адзінстве і рад, што таксама і ён прымае хоць маленькі ўдзел у тварэньні новай гісторыі, якая разгортваецца перад ім шырокім палатном.

Плывуць трывожныя дні адзін за адным: адліга, мароз, мяцеліца. Мікола іх не заўважвае. У ліхаманцы напружанай працы ён з кожным днём усё ярчэй і ярчэй бачыць строгае адзінства і вялікі сэнс у змаганьні новага са старым, як на вёсцы, так і ў горадзе.

Пасьля вечароў крытыкі навуковых прац у рабочым клюбе, у Інстытуце пачалася чыстка...

21. Межы

Па лясох, па тых гушчарох, дзе і ўлетку мала доступу сонечным косам, дзе-ні-дзе яшчэ туляюцца ад неба закарэлыя латачкі сьнегу. На іхнія крохкія сьпіны сеяцца з дрэў пажоўклыя хвойныя голкі. Сюды ледзь пралазіць цёплы вецер. Ён трэцца-ціскаецца каля шурпатых грудзей стагодніх пнёў і кідае праз густыя галіны сонечныя кропачкі на забытыя вясною кавалкі сьнегу. Смокча вецер прытоеныя ў лесе рэшткі зімы і вакол замурзаных сьнежных латак блішчаць лужыны. Воддаль рупліва ёрзаюць па моху розныя мурашкі. Над дрэвамі па вясноваму чылікаюць птушкі, разгульвае сонца.

Па зялёных лясных палянах, па лугох і палёх, па азімай руні, па рэчках і вёсках вандруе красавік у жаўронкава-сонечнай сьвітцы. На месцы яго сьлядоў як-бы ніколі не даплываў сюды воўчы лямант з асівелай сьцюжы хвойнікаў.

Пад босымі нагамі красавіка сьцелецца юнацкая пахучая глеба, разгортваецца ярка-зялёная далячыня, апушаная мяккай, як дзіцячыя валасы, травою.

Каля прасёлачных дарог, цягнуцца дзе-ні-дзе вузенькія, нібы істужкі, шнуры, доўгія, дзесяткамі год нечапаныя, межы. Воддаль— купкі саламяных стрэхаў.

За мінулую зіму паплыла ў нябыт частка апошняй спадчыны стагодзьдзяў. Зьніклі Глухоўкі, Ванцэвічы, Магданаўкі. Зьніклі ранейшыя назвы вёсак, якіх агідная паншчына хрысьціла калісьці прозьвішчамі паноў часоў прыгону.

Межы на вузенькіх загонах дажываюць свае апошнія дні. Некаторыя глядзяць на іх з прытоенай жаласьлівасьцю ў вачох, а некаторыя з несхаванай радасьцю. Зараз зьнікнуць межы разам са старымі панскімі назвамі вёсак і хутароў. Дажываюць апошнія гады і саламяныя стрэхі.

Па зямлі вандруе красавік.

Грэецца на сонцы стары Цыпрук Ярэмчык. Зьняў з сябе кажуронак і выставіў засохлыя грудзі, аброслыя сівымі валасамі.

... Няхай пякуцца!

Ён нейдзе чуў, што вясновае сонца лечыць чалавека лепш за розных дактароў.

Прыжмураныя вочы Цыпрука блішчаць дзьвюма ільдзінкамі. Ён глядзіць на старыя межы і гаворыць сам з сабою:

— Зараз іх ня стане, ці што? Ну й здольны народ пайшоў на розныя мудроныя штукі!

Стары Цыпрук абапіраецца аб моцны кій і грэе асівелыя валасатыя грудзі.

Павольным крокам падыходзіць да яго матрос царскіх часоў Солах.

— Добры дзень.

— Дзень добры.

У Солаха пануры выгляд. Вочы пазіраюць у глыб. Ён пастарэў за гэтую зіму.

— Ну, як?—пытаецца Солах надломаным голасам,—скора сяўба?

У яго такі голас, нібы працягвае толькі што спыненую гутарку. Глядзіць на Цыпрука такімі вачыма, быццам стары ў нечым перад ім вінаваты.

— Хутка, братку мой, ці што...—адказвае Цыпрук.—Я вось гляджу на іх... (ён паказвае на вузкія шнуры). Усё жыцьцё іх бачыў і быццам сягоньня толькі ўгледзеў.

— Твой Мікола табе акуляры надзеў,—гіронізуе Солах і мерае сур'ёзнымі вачыма цыпрукову постаць.

— Ай-я-яй, які народ пашоў...—адказвае Цыпрук ня Солаху, а ўласным думкам.

Стары мяняе позу, настаўляе далонь над вачыма, як брыль, міг адзін глядзіць зажмураным вокам супроць сонца, дзе на далёкіх паплавох тырчаць пустыя сьцяжарні, раптоўна адварочваецца ад Солаха і кажа радасным голасам (каб дапякчы Солаху): „Усе межы сёлета заарэм!"

— Хто-ж гэта „мы"?—пытаецца Солах.

— Ну, мы ўсе... і я, і ты...

— Без мяне мяне жанілі,—кажа Солах,—Няхай будзе „мы",—згаджаецца ён.—Затое і ваявалі тут ўсю зіму.

Пры гэтым Солах успамінае чамусьці вайну з Японіяй. Глядзіць задумёна на межы і ўсьміхаецца самому сабе.

Цыпрук з нецярплівасьцю за ім назірае. Ведае, што калі Солах моршчыць лоб гармонікам, дык скажа зараз нешта цікавае. Любіць Цыпрук цікавае паслухаць...

— Та-а-ак...—Солах трэ лоб рукою.—Мы цяпер колгасьнікі Энгельса. Прывык ужо да новай назвы. Ну, і ваявалі зімачку, а ўсё за гэтыя межы! Ведаеш?

— Што?

— Крэпасьць Порт-Артур лягчэй далася, чым гэтыя межы.

— Ну?

— Так, так!

— Яно і праўда.

— Усё гэта яшчэ віламі па вадзе пісана,—пачаў Солах сумнявацца. Многія яшчэ ня вераць, што сапраўды будзе адно вялікае поле. Некаторыя прыхавалі збожжа. На ўсялякі, кажуць, выпадак.

— Плугі ўжо гатовы, насеньне прачышчана, няхай толькі трохі зямля абсохне. Яшчэ якіх тры дні, калі будзе пагода. А сягоньня мы пойдзем з Міколай у Гайдачаны паглядзець колгасную сяўбу. Кажуць, трактары заўтра раніцою, ці што, прыедуць. Бачыў Міколу? Ён сягоньня аўтобусам прыкацiў. З ім нейкі рабочы Сакалоўскі, які зімою ў мяне начаваў.

— А як-жа, і мой Саўка пойдзе. Ён цяпер газэтная шышка. Піша і друкуе. А дзе Мікола?

— Мікола? Ды ён у канцылярыі колгасу, падганяе на сяўбу ці што.

Пад вечар, калі пры будынках паляглі доўгія цені, па новай грэблі, дзе колькі год таму назад квохала непралазная гразь, пашлі чацьвёра: стары Цыпрук, яго сын Мікола, Сакалоўскі і Саўка Солах.

Яны ішлі ў Гайдачанскі сельсавет на колгасное сьвята, каб паглядзець заўтра раніцою трактарную колёну.

Над бярэзьнікам палыхае, дрыжыць яркая бавоўна зараніцы. Зьвіняць жаўранкі. Сьвежы ветрык шапаціць між галінамі.

Ад бярэзьніка пачынаецца аграмаднае поле, шызае ад ценяў веснавой ночы. А вось брызнулі шырокім вэерам першыя праменьні сонца. Цені на полі пачалі таяць, блекнуць.

На высокім камяні, які вызначаецца на гладкім полі, нібы помнік невядомым падзеям і гэройскім учынкам, граюць сонечныя блікі. Вызначаюцца вузкія палосы глухаўскага поля. Рыжаватыя межы цягнуцца роўнымі вужамі. На адным месцы, недалёка ад высокага каменя, поле абселі вароны.

На ранічным абшары цямнеецца паіржавелы калючы дрот савецка-польскай мяжы. Недалёка за калючым дротам зьліваюцца з небам саламяныя стрэхі замежнай вёскі. Рудні. Адгэтуль менш відаць былая вёска Глухаўка, цяперашні колгас „Чырвоная варта". Толькі вокны царквы ярка блішчаць нібы знутры будынку брыскаюць іскры пажару. Крыж з царквы быў зьняты яшчэ зімою.

Па дарозе да поля ідзе сьпешна групка хлапцоў і дзяўчат. Часам аглядаюцца на бярэзьнік, прыслухоўваюцца і зноў ідуць сюды наполе.

— Мы самыя першыя,—кажа адна з дзяўчат. Шустрымі вачыма глядзіць на хлапцоў і вось-вось засьмяецца.

З боку бярэзьніка, за якім раскінуўся бальшак, пачуліся невядомыя ў гэтай мясьціне гукі. Ня то самалёт нявідочны гудзіць, ня то машына нейкая грукоча.

— Лявонка, едуць!— усплясьнула дзяўчына рукамі, нібы спалохалася, падскочыла ў гару і зараз-жа паправіла пасму валасоў, якая ўпала ёй на вочы.

— Комсамол, наперад!—закамандваў Лявонка.

— Едуць! едуць!—закрычалі ў адзін голас усе і пусьціліся бягом наперад.

З-за бярэзьніка паказаліся адна за аднэй пяць машын. Яны шпарка імчаліся наперад. І здавалася, што вельмі цяжкія яны, аж зямля пад імі гнецца. І здавалася, што лёгкія яны, нібы вецер. Над машынамі ірдзеліся чырвоныя сьцяжкі. Мільгаліся пад ветрам, як крыльлі невядомай птушкі.

— Вы, павольна,—стрымліваў Лявонка грамадку комсамольцаў з робленай паважнасьцю ў голасе,—а то, як дзеці малыя!

Усе засьмяяліся і па ўсім полі разьлёгся гучны крык:

— У-ра-а-а!

— Трактарная колёна...

Драчык не падвёў! Мілыя, вось-жа лоўка!—ня стрымлівала сваіх пачуцьцяў яшчэ адна з дзяўчат.

— І пабеглі насустрач трактарнай колёне.

Грукаценьне матораў расло, напоўніла сталёвымі гукамі ружовае паветра.

З крыкам падняліся з загонаў спалоханыя вароны, шэрым стадам яны ўзьняліся над полем. Паляцелі на той бок калючага дроту. У празрыстым паветры ярка абрысоўваліся шырока разгорнутыя крыльлі і завостраныя дзюбы.

Пяць трактараў спыніліся, выстраіліся на полі ў адзін шэраг.

— Здаровы хлопцы!—крыкнуў Лявонка з усёй сілы маладых грудзей і зачырванеўся ад напружаньня.

Прывітаньне падхапілі ўсе.

Трактарысты сьмяяліся, блішчэлі белыя зубы. Усе махалі рукамі, крычалі, і кожны пасвойму бурна выказваў сваю радасьць.

Тым часам з розных месц: з-за бярэзьніка, з боку—„Чырвонай варты", „Першага мая" паказваюцца на далягляцзе грамады і грамадкі людзей. Палыхаюць над галовамі чырвоныя сьцягі, чуваць песьні, хто ідзе стройнай колёнай, дзе ўрассыпную, едуць конныя, каля дарослых мітусяцца дзеці. Белыя і чырвоныя хусткі на жаночых галовах. Між вяскоўцаў і чырвонаармейцы-прымежнікі. Расьце, надыходзіць, нібы хвалі, людзкі гоман, сьмех, жарты.

— Ніколі гэтае поле ня бачыла столькі народу!—кажа адна з дзяўчат і вочы яе робяцца сур'ёзнымі і задумёнымі.—Як на позыцыі,—кажа яна цішэй.

— Вось яна гэта позыцыя,—сьмяецца Лявонка.—Дзікая трава на межах! Зараз ім канец!

Усё бліжэй і бліжэй падыходзяць грамады. Вышэй узьнімаецца сонца.

— Мабыць ніхто з вас яшчэ трактару ня бачыў,—сьмяецца адзін трактарысты і чорнымі, трохі выпуклымі, вачыма глядзіць на Лявонку.

— Бачылі!—кажа Лявонка з крыўдай у голасе.—Вось хіба з тых (ён паказвае рукою на грамады, якія набліжаюцца сюды), старыя ня бачылі гэтага „дзіва".

Толькі каля самага бярэзьніка і далёкіх хмызьнякоў і гайкоў яшчэ ляжаць вільготныя цені. Усё поле ахоплена рыжаватым водсьветам сонечнай раніцы.

— Каля чатырох сот чалавек будзе тут, глядзі Лявонка!—дзяўчына тармошыць яго за пінджак.

— Праўда,— згаджаецца Лявонка.—Ніколі наша поле столькі народу ня бачыла.

Расьце шум, набліжаецца. Сотні вачэй, сьвежыя ад узбуджанасьці твары, узмахі рук, крыкі „ура". Усё гэта жывой хваляй плыве

на трактарную колёну. Адзін момант здаецца, што грамада, якая цяпер з дробных груп склеілася ў адно цэлае, рынецца на трактарную колёну, накінецца на яе...

Старыя, маладыя, мужчыны, жанчыны, мацаюць рукамі жалеза і сталь машын.

Вось адзін стаў на крыло трактара. Вось і другі, трэці.

Маленькі хлопчык узьлез на калені трактарыста. Другі крычыць „татачка, і мяне пасадзі туды, да дзядзькі"! У агульным тлуме раздаецца плач маленькай дзяўчынкі. Трактарыст са сьмехатлівымі міргаючымі вачыма, з тонкім ружовым носам, выставіў дзяўчынцы доўгія рукі з растапыранымі пальцамі.

— Мамачка, баюся..—просіцца дзяўчынка.

— Ну, дык ня трэба, Галенка.—Маці сьмяецца і выцірае рукою сьлёзы дачушкі.

— Баіцца, нялюдзкае дзіця,—апраўдваецца кабета.—Што-ж ты з ёю зробіш...

— Ай, нага, нага!—крычыць дзесяцігадовы хлапчук. Нехта ўступіў ботам на яго босую нагу. Ён скача на аднэй назе. Ён бяз шапкі, белагаловы. На сонцы яго валасы ружавеюць.

Драчык, Шаневіч, Зьмітрок, Мікола, Сакалоўскі і некалькі іншых заклапочаныя і ўзбуджаныя—бегаюць туды і сюды і шукаюць месца, дзе пачаць мітынг.

— Глядзі, Марцінка,—торгае мужа за руку Мэра,—каб хто ня ведаў, падумаў-бы, што яны злуюцца. Надуліся, як пузыры.

Марцін ёй нічога на гэта не адказвае і падскоквае да Драчыка.

Антось, Антось! - крычыць ён.

— Га?—Драчык падстаўляе здаровае вуха.

— А вунь там!—Марцін паказвае рукою на вялізны камень.

Драчык ўзрадваўся. Маршчыны на яго твары расплываюцца ў шырокую ўсьмешку.

— Вось тут мы і пачнем,—кажа ён.—Люблю шчырасьць, каменная трыбуна. Та-ва-ры-шы! сю-у-уды-ы-ы!—крычыць ён да грамады і паказвае рукою на камень.

Жывы лес грамады рынуўся, валам валіць. Да каменя ціснуцца ўсе, кожны стараецца захапіць самае блізкае месца.

— Ды ты не піргайся!—чуваць пісклівы голас.

— Мяне піргаюць, дык і я,—адказвае спакойны басок.

Многія расчырванеліся, выціраюць з твару пот рукавамі.

Малады Саўка Солах нешта піша алоўкам у блёк-нот, аглядаецца навакол пільным вокам і зноў піша...

Блізка ад каменя стаяць стары Цыпрук, каваль Лейба, Мікола, Сакалоўскі, Марцін. Мэру адціснулі на дзесяць галоў далей.

Стары Лейба толькі ўчора вечарам пазнаёміўся з новым сватам—Цыпруком. Часта Лейба паглядае на Цыпрука цёплым вокам сваяка...

Чым больш сваякоў, тым Лейба шчасьлівейшы. Сівая барада ў яго расчэсана пасьвяточнаму. Чорныя вочы пад кусткамі брывёў трохі зьдзіўленыя.

— Сваток! сваток!—кажа Лейба і кладзе руку на плячо старога Цыпрука.

— Га?

— Відаць, што сьвята ідзе не ад бога, але ад людзей. Ад людзей ідзе яно. Вось бачыш, сваток, гэту грамаду? Захацелі яны—і сьвята сабе ўладзілі...

— Праўду кажаш, ці што...

Цыпрук жмурыць вузкія ільдзінкі вачэй і глядзіць на Лейбу з нейкай асаблівай павагай.

— Глядзі, сваток, цяпер на гэтыя межы. Пасьля ты іх ніколі ўжо не пабачыш.

Цыпрук ківае галавою і ўстаўляе сваё слова:

— Мабыць, Язэпу Крушынскаму гэта і ня сьнілася.

— А калі і сьнілася, дык гэта быў для яго страшным сном.

— Ну, і разумны ты, сваток, чалавек...—любуецца Цыпрук на Лейбу.

— Яны не гавораць, а крычаць адзін аднаму, бо гул грамады расьце, шум павялічваецца, нібы ў лесе ў час навальніцы.

Антось Драчык тым часам узьлез на высокі камень. Вакол каменя цясьней падступіла грамада. Сплялiся людзі ў адно, склеіліся, здаецца, так, што ніколі не разыйдуцца па асобку...

Та-ва-ры-шы!—пачаў Драчык зычным голасам.

— Цішэй, цішэй!—перадавалі адзін аднаму з берагоў грамады.

Грамада пачала супакойвацца. Шэпт, нібы жытняе поле-пад ветрам, чуваць быў з усіх бакоў.

— Цішэй, цішэй.

— Як прозьвішча таго, што на камені стаіць?—пытаецца Саўка Солах у аднаго старога дзеда.

— Гэта-ж Драчык, старшыня сельсавету.

— Саўка запісвае ў блёкнот.

Драчык аглядае мора гагоў і на хвіліну задумваецца; выцер рот дрыжачай рукою і кашлянуў у далонь.

— Таварышы!

Голас яго зьмяніўся, зрабіўся болей спакойным.

— Сягоньня мы руйнуем спрадвечныя межы паасобных гаспадарак беднякоў і сераднякоў. Сягоньня памруць межы! Памруць на векі-вечныя! Ніколі ўжо калы ня будуць гудзець над гэтымі межамі, як часта бывала да гэтага часу! Ніколі ўжо сварак і боек тут ня будзе. Мы аб іх забудзем, аб межах, а нашы дзеці і гэтага слова можа не пачуюць! Толькі памятайце, таварышы, што ў нашых колгасах яшчэ ёсьць Крушыншчыкі, з імі яшчэ прыдзецца змагацца!

Драчык спыніўся на адну хвіліну, задумаўся. Нецярплівае шорханьне грамады як-бы ўзбудзіла яго. І ён зноў пачаў:

— Цяпер нам трэба абмеркаваць...

Антось Драчык пачаў пералічваць тое, што зроблена было за зіму колгасамі сельсавету, успомніў, што з раёну прыслалі сто заводных цялят, што пабудавалі некалькі новых хлявоў, і давай разгортваць далейшыя пляны пяцігодкі: школы, добрыя дамы, яслі для дзяцей, багатыя ўраджаі, асушка балот, крухмальні, лесапільні. Ён разгортваў перад грамадою шырокае палатно блізкай будучыні...

Некаторыя старыя жанчыны выціраюць хусткамі вочы. Ківаюць адна аднэй галовамі ня то з папрокам, ня то з пашкадаваньнем.

— Адвекавала я свой век...—кажа адна нізенькая старая цётка сваёй суседцы.

— Ды ліха цябе, Макарыха, ня возьме. Яшчэ даўбнёй ня прыб'еш. пацяшае яе высокая бяз хусткі суседка.

— А ты, Мацеіха, чаго зараўла?—пытаецца тая самая ў удавы Мацеіхі.

— Я? З радасьці...—ўсхліпвае сарамліва Мацеіха.

І раптам спыніла ўсхліпваньне, выцерла вочы і зацікаўлена паглядзела на замежную вёску Рудню за паіржавелым калючым дротам.

— Глядзеце, глядзеце, людцы?—Мацеіха паказвае рукою куды глядзець.—Як вераб'і усёроўна!

Мацеіха пры гэтым пачала сьмяяцца.

Многія адварочваюць галовы ў бок граніцы.

На саламяных стрэхах замежнай вёскі Рудні стаяць дзеці і пільна глядзяць сюды. Некаторыя стаяць каля комінаў і на яркім фоне неба яны вызначаюцца, як малюнкі на паперы. На гародах і платох стаяць дарослыя мужчыны і жанчыны. Усе яны глядзяць здалёку на вялікае поле „Чырвонай Варты".

Саўка Солах доўга піша нешта ў блёк-нот.

— Як нябожчык „Леў Талстой",—кажа нейкі дзядзька.

Каваль Лейба і стары Цыпрук высьлізнуліся з грамады, каб паглядзець туды за калючы дрот...

— Эх, сваток,—кажа Лейба,—каб ня гэтая граніца—усе з Рудні былі-б тут і сьвяткавалі-б разам з намі.

Цыпрук наставіў над вачыма далонь правай рукі, а левай рукой мацней абапіраўся аб кій.

— Праўду, сватку, кажаш. Бач, сюды ім хочацца, ці што...

Да каменнай трыбуны прабіраўся Мікола Ярэмчык, лакцямі сабе прабіваў дарогу паміж плеч, сьпін і грудзей. Тым часам пяць трактараў нарыхтаваліся каля вузкіх загонаў на шырокім полі. Загулі моторы. Закруціліся калёсы. Вялікія сталёвыя плугі ўгрызьліся ў глебу.

Да першых сьвежых барознаў падыходзілі колгасьнікі. Стары Цыпрук па гаспадарску падсунуўся да сьвежай узворанай баразны, нагнуўся і давай сваім кіем мерыць шырыню і глыбіню.

З лёгкім крэхтам падняўся, выпрастаўся, пагладзіў паясьніцу, вочы зажмурыліся; ён кіўнуў галавою ад дзіва і сказаў:

— Нічога сабе баразёначка, га? Ніколі ў нас так не аралі...

Цыпрук цмокнуў губамі, нібы цукерку смокча, выставіў палец у гару, бы хоча неба пракалоць пальцам, і казаў самому сабе:

— Век пражыў, шмат чаго бачыў, а вось гэткага ворыва, яй права, ніколі...

Яшчэ раз нагнуўся, узяў у рукі кавалак зямлі і давай яго мяць і расьціраць з асаблівай любасьцю, як скульптар гліну.

— Вось гэта дык рата!.. ай-я-яй!..

Запахла сьвежая глеба... Ноздры Цыпрука дрыжэлі. Ён прагна з лёгкім посьвістам уцягваў у сябе носам парны пах глебы...

Гудуць трактары...

Вось узьбіраецца на мяжу трактар, трохі кавыляе ў адзін і другі бок, пярэднімі калёсамі прасуе адзірванелую мяжу. Вось і заднія калёсы душаць яе жалезнымі барадаўкамі-шыпамі, хочуць яе расплаcтаць, расьціснуць, каб з мяжы аж сок паказаўся. Два сталёвыя дыскі крамсаюць яе, дробяць на часткі. Трактарыст напірае на пэдаль з асаблівай упартасьцю. Сталёвыя лемяхі пачынаюць пераварочваць, пераможуваць дзёран... Ірвецца белае карэньне дзікіх траў, шорхае зямля...

— У р-р-а-а! Межы гінуць!

Дзеці, расхрыстаныя, вясёлыя бягуць за трактарамі, размахваюць рукамі, рагочуць...

Сярод неахонага гулу чуваць гучныя словы Міколы Ярэмчыка. Ён стаіць на высокім камені, пакрытым зялёнымі лішаямі.

— Паміраюць межы... Надыйдзе час, што ня будзе ніякіх меж...

Мікола паказвае рукою на калючы дрот дзяржаўнай мяжы.

Шаневіч пачаў сьпяваць Інтэрнацыянал, падхапіла грамада. Вышэй запалыхалі чырвоныя сьцягі.

— Глядзі, глядзі, сватку! — Стары Цыпрук штурхнуў зьлёгку Лейбу.—Глядзі!

На тым баку калючага дроту рудненцы падкідвалі ў гору шапкі...

Расшырыліся на адзін міг вочы Цыпрука ды зноў звузіліся ў дзьве ільдзінкі.

— Людцы! Людцы!— ён узмахнуў рукамі, усім тулавам паддаўся наперад, нібы зьбіраўся бегчы, каб кагосьці ратаваць.

Глядзяць рудненцы з таго боку калючага дроту на бальшавіцкую сяўбу, а да іх па гародах гарцуюць на конях жандары. Шапкі іх блішчаць і відаць як з-пад конскіх капыт выбіваюцца ў гару комы зямлі...

— А я-яй...—ня то стогне, ня то дзівіцца стары Цыпрук. Яму добра відаць, як рудненцы мітусяцца, як над іх галовамі паднімаюцца і апускаюцца бізуны...

Жандары хутка ачысьцілі гароды, платы, саламяныя стрэхі.

Грамада колгасьнікаў раптам сьціхла. Усе павярнуліся тварамі на той бок... Чулася напружнае дыханьне некалькіх сот чалавек.

У вачох старога Цыпрука заблішчэлі сьлёзы. І вось ён пачуў голас старшыні „Чырвонага Кастрычніка“, тав. Шаневіча:

— Няма на сьвеце такой сілы, якая прымусіла-б нашых зарубежных братоў—прыгнечаных Заходняй Беларусі не глядзець на Савецкую Беларусь і ня ведаць, што ў нас робіцца...

Саўка Солах рупна піша нешта ў блёк-нот, паднімае галаву з паперы, аглядае грамаду і зноў піша.

Сонца мацней пачало грэць зямлю.

Нешта зьвініць у вушох Цыпрука.—Ён заўважвае, як некаторыя колгасьнікі пільна глядзяць на вузкія палоскі.

Нішчаць трактары гэтыя палоскі. Ужо ладны кавалак поля завораны, ужо многа меж ня стала.

І неяк дзіўна становіцца Цыпруку: ён ў сябе нешта новае адчувае, што ён сягоньня адзін з тутэйшых гаспадароў... Першы раз на гэтым полі, а вось гаспадар... Па-гаспадарску пачынае ўсё аглядаць... Пры ім нейкі стары з сівой бародкай рукі ламае.

— Чаго ты?—пытаецца Цыпрук.

— Страшна, ніколі свайго шнура не пазнаю. Усё жыцьцё на ім сьпіну гнуў...

— Кінь!—злуецца Цыпрук.— Во хто цяпер будзе за цябе карак гнуць,—і паказаў рукою на трактары, а калі каньмі араць, дык на гэта таксама ёсьць моладзь.—Табе дадуць працу па сіле. Эх, ты!

На высокім камені стаіць наборшчык Сакалоўскі. Ён жмурыць вочы на сонцы, аглядаецца ва ўсе бакі.

— Рабочыя нашай друкарні прымаюць шэфства над колгасамі Гайдачанскага сельсавету!—гучыць яго голас. — Надрукуем для вас газэту. У хуткім часе прышлем бібліотэку!

Голас Сакалоўскага пачынае плаўна разыходзіцца па шматгаловым сходзе на полі.

Адну хвіліну Сакалоўскі спыняецца, выцірае рукою ўспацелы лоб, успамінае зімовыя сходы ў клюбе тутэйшага сельсавету. „Як цяжка ўсё гэта было з'арганізаваць",—думае ён.

— Мы перамагаем усе цяжкасьці. Ня мала яшчэ іх будзе і ў вас, таварышы колгасьнікі. На кожным кроку ворагі пастараюцца перашкодзіць. Але будзьце ўпэўнены, што пе́рамога будзе на нашым баку!

Блішчыць вільгацьцю сьвежа-узараная глеба.

Стары Цыпрук ужо некалькі разоў імкнецца да каменя. Кожны раз стрымліваецца. Заўсёды толькі іншых слухаць любіў. Ніколі сам перад грамадою не гаварыў.

...Папрасіць слова, ці што?

Страх яго бярэ. Аднак усё бліжэй падсоўваецца да каменнай трыбуны.

— Наш прымежны сельсавет,—чуе Цыпрук малады голас аднаго з тутэйшых комсамольцаў,—будзе стаяць на варце. Няхай польскія паны ня думаюць лезьці на нас, бо трактары па іншаму загуляюць... Я тады пры польскай окупацыі быў яшчэ хлапчуком, а добра памятаю панскія бізуны...

Каля Цыпрука стаіць цяпер удава Мацеіха і плача ў голас.

— Чаго, ты, цётка?

— Гээ-эта-ж мой Лявонка гаворыць...

— Дык ты радуйся, ці што. І мой Мікола нядаўна гаварыў.

— Але майго Лявонкі бацька, мой муж Мацей памёр пад польскімі шаблямі... Успомнілі вось, і...

— І я каштаваў панскі бізун,—пацяшае Цыпрук удаву.

Гудуць трактары.

На агромністым полі яны разыходзяцца і зыходзяцца. Цёплы вецер, афарбаваны сонцам, нясе на той бок калючага дроту пах сьвежай глебы.

Першы раз у жыцьці бачыць Цыпрук Ярэмчык такое ворыва...

Заўсёды ён уставаў раніцою ды хадзіў адзін на свой шнур. На суседнім шнуры—другі араты, далей—трэці, але рэдка калі зыходзіліся разам. Здалёку толькі чуваць былі нялюдзкія лаянкі і злосныя галасы.

Плоймай ластавак праносяцца перад Цыпруком кавалкі ўспамінаў, пырхнуць ценем і зьнікнуць. Па доўгай дарозе свайго шэрага жыцьця ён так прагнуў бачыць і чуць цікавае..

— Хто яшчэ просіць слова?—чуе Цыпрук голас Драчыка.

— Я-а-а! Я!

Цыпружу здаецца, што гэта ня ён сам крыкнуў, а нехта незнаёмы, бо свайго ўласнага голасу не пазнаў. Яму ачышчаюць дарогу да каменнай трыбуны. Ніколі ён не адчуваў у сябе такой сілы. Ніхто-б яго цяпер не стрымаў. Ён мусіць гаварыць перад грамадою. Ён павінен выказаць тое, што расьце ў яго ўнутры...

— У Рудні вокны завешваюць, каб сюды і праз вокны не глядзелі, чуе Цыпрук нейчы голас.

Ён па хлапцоўску ўскочыў на высокі камень. Перад сабою ён бачыць шмат твараў. Гарачыя вочы накіраваны на яго. Заўважыў, як яго сын Мікола глядзіць на яго радаснымі вачыма, а вунь сівы Лейба, яго сват. Кінуў вокам на той бок калючага дроту: толькі паліцэйскія жандары на конях разьяжджаюць...

І цяпер Цыпрук не пазнае свайго голасу, які імкнецца з усяго яго нутра:

— Таварышы браты! Бачачы і чуючы ўсё гэта, прашу запісаць мяне ў бальшавікі!

Больш гаварыць ён ня можа. Ад крыкаў „ура“, ад плясканьня ў далоні зьвініць у вушох.

1930-1931
Менск.

Рыхтуючы твор да асобнага выданьня я некаторыя са зьмешчаных тут разьдзелаў грунтоўна перапрацаваў і напісаў некалькі новых, якія сюды не ўвайшлі.

Аўтар.

Л. Бэндэ

Творчы рост Андрэя Александровіча [1])

Творчасьць Андрэя Александровіча—нашага сёнешняга юбіляра—зьяўляецца вельмі важным чалавечым докумэнтам пра тое, як вызваленыя Вялікім Кастрычнікам ад падвойнага соцыяльнага ўціску працоўныя масы былой „акраіны"—Беларусі,—здольны праявіць ня толькі энтузыязм і героізм у змаганьні супроць сваіх клясавых ворагаў на франтох грамадзянскай вайны, у партызанскіх атрадах, на фронце пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва, але і праявіць нябачны ў гісторыі дзёрзкі ўчынак заваяваць культурныя вышыні, заваяваць „сьвятыні" мастацтва, сьвятыні поэтычнай творчасьці, усё тое, што было раней прывілеяй і манополіяй пануючых кляс і іх прыслужнікаў.

Пролетарская рэволюцыя ёсьць адзіны, самы надзейны, самы радыкальны спосаб ня толькі вызваленьня працоўных мас з-пад уціску, з-пад эксплёатацыі, але яна ў той-жа час самы надзейны і адзіна магчымы спосаб, каб абудзіць ад вечнага сну, каб пазбавіць ад асуджанасьці ўсёй сутнасьцю эксплёататарскага ладу—цемры, забітасьці—мільённыя масы працоўных, выклікаць у іх творчыя сілы, творчыя здольнасьці, таленты і гэтым самым яшчэ ў большай сіле, у большай глыбіні і шырыні пераможна ісьці да свае мэты.

Радзіла рэволюцыю паўстаньне.
А рэволюцыя і нашу краіну,

кажа наш юбіляр.

Беларусь савецкая, Беларусь соцыял'стычная не адрадзілася з-пад „муроў полацкіх капліц", а радзілася ў буры змаганьня рабочых і сялян, пад сьцягам комуністычнай партыі, пад сьцягам Леніна.

Соцыялістычная рэволюцыя разгарнула шырокія прасторы, стварыла ўсе патрэбныя об'ектыўныя ўмовы для таго, каб працоўныя масы „зусім сьвядома пачалі тварыць сваю гісторыю" (*Энгельс*).

Рабочая кляса нашай краіны, кіруючы мільённымі масамі сялянства, пераможна будуе соцыялізм, перабудоўвае людзкую прыроду.

Жыцьцё ідзе праз петлі—перашкоды,
Жыцьцё ідзе, зьнішчаючы закон
І формы, створаныя спракон
Вякоў прыродай...

рушыць на сваім пераможным шляху.

Мы ўступілі ў пэрыод соцыялізму, соцыялістычны пролетарыят трымае ў сваіх руках усе важнейшыя вагары народнай гаспадаркі,

---

[1]) Даклад, прачытаны на ўрачыстым пасяджэньні, прысьвячаным дзесяцігодзьдзю літаратурнай дзейнасьці Андрэя Александровіча.

мы пераможна завяршаем сусьветна-гістарычнага значэньня перамогу, фундамэнт соцыялістычнай эканомікі[1]).

Але было-б наіўна думаць, што соцыялізм толькі вычэрпваецца эканомікай, увесь зводзіцца да яе. Было-б наіўна думаць, што культура і яе сустаўная частка, мастацтва і літаратура, у якой-бы то ні было ступені супроцьстаіць соцыялізму.

Сьвядомасьць ва ўсіх сваіх формах, зьяўляючыся адлюстраваньнем быцьця людзей, ня ёсьць пасыўны момант, а зьяўляецца актыўнадзейнай творчай сілай у перабудове быцьця, у справе барацьбы за соцыялізм, у справе перабудовы саміх людзей.

Юбілей Александровіча, аднаго з буйнейшых, аднаго з самых кваліфікаваных—на сёнешнім узроўні пролетарскай літаратуры—інжынэраў пролетарскай поэзіі, зьяўляецца ў той-жа час і юбілеем, аглядам творчых дасягненьняў усёй пролетарскай літаратуры Беларусі.

Александровіч, як пролетарскі поэт, не зьяўляецца чымсьці самастойным, самадаўлеючым ад усёй пролетарскай літаратуры, а неадлучнай, органічнай часткай яе. Ён, гаворачы паводле словаў Маркса, „зьяўляецца толькі індывідуальным элемэнтам“ усёй пролетарскай літаратуры. Таму зусім натуральна, што творчы шлях Александровіча, яго індывідуальныя буйныя посьпехі і перамогі стануць зразумелымі толькі ў рэальнай сувязі і на аснове росту ўсёй пролетарскай літаратуры.

Пролетарская літаратура ня ёсьць нешта раз назаўсёды дадзенае, нязьменнае, а ёсьць рэальны процэс разьвіцьця, усходжаньня з аднэй на другую, больш высокую, ступень у мастацкім разьвіцьці чалавецтва.

Яна не зьяўляецца ўласнасьцю альбо дасягненьнем прыватных асоб ці групы асоб, яна ёсьць частка агульнапролетарскай справы, частка таго, што мы ўкладаем у разуменьне соцыялізм.

Беларуская пролетарская літаратура зьявілася і разьвівалася, як далейшае разьвіцьцё ў мастацкай літаратурнай форме,—у новых гістарычных умовах, ва ўмовах панаваньня рабочае клясы,—тых сапраўды рэволюцыйных, соцыялістычных элемэнтаў нацыянальнай культуры, якія здабыты праз пакуты рабочай клясы ў часы яе змаганьня пад кіраўніцтва бальшавізму, супроць падвойнага соцыяльнага ўціску—супроць царызму і капіталістычнай эксплёатацыі.

Пролетарская літаратура расла і разьвівалася ў жорсткай класавай барацьбе, якую вяла і вядзе рабочая кляса пад ленінскім кіраўніцтвам комуністычнае партыі за сваю дыктатуру, за яе замацаваньне, за пабудову соцыялізму, за перабудову ня толькі соцыяльнага быцьця працоўных, але і за перабудову іх саміх.

Пролетарская літаратура на працягу ўсёй сваёй гісторыі заўсёды зьяўлялася зброяй у руках сваёй клясы ў яе барацьбе супроць класавага ворага, супроць сіл і традыцый старой грамады.

---

[1]) Гэта гаварылася ў 1931 годзе.

Роля і значэньне пролетарскай літаратуры на сучасным этапе соцыялістычнага будаўніцтва ацэньваецца нашай партыяй як „магутны сродак у змаганьні за соцыялізм“.

(*ЦК УсеКП(б) пра выдавецкую работу*).

Нашаму юбіляру, Андрэю Александровічу, належыць на сучасным этапе пролетарскай літаратуры адно з першых месц у авангардзе беларускага пролетарскага літаратурнага руху.

Сіла пролетарскай літаратуры знаходзіцца ў простай залежнасьці ад узроўню і глыбіні ідэй, якія выражаны ў творах.

А таму, каб зразумець і ацаніць як належыць творчасьць Александровіча, трэба паглядзець „у корань“, зразумець тыя ідэі, якія ў яго творах выражаны, супаставіць іх з ідэямі і задачамі рабочае клясы ў яе будаўнічай барацьбе на кожным гістарычным этапе.

Якія-ж ідэі і наколькі глыбока выражае іх Андрэй Александровіч у сваёй творчасьці?

Наш рост у яго супярэчнасьцях, нашы перамогі ў актыўнай клясавай барацьбе па соцыялістычнай рэконструкцыі ўсіх бакоў нашага жыцьця, барацьба за перабудову людзкога матэрыялу, а міраньне старога і нараджэньне новага соцыялістычнага героіка і патос барацьбы за новыя комуністычныя формы працы—вось далёка няпоўнае пералічэньне тых ідэй, якімі напоўнена творчасьць Александровіча за апошнія гады.

Годы сучасныя, бурныя годы!
Гартаванай сілай, аг ём расьцьвілі (*103*)—

Характарызуе поэта наш час у романе „Нараджэньне чалавека“.

Поэта падыходзіць да об‘екту сваёй творчасьці, не як цікаўны малады чалавек, які стаіць збоку і „звышоб‘ектыўна“ паглядае на змаганьне рабочае клясы і замалёўвае яе ў свае нудныя радкі—накшталт такіх вось:

А цяпер вось, поўны творчых дум і сіл,
Спатыкаю раньне першы раз ў жыцьці.
Ах! (трымайце мяне! Л. Б.) якое сонца, яркі поўдню цьвет.
Па табе заплакаў (якая трагедыя! Л. Б.) першы раз поэт.
Дык гары-ж, як сэрца стамільённых мас,
Я вітаю першы й мо“ апошні раз.
І туманным шляхам на ружовы шлях
Падпіхаю трактар, твой жалезны птах.

(*В. Маракоў, Полымя № 3*).

Такі падыход Александровічу чужы, ён адчувае сябе органічна-неадлучнай часткай клясы, якая змагаецца, якая перамагае, якая радуецца сваім перамогам.

Як ня славіць песьняй сакалінай
Бэларусь, рэспубліку сваю.
Краіна, родная, савецкая краіна,—
Табе я ў песьнях сэрца аддаю.

Ты красуеш ростам рыштаваньняў,
Творчай працай гартаваных сіл,
Ты ў агні шчасьлівага сьвітаньня,
Быццам раніцай
На ўсходзе небасхіл. („Цені на сонцы").

Але Александровіч ня выпускае з-пад увагі таго, што росквіт краіны ідзе праз перамаганьне жорсткага супраціўленьня клясавых ворагаў, праз перамаганьне сіл і традыцый старога, струхнелага, ня выпускае з-пад увагі таго, што наш рост, наш рух па соцыялістычным шляху ёсьць „натуральна-гістарычны процэс".

Змаганьне—жыцьцё. І каб жыць—то змагацца
Стагодзьдзямі ўслаўлены сьмелы закон.
З сабой, з чалавекам, з прыродаю, з працай—
Змагацца для славы наступных дзён.
("*Нараджэньне чалавека*" *104*).

У той час, калі рабочая кляса, бядняцка-серадняцкія масы пад яе кіраўніцтвам—напружваюць свае сілы для таго, каб пазбавіцца спадчыны „царства неабходнасьці" і завяршыць „скачок у царства свабоды"—у гэты час нашы клясавыя ворагі, апранаючы на сябе рознакаляровыя маскі,—сваёю здрадай, сваёй падрыўной і шкодніцкай работай імкнуцца затрымаць магутны бег „лёкомотыву гісторыі". У той час, калі расьце і квітнее новае, побач яшчэ тлее, трухлее і гніе старое, якое сваімі атрутнымі бацыламі прыносіць шкоду, часамі псуе здаровае, прытрымліваe разгорнуты наступ пераможнага соцыялізму. У той час, калі

Сусьвет ахвачан сонечным пажарам,
. . . пад сонца
цені падпаўзьлі.

і на пылаючае сонца находзяць туманныя плямы.

Александровіч заўважае ня толькі супярэчнасьці нашага росту па лініі клясавых супярэчнасьцяй, ён бачыць і тое, што на пэўным папярэднім этапе соцыялістычнага будаўніцтва былі супярэчнасьці і другога парадку, супарэчнасьці, якія вынікалі на базе неадноўленага і неперабудованага, не разгорнутага яшчэ таго разьбітага матэрыяльнага быцьця, якое нам засталося ў спадчыну ад капіталіаму, які перад сваім канцом,—падобна Плюшкіну, што пабіў перад сьмерцю ўсю сваю пасуду,—разбурыў гаспадарку.

Гэтая супярэчнасьць выражана Александровічам у адным з момантаў гісторыі нараджэньня Марылі ў романе „Нараджэньне чалавека".

А горад стаў інакшым, непадобным,
У ім нязвычны рух,
І радасьць новых слоў.
О, ты, Марылін лёс!
Чаму яна галоднай
Ідзе сярод квітнеючых садоў?

Увесь гэты складаны і супярэчлівы клубок, у якім не адзін пісьменнік заблытаўся, гэтыя супярэчнасьці нашага руху, нашага росту Акександровіч адчувае, бачыць, імкнецца іх пазнаць, асмысліць і адлюстраваць праз вобразы, праз рытмы сваёй поэзіі.

Аднак, мастацкае пазнаньне і адлюстраваньне бываюць розныя. У іншых пісьменьнікаў бывае такое, што ён далей эмпірычнага павярхоўнага, таго толькі, што кідаецца ў вочы, ня ідзе, застывае, альбо бездапаможна блытаецца ў спляценьні супярэчнасьцяй, як у зачараваным коле.

Александровіч у сваіх творах апошніх гадоў, у такіх творах, як „Цені на сонцы", „Нараджэньне чалавека", „Напор" і шэрагу вершаў ранейшых часоў, не абмяжоўваецца пасыўным сузіраньнем і об'ектывісцкім рыфмаадлюстраваньнем рачаіснасьці, а імкнецца пазнаць і мастацкі раскрыць асновы, прычыны, шляхі перамаганьня супярэчнасьцяй.

Былі сталецьцямі ў карытах сутарэньнях
Майстэрні дробныя раскіданы ў завулках.

А цяпер, пры панаваньні рабочае клясы, пад кіраўніцтва ленінскай партыі краіна перабудоўваецца, будуецца нанава.

З балот
У гарады
Пабеглі правады,
Загудзелі поўным ходам
Гмахі фабрык і заводаў. (*„Поэма імя вызваленьня"*)

У гэтым бачыць Александровіч вядучае, што ператварае краіну „майстэрняў дробных" у краіну сталінстанаў, у колгасную краіну.

Праца зьяўляецца тэй асновай, тым пачаткам, шляхам якога перамагаюцца супярэчнасьці, неўпарадкаванасьць соцыяльнага быту асоб з працоўнага асяродзьдзя.

Я шукаю шчасьце
Шчасьця—гэта праца,

гаворыць Марылька ў романе „Нараджэньне чалавека".

Асновай асноў, адзіна магчымым шляхам пазбаўленьня ад ворагаў, ад спадчыны мінумых гадоў, для Александровіча, як і для ўсёй рабочай клясы, для ўсіх у мінулым прыгнечаных і эксплёатуемых, зьяўляецца актыўная, непрымірымая клясавая барацьба ў розных яе формах.

Тварцоў
пакаленьня—
на вдраду,
на цені,—
У бой навальнічы
Партыя кліча! (*„Цені на сонцы"*, 71).

На гэтую клясавую барацьбу заклікае творчасьць Александровіча.

На фронт, таварышы!
На фронт, энтузыясты!
. . . . . .
Ў барацьбе за працаю
Штодзень сабе прыблізім
Завяваны
Ў баёх
Соцыялізм.

(*„Н. ч.", 123*).

У гэтай нясупыннай і жорсткай барацьбе творыцца ня толькі новае быцьцё, новыя ўмовы людзкого існаваньня, але творыцца і новы чалавек, энтузыяст, барацьбіт, які ня сьлепа змагаецца, а „сьвядома творыць сваю гісторыю".

Як для масавага нараджэньня комуністычнай сьвядомасьці, так і для выкананьня самой справы, неабходна масавая зьмена людзей, якая магчыма толькі ў практычным руху, у рэволюцыі, значыць, рэволюцыя патрэбна ня толькі таму, што нельга ніякім іншым способам скінуць пануючую клясу, але і таму, што класа, якая скідае, можа толькі ў рэволюцыі ачысьціцца ад усяго бруду старой грамады зрабіцца здольнай стварыць новую грамаду" (*Маркс*).

Новы чалавек, новыя людзі Александровіча формуюцца ў клясавай барацьбе, у соцыяльнай практыцы, незалежна ад таго, ці асьведамляюць яны гэта, ці не. У Александровіча, асабліва ў апошніх яго творах, мы ня знойдзем колькі-небудзь значнага „отображательства" ўнутраных зігзагаў душы чалавека, узятай самой па сабе без соцыяльнай практыкі.

Новая псыхіка, новыя погляды, новая сьвядомасць нараджаецца ў гэтай практыцы.

Няма таго, няма, што так цярпела ўчора,
Ўчарайшы дзень зусім я ня жыла,
Я нарадзілася, калі стаяла гора.
Дарогай вогнішча ў жыцьцё сваё ўвайшла.

Так паказвае нараджэньне новых людзей Александровіч праз словы героіні свайго роману „Нараджэньне чалавека".

Толькі ў актыўнай рэволюцыйнай практыцы бачыць Александровіч шлях і способ пераробкі людзей, нараджэньне ў іх соцыялістычнай сьвядомасьці, сьвядомасьці таго, што змагар за соцыялізм не зьяўляецца самадаўлеючым, абстрактным індывідуумам, а неадлучнай, органічнай часткай колектыву барацьбітоў, якія перабудоўваюць сьвет.

...Рэволюцыя. як маці, спавіла,
... У рэволюцыю радзілася я зноў...
Мой шлях адзін, і сьцяг адзін, таварыш,
Сваё жыцьцё злучу з жыцьцём другіх. (*„Н. ч.", 101*).

Вось, выходзячы з гэтага падыходу да мастацкага выяўленьня процэсу пераробкі людзей, поэта і заклікае новае пакаленьне „акрынічыцца“ прыбоем і пераможна будаваць заваяваны ў баёх соцыялізм.

Шлях заваёваны. Не шкадаваць ся бе,
А творчым акрынічыцца прыбоем,
І будаваць жыцьцё, і будаваць такое,
Як радасьць перамогі ў барацьбе. (*„Н. ч.“, 124*).

Паняцьце новага чалавека, ідэя, за якую змагаецца ў сваёй творчасьці Александровіч, ня мірыцца з мяшчанскім, абыватэльскім, дробнабуржуазным хныканьнем, штопаньнем і латаньнем жыцьця.

Хныкаць, і штопаць, і латаць жыцьцё--
Маруднае самазабойства.
Ветрамі дзьмі, распаляй касьцёр
Думак, імкненьняў, геройства. (*Стар. 82*).

Бо жыцьцё, змаганьне, такі ўжо закон гісторыі чалавецтва, таму поэта лічыць, што

Мала радзіцца,—будзь цьвёрдым, як камень,
Любою істотай умей заўладаць.
Тысячы дышуць такімі грудзямі,
Сэрца тваё—грамада (*104*).

У гэтым сіла, гэта тое новае, больш вышэйшае, што прынёс з сабою новы этап у разьвіцьці творчасьці Александровіча,

Які вынік можна зрабіць з разгледжанай у кароткіх рысах творчасьці Александровіча апошніх год.

Самае асноўнае, самае галоўнае, што адсюль вынікае, гэта тое, што ў творах апошніх год, асабліва ў такіх творах як „Нараджэньне чалавека“ і „Напор“, мы маем асобныя конкрэтныя паказальнікі станаўленьня дыялектычна-матэрыялістычнага мастацкага мэтоду ў Александровіча. А гэта ёсьць асноўны вынік, асноўная сума дзесяцігадовага разьвіцьця і росту нашага юбіляра, пролетарскага пісьменьніка.

Сёнешні ўзровень творчасьці Александровіча не зьяўляецца толькі „прыватнай уласнасьцю“ яго самога. Узровень ягонай творчасьці зьяўляецца выражэньнем таго ўзроўню перадовога атраду беларускай пролетарскай літаратуры, на якім яна зараз знаходзіцца. Творчасьць Александровіча не перакрывае сабой усёй пролетарскай літаратуры, а толькі зьяўляецца адным з рэальных паказальнікаў яе посьпехаў.

У чым сакрэт посьпехаў Александровіча, у чым сіла яго творчасьці, у чым тое вядучае, якое абумоўлівае творчыя посьпехі Александровіча, як і ўсёй пролетарскай літаратуры.

Маркс у свой час пісаў:

„Соцыяльная рэволюцыя XIX стагодзьдзя можа чэрпаць для сябе поэзію ня з мінулага, а толькі з будучага. Яна ня можа пачацца нават, пакуль ня вытручаны ўсе забабоны мінулага.

Пяпярэднім рэволюцыям патрэбны былі вялікія гісторычныя ўспаміны, каб падмануць саміх сябе адносна свайго сапраўднага зьместу. Рэволюцыя XIX стагодзьдзя, каб знайсьці свой сапраўдны зьмест, павінна пакінуць мёртвым хаваць сваіх мерцьвякоў. Там фраза была вышэй зьместу, тут зьмест вышэй фразы." (*К. Маркс, 18 Брумэра*).

Вось у гэтым сіла. Сіла ў тым, што наша поэзія харчуецца жыватворчымі ідэямі соцыялістычнага пролетарыяту, яго радасьцямі, яго пачуцьцямі, яго сьвядомасьцю. Сіла ў тым, што пролетарская літаратура знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з рабочай клясай, з яе барацьбой і перамогамі. Вось гэта, а ня што-небудзь іншае, дае веру, сілу, творчы запал і імпэт для пролетарскага пісьменьніка

У сьвятле гэтай дадзенай намі характарыстыкі творчасьці Александровіча апошняга этапу, як пролетарскага пісьменьніка, зусім зьяўляецца нецярплівай тая „крытыка", тая „ацэнка", якую даюць творчасьці Александровіча пераверзіянскі меншавіствуючыя паненкі, якія знайшлі сабе гасьцінны прытулак на старонках часопісі „Узвышша", тыя паненкі, пра якіх мы нядаўна гаварылі на конфэрэнцыі МенАПП.

Дазвольце спыніцца на аднэй крытыцы, на адным узоры літаратурнай пошласьці, якая, бачыце, прэтэндуе на об'ектыўную ацэнку.

Як вы ўбачыце ніжэй, гэтая „крытыка і ацэнка" ня толькі забаўная, але і навучальная.

Вось што піша В. Зубко ў артыкуле пад назвай „Нататкі пра творчасьць А. Александровіча" (*Узвышша № 9-10 за 1930 г.*).

> „Якая-ж соцыяльная глеба дала Александровічу поэзію, быцьцём якой соцыяльнай групы яе абумовіла. Існуе хадзячая думка (зьвярнеце ўвагу! Л. Б.): Александровіч—пролетарскі пісьменьнік. Чаму пролетарскі? Задача разьвязалася вельмі (?!) проста. Яго поэзія заражае (!) на карысьць (стыль! Л. Б.) пролетарыяту." (*Ст. 158*).

Выходзіць, што мы з вамі таксама ахвяры хадзячай думкі, калі адзначаем юбілей пролетарскага поэты. Але паслухаем далей В. Зубко, як яна вельмі ня проста разьвязвае задачу.

> „Праўда, і такі падыход мае сваю рацыю, хоць ён і вельмі просты"
>
> „Александровіч сваею творчасьцю дзейнічае цалкам на карысьць пролетарыяту. Ён поэта для пролетарыяту. А калі так, дык чаму не пролетарскі?"
>
> „Яго тэмы—наша (ці ваша? Л. Б.) пролетарская сучаснасьць, яго погляды—погляды пролетарыяту (праўда, не заўсёды, заўважым у дужках. Л. Б.), у яго творах—энтузыязм змаганьня і будаўніцтва".

Дык чаму-ж усё-ж такі непролетарскі, раз тэмы—пролетарская сучаснасьць, раз погляды пролетарыяту, раз творчасьць яго дзейнічае на карысьць пролетарыяту? Мы грэшныя думалі раней і трымаемся той думкі зараз, што раз пісьменьнік праз сваю твор-

часьць і ў сваёй творчасьці пазнае сьвет з пункту гледжаньня пролетарыяту, раз яго погляды выражаюць погляды пролетарыяту, не разыходзяцца з імі, раз яго творчасьць служыць збройяу. руках пролетарыяту, дзейнічае на карысьць пролетарыяту,—дык гэта і ёсьць пролетарскі пісьменьнік. Аднак В. Зубко ня згодна з гэтымі „хадзячымі думкамі" хоць і робіць ім уступку („маюць сваю рацыю"), бо па яе Александровіч не пролетарскі пісьменьнік, а „поэта для, пролетарыяту" і „гэта таму, піша яна,—што ён прышоў да пролетарыяту і сваёю творчасьцю... стаў у рады ягоных змагароў" (ст. 158), хоць „не пролетарыят нарадзіў Александровіча", хоць „Александровіч не ад пролетарыяту" (*Стар. 163*).

У супроцілегласьць „хадзячай думцы", што Александровіч пролетарскі поэта, В. Зубко констатуе „глыбокамысьленна", што Александровічава пролетарскасьць знаходзіцца ў процэсе станаўленьня, і гэта зьвязана з тымі зрухамі, якія перажывае той соцыяльны пласт, які даў нам Александровіча, са зьменамі ў быцьці яго соцыяльнай групы..." (ст. 158). Што-ж гэта за соцыяльная група, якая дала нам Александровіча і пролетарскасьць якой знаходзіцца ў процэсе станаўленьня?

Гэтую соцыяльную групу, ці соцыяльны пласт В. Зубко шукае ў вобразах творчасьці Александровіча і знаходзіць: першае „не якінебудзь конкрэтны жывы друкар, а друкар наогул" (159) другое—соц-будаўніцтва ён малюе так, што наогул „мы" творым, наогул будаўніцтва і новае жыцьцё" (159), трэцяе—„сынтэтычны вобраз лірычнага „я" (155), чацьвертае—„момант богэмшчыны" (163), момант „сваволься-тва" (161), момант „валацужніцтва" (161), пятае, „у вобразах пэрсанажаў Александровіча мы часьцей сустракаем нерабочых... гэтыя вобразы... шавец, дзяўчына швачка, чалавек з выпадковым заробкам, які ня мае пэўнага грашоўнага становішча (Абрам), газэтчык, чысьцільшчык ботаў, тачыльшчык нажоў... зноў шавец і г. д." Адным словам" „пераважны тут вобраз—вобраз саматужніка" (160) „Цікава, што рабочых вытворчых вобразаў, характарных для пролетарскага стылю, амаль не назіраецца" (163) (а „амаль", вядома, ня лічыцца. Л. Б.) А што-ж без „амаль" назіраецца? „Вобразы, што адбіваюць саматужніцкія працоўныя процэсы... большасьць стылістычных вобразаў адбівае непасрэдна сьветаадчуваньне яго жыцьцярадаснасьць", гэта значыць „сьветаадчуваньне і жыцьцярадаснасьць" „... саматужніцкіх працоўных процэсаў".

Выходзіць па Зубко, што вобразы Александровіча і ёсьць ня што іншае, як адлюстраваньне той соцыяльнай групы, якая „нам яго дала". Выходзіць, што творчасьць пісьменьніка, характар яе, кляса-вая сутнасьць яе вызначаецца вобразамі (у разуменьні Зубко, вядома) пісьменьніка, інакш кажучы, пісьменьнік толькі можа ствараць вобразы сваёй уласнай соцыяльнай групы, пісьменьнік неадлучны ад вобразаў сваёй творчасьці.

Гэта ня нова і неарыгінальна. Тэарэтычны дзед (Пераверзеў) і бацькі (Соўсун і Фохт) В. Зубко даўно пропагандуюць фаталістычную асуджанасьць пісьменьніка колам вобразаў сваёй соцыяльнай групы.

„Начнем з положэния об ограниченности творческих возможностей. Мы уже видели, что она является неизбежным следствием тех образов, из которых складываются художественные произведения, не произволом, а капризом автора определяется образный состав его творчества, и не в его власти вырваться из детерминированного круга образов, потому что он и его образы связаны, как суб'ект и об'ект единой социальной действительности. Куда бы ни летел на крыльях творческого воображения автор,—в надзвездные эфиры или в преисподнюю, под экватор или на полюсы, в древний Рим или в средневековый Париж,—он летиг окруженный своими образами, всюду несет их з собой. Нет перевоплощения, о котором говорят идеалисты, есть лишь перемещение в разные планы, перелицовка, переодевание единой системы образов, детерминированных единой социальной действительностью". (Переверзев „Литература и Марксизм" кн. II 1929г.)

В. Зубко падышла да творчасьці Александровіча (і ня толькі да Александровіча) вось з гэтай вульгарна-матэрыялістычнай позыцыі, гэтым меншавіцкім атреп'ем яна харчавалася і дрэнна пераможанае, падае яго чытачу, як „цікавыя нагляданьні" на старонках „Узвышша". Будзь-бы хоць трошкі сьмялейшай Зубко, яна зрабіла-б лёгічны вывад (які няўхільна вынікае з усёй пераверзіянскай концэпцыі), што героі поэмы „Цені на сонцы" гэта саматужнік у другім пляне, гэта перааапрануты Андрэй Александровіч. Праўда, Зубко на гэта не асьмелілася пайсьці, яна палічыла за лепшае абыйсьці па сутнасьці поэму „Цені на сонцы", зрабіўшы для блізіру пару мазкоў аб „каштоўнасьці карыкатуры".

Выходзіць па концэпцыі такіх крытыкаў, што „соцыяльная прырода" (які нязручны тэрмін!) Александровіча, фаталістычна вызначана загадзя і наканована яго соцыяльным паходжаньнем і выхаваньнем у маленстве, што яго творчасьць і ён сам фотолістычна круціцца ў замкнутым коле вобразаў, якія „быцьцём соцыяльнай групы... абумоўлены" (Зубко) той соцыяльнай групай, з якой ён вышаў.

Выходзіць, што лёс Александровіча абумоўлены яго паходжаньнем і яго вобразамі і на яго раду загадзя напісана сядзець у дробнабуржуазнай скрынцы і плысьці па хвалях жыцьця, туды, куды жыцьцё будзе несьці гэтую скрынку. Падзьме буржуазны вецярок, скрынка з Александровічам паплыве ў яго кірунку. Падзьме пролетарскі вецярок, скрынка з Александровічам паплыве ў яго кірунку, і Александровіч будзе „поэта для пролетарыяту" (Зубко). Так выходзіць па вучэньню Зубко, якая давяла да абсурду і без таго абсурднае вучэньне яе тэарэтычнага дзеда Пераверзева.

Але-ж гэта ня ўсё. Чаму ўсё-ж такі „погляды Александровіча—погляды пролетарыяту? „Чаму „яго пролетарскасьць знаходзіцца ў процэсе станаўленьня?“ Чаму „ён прышоў да пролетарыяту і сваёю творчасьцю... стаў у рады ягоных змагароў“? Чаму ён не пролетарскі пісьменьнік, а „поэта для пролетарыяту“? На ўсе нашы пытаньні В. Зубко праз меру сьмела і нахабна, за тое коратка і выразна, дае адказ таму „што соцыяльная група (дроная буржуазія, саматужнікі Л Б.), якую выражае творчасьць Александровіча, не бярэ таго стаілага непасрэднага ўдзелу ў конкрэтным рэчавым будаўніцтве, які бярэ пролетарыят, хоць яна стаіць вельмі блізка да яго і ідэолёгічна зьліваецца з ім“ (160) (падкрэсьлена намі Л. Б.).

Дык вось, Александровіч прышоў да пролетарыяту таму, што дробная буржуазія, якая парадзіла яго, „ідэолёгічна зьліваецца з пролетарыятам“. А таму паводле Зубко „жыцьцярадаснасьць і бесшабашнае ўдальства богэмы перарастаюць у запал, жыцьцярадаснасьць узыходзячай юнацкай клясы, героічнай клясы, якая скорыць сабе сьвет для будучага шчасьця ўсяго чалавецтва. У рытм вершу пранікаюць тэмпы новага жыцьця“ (163): Мабыць хопіць. Нам думаецца, што такую пошласьць трэба ня столькі абвяргаць, а з носьбітам яе ня столькі спрачацца, дыскусаваць, колькі выкрываць, зрываць маскі і „колкім венікам страхнуць бы, страхнуць“.

(*Александровіч*).

Аднак інакшай думкі, на гэты конт трымалася рэдакцыя „Узвышша“. (Да рэчы: ці не пара ўжо ліквідаваць абязьлічку ў некаторых нашых часопісях?!) Вось што яна пісала ў заўвазе да артыкулу В. Зубко.

„Артыкул В. Зубко зьмяшчае ў сябе шэраг цікавых наглядань-няў над творчасьцю А. Александровіча, дзеля чаго рэдакцыя лічыць патрэбным яго выдрукаваць, ня гледзячы на некаторую мэтодолёгічную нясталасьць і спрэчнасьць вывадаў. Рэдакцыя“.[1])

---

1) Рэдакцыя лічыць, што сапраўды пара ліквідаваць абязьлічку і ня толькі „ў некаторых“, а ва ўсіх нашых часопісях. Што да артыкулу Зубко, дык рэдакцыя лічыць, што фактычны матар'ял, які прыводзіць Зубко, разглядаючы творчасьць Александровіча, выразна сьведчыць аб тым, як Александровіч, вызваляючыся ад шалухі дробна-буржуазнай ідэолёгіі, выкрысталізоўваўся, як пролетарскі пісьменьнік, але Зубко, атрымаўшы ў БДУ значную пераверзеўскую закваску праз Фохта і Саўсуна, ня здолела пераступіць цераз перавeрзіянскі канон і проста сказаць, што Александровіч зьяўляецца пролетарскім пісьменьнікам, а пакінула яго ў межах дробнай буржуазіі, якая на яе думку, наогул уся цалкам набліжаецца да пролетарыяту. Рэдакцыя сапраўды зрабіла палітычную памылку, калі зьмясьціла ў № 9-10 „Узвышша“ за 1931 год артыкул Зубко і зазначыла толькі на мэтодолёгічную нясталасьць і спрэчнасьць вывадаў, а не раскрыла перавeрзіянскай установкі ў артыкуле Зубко. Такіх памылак у рэдакцыі „Узвышша“ і ў цэлай організацыі было-б менш, каб Узвышша мела большую дапамогу з боку іншых організацый і ў першую чаргу з боку вядучай літаратурнай організацыі—Беларускай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў.

Рэдакцыя.

Што гэта, калі ня гнілы стыдлівы лібэралізм рэдакцыі?

„Соцыяльная прырода“ Александровіча ёсьць жывы, рэальны процэс яго росту, процэс перамаганьня таго дробна-буржуазнага, мяшчанскага напластаваньня на яго творчасьці, чым яна характарызуецца на першых кроках яго творчага шляху.

Бясспрэчна, што Андрэй Александровіч прышоў у беларускую літаратуру, як поэта дробна-буржуазнага гарадзкога мяшчанскага асяродзьдзя. Бясспрэчна, што на працягу значнага часу у яго творчасьці выяўяяліся паасобныя бакі ідэолёгіі і густаў дробнай буржуазіі, гарадзкога мяшчанства, іх уяўленьне аб рачаіснасьці. У яго творчасьці першых год мы знаходзім і лірычнасьць па адрасу ветру, любаваньне вуліцай з яе шумамі і ліхтаром, захапленьне начной цішынёй і „шапатлівым звонам“, богемшчыну, яе апяваньне і іншае.

Уяўленьне поэты пра соцыяльную рачаіснасьць ня ідзе далей таго, што кідаецца ў вочы на павярхоўнасьці, гэтае ўяўленьне яшчэ значна прымітыўнае, часьцей наіўнае і скажонае. Ён адчувае сілу рэволюцыі, сілу рабочае клясы, суб'ектыўна імкнецца да яе, апяваць і славіць яе, але покуль што не разумее яе, як глыбокі і ўсебаковы процэс, і таму фіксуе ў вершаваных радкох „фабрычныя гудкі“, „фабрычны дым“, „рамы фабрычных вакон“, „шапкі фабрычных труб“. Праўда, часамі ён прасякае і за рамы „фабрычных вакон“ і чуе „гул катлоў“, „сьпеў молата“, бачыць „сталь-машыну“, „галодную сталь“, але чалавек, яго будаўнічая героічная праца не знаходзяць свайго адлюстраваньня. Як правіла, машына, яе сіла, супроцьстаіць чалавеку. Яна лягчэй успрымаецца поэтам і ім апяваецца:

„І дзень і ноч машынаў гул,
цалуе горача рабочых.
Таму руку, таму нагу
прыцісьне і радасна рагоча:
— Варштат заменіць сотні рук,—
Што робіш ноч, ён дасьць хвілінай...
. . . . . .

Цябе вітаю я, машына“.

Там, дзе поэта прабуе ўнікнуць у сэнс працы на заводзе, даць вобразы жывых рабочых, а не дэклямаваць пра рабочых, там поэта, разам з поэтычна неапраўданай радасьцю, разам з супроцьстаўленьнем рабочага сонцу,

(„Няхай сонца панкоў забаўляе,
Наша сонца—песьня машын“)

паказвае ўмовы працы ў адмоўна згушчаных тонах.

„На заводзе кашлем крывавым
Рве грудзі рабочая раць.
Прывозяць вагонамі камень,
Выгружаць рабочы ідзе.
Узьвіваецца пыл слупамі,
У грудзёх рабочых гудзе“.

Неадлучнымі элемэнтамі, якія выяўляюць характар Александровічавай творчасьці таго часу, зьяўляецца яго ўяўленьне пра рэволюцыю.

Яна яму ўяўляецца і так знаходзіць сваё адлюстраваньне часьцей як „мяцежная стыхія“, як стыхійны „гул“, „звон“, а таксама неадлучным эпітэтам таго пэрыоду зьяўляецца анархічнае, космічнага парадку, бунтарства супроць космосу. Зварочваючыся да сонца, поэта не на жарт гаворыць:

„Ведай толькі, кажу, я ня сьмехам,
Лепш ня сунься са мной на нажы“.

Да ранейшай творчасьці Андрэя Александровіча ня можа быць аднабаковага падыходу. Яе нельга браць з якога-небудзь аднаго боку і гэтым характарызаваць, бо гэта няўхільна прывяло-б да таго, што раздуваньне, распуханьне асобных рыс, „кавалачкаў, „абломкаў“,— ператварылася-б у самастойную цэльную, простую лінію, прывяло-б у балота ідэалізму. А так іменна падыходзілі нацдэмы і іх прыяцелі да творчасьці нашага поэты, калі ставілі стаўку на яго компромэтацыю. Калі, пачынаючы ад Бабарэкі і канчаючы Байковым і Жылуновічам, нацдэмы і нацопортуністы замоўчвалі творчасьць Александровіча,—гэта значыць фактычна адмаўлялі за ёю права на існаваньне і права на рост і разьвіцьцё пісьменьніка, дык другія (Кундзішы) хапаліся за слабыя бакі творчасьці Александровіча, разьдзімалі, распухлялі іх да такой ступені, што ўсё здаровае, рэволюцыйнае, усё тое, што прывяло да сёнешняга яго ўзроўню, пакрывалася разадзьмутым, распухлым пад іх рукамі адмоўным.

Творчасьць Александровіча першага яе этапу — урбаністычная творчасьць. Але Александровічаў урбанізм меў свае асаблівасьці— у большасьці актыўны адбор об'екту.

Таму зусім было-б няправільна лічыць, што творчасьць Александровіча першых яго этапаў характырызуецца толькі тымі рысамі, якія мы падалі ў скандэнсаваным выглядзе.

Праз дробна-буржуазную, мяшчанскую шалуху прабіваўся здаровы рэволюцыйны (гістарычна) струмень, струмень, які характарызуе здаровую тэндэнцыю, якая з цягам часу, пад уплывам узрастаючай пралетарскай літаратуры, набыла агульнае характарызуючае значэньне, перарасла ў вядучы пачатак. Яшчэ ў зусім раньніх вершах у гаразкім ветры чуецца яму радасьць рабочая, чуюцца сьпевы барацьбы:

„Подых ветру вабіць радасьцю рабочай,
Чырвань вуліц цешыць сьпевам барацьбы“.

Адчуваючы і апяваючы стыхію рэволюцыі, якая прынесла вызваленьне працоўным ад уціску і эксплёатацыі, поэта часамі ўлоўлівае і тое, што „мяцежная стыхія“ мае сваёй асновай рабочы рух, барацьбу за кіраўніцтва рабочае клясы. Праўда, гэта яшчэ нявыразна ўсьведамляецца поэтай, але сама галоўнае, што ён адчувае ўжо і пачынае ўсьведамляць усё гэтае, кажучы:

„Падпольле—дзіця рабочых“.

Далейшы рост поэты вядзе да ўсьведамленьня і сьвядомага адлюстраваньня рабочае клясы ў яго творчасьці. Наш час уяўляецца Александровічу, як час рабочы, які вызначаецца панаваньнем працы, панаваньнем сілы рабочай. Гэта знаходзіць сваё выяўленьне часта ў наіўных, прымітыўных вобразах:

„Што ня стане
У час рабочы?
У нас і камень
Зарагоча".

Усё гэта ўзмацняе веру ў рабочае клясы, дае сілу і бадзёрасьць, творчы запал і імпэт для творчага ўздыму.

„Заўтрае клікаць
Сталевай машыну ай,
Узьняўшы няўпынна
Дзён сьветлых узьлёт.

Поэту захапляе барацьба за „заўтрага сьветлыя далі", ён ня мірыцца з нудлівым выцьцём песен лірыкаў кулацтва, а таксама і дэзэртыраў, якія бягуць з вёскі, „ня вывеўшы ў полі заросшы палын", бягуць у горад і тут, пападаючы ў акружэньне дробна-буржуазнай богэмы, адрываюцца ад працоўных і таму „дзіка ім песьня сталёвых машын", і таму

„Горад іх давіць, як пылам кастрыца,
Як вёску іх родную горкі палын".

„З жыцьцём ня суладзіўшы,
Як на чужыне,
Пакінуўшы вёску, сьціраюць асфальт.
Любоў да жыцьця няпрыкметна ў іх стыне.
Ня вабіць іх заўтрага сьветлая даль".

Александровіч узьнімаецца на ўзровень разуменьня сапраўдных задач, сапраўды рэволюцыйна-дзейнай ролі, сапраўды рэволюцыйнай поэзіі. Ён прысьвячае сваю творчасьць карчаваньню „палын-травы", усяго старога, усяго таго, што гняце яшчэ вёску, на перабудову вёскі.

„Пайду я прасторам
Лясной Беларусі,
Пайду на шляхох беларускіх далін.
Горад, мой родны, я не зракуся
Гучных мэлёдый сталёвых машын.
Толькі пайду я далінай вазёраў,
Там пакарчуем палын-траву". (1926 г.).

І ў гэтым сіла, і гэта ёсьць тое, што робіць Александровіча поэтам пролетарыяту, узьнімае яго на ўзровень задач, што стаяць перад пролетарыятам на тым гістарычным этапе.

Узьняўшыся сваёй творчасьцю на ўзровень задач рэволюцыйнай клясы, поэта ня можа спакойна сузіраць і мірыцца з тым, што другая частка Беларусі пад уціскам, што

„Сёньня... там... будуюць казэматы".

што

„Сёньня... там... няведамы прыгон".

Ён глыбока эмоцыянальным, актыўна-пазыўным творам, які выклікае непрымірымую клясавую нянавісьць, клейміць разьюшаных панoў „Пілсудзкіх, Мураўёвых“, а панская Польшча выкрываецца сёньня:

„Як царская Расія
Краіна сьмерці!.. Краіна цёмных крат“...

Такім чынам выходзіць, што творчасьць Александровіча на пэўным этапе свайго разьвіцьця, якое ішло шляхам аўладаньня сьветалоглядам пролетарыяту, шляхам перамаганьня дробнабуржуазнага напластаваньня, уваходзіць у рэчышча пролетарскай літаратуры, становіцца яе сустаўной і неадлучнай часткай. Александровіч становіцца пролетарскім поэтам.

Гаворачы аб процэсе формаваньня Александровіча, як пролетарскага поэты, мы ні ў якай меры не павінны ігнараваць і тую гістарычную асаблівасьць і цяжкасьць росту і разьвіцьця беларускай пролетарскай літаратуры, якая абумоўлівалася цяжкасьцямі і складанасьцю барацьбы рабочае клясы за пролетарскі соцыялістычны шлях разьвіцьця беларускай-нацыянальнай культуры.

Калі мы гаворым аб пролетарскай літаратуры і аб Александровічу, як пролетарскім поэце, дык зусім ня трэба думаць, што шлях разьвіцьця пролетарскай літаратуры і Александровіча, яе пролетарскага поэты,—лёгкі і ня зьвязаны з хібамі і недахопамі.

Пролетарская літаратура расла і разьвівалася ня ізолявана ад таго дробнабуржуазнага абкружэньня, у якім знаходзіцца пролетарыят.

Дробнабуржуазная ідэолёгія часамі больш, часамі менш уплывала на паасобных пролетарскіх пісьменьнікаў

Носіць на сабе сьляды ўплыву дробна-буржуазнай ідэолёгіі, асабліва ў яе нацыяналістычнай афарбоўцы, і творчы шлях Андрэя Александровіча.

Барацьба нашай партыі, а пад яе кіраўніцтвам і барацьба Беларускай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў супроць беларускага нацыяналізму, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму,—узьдзейнічала на Александровіча і на яго творчасьць, як магутны выхаваўчы фактар. Усё гэта ярка выразілася ў рашучым разрыве пісьменьніка з нацыяналізмам, у абвяшчэньні сьмяротнай барацьбы ўсякаму нацыяналізму і шовінізму.

Гэтая вайна нацыяналізму, вайна ўсяму варожаму для соцыялістычнага будаўніцтва, асабліва пераможна вядзецца Александровічам яго поэмай „Цені на сонцы“. Поэма „Цені на сонцы“ зьявілася моцнай і вострай зброяй у руках рабочае класы ў барацьбе яе супроць контррэволюцыйнага нацдэмократызму, таксама, яна, гэта япоэма, азначала сабою новы, больш высокі этап разьвіцьця пролетарскае літаратуры, росту Александровіча. Вазьмеце зоолёгічную галерэю тыпаў з поэмы „Цені на сонцы“. Пачынаючы ад „шчупленькага крытыка—марксыста ня іначай“ зяця, цесьця, кума, свата, сваяка, брата, архі-

мадрыта і канчаючы эстэцтвуючымі дамамі з „узвышшаным“ настроем і прайдзісьветам, дыплёматам, ці-ж гэта не зьявілася зрывам рознакаляровых масак з ворагаў соцыялістычнага будаўніцтва? Ці гэтае зрываньне масак не зьяўлялася і не зьяўляецца функцыяй і задачай пролетарскай літаратуры?

Далейшая творчасьць Александровіча („Устаноўка“, „Поэма імя вызваленьня“, „Поэма пра ворага“, „Нараджэньне чалавека“ „Напор“ і шмат вершаў) ёсьць разгортваньне і паглыбленьне таго шляху, на які рашуча стаў поэта, за які актыўна змагаецца названымі творамі, і аб частцы якіх мы ўжо гаварылі.

Творчасьць Андрэя Александровіча рознастайная і багатая і ў жанравым разрэзе. Для выкананьня задач, якія стаяць перад пролетарскай літаратурай, ён не абмяжоўваецца адным відам жанру— вершам ці поэмай. Ён зьяўляецца аўтарам многіх дзіцячых кніжак, аўтарам аднэй з лепшых п'ес нашага часу.

Крытычна праглядаючы творчы шлях юбіляра, абараняючы пролетарскую літаратуру, яе кроўныя інтарэсы ад наскокаў праверзіянскіх меншавіцтвуючых і іншых неданоскаў, — мы, зразумела, ні ў якай ступені ня можам адмовіцца ад крытыкі і самакрытыкі нашых слабых бакоў, памылак, творчых і ідэолёгічных зрываў і ў творчасьці нашага юбіляра.

Было-б найвялікшай шкодай для пісьменьніка і для ўсёй пролетарскай літаратуры, калі-б мы гаварылі, што творчасьць Александровіча ёсьць усё тое, што магчыма дасягнуць, што яна ёсьць тое, што перакрывае сабою пролетарскую літаратуру. Пролетарская літаратура адстае ад тэмпаў ад узроўню соцыялістычнага будаўніцтва, гэтае адставаньне датычыць творчасьці Александровіча. Адставаньне пролетарскай літаратуры ад узроўню соцыялістычнага будаўніцтва перш за ўсё выяўляецца ў нявыстарчальна глыбокім і ўсебаковым партыйным асмысьліваньні і адлюстраваньні процэсу соцыялістычнага будаўніцтва, у яго конкрэтных бакох, у нявыстарчальна глыбокім пранікненьні ва ўнутраны зьмест гэтага процэсу, у нявыстарчальна мастацкім разгортваньні гэтага процэсу, яго вядучых асноў.

Усім гэтым грэшыць і творчасьць апошніх год нашага юбіляра. Аднэй з асноўных прычын адставаньня пролетарскай літаратуры, павольнасьці перамаганьня і ліквідацыі гэтага адставаньня,—зьяўляецца нявыстарчальнае аўладаньне нашымі пісьменьнікамі марксысцка-ленінскім, дыялектычна-матэрыялістычным мэтодам, а як вынік гэтага нявыстарчальна глыбокае і ўсебаковае асмысьленьне таго новага, што прыносіць сабою новы этап соцыялістычнага будаўніцтва, уступленьня краіны ў пэрыод соцыялізму. Шлях творчай перабудовы Александровіча цяжкі і зьвязаны з значнымі зрывамі, якія зьяўляюцца непасрэдным вынікам шляху найменшага супраціўленьня, на які стаў Александровіч сваёй „Устаноўкай“, „Поэмай імя вызваленьня“, „Поэмай пра ворага“ і інш. Замест глыбокага і ўсебаковага пранікненьня і асмысьленьня

мастацкага актыўна-дзейнага адлюстраваньня багацейшага матэрыялу ў названых творах Александровіч пашоў па лініі ўгварэньня контрастных і неконтрасных схэм, любаваньня гукамі самімі па сабе, па лініі культываньня голага тэхніцызму на павярхоўнасьці жывога матэрыялу. Праўда, трэба сказаць, што гэтая тэхніка ня нізкага гатунку, а высокай якасьці, адшліфованая вопытным кваліфікаваным майстрам.

Гэты рацыяналізм і схэматызм, якім характарызуецца творчы мэтод у названых творах, тыя памылкі і зрывы, якія мы канстатавалі, вынікаюць з недастаткова глыбокага і ўсебаковага партыйнага амысьленьня рачаіснасьці, вынікаюць з недахопаў сьветапогляду аўтара.

Гэты пройдзены і асмысьлены пісьменьнікам этап, такія творы, як „Нараджэньне чалавека", п'еса „Напор", сьведчаць пра тое, што Александровіч пашоў па правільным шляху, шляху найбольшага супраціўленьня, пры мастацкім пазнаньні і раскрыцьці праз вобразы нашае рачаіснасьці, як шматграннага і шматадменнага адзінства, супярэчнасьцяй у іх змаганьні, па шляху амысьленьня (праўда не выстарчальна партыйнага) і мастацкаактыўна дзейнага адлюстраваньня шляхоў нашага руху, нашых перамог.

А ўсё гэта разам, абумоўліваючы больш глыбокую ідэйную насычанасьць творчасьці Александровіча, абумоўлівае вышэйшую ступень мастацкасьці, абумоўлівае і тую актыўную функцыю, якую павінна выконваць пролетарская літаратура.

Рост і посьпехі пролетарскай літаратуры, рост і перабудова творчасьці Андрэя Александровіча ў прыватнасьці,--зьяюўляюцца прыватным выяўленьнем ілюстрацыі правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, перамогі рабочае клясы пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі ў справе барацьбы за беларускую культуру, соцыялістычную па зьмесьце і нацыянальную па форме.

У справе росту і перабуовы творчасьці Александровіча, як пролетарскага пісьменьніка, рашаючую ролю адыграў БелАПП, ідэйна вядучы атрад усёй савецкай літаратуры, які пад кіраўніцтвам партыі змагаецца за вялікае мастацтва бальшавізму, за гегемонію пролетарскай літаратуры.

Далейшы творчы рост Александровіча, як пролетарскага пісьменьніка, будзе зьяўляцца важнейшым фактарам у справе заваяваньня творчай гэгемоніі пролетарскай літаратуры.

„Колькі сіл, напорнасьці
Заве ў грудзёх маіх—
Гарэць, тварыць, да зор расьці
Ад веку агнявых.
Поступам гартаваным
Іду ў жыцьцё, далей.
Шлях мой заваяваны;
Давай, цягнік, хутчэй!.." (*„Нараджэньне чалавека"*)

Плашчынскі

Пра аповесьць Платона Галавача „Спалох на загонах“[1])

Мы бачым, як уся энэргія працоўных мас, усе сілы і магчымасьці як мага концэнтруюцца на пабудову соцыялізму ў мінімальна каротkі гістарычна тэрмін. Вось чаму і ад мастацтва, а значыць, і ад літаратуры сёньня патрабуецца, як ніколі раней, каб яно было ваяўнічым, няпрымірымым да ўсяго, што цягне назад, што становіцца ўпоперак шляху да пабудовы соцыялізму. Адсюль задача, пастаўленая перад літаратурай, змаганьне за партыйнасьць у літаратуры, за вялікае мастацтва бальшавізму. Партыйнасьць і азначае найбольшую ідэолёгічную чыстату, бальшавіцкую пільнасьць і няпрымірымасьць да ўсяго клясава-варожага, азначае разам з гэтым і вышэйшую якасьць зброі, якой вядзецца змаганьне,—вышэйшую мастацкую якасьць літаратуры—найбольш шырокі ахоп рачаіснасьці, паказ у сапраўдных яе супярэчнасьцях, у руху і пэрспэктыве адно мае на ўвазе другое, як непадзельную еднасьць, інакш разумець—значыць нічога не разумець.

Наша мастацтва і літаратура ня выконваюць цалкам тэй ролі, якую павінны выконваць, значна адстаюць ад патрэб соцыялістычнага будаўніцтва.

Кожны дзень робіць вялікія зьмены ў нашым жыцьці, з кожным днём сьвядомасьць шырокіх працоўных мас узрастае, — яна ужо настолькі выросла, што самыя перадавыя, самыя складаныя ідэі становяцца іх набыткам, імі ажыцьцяўляюцца пад кіраўніцтвам партыі пролетарыяту. Нашы-ж пісьменьнікі і поэты, жадаючы паказаць гэты рост, часта даюць у параўнаньні з ім вельмі маленькае, малапрыкметнае, часта вельмі падобнае на ўчарайшае, звужваюць яго, нават штампуюць. Замест супярэчлівага і сваяасаблівага, у іх выходзіць прымітыўнае, шаблённае і не без бутафорыі. Павярхоўнае беганьне вачмі вакол зьявы вельмі характэрна для нашай літаратуры. Горш за ўсё, калі маладая пролетарская літаратура падпадае такому ўплыву, на што не заўсёды зьвяртаецца належная ўвага. Усё гэта зьніжае ролю літаратуры, зьмяншае яе значэньне ў змаганьні за соцыялізм.

Вось чаму з асаблівай павагай ставішся да твораў, у якіх узята за мэту паказаць той ці іншы бок нашага жыцьця ў ягоных супярэчнасьцях, шыраце, у ягоным сапраўдным разьвіцьці, даць нешта новае ў параўнаньні з тым, што ёсьць.

---

[1]) Першае выданьне.

Тэма аповесьці „Спалох на загонах“ — колектывізацыя вёскі; тэма вельмі актуальная, зусім мала распрацаваная нашай мастацкай літаратурай. Яшчэ і на сёньня няма такіх твораў, у якіх-бы процэс колёктывізацыі быў паказаны ва ўсіх ягоных складанасьцях і супярэчнасьцях.

Пісалі пра колектывізацыю і, замест яе, ставілі ў цэнтр увагі выбітага з жыцьця чалавека ці чалавека нязвычайнага, моцнага ў сілу якіхсьці фізыолёгічных прычын. Пісалі пра колектывізацыю і бязбожна схэматызавалі яе процэс, ці ў лепшым выпадку ўлаўлівалі толькі агульныя абрысы, упускаючы вельмі важнае: складанасьць і супярэчлівасьць яе. Пісалі пра колектывізацыю, падаючы вельмі шмат правільнага, цікавага, але разам з гэтым падавалі яе ў аснове, як нешта стыхійнае, адасобленае ад нашага агульнага разьвіцьця, ад гораду — без пролетарыяту і ягонай партыі, якая стаіць на чале гэтага процэсу. Падавалі колектывізацыю не як адзін з момантаў таго, што вядзе да зьнішчэньня розьніцы паміж горадам і вёскай, а проста як такое, што вядзе да лепшага жыцьця наогул. Часта не хапала ідэйнай насычанасьці і месца яе займаў бытавізм, голая эмпірыка, нанізваньне фактаў.

Як-жа падышоў да гэтае тэмы пролетарскі пісьменьнік Галавач? — асноўнае пытаньне, на якое павінен быць дадзены адказ. Самы агульны адказ: у Галавача няма большасьці пералічаных памылак; ён падышоў да колектывізацыі як да складанага соцыяльнага процэсу, зьвязанага з абвостраным клясавым змаганьнем, паказаў змагара за соцыялістычную рэконструкцыю вёскі; вельмі важнае ў ягонай аповесьці — змаганьне супроць папоўшчыны і кулацкага ўплыву на перадавую частку сялянства, змаганьне за вызваленьне іх з-пад клясава-варожага ўплыву, змаганьне супроць розных манэўраў клясавага ворага, што накіраваны на разбурэньне колектывізацыі. Але разам з гэтым у аповесьці ёсьць шэраг важных недахопаў, якія патрэбна асабліва падкрэсьліць і ніяк нельга іх абмінуць, як гэта зрабіў у сваёй рэцэнзіі на аповесьць М. Пятровіч (рэцэнзія зьмешчана ў „Маладняку“ № 10, за 1931 год).

Аповесьць пачынаецца ўступам. Уступ да аповесьці і сама аповесьць у пэўным сэнсе супроцьстаўленьне таго, што было, і таго, што павінна стаць, што ідзе, што ўжо становіцца рэальнасьцю. Але, з другога боку, гэта адзінае, непадзельнае, бо ў аповесьці паказана тое, што магло зьявіцца толькі як працяг рэволюцыі, як яе далейшае разьвіцьцё.

Калі прачытаеш уступ і аповесьць, адразу кідаецца ў вочы вельмі важны момант. Ствараецца ўражаньне, што яны нібы напісаны рознымі людзьмі, якія пазнаюць і ўсьведамляюць рачаістасьць рознымі мэтадамі пазнаньня. Калі ў аснове аповесьці мэтад дыялектычнага матар'ялізму, дык ва ўступе элемэнты ідэалістычнага падыходу да жыцьця — да Кастрычнікавай рэволюцыі. Беднасьць вёскі, вайна і рэволю-

цыя—вось матар'ял уступу, які пададзены ў надзвычайна эмоцыянальных танах. Паасобныя месцы глыбока ўразаюцца ў памяць, хвалююць, прыкоўваюць да сябе нашу ўвагу сваей глыбокай соцыяльнай праўдай.

Вось прыклад: „Ты памятаеш сваю хату? У ёй няма памосту і працякаюць дах і столь. Праз шчыліны ў вокнах пралазіць у хату з ветрам мяцеліца. Бр-р-р... Як сьцюдзёна у тваей хаце. І як яна за гэтыя два гады апусьцела. Вось толькі на печы, на астыглай чарэні нешта скурчылася, захутаўшыся ў рызьзё. Да гэта тваё дзіця, твой самы меншы сын. У яго шчарнелыя тонкія ногі і рукі і празмеру тоўсты жывот. Яно нешта гавора! Чуеш? Гэта яно гукае маці, просіць есьці. Але маці няма ў хаце. Яна, вось тая, бачыш у парванай, лапленай сьвітцы жанчыну, стаіць ля парогу ў хаце багатага суседа. Сьлязьлівымі ўпалымі вачыма пазірае яна на суседаў стол і, працягваючы дрыжачую руку, просіць для дзіцяці хоць маленькую скібачку хлеба". Гэта адно з лепшых месц уступу. Бацька гэтай сям'і вымушаны ваяваць, каб весела і спакойна жылося другім, каб яны малі, цалкам аддавацца чарльстону і распусьце.

Але як Галавач паказаў рэволюцыю? Тут галоўная загана уступу, якая робіць Галавача да некаторай ступені ідэалістым, незалежна ад яго субектыўных жаданьняў

Зразумелая рэч, што рэволюцыя зьяўляецца крайнім выражэннем соцыяльных супярэчнасьцяй, клясавых супярэчнасьцяй. Вось чаму, спыняючыся на рэволюцыі, мастак павінен сконцэнтраваць усю сваю ўвагу на выяўленьні зазначаных супярэчнасьцяй, павінен ускрыць дынаміку рэволюцыі праз разьвіцьцё і паглыбленьне гэтых супярэчнасьцяй. Так Галавач і падыйшоў да колектывізацыі у сваёй аповесьці. Тое, што Галавач ва ўступе ня ставіў сваей мэтай даць разгорнуты малюнак рэволюцыі, зусім яшчэ не адмаўляе правільнасьці вышэйсказанага, бо гутарка ідзе не пра разгорнутасьць паказу, а аб прынцыпе паказу, што не адно і тое.

Галавач не ідэалізуе рэволюцыю, ён вельмі добра разумее ўвесь цяжкі шлях яе, каб займацца ідэалізацыяй. Вось шлях рэволюцыі:

„руйнаваньне і будаўніцтва;
заблаванье і жудасьць;
радасьць і сьлёзы;
голад, сьмерьць і надзея;
адданасьць і недавер'е;
роспач і вера ў Яе".

Але-ж і разумеючы ўсю складанасьць і цяжкасьць рэволюцыі, можна па рознаму падаваць іх. Ад мэтаду падачы, ад слоўнай сыстэмы ў непасрэднай залежнасьці знаходзіцца і конкрэтны сэнс паданага, ягоная правільнасьць. Гаварыць пра рэволюцыю, не бяручы кожнага яе моманту ў акрэсьлена клясавым разрэзе,—значыць стаць на шлях, што вядзе да памылковага пра рэволюцыю ўяўленьня, пра яе рухаючую сілу. Я не хачу сказаць, што Галавач стаў сьвядома на

такі шлях, што Галавач не разумее клясавай дынамікі рэволюцыі, сьвядома ігноруе яе,—у такім разе ён нічога агульнага ня меў-бы з пролетарскім пісьменьнікам, паколькі сьвядома стаў на шлях скажэньня рэволюцыі. Але, жадаючы даць абагульняючы вобраз рэволюцыі, Галавач у сваім уступе да аповесьці стаў на шлях ідэалістычнага мастацкага мэтаду, таму і ня мог прыці да станоўчых вынікаў. Вось чаму Кастрычнік у абмалёўцы Галавача паўстае як нешта стыхійнае: „Парушаючы векавыя традыцыі, яна няшчадна рвала ланцугі старога і вызваляла людзей. І таму (? І. П.) яна адных абрадвала, другіх зьдзівіла сьмеласьцю сваіх імкненьняў, у трэціх узбудзіла надзею, у чацьвёртых—страх і схаваную нянавісьць да сябе, пятых адкінула ад сябе, як непатрэбнае“.

Мімаволі паўстае пытаньне: адкуль такая рэзнастайнасьць дачыненьняў да рэволюцыі ў „людзей“, няўжо толькі таму, што рэволюцыя зьнішчала старое „і вызваляла людзей“. Замест паказу рознасьці дачыненьняў людзей да рэволюцыі, як вынік рознасьці іх клясавага становішча, выйшла псыхолёгізацыя процэсу рэволюцыі. У Галавача вышла спаўзаньне на шлях падыходу да чалавека не як да прадстаўніка пэўнае клясы, чым і вызначаюцца ягоныя інтарэсы, а як да чалавека наогул. Адсюль „яна ішла і клікала кожнага з людзей (разьбіўка мая.—І. П.) да любові, народжанай у нянавісьці...“ А гэта і вядзе да перавальшчыны, дзе чалавек губляе сваю клясавую плоць і кроў, дзе ягоная духовая існасьць становіцца агульначалавечай, стаіць па-за рамкамі клясавай абумоўленасьці. З гэтым непадзельна зьвязана і тое, што Галавач, гаворачы пра Кастрычнік, ня вылучыў кіруючай ролі пролетарыяту, гэта значыць таго, што і робіць яго адменным ад усіх рэволюцый, якія толькі калі-небудзь і былі, што робіць яго пролетарскай рэволюцыяй. Вось чаму Галавач прышоў і ня мог ня прыці да значных палітычных памылак да стыхізацыі рэволюцыі, што прывяло да містыфікацыі яе. Вось чаму чалавек стаў у Галавача пасланцом рэволюцыі. Падкрэсьліваю—гэта важнейшая палітычная памылка абойдзена ў рэцэнзіі Пятровіча.

Цяпер пра аповесьць.

Тэма аповесьці—стварэньне колгасу ў вёсцы Цярэшкаў Брод. Вузенькія палоскі, цесныя нізенькія хаты з вокнамі, пазатыканымі анучамі, гразь, беднасьць, недаяданьне, нястачы і на гэтай аснове сваркі—найбольш характэрнае для Цярэшкавага Броду. У Цярэшкавым Бродзе толькі лічаныя жывуць добра, могуць ня ў чым сабе не адказваць.

„Было:

Вечны смутак, туга вечная і роспач“.

Галавач гэта некалькі разоў паўтарае, падкрэсьліваючы бязвыходнасьць, немагчымасьць сапраўды перайначыць жыцьцё, застаючыся

ў палоне вузенькай палоскі, у палоне прыватнай уласнасьці. Ня што іншае як беднасьць тут вядзе на забойства роднага брата, даводзіць да самагубства, прымушае выпрашваць хоць пудзік жытняй мукі на заціркy дзецям, каб выратаваць іх ад галоднай сьмерці, праціць, не зьвяртаючы ўвагі, што гэтым падаеш у залежнасьць ад кулака. Такое жыцьцё ня можа задаволіць чалавека. Але гэтым людзям аднаго нездавальненьня яшчэ мала, каб сьмела парваць са старым, каб бяз хістаньняў з ім разьвітацца. Тут можа ўжывацца і ўжываецца разам з нездавальненьнем і праклёнам да старога прывязанасьць да яго. Нездавальненьне старым і боязьнь перад адменным ад яго будучым. Калі перад імі раскрываюць мізэрнасьць іх жыцьця і даводзяць, што выйсьця ў такім, якім яно ёсьць, няма і ня можа быць, яны ў адзін голас пытаюць: „а дзе-ж выйсьце нам, скажы, дзе?“

Жадаючы выйсьця, яны з недаверлівасьцю ставяцца да колгасу, як да адзіна магчымага выйсьця. Век жывучы ва ўмовах прыватнай уласнасьці, на сваім уласным кусочку зямлі ім вельмі цяжка расстацца з ёй. Прыватная ўласнасьць дае сябе адчуваць што хвіліны і на кожным кроку. Жывучы „сам сабой“, гэтаму селяніну цяжка адразу зразумець сапраўдны сэнс жыцьця, якое парушае прыватную ўласнасьць, якое вядзе да канчатковага зьнішчэньня яе: „Якое жыцьцё? Аддай усё сваё, і кароў, і ўсё, а сам як-жа?“ Серадняк Клемс, які пасьля становіцца адным з стойкіх колгасьнікаў, не адразу падпісаўся пад заявай пра ўступленьне ў калгас. Ягоную жонку глыбока непакоіць: „што, ня пытаючы яе, забяруць каровы з хлева, што ня будзе яна больш даіць іх, што хтосьці чужы будзе даваць ёй малако ад яе ўласнай каровы“. Нават, ідучы ў колгас, тут не выключаецца магчымасьць хаваньня хамута і аброці, мяшка збожжа „на ўсякі выпадак“. Арганізаванасьць колгаснага жыцьця тут некаторымі ўспрымаецца як зьнішчэньне магчымасьці „пажыць вольна“, без „званкоў“, „каб ніхто нада мною не стаяў“. Перавагу колгасу над індывідуальнай гаспадаркай цяжка перад імі давесьці на словах, яны патрабуюць жывых фактаў, што сьведчаць пра большую карыснасьць колгасу ці комуны. Больш таго, нават убачыўшы ўласнымі вачыма гэту перавагу, яны не адразу прыходзяць да непахіснага і сьмелага сьцьвярджэньня, што сапраўды тут іх выйсьце і іншага ня можа быць. Яны дзівяцца, як усё добра ў комуне, куды лепш як у іх, але, каб пачаць самім будаваць такое жыцьцё, ім цяжка адразу адважыцца. „Хто яго ведае, як яно лепш будзе, можа і трэба гэта комуна ўжо, мо‘ такі сьвет цяпер настаў“... так разважае бяднячка Палашка, пабываўшы ў комуне. Адсутнасьць уласнай практыкі, вялікая сіла ўласьніцтва робяць тое, што гэты селянін ня важыцца першым пераступіць парог старога жыцьця, а хоча паглядзець, як іншыя пойдуць і будуць жыць пановаму. „Страшнавата яно, каб хто першы пайшоў...“ І далей: „Я ня супроць, але, першым гэта, брат таварыш, ня наша справа. Ніколі я такога ня бачыў жыцьця, а тут наслухаешся рознага і страшаць яшчэ...“ Так

адказвае адзін селянін на пытаньне Панаса, чаму ён ня ідзе першым у калгас.

Колектывізацыя, выклікаючы супярэчнасьці ў сьвядомасьці селяніна, ня можа ня выклікаць іх і ў сям'і, бо яны не з аднолькавай абвостранасьцю перажываюцца кожным членам сям'і, не ў адзін і той жа час перамагаюцца. Галіна разыходзіцца з сваім мужам, ідучы у колгас. Клемсіха, адмаўляючыся ісьці ў колгас, настойліва пярэчыць замеру свайго мужа стаць колгасьнікам, астаючыся бясьсільнай павярнуць яго назад. Яе протэст ня выходзіць за рамкі пасывізму, не об'ектывуецца ў колькі-небудзь актыўнае дзеяньне. Далей сварак з мужам і сьлёз Клемсіха ня ідзе.

Рэлігія—вечная спадарожніцца прыватнай уласнасьці, пры колектывізацыі губляе пад сабой грунт, бо яе аснова, прыватная ўласнасьць, рушыцца. Шмат з тых, хто запісаўся ў колгас у Цярэшкавым Бродзе паляць абразы. Клемс, які „ледзь не перахрасьціўся перад тым, як падпісаць пратакол“ пра ўступленьне ў колгас, таксама кідае ў печ абразы, бо „раз у калгасе, дык якія тут абразы. Аднаго чаго трэба трымацца...“ Жонка не пярэчыць ужо ягонаму ўчынку, хавае сваю крыўду ў сабе, бо адчувае безвыніковасьць такога пярэчаньня, бо бачыць, што так зрабіў ня толькі адзін яе муж, але і іншыя колгасьнікі. Яна хоча толькі спагады сваім перажываньням. Але замест спагады, на скаргу Клемсіхі, што „у колгасе богу не даюць памаліцца, абразы паздымалі ды папалілі...“ дзесяцігадовы ўнук Сёмка нечакана для яе самой адказаў: „— А на чорта гэтыя абразы, яшчэ тое і з царквою будзе хутка. І зарагатаў“. Яна ўжо ня моліцца ў хаце, а ідзе „за ток і, сьпяшаючыся, моліцца на царкву“. Тут зноў нечаканасьць. Замест крыжа на царкве зьяўляецца чырвоны сьцяг. Такім чынам рэлігійнасьць яе застаецца без падтрыманьня. Адзін з важнейшых элемэнтаў сьвядомасьці, узгадаваны і ўбіты ў галаву старым сьветам, ідзе да свайго скону, што Галавач праз вобраз Клемсіхі памастацку паказаў.

Рэлігія заўсёды была абароньніцай застою і рэакцыі. У наш час яна стала адным з важнейшых сродкаў клясавага ворага ў ягоным змаганьні супроць соцыялізму. У Цярэшкавым Бродзе, хаваючыся за рэлігію, клясавы вораг змагаецца супроць колгасу.

На адным баку грамадзкае сьвята, першае ворыва колгасьнікаў са сьцягам, на якім напісана: „Хай жыве комунізм“, а на другім „з прошчамі процэсыя“; на адным баку мітынг і „Паўстань, хто з голаду век пух“, а на другім „О-о-о-тча на-а-аш...“; тут—Панас, Клемс, Галіна і найбольш перадавая частка сялянства, там—бацюшка, контррэволюцыя і цемра, ва ўладзе якой знаходзіцца найбольш адсталае сялянства. Клемс вельмі добра разумее соцыяльны сэнс усяго гэтага. „Яны з прошчамі, з крыжамі супроць нас ідуць, а што мы? Хіба на дрэннае што мы пайшлі? Мы з пакуты вылезьці хочам, шчасьця хочам сабе і другім, хочам, каб крыху хоць радасьней жыць.

Дык чаму-ж і гэта богу не да спадобы? Чаму яму хочацца, каб мы век увесь пакутвалі?" Гаворачы гэта перад калгасьнікамі, Клемс вельмі далёка адыходзіць ад ранейшага Клемса, бо зразумеў контррэволюцыйную ролю рэлігіі. Праз супроцьстаўленьне першага ворыва колгасьнікаў з працэсыяй Галавач вельмі яскрава ўскрыў, конкрэтна паказаў адну з форм клясавага змаганьня ў вёсцы вакол колгасу, змаганьня вельмі абвостранага, з ахвярамі. Імем Хрыста клясавы вораг, пераадзяючыся ў рызу, вядзе цёмных жанчын на забойства Панаса.

Паказваючы пераход сялян у колгасьнікаў, Галавач падкрэсьлівае, выпукляе цяжкасьць і складанасьць гэтага пераходу, даводзіць неабходнасьць доўгага і ўпартага змаганьня за гэты пераход, разумеючы прычыны яго, а ня толькі констатуе сам факт. Галавач не глянцуе не займаецца лякіроўкай адзначанага процэсу; ён агаляе ўвесь консэрватызм прывычкі, паказвае сапраўднае аблічча прыватніцкай псыхолёгіі, што так укаранілася ў сьвядомасьць селяніна, тармозячы перараджэньне ягонай псыхолёгіі, ягоных поглядаў У Галавача тут няма ніякага любаваньня і поэтызацыі процэсу перараджэньня, да яго паказу ён падыходзіць як сапраўдны змагар за соцыялізм.

У некаторых нашых поэтаў і пісьменьнікаў справа з перараджэньнем выходзіць вельмі лёгка. Адно-два хісганьні—і ўсё вырашана, запісаўся ў колгас, і адразу зьнікла ўсё, што было раней, што прымушала яго хістацца, доўга думаць перад тым, як падань заяву пра ўступленьне ў колгас. Галавач нічога агульнага з такім падыходам ня мае, бо раскрывае зьяву ў яе праўдзівасьці. Ён не баіцца паказваць і падкрэсьліваць на адмоўнае, бо бачыць пэрспэктыву агульнага, разьвіцьцё зьявы, якога нішто ня можа спыніць. Калі селянін запісаўся у колгас, дык для Галавача яшчэ гэтым уся справа не вырашаецца, запіс яшчэ ў кожным прыватным выпадку нічога не гаворыць пра канчатковае і непарушнае вырашэньне перамогі новага над старым у псыхолёгіі селяніна. Гэтым яшчэ ня здымаецца само хістаньне, і магчымасьць павароту назад, бо яшчэ больш абвастраецца клясавае змаганьне вакол колгасу, бо яно знаходзіць свой адбітак у колгасе. Галавач ня гоніцца за колькасьцю, якая, як некаторым можа здавацца, вырашае справу. У Галавача іншы прынцып—справу вырашае перш за усё якасьць. З колгасу у Цярэшкавым Бродзе, пасьля падачы заяў, большая частка сялян выходзіць. Але гэта не палохае Галавача і не палохае таму, бо ён бачыць сілу тых, што засталіся, бо яны не разьбягуцца, ня струсяць перад цяжкасьцямі, бо яны канчаткова вырашылі перабудаваць сваё жыцьцё, змагацца за новае, зразумеўшы патрэбнасьць гэтага змаганьня; не палохае таму, бо Галавач разумее заканамернасьць, сацыяльную абумоўленасьць такога выхаду, бо перакананы ў канчатковай перамозе колектывізацыі над старой вёскай.

Правільна паказаць колектывізацыю бяз клясавага змаганьня немагчыма. Абыйсьці клясавае змаганьне значыць не зразумець процэсу

колектывізацыі, сказіць яго, пашкодзіць ягонаму пераможнаму поступу. Стварэньне колгасу ў Цярэшкавым Бродзе зьвязана з абвостраным клясавым змаганьнем. Як ўжо раней адзначалася, характэрнае для аповесьці—змаганьне супроць кулацкага ўплыву на сялянства і асабліва на перадавую ягоную частку. Да паказу клясавага змаганьня і самога кулака Галавач падышоў не шаблённа. У большасьці выпадкаў кулак падаваўся ня інакш, як пузатым, на самай справе вельмі абмежаваным і страляў ня інакш, як праз вакно. Ня ўмелі паказваць сапраўднага кулака, як ворага, з якім патрэбна весьці змаганьне ўпарта і ўмела. Кулак Галавача—сур'ёзная клясава-варожая сіла, вельмі добра разумее ўсю моц сялянскага консэрватызму, іх прывязанасьць да прыватнай уласнасьці, рэлігійнасьць, скарыстоўваючы ўсё гэта ў мэтах перашкоды стварэньню і замацаваньню колгасу. Гэты кулак нават гатоў „дапамагаць“ беднаце, ён выступае, і пасвойму агітуе за колгас, запісваецца сам у колгас, вядучы разам з гэтым непрымірымае змаганьне супроць колгасу. Такім зьяўляецца Мышкін і Лукаш. Гэты кулак адкрыта не выступае супроць колгасу, ён сваяасаблівы політык, ён стараецца дзейнічаць за сьпіной сялян іх-жа рукамі. А калі і выступае, то ня як ад самаго сябе, а як ад сялян, выстаўляючы сябе хадатаем за сялянскія інтарэсы, змагаючыся супроць комуны (Лукаш). І Мышкін і Лукаш добра разумеюць, што больш моцнай зброяй у змаганьні супроць колгасу зьяўляецца—падначаліць сабе пэўную частку сялянства, найбольш адсталую (асабліва жанчын) і іх рукамі змагацца супроць колгасу. Сэнс контррэвалюцыйнай змовы паміж Лукашом, Мышкіным і Незнаёмым у гэтым і зьмяшчаецца. Выхад значнай часткі сялян з колгасу ня што іншае, як вынік кулацкай чыннасьці.

Паказам змаганьня кулака супроць колгасу Галавач вучыць ставіцца да кулака з усёй сур'ёзнасьцю, клясавай пільнасьцю, ставіцца як да хітрага клясавага ворага, які ўмее змагацца, і з якім таксама патрэбна ўмела і ўпарта змагацца, бо кулак уласьцівымі яму спосабамі імкнецца падначаліць сабе і падначальвае частку сялянства, вельмі добра разумеючы значэньне гэтага. Усё гэта не сказана, а па-мастацку і пераканаўча паказана пісьменьнікам, праходзіць праз усю ягоную аповесьць, што асабліва патрэбна падкрэсьліць. У паводзінах кулакоў, у іх узаемадачыненьнях з сялянствам у Галавача няма нацяжкі, голага фразёрства. Таксама няма нічога штучнага ў тым, што пад уплывам кулацтва значная частка сялян пакідае колгас; абумоўленасьць гэтага выразна падкрэсьлена самім паказам соцыяльных сваяасаблівасьцяй сялян Цярэшкавага Броду. Галавач не гаворыць пра магчымасьць кулацкага ўплыву на сялянства, а пуката і пераканаўча яго паказвае, добра разумеючы прычыны такога ўплыву.

Упартым змагаром за колгас ў Цярэшкавым Бродзе зьяўляецца Панас. Вобраз Панаса ў гэтым сэнсе паказаны найбольш поўна ў параўнаньні з падобнымі яму. Панас вышаў з беднай сялянскай сям'і. Яшчэ

ў дзяцінстве ён чуў глыбока праўдзівы сьпеў, сумны сьпеў свайго дзеда пра беднасьць, недаяданьне, няшчаснае і бязрадаснае жыцьцё. Сялянская беднасьць пакінула глыбокія сьляды ў сьвядомасьці Панаса. Будучы выхаванцам беднасці, Панас добра ведае і разумее псыхолёгію сялян, іх жыцьцё. На сходзе ягоная ўвага прыкоўваецца „да спацелых", бледных твараў, да худых вялікіх рук, што трасуцца, калі чалавек уздымае іх, каб расшпіліць каўнер армяка, ці зьняць шапку. Вось што характэрна, для іх псыхолёгіі з пункту гледжаньня Панаса: „жаданьне чагосьці лепшага, праклёны і нянавісьць да таго, што ёсьць, і страх, вечны страх перад тым, што будзе". Асноўнае ў паводзінах Панаса—змаганьне, настойлівае змаганьне, за зьнішчэньне такога „страху", якім так умела карыстаецца кулак. „Гэта сьветлае жыцьцё ня прыдзе само, трэба рабіць самім нам"—так гаворыць Панас на сялянскім сходзе, што і зьяўляецца адзіным прынцыпам ягоных паводзін.

Панас не „знаёмы" Зарэцкага, які стаіць у баку ад змаганьня за колгас, які можа толькі „рашчулена" разважаць пра перажываньні сялянкі, але бясьсільны сам што-небудзь карыснае зрабіць, бо процэс колектывізацыі—чужы яму процэс. Панас перш за ўсё актыўны змагар, цьвёрда пераконаны ў пераможнасьці колгасу, настойліва змагаючыся, каб гэта непарушная пераконанасьць была ня толькі ягонай, а каб яна стала пераконанасьцю і сялян Цярэшкавага Броду і ў першую чаргу беднякоў. Панас добра разумее, што аднэй з важнейшых перашкод у стварэньні колгасу зьяўляецца кулак і што без змаганьня з ім нельга стварыць колгасу. Ён разумее, што часта нават беднякі падпадаюць пад кулацкі уплыў, выступаючы супроць колгасу. Кулацкі ўплыў павялічвае хістаньні ў псыхолёгіі селяніна, тармозіць перамаганьне ягонай нерашучасьці стаць колгасьнікам. Гэты ўплыў можа быць такім моцным, што нават разумеючы сам яго, бядняк не адразу важыцца адчынена перад сходам сялян заявіць пра гэты уплыў у мэтах хутчэйшага вызваленьня ад яго. Вось чаму змаганьне за колгас у Панаса непадзельна зьвязана са змаганьнем супроць кулацтва і папоўшчыны, зьяўляецца аднэй справай.

Настойлівасьць у змаганьні за колгас, пераконанасьць у перамогу яго, ня гледзячы на вялізарнейшыя цяжкасьці і перашкоды, разуменьне іх сутнасьці, безагаворачная адданасьць гэтай справе—характэрныя рысы вобразу Панаса. Не выпадкова кулакі глядзяць на Панаса, як на самага моцнага іх ворага, не выпадкова яны робяць яго сваёй ахвярай.

Паўстае пытаньне. Як Галавач паказаў кіруючую ролю пралетарыяту, ягонай партыі ў справе перабудаваньня вёскі на соцыялістычны лад, які ўдзел тут прымае горад? Зразумелая рэч, што пастаўленае пытаньне зьяўляецца вельмі важным для правільнага і ўсебаковага паказу процэсу колектывізацыі, яно-ж і найбольш слабае месца ва ўсей літаратуры пра колектывізацыю. Сказаць, што Галавач

не разумее кіруючай ролі пролетарыяту ў калектывізацыі—значыць заплюшчыць вочы на факты, сьвядома іх абыйсьці. Але-ж адным разуменьнем справа не вырашаецца, што таксама ясна. Тут адзін з асноўных недахопаў аповесьці.

Галавач ня выпукліў, не падкрэсьліў кіруючай ролі партыі пролетарыяту ў справе колектывізацыі вёскі. Калі Галавач пуката паказаў опортуніста-абыватэля Асьцюка, дык гэтага ён не зрабіў у дачыненьні да сапраўднага бальшавіка-ленінца. Галавач усебакова не паказаў сапраўднай ролі рабочай брыгады, якую паслалі чыгуначнікі ў Цярэшкаў Брод у дапамогу колгасу. Брыгада рамантуе толькі сельска-гаспадарчыя прылады. У аповесьці ёй адведзена вельмі малое месца. Яе палітычнай работы мы ня бачым, яе актыўнага ўдзелу ў клясавым змаганьні няма. Падкрэсьліваю, зьява паказана вельмі аднабока. Разгорнутага паказу кіруючай ролі у колектывізацыі рабочага, загартаванага бальшавіка, тут няма. Паказваючы удзел брыгады рабочых у сацыялістычнай рэконструкцыі вёскі. Галавач спыніўся толькі на фізычнай працы, якая, вядома, таксама мае палітычны сэнс, палітычную карысьць. Прыезд брыгады ў Цярэшкаў Брод меў той станоўчы вынік, што работа брыгады разьвеяла недаверлівасьць да гораду з боку сялян. Але-ж такім паказам рабочай брыгады справа паказу кіраўніцтва пролетарыяту ў соцыялістычнай рэконструкцыі вёскі ня можа быць вырашана, бо паасобным момантам нельга падмяняць агульнага, нельга ставіць паміж імі знаку роўнасьці.

Некаторыя думаюць, што праз вобраз Панаса Галавач яскрава паказаў партыйнае кіраўніцтва колектывізацыяй. Сяляне яго называюць „прадстаўніком" з гораду. Але ў аповесьці нічога выразнага ня сказана, хто яго паслаў. Панас нідзе выразна не заяўляе перад сялянамі, не падкрэсьлівае, што яго прыслала на вёску партыя, што ён выступае ад імя партыі, ажыцьцяўляе партыйнае кіраўніцтва колектывізацыяй. У аповесьці няма шырокага паказу, у якіх дачыненьнях ён знаходзіцца з сельсаветам і раёнам, чаго і нельга было зрабіць, бо Галавач амаль-што абышоў сельсавет і раён у ягоных стасаваньнях да колектывізацыі. Колектывізацыя ў Цярэшкавым Бродзе праходзіць без належнага ўдзелу сельсавета і раёну, што зусім не зьяўляецца характэрным для нашага часу. Магчыма, у Цярэшкавым Бродзе і стварыўся колгас без такога ўдзелу. Але-ж гэта трэба расцэньваць як прыватнае і ня інакш. Мастацкі твор павінен насіць абагульняючы характар—значыць ён паказвае тыпічнае. Прыватнае класьці ў аснову зьявы ніяк нельга, бо яно прывядзе да няправільных вывадаў. Там, дзе паказваецца толькі прыватнае без ягонага дачыненьня да агульнага, да характэрнага, там рачаіснасьць паказваецца не такой, якой яна ёсьць.

Пятровіч у сваёй рэцэнзіі падкрэсьлівае, што „Платон Галавач здолеў паказаць, як пролетарыят змагаецца за колектывізацыю". Сказана выразна, але непераканаўча. Дзіўна, на падставе чаго робіцца такое безагаворачнае сьцьвярджэньне. Такіх падстаў не дае

паказ брыгады, сход чыгуначнікаў, на якім вылучаецца гэта брыгада, не дае іх і паказ пасяджэньня гарадзкога партыйнага камітэту. Прыведзеныя факты гавораць толькі пра спробу такога паказу, але не зьяўляюцца разгорнутым паказам. Сказаць „здолеў паказаць"—значыць, даў разгорнуты паказ, выпукліў, падкрэсьліў. Інакш і нельга разумець. Трэба-ж умець адрозьніваць тое, пра што гаворыцца, ад таго, што паказана. Брыгадзір Чурынаў перад ад'ездам брыгады з Цярэшкавага Броду гаворыць сялянам, што пролетарыят дапамагае і будзе дапамагаць перабудоўваць ім жыцьцё, што яны недаверліва паставіліся да брыгады пад уплывам кулацтва. Яму селянін адказвае: „мы цёмныя, усяго мы баімося... самі сябе нават часам баімося". Былі ўсе падставы, каб паказаць змаганьне брыгады з кулацтвам, паказаць яе кіруючую ролю, акунуць яе ў клясавае змаганьне, а ня толькі спыніцца на адным рамонце, як зрабіў Галавач. Параўнайце тое, што дадзена пра сэкратара парткому з паказам абывацельшчыны-опортуніста Асьцюка, з выяўленьнем усей абывацельшчыны, што яшчэ бытуе ў горадзе, і адразу кінецца ў вочы вялікая дыспропорцыя ў разгорнутасьці паказу таго і другога. Калі Асьцюк усё-ж паўстае перад намі, як жывы конкрэтны вобраз, дык сэкратара парткому толькі занатаваны некаторыя рысы, разгорнутага паказу ягонага вобразу няма, што так патрэбна было зрабіць.

Вельмі цікава, што Пятровіч убачыў у аповесьці, фактычна, адзін недахоп: „Барацьба супярэчнасьцяй у чарзе павінна была быць паказана больш складанай, больш напруджанай"; а перад гэтым Пятровіч піша: „у паказе чаргі аўтар застанавіўся на паўшляху, зьвярнуўшы ўвагу на п'янага, якога хутка адшылі жанчыны". Чаму на паўшляху, не зразумела. Якія супярэчнасьці мае на ўвазе Пятровіч, таксама не зразумела. Няўжо пашкодзіла паказу складанасьці супярэчнасьцяй тое, што Галавач мімаходам спыніўся на п'яным? Тут важна падкрэсьліць, што горад паказаны найбольш пуката, галоўным чынам з боку чаргі, абывацельшчыны і параўнаўча мала зьвернута мастацкай увагі на горад, як на кіраўніка змаганьня за соцыялізм на вёсцы. Вось гэтага Пятровіч і ня ўбачыў, ня ўбачыў вельмі важнага.

„Спалох на загонах", адзін з лепшых твораў Галавача, паказвае на творчы рост пролетарскага пісьменьніка. Гэта аповесьць адрозьніваецца ад падобных ёй твораў у тэматычным пляне перш за ўсё тым, што тэма яе раскрыта больш глыбока. У аповесьці няма голага нанізваньня фактаў, паўзучая эмпірыка тут ня падмяняе ідэйнасьці. Ідэю аповесьці Галавач раскрывае ня мэтодам сухой і голай канстатацыі фактаў, ня мэтодам застылай статыкі, а праз супярэчлівую дынамікў нашай рачаіснасьці. Галавач паказвае жыцьцё, як супярэчлівае і суровае, прычым гэта ў яго не набывае штучных форм выражэньня, пісьменьнік на рачаіснасьць не нацягвае халата тандэнтнай романтызацыі процэсу нашага разьвіцьця. Шлях нашага разьвіцьця,

стварэньне новай рачаіснасьці не зьяўляецца лёгкім і прасталінейным—ён вельмі складаны і цяжкі, супярэчлівы, шлях абвостранага клясавага змаганьня, па якім трэба ўмець ісьці, ісьці ўпарта, каб перамагчы. „Спалох“—толькі часовае, але неабходнае, соцыяльна абумоўленае. Гэты „спалох“ у процэсе клясавага змаганьня, у процэсе змаганьня за новую рачаіснасьць перамагаецца.

Будучы глыбока пераконаным у пераможнасьці соцыялістычнага разьвіцьця нашай рачаіснасьці, раскрываючы ў гэтым пляне конкрэтыку выражэньня руху ідэі сваёй аповесьці, Галавач не заўсёды з патрэбнай паўнатой раскрывае яе. Вобразная сыстэма, сюжэтная дынаміка зьяўляецца формай выражэньня ідэі твору. Паколькі вобразы, якія ў аповесьці выражаюць пролетарскае кіраўніцтва процэсам колектывізацыі, невыстарчальна распрацаваны Галавачом, дык і ідэя аповесьці не набыла свайго належнага ўсебаковага выражэньня.

Тут жа трэба адзначыць, што ў аповесьці няма паказу опортунізму ў дзейнасьці, у яго непасрэднай практыцы, а гэта азначае, што ў аповесьці няма належнага разгорнутага мастацкага паказу ўсёй яго шкоднасьці для соцыялістычнага будаўніцтва. Я падкрэсьліваю на словы „мастацкага паказу“, г. зн. на мастацкую адчувальнасьць, на тое, што патрабуе, каб зьява жыцьця паўставала ў творы, як перакананаўчае і поўнае адлюстраваньне сапраўднасьці. Калі і гаварылася вышэй, што абываталь, опортуніст Асьцюк, у аповесьці зьяўляецца ўсё-ж жывым чалавекам, то гэта яшчэ ні ў якім разе не адзначае, што ён пададзены Галавачом без заган. У гэтым вобразе ёсьць значныя элемэнты шаблёну, ён не зьяўляецца выражэньнем манэўруючага опортунізму, завуаляванага, а значыць і найбольш шкоднага, ён не выражае таму і сур'ёзнай перашкоды для нашага будаўніцтва, ён проста нікчэмная, з мяшчанскімі „прынцыпамі“, мізэрнасьць. Калі ў аповесьці раскрыта на конкрэтным матарыяле, раскрыта памастацку, вялізарнейшая небясьпека кулацкага ўплыву на працоўнае сялянства, то Галавач недастаткова гэта зрабіў у дачыненьні да паказу опортунізму.

Як на адзін з прыкладаў схэматызму, можна паказаць на факт Галавачовай падачы Клемсавага адыходу ад рэлігіі, які зьяўляецца адным з найменш пераканаўчых з мастацкага боку момантаў аповесьці. Паўнаты процэсу станаўленьня гэтай новай якасьці ў сьвядомасьці селяніна вобраз Клемса не выражае, бо замест супярэчлівага росту сьвядомасьці тут занадтая лёгкасьць яго, амаль раптоўнасьць.

Ня гледзячы на значныя недахопы, аповесьць „Спалох на загонах“—патрэбны і карысны твор. Яна, як ніводзін з твораў, напісаных пра колектывізацыю, мобілізуе сьвядомасьць шырокіх працоўных мас на змаганьне за соцыялістычную перабудову вёскі. Недахопаў у аповесьці зусім няма ніякай патрэбы абыходзіць, згладжваць. У гэтым была-б вельмі дрэнная паслуга як самому пісьменьніку, так і беларускай пролетарскай літаратуры, у якой Галавач па праву займае значнае месца.

Пастанова літаратурна-мастацкага згуртаваньня „Узвышша“.

Пры сваім утварэньні літаратурнае згуртаваньне „Узвышша“ зьяднала ў сваіх шэрагах савецкіх пісьменьнікаў, значная частка якіх была яшчэ мала выяўлена альбо зусім ня выяўлена, якія не ўсьведамлялі сабе ясна ні тых задач, што стаяць перад савецкай літаратурай, ні таго месца, якое яны самі займаюць у гэтай літаратуры. Ня маючы яшчэ выразна акрэсьленага сьветапогляду, нясучы на сабе цяжар дробнабуржуазнай ідэолёгіі, яны лёгка падпадалі пад розныя непролетарскія ці нават антыпролетарскія ўплывы, і іх ідэёвы і творчы рост праходзіў са значнымі зрывамі і адхіленьнямі ў бок ад правільнага шляху. Гэтаму асабліва спрыяла тая акалічнасьць, што пэўная частка найбольш кваліфікаваных пісьменьнікаў ва „Узвышшы“—фактычнае былое кіраўніцтва згуртаваньня—былі пад моцным уплывам ідэй беларускага адраджанізму, што выразна выявілася і ў дэклярацыі, якая была складзена пры ўтварэньні організацыі.

Праца літаратурнага згуртаваньня „Узвышша“ ў першы пэрыод яго існаваньня—1926-29 г.—мела на сабе выразныя адзнакі нацыянал-дэмократызму. Асаблівую актыўнасьць нацыянал-дэмократычныя элемэнты праявілі ўнутры „Узвышша“, калі пролетарыят павёў рашучы наступ на кулака, і калі клясавае змаганьне асабліва абвастрылася на ўсіх франтох гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Разам з гэтым адбывалася і дыфэрэнцыяцыя сярод членаў згуртаваньня „Узвышша“.

Адначасова з тым, калі пролетарская грамадзкасьць пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі выкрыла контррэволюцыйны нацыянал-дэмократызм, літаратурнае згуртаваньне „Узвышша“, пры дапамозе тае-ж пролетарскай грамадзкасьці, таксама ачысьцілася ад нацыянал-дэмократычных элемэнтаў, выключыўшы з свайго складу ранейшых ідэолёгаў „Узвышша“ і актыўных праваднікоў нацыянал-дэмократычнай лініі.

Пасьля ачышчэньня „Узвышша“ ад нацыянал-дэмократычных элемэнтаў праца ў згуртаваньні ішла ў асноўным па лініі зжываньня нацыянал-дэмократычных тэндэнцый унутры згуртаваньня і па лініі выпраўленьня яго членамі ранейшых памылак у творчасьці.

Не зважаючы на паасобныя зрывы і памылкі ў сваёй працы, за апошнія два гады згуртаваньне дасягнула пэўных вынікаў у справе перавыхаваньня сваіх членаў. Значная частка ўзвышаўскіх папутнікаў, перамагаючы сваю дробна-буржуазную ідэолёгію, а часам і пэўныя ўплывы буржуазнай ідэолёгіі, рашуча стала на шлях перабудовы свайго творчага мэтоду з мэтай набліжэньня да пролетарскай літаратуры. Аднак трэба адзначыць, што перабудова гэта ў розных членаў згуртаваньня праходзіла па-рознаму і не ў аднолькавай ступені. Калі такія члены згуртаваньня, як Кузьма Чорны, здолелі за гэты час перарасьці ў саюзьнікаў пролетарскай літаратуры, дык ёсьць яшчэ і такія члены, якія ідуць па шляху перабудовы досыць нерашуча і няўпэўнена. Больш таго, ёсьць адзінкі, як напрыклад Лукаш Калюга, якія на сёнешні дзень гэтай перабудовы амаль што і не пачыналі.

У апошнія часы перад згуртаваньнем „Узвышша“ паўстала пытаньне аб далейшых задачах згуртаваньня і аб пэрспэктывах яго організацыйнага росту. Але гэта пытаньне нельга разьвязваць асобна. Яго трэба ставіць у сувязь з тымі задачамі, якія стаяць цяпер перад пролетарскай літаратурай, у сувязь з усім літаратурным рухам БССР. Тэндэнцыі-ж разьвіцьця літаратурнага руху ў даны момант такія, што замкнутая літаратурная організацыя, у якой згуртавалася дзесятак пісьменьнікаў, каб працаваць над сабой і сваёй творчасьцю, зьяўляецца на сёньня ўстарэлай і ня можа спраўляцца з задачамі, якія стаяць перад пролетарскай літаратурай. Літаратурная організацыя ў сучасны момант павінна зьяўляцца масавай організацыяй, якая кіруе цэлым вучасткам літаратурнага руху.

Члены згуртаваньня „Узвышша“ ў сваёй большасьці выразна ўсьвядомілі сабе неабходнасьць перабудовы свае творчасьці ў адпаведнасьці з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва і той шлях, па якім гэта перабудова павінна пайсьці.

З прычыны ўсяго гэтага агульны сход членаў згуртаваньня „Узвышша“ пастанаўляе:

1. Констатаваць, што члены згуртаваньня „Узвышша“ ня ставяць сабе ў творчасьці іншых задач, апрача тых, якія стаяць перад пролетарскай літаратурай БССР і ўсяго Савецкага саюзу.

2. Лічыць, што літаратурнае згуртаваньне „Узвышша“, дзякуючы сваёй організацыйнай вузкасьці і замкнутасьці, ня маючы пэрспэктыў росту, тых задач, якія стаяць сёньня перад пролетарскай і савецкай літаратурай, з посьпехам выконваць ня можа.

3. Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаваньне „Узвышша“ распусьціць.

4. Лічыць пажаданым утварэньне ў БССР літаратурнай організацыі тыпу саюзу савецкіх пісьменьнікаў, якая-б, па магчымасьці,

ахапіла ўсіх папутнікаў БССР і, забяспечаная належным партыйным кіраўніцтвам, змагла-б шырока разгарнуць працу па перавыхаванню папутнікаў з мэтай набліжэньня іх да пролетарскай літаратуры.

Члены літаратурнага згуртаванья „Узвышша“:

Зьмітрок Бядуля, П. Глебка, С. Дарожны, Лукаш Калюга, Т. Кляшторны, Крапіва, Максім Лужанін, А. Мрый, Кузьма Чорны.

Паведамленьне.

З прычыны роспуску згуртаванья часопісь „Узвышша“ ў 1932 г. выдавацца ня будзе.

Рэдакцыя.

10108.

Рэдагуе рэдколегія *Выдае* Беларускае дзяржаўнае выдавецтва

~~205160~~